АСАЦЫЯЦЫЯ РОЎНЫХ ПРАВОЎ
У СУПРАЦОЎНІЦТВЕ З БЕЛАРУСКІМ ХЕЛЬСІНКСКІМ КАМІТЭТАМ

# ЧАЛАВЕК І ЯГО ПРАВА

## Даклад аб няроўнасці і дыскрымінацыі ў Беларусі

ERT Country Report Series: 3
Лондан, лістапад 2013 года

Асацыяцыя роўных правоў (The Equal Rights Trust) – гэта незалежная міжнародная арганізацыя, мэтай якой з'яўляецца барацьба з дыскрымінацыяй і прасоўванне роўнасці як фундаментальнага права чалавека і асноўнага прынцыпу сацыяльнай справядлівасці. Асацыяцыя роўных правоў – гэта інфармацыйна-аналітычны цэнтр, які факусіруецца на складаных узаемаадносінах паміж рознымі відамі дыскрымінацыі і распрацоўвае стратэгіі прымянення прынцыпаў роўнасці на практыцы.

© Лістапад 2013 Асацыяцыя роўных правоў

© Дызайн і вокладка: лістапад 2013, Дафіна Георгіева

Вёрстка: Іштван Феньвешы

Надрукавана ў Вялікабрытаніі, Srtoma Ltd.
ISBN: 978-0-9560717-9-8

Усе правы абаронены. Ніякая частка дадзенай публікацыі не можа быць перакладзеная, адноўленая, захаваная ў інфармацыйна-пошукавай сістэме або перададзена ў любой форме ці іншымі сродкамі без папярэдняга пісьмовага дазволу выдаўца або ліцэнзіі на абмежаванае капіраванне ад Агенцтва па ліцэнзаванні аўтарскіх правоў (CLA, Вялікабрытанія) або Цэнтра аўтарскага афармлення (CCC, USA).

The Equal Rights Trust
314-320 Gray's Inn Road
London WC1X 8DP
United Kingdom
Тэл. +44 (0) 207 610 2786
Факс: +44 (0) 207 833 0277
www.equalrightstrust.org

Асацыяцыя роўных правоў – гэта кампанія, абмежаваная гарантыяй, зарэгістраванай у Вялікабрытаніі, а таксама дабрачынная арганізацыя.
Рэгістрацыйны нумар кампаніі: 5559173.
Дабрачынны нумар: 1113288.

Даклад падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза.
Змест даклада забяспечаны выключнай адказнасцю Асацыяцыі роўных правоў і Беларускага Хельсінкскага Камітэта і не павінен разглядацца як адлюстраванне пазіцыі Еўрапейскага Саюза.

*Чалавек, яго правы, свабоды*
*і гарантыі іх рэалізацыі*
*з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю*
*і мэтай грамадства і дзяржавы.*

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.**

## ЗМЕСТ

*АЎТАРЫ І ВЫКАЗВАННЕ ПАДЗЯКІ*

*СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ СКАРАЧЭННЯЎ*

*РЭЗЮМЭ*

**1. УВОДЗІНЫ** ... 1

1.1 Мэта даклада і яго структура ... 1

1.2 Канцэптуальныя рамкі і метадалогія даследавання ... 3

1.3 Нацыянальны кантэкст ... 18

1.4 Дзяржаўнае кіраванне і палітычная сітуацыя ... 21

**2. ТЫПОВЫЯ ПРАЯВЫ НЯРОЎНАСЦІ** ... 30

2.1 Няроўнасць на падставе рэлігіі, мовы і этнічнасці ... 34

2.1.1 Рэлігія ці вераванні ... 35

2.1.2 Нацыянальныя (этнічныя) меншасці ... 75

2.1.3 Праявы няроўнасці на падставе выкарыстання беларускай мовы ... 117

2.2 Няроўнасць на падставе полу, інваліднасці і сексуальнай арыентацыі ... 131

2.2.1 Праблема гендарнай роўнасці (жанчыны) ... 132

2.2.2 Інваліды і людзі, якія жывуць з ВІЧ ... 148

2.2.3 Супольнасць ЛГБТ ... 164

2.3 Няроўнасць на падставе палітычных поглядаў і перакананняў ... 177

2.4 Уплыў фактараў беднасці і грамадзянства ў кантэксце роўнасці і недыскрымінацыі ... 188

**3. ЗАКАНАДАЎСТВА, ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА І СУДОВАЯ ПРАКТЫКА Ў СФЕРЫ РОЎНАСЦІ І НЕДЫСКРЫМІНАЦЫІ** . . . . . 196

3.1 Міжнародна-прававыя абавязацельствы Беларусі. . . . . 196

3.2 Нацыянальнае заканадаўства . . . . . 203

3.2.1 Канстытуцыя . . . . . 203

3.2.2 Нормы аб роўнасці і недыскрымінацыі ў беларускіх законах. . . . . 209

3.3 Дзяржаўная палітыка . . . . . 230

3.4 Судовая практыка . . . . . 240

**4. ЗАКЛЮЧЭННЕ І РЭКАМЕНДАЦЫІ**. . . . . 259

4.1 Заключэнне. . . . . 259

4.2 Рэкамендацыі . . . . . 265

*БІБЛІЯГРАФІЯ*. . . . . 272



*АЎТАРЫ ДАКЛАДА І ВЫКАЗВАННЕ ПАДЗЯКІ*

Гэты даклад падрыхтаваны *Асацыяцыяй роўных правоў* (The Equal Rights Trust) у цесным супрацоўніцтве з РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт».

У рамках спецыяльнага праекта, які стаў магчымы дзякуючы падтрымцы Еўрапейскага Саюза, Асацыяцыя і Камітэт правялі даследаванне сітуацыі ў Беларусі, а таксама зрабілі першасны аналіз матэрыялаў і вызначылі асноўныя тэмы і праблемы для падрабязнага апісання.

Першая версія даклада была падрыхтавана эстонскім экспертам па пытаннях недыскрымінацыі *Вадзімам Палешчуком* у жніўні 2012 г. на аснове сабраных і прадстаўленых РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» матэрыялаў, сведчанняў і аналітыкі, а таксама з прыцягненнем іншых пісьмовых крыніц. Гэта версія даклада была пракаментавана і дапоўнена *Дзімітрынай Пятровай*, выканаўчым дырэктарам Асацыяцыі роўных правоў. У лютым-сакавіку 2013 г. *Вадзім Паляшчук* падрыхтаваў другую пашыраную версію даклада, адрэдактаваную і падпісаную да друку *Дзімітрынай Пятровай* у чэрвені 2013 г.

Важную ролю для выяўлення і апісання праблем няроўнасці і дыскрымінацыі адыгралі палявыя даследаванні, арганізаваныя пад агульнай каардынацыяй Васіля Санковіча (РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт»). Першасную праваабарончую экспертызу нарматыўна-прававой базы ажыццявіў *Алег Гулак*. Эксперты *Віктар Адзіночанка* (пытанні свабоды веравызнання), *Сяргей Драздоўскі* (правы людзей з інваліднасцю), *Наталля Манькоўская* (правы членаў супольнасці ЛГБТ), *Наталля Кутузава* (правы прадстаўнікоў этнічных меншасцяў) і *Ірына Саламаціна* (пытанні гендарнай роўнасці) правялі ў сваіх галінах даследаванні беларускага заканадаўства і правапрымяняльнай практыкі, выступілі каардынатарамі груп інтэрв'юераў і актыўна ўдзельнічалі ў дапрацоўцы даклада, даючы свае каштоўныя заўвагі і дапаўненні.

Асацыяцыя роўных правоў і РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» дзякуюць за дапамогу ў правядзенні даследавання, складанні даклада і за прававую экспертызу *Міжэтнічнаму кансультатыўнаму савету пры Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур, МГА «Гендарныя перспектывы», ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», ГА «Радзіслава»,*

*ППУ «Офіс па правах людзей з інваліднасцю»*, *Праваабарончаму праекту «ГейБеларусь»*, а таксама *Саюзу беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын*. Акрамя таго, яны выказваюць удзячнасць латвійскаму эксперту па пытаннях правоў чалавека *Аляксею Дзімітраву* за яго каментары і заўвагі да першай версіі даклада, а таксама *Леаніду Райхману* за рэдакцыю тэксту.

Аўтары хацелі б таксама падзякаваць усім беларускім удзельнікам палявых даследаванняў за іх паслядоўнасць у адстойванні свайго права жыць у Беларусі, свабоднай ад якой-небудзь няроўнасці і дыскрымінацыі.

Чалавек і яго права

*СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ СКАРАЧЭННЯЎ*

| | |
|---|---|
| **ААН** | Арганізацыя Аб'яднаных Нацый |
| **АБСЕ** | Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе |
| **АГП** | Аб'яднаная грамадзянская партыя |
| **АДКБ** | Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы |
| **АЗАГС** | Аддзел запісу актаў грамадзянскага стану |
| **АЭП** | Адзіная эканамічная прастора |
| **АЭС** | Атамная электрастанцыя |
| **БДІПЧ** | Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека |
| **БДУ** | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт |
| **БЛЛ** | Беларуская ліга сексуальнай роўнасці «Лямбда» |
| **БНФ** | Партыя «Беларускі народны фронт» |
| **БПЦ** | Беларуская праваслаўная царква |
| **БССР** | Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка |
| **БХК** | Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» |
| **ВІЧ** | Вірус імунадэфіцыту чалавека |
| **ВНУ** | Вышэйшая навучальная ўстанова |
| **ГА** | Грамадскае аб'яднанне |
| **ДНК** | Дзяржаўная надзвычайная камісія |
| **ЕС** | Еўрапейскі Саюз |
| **ЕўрАзЭС** | Еўразійская эканамічная супольнасць |
| **ЗАП** | Заўвага агульнага парадку |
| **ЗАТ** | Закрытае акцыянернае таварыства |
| **ІАЦ** | Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь |
| **КаАП** | Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь |
| **КДБ** | Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь |
| **КЗаП** | Кодэкс законаў аб працы |
| **КК** | Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь |
| **КПЧ** | Камітэт ААН па правах чалавека |
| **КС** | Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь |
| **ЛГБТ** | Лесбіянкі, геі, бісексуалы і трансгендары |
| **ЛЖВ** | Людзі, якія жывуць з ВІЧ |
| **МАП** | Міжнародная арганізацыя працы |
| **МВФ** | Міжнародны валютны фонд |

| | |
|---|---|
| **МГА** | Міжрэгіянальнае грамадскае аб’яднанне |
| **МЗС** | Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь |
| **МНС** | Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь |
| **МПГПП** | Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах |
| **МПЭСКП** | Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах |
| **МСМ** | Мужчыны, якія маюць сексуальныя зносіны з мужчынамі |
| **МУС** | Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь |
| **НДІ** | Навукова-даследчы інстытут |
| **ПК** | Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь |
| **ПРААН** | Праграма развіцця Арганізацыі Аб’яднаных Нацый |
| **ПУА** | Прыватная ўстанова адукацыі |
| **РАУС** | Раённы аддзел унутраных спраў |
| **РБ** | Рэспубліка Беларусь |
| **РГА** | Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне |
| **РПГА** | Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб’яднанне |
| **РПЦ** | Руская праваслаўная царква |
| **СМІ** | Сродкі масавай інфармацыі |
| **СНД** | Садружнасць Незалежных Дзяржаў |
| **СНІД** | Сіндром набытага імунадэфіцыту |
| **СПБ** | Саюз палякаў Беларусі |
| **ССР** | Савецкая сацыялістычная рэспубліка |
| **СССР** | Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, Савецкі Саюз |
| **УВП** | Унутраны валавы прадукт |
| **ЮНФПА** | Фонд ААН у галіне народанасельніцтва |
| **ЮНЭЙДС** | Аб’яднаная праграма ААН па ВІЧ/СНІД |



*РЭЗЮМЭ*

Артыкул 22 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. абвяшчае роўнасць кожнага перад законам і права кожнага без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў. Аднак краіне ўсё яшчэ неабходна пераадолець шэраг бар'ераў на шляху да раўнапраўнага грамадства, свабоднага ад дыскрымінацыі.

## 1. Уводзіны

*Мэта даклада і яго структура*

Мэтай гэтага даклада з'яўляецца выяўленне асноўных сфер, формаў і прычын няроўнасці і дыскрымінацыі ў сучасным беларускім грамадстве праз аналіз заканадаўства, адміністрацыйнай і судовай практыкі, а таксама фармуляванне адпаведных рэкамендацый для беларускіх уладаў. Даклад складаецца з чатырох глаў. У першай з іх асвятляюцца канцэптуальныя асновы даклада і метадалогія яго напісання, даюцца базавыя факты пра Беларусь. У другой главе праз прызму роўнасці і недыскрымінацыі разглядаецца становішча розных уразлівых груп: рэлігійных, этнічных і моўных, а таксама акцэнтуецца ўвага на групах, праблемы няроўнасці якіх шмат у чым абумоўлены традыцыяналісцкімі стэрэатыпамі ў беларускім грамадстве (жанчыны, інваліды і людзі, якія жывуць з ВІЧ, а таксама прадстаўнікі супольнасці ЛГБТ). У асобную групу вылучаны людзі, якія прытрымліваюцца апазіцыйных поглядаў і перакананняў. Трэцяя глава даклада дае агляд міжнародна-прававых абавязкаў Рэспублікі Беларусь у сферы роўнасці і недыскрымінацыі на ўзроўні ААН, АБСЕ і СНД, разглядае асаблівасці беларускага нацыянальнага заканадаўства і дзяржаўнай палітыкі, а таксама судовай практыкі па гэтай тэме.

*Канцэптуальныя рамкі і метадалогія даследавання*

Канцэптуальныя рамкі дадзенага даклада – гэта адзіны праваабарончы падыход да роўнасці, які вылучае інтэгральную ролю роўнасці пры доступе да ўсіх правоў чалавека і імкнецца пераадолець фрагментацыю ў дачыненні да заканадаўства і палітыкі ў сферы роўнасці.

Адзіны праваабарончы падыход да роўнасці мае цэласны характар. Улічваючы спецыфіку розных відаў роўнасці і разнастайных тыпаў неспрыяльнага становішча ў сацыяльным кантэксце, ён імкнецца да больш эфектыўнай рэалізацыі права на роўнасць праз падкрэсленне агульных аспектаў гэтых розных відаў і тыпаў. У гэтых канцэптуальных рамках мы зможам разгледзець і параўнаць няроўнасць на розных падставах (напрыклад, з-за этнічнасці, роднай мовы, полу, гендарнай ідэнтычнасці, інваліднасці, сексуальнай арыентацыі, рэлігійных вераванняў і палітычных поглядаў) і ў самых розных галінах, такіх, як праваахоўная дзейнасць, занятасць, адукацыя, грамадская і палітычная актыўнасць, доступ да тавараў і паслуг.

Адзіны праваабарончы падыход да роўнасці знайшоў адлюстраванне ў дакуменце, які называецца Дэкларацыя прынцыпаў роўнасці. Дакумент распрацаваны і выпушчаны ў свет Асацыяцыяй роўных правоў (The Equal Rights Trust) у 2008 г. пасля кансультацый са 128 экспертамі ў сферы правоў чалавека і роўнасці з 47 краін розных рэгіёнаў свету.

Гэты даклад падрыхтаваны па выніках даследавання беларускага заканадаўства і правапрымяняльнай практыкі з выкарыстаннем дадзеных гістарычных, паліталагічных і сацыялагічных даследаванняў, афіцыйнай статыстыкі і па выніках маніторынгу, здзейсненага беларускімі праваабаронцамі. Праблемы, якія знаходзяцца ў цэнтры ўвагі гэтага даклада, раней практычна не былі аб'ектам пільнага даследавання беларускіх і замежных навукоўцаў, міжнародных міжурадавых і праваабарончых арганізацый, а таксама саміх уладаў Рэспублікі Беларусь. Таму, нароўні з даследаваннем наяўных публікацый і матэрыялаў, аўтарамі былі зроблены крокі для першаснага збору звестак у межах экспертнага апытання і палявых даследаванняў (з дапамогай метадаў фокус-групы і інтэрв'ю). Экспертнае апытанне і палявыя даследаванні пры падтрымцы Асацыяцыі роўных правоў былі падрыхтаваныя і праведзеныя РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт».





*Нацыянальны кантэкст, дзяржаўнае кіраванне і палітычная сітуацыя*

У главе 1 прыводзіцца агляд дэмаграфічнага, сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і гістарычнага кантэксту праблем роўнасці і дыскрымінацыі ў Беларусі. Ніжэй падаюцца найбольш важныя звесткі:

- Беларусь размешчана ва Усходняй Еўропе без выхаду да мора. Яна падзяляецца на шэсць абласцей і тэрыторыю сталіцы Рэспублікі Беларусь – горад Мінск. Тэрыторыя краіны складае 207,6 тыс. км$^2$. Беларусь мяжуе з Расіяй, Украінай, Польшчай, Літвой і Латвіяй.
- Асноўнымі этнічнымі групамі (нацыянальнасцямі) Беларусі з'яўляюцца: беларусы – 83,7%, рускія – 8,3%, палякі – 3,1%, украінцы – 1,7%, яўрэі – 0,1% (2009 г.). У краіне дзве дзяржаўныя мовы – беларуская і руская.
- Пераважная большасць вернікаў адносяць сябе да праваслаўных. Другой па колькасці рэлігійнай групай з'яўляюцца рыма-каталікі.
- Паводле паказчыкаў 2011 г., ВУП краіны ў бягучых коштах склаў 276009 млрд бел. руб. або 55,48 млрд $ (5881 $ на душу насельніцтва).
- Паводле звестак ПРААН Беларусь у 2011 г. займала 65-ю пазіцыю ў свеце па ўзроўні чалавечага развіцця і знаходзілася на самым высокім месцы сярод усіх краін-чальцоў Садружнасці Незалежных Дзяржаў (11 былых рэспублік СССР, апроч Грузіі, Латвіі, Літвы і Эстоніі).
- Тэрыторыя Беларусі раней уваходзіла ў склад розных дзяржаў. Беларусь канчаткова набыла незалежнасць у 1991 г., а непасрэдна перад

гэтым знаходзілася ў складзе СССР як Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР).

- Беларусь з'яўляецца прэзідэнцкай рэспублікай. Цяперашні Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка быў упершыню абраны на гэтую пасаду ў 1994 г. і тройчы пасля гэтага пераабіраўся. Для Беларусі характэрныя моцныя аўтарытарныя тэндэнцыі, вельмі малая роля палітычных партый і параўнальна нязначны ўдзел парламента ў працэсе ініцыявання заканадаўства. Пры гэтым варта ўлічваць адносна шырокую сацыяльную апору цяперашняга беларускага рэжыму.

- Беларусь удзельнічае ў шэрагу рэгіянальных праектаў інтэграцыйнай накіраванасці, у якіх вядучая роля адводзіцца Расійскай Федэрацыі.

## 2. Тыповыя праявы няроўнасці

Пры аналізе тыповых праяў няроўнасці ўлічвалася наяўнасць двух асноўных падыходаў да беларускага нацыябудаўніцтва, якім адпавядаюць два тыпы ідэнтычнасцяў з арыентацыяй у заходнім альбо ўсходнім (расійскім) кірунку, а таксама розныя прамежкавыя або камбінаваныя варыянты гэтых ідэнтычнасцяў. Уразлівымі могуць быць тыя сацыяльныя групы, прадстаўнікі якіх з'яўляюцца носьбітамі «няправільнасці» з пункта гледжання ўладаў і / або большасці насельніцтва. Гэтая «няправільнасць» можа датычыцца падыходаў да нацыябудаўніцтва і беларускай ідэнтычнасці альбо грунтавацца на сувязі ці асацыяванні з палітычнай апазіцыяй. Некаторыя ўразлівыя групы могуць пакутаваць ад распаўсюджанасці ў грамадстве традыцыяналісцкіх і патэрналісцкіх стэрэатыпаў, якія часам падтрымліваюцца дзяржавай. Падчас разгляду прыкладаў няроўнасці ў розных сферах у дакладзе пры неабходнасці надавалася ўвага гістарычнаму, а таксама знешнепалітычнаму кантэксту (уплыву суседніх дзяржаў і падзей, якія адбываюцца там палітычных падзей).

*Праявы няроўнасці на падставе рэлігіі або веравання*

У XX стагоддзе Беларусь увайшла як краіна з пераважна праваслаўным насельніцтвам, якой яна застаецца і сёння. Ступень рэлігійнасці ў краіне высокая, што, аднак, не адбіваецца на ўзроўні ўдзелу ў рэлігійных абрадах і сакрамантах. У краіне таксама моцнымі застаюцца пазіцыі каталіцкай царквы, асабліва сярод польскай меншасці. У Канстытуцыі абвяшчаецца роўнасць рэлігій і веравызнанняў перад законам; на ўзроўні законаў і практыкі вылучаюцца пяць «традыцыйных» канфесій. Улады спрыяюць беларусізацыі мясцовай каталіцкай царквы, выкарыстоўваючы для гэтага візавую палітыку. Стаўленне ўладаў да «нетрадыцыйных» канфесій вельмі насцярожанае. Заканадаўства ставіць у няроўныя ўмовы традыцыйныя і буйныя канфесіі ў параўнанні з невялікімі і новымі для Беларусі рэлігійнымі плынямі. Таксама ёсць прыклады адміністрацыйных перашкод для рэгістрацыі рэлігійных арганізацый. Пазастатутная дзейнасць рэлігійных арганізацый праследуецца як адміністрацыйнае правапарушэнне. Удзел у дзейнасці незарэгістраванай арганізацыі можа карацца ў крымінальным парадку, і ўлады неаднаразова папярэджвалі парушальнікаў аб магчымасці прымянення такіх санкцый. Заканадаўства абмяжоўвае рэлігійную дзейнасць па-за культавымі будынкамі. Хоць магчымасць праходжання альтэрнатыўнай службы прадугледжана ў Канстытуцыі, адпаведны закон да гэтага часу не прыняты.

*Праявы няроўнасці на падставе этнічнага паходжання*

Сёння беларусы складаюць больш за 4/5 насельніцтва краіны. Для ўсіх буйных этнічных груп, у тым ліку беларусаў, не назіраецца выразнай прывязкі заяўленай этнічнасці да «нацыянальнай мовы» (акрамя рускіх, якія амаль усе гавораць на рускай мове як на роднай). Беларуская Канстытуцыя і іншыя законы гарантуюць нацыянальным меншасцям (якімі лічацца толькі грамадзяне Беларусі) роўнасць у асноўных сферах грамадскага жыцця. Ёсць і некаторыя гарантыі выкарыстання моў меншасцяў у адукацыі, прычым на практыцы працуюць школы на польскай і літоўскай мовах. Рэгуляванне публічнага выкарыс-

тання моў меншасцяў (напрыклад, у вулічнай рэкламе) мае абмежавальны характар, аднак яно не падмацавана магчымасцю накладання якіх-небудзь санкцый. Самая буйная пасля рускай польская меншасць сутыкаецца з дыскрымінацыйным стаўленнем уладаў Беларусі і Польшчы пры карыстанні свабодай асацыяцый, што стала вынікам палітызацыі пытанняў польскай меншасці. Сістэма польскіх школ таксама застаецца неразвітай, мабыць, па той жа прычыне. Улады Беларусі даказалі сваю гатоўнасць змагацца з праявамі антысемітызму, аднак існуюць праблемы з павагай да культурнай спадчыны. У краіне не праводзілася рэстытуцыя правоў уласнасці на культавыя будынкі. Цыганская меншасць, як і ў іншых еўрапейскіх краінах, сутыкаецца з сістэмнай дыскрымінацыяй і расавым прафіляваннем з боку праваахоўных органаў.

*Праявы няроўнасці на падставе выкарыстання беларускай мовы*

Беларуская мова прайшла этап канчатковай стандартызацыі толькі ў першай трэці XX ст. Нягледзячы на афіцыйную палітыку беларусізацыі ў 1920-я і ў пачатку 1990-х гг., па розных гістарычных прычынах беларуская мова не дамінуе ў гарадскім асяроддзі, саступаючы першынства рускай мове і змяшанай беларуска-рускай гаворцы. У сферы адукацыі, асабліва вышэйшай, а таксама ў сферы гандлю і паслуг беларуская і руская мова не выкарыстоўваюцца ў роўнай ступені. Гэта абмяжоўвае магчымасці тых беларусаў, якія аддаюць перавагу таму, каб мець зносіны на беларускай мове ў публічнай сферы. Больш за тое, такія моўныя перавагі могуць увязвацца з апазіцыйнай палітычнай дзейнасцю. Пры гэтым Канстытуцыя і заканадаўства гарантуюць юрыдычную роўнасць абедзвюх дзяржаўных моў.

*Праявы гендарнай няроўнасці (жанчыны)*

Традыцыяналісцкія стэрэатыпы па-ранейшаму ўплываюць на становішча беларускіх жанчын у розных галінах грамадскага жыцця. На рынку працы яны па-ранейшаму зарабляюць у сярэднім менш за мужчын. Яны недастаткова прадстаўлены наверсе кар'ернай лесвіцы (акрамя дзяржсектара) і празмерна прадстаўлены ў менш прэстыжных сектарах эканомікі. Беларускія жанчыны добра адукаваныя. Тым не менш, праз сістэму адукацыі можа рэалізоўвацца цяперашні дысбаланс на рынку працы. Магчымасці жанчыны абмяжоўвае няроўнае размеркаванне хатняй працы. Востра стаіць пытанне аб хатнім (бытавым) гвалце. Праблемы роўнасці палоў атрымалі прызнанне беларускіх уладаў, што прывяло да прыняцця канкрэтных мер на практыцы.

*Праявы няроўнасці на падставе інваліднасці і ВІЧ*

Інваліды складаюць прыкладна 5% насельніцтва краіны. У Беларусі існуе развітае заканадаўства аб іх сацыяльнай падтрымцы; у інтарэсах інвалідаў і іншых уразлівых груп прымяняюцца розныя пазітыўныя захады на рынку працы. Да ліку пытанняў, якія цяпер вырашаюцца, але пакуль не вырашаныя, ставіцца даступнасць публічнай інфраструктуры. На рынку працы шмат складанасцяў, звязаных з разумным прыстасаваннем працоўнага месца. Асобна знаходзяцца праблемы людзей, якія жывуць з ВІЧ. Яны могуць сутыкацца з праблемай стыгматызацыі і дыскрымінацыі, часам у сувязі з нізкім узроўнем інфармаванасці насельніцтва.

*Праявы няроўнасці на падставе сексуальнай арыентацыі*

Сексуальныя адносіны паміж жанчынамі ніколі ў беларускай гісторыі не былі крыміналізаванымі. Дэкрыміналізацыя сексуальных адносін паміж мужчынамі адбылася ў 1994 г., дэпаталагізацыя – у 2002 г. Становішча ЛГБТ даследавана недастаткова, узровень цярпімасці да іх большасці беларускага насельніцтва з’яўляецца нізкім. Ёсць прыклады фізічнага і псіхалагічнага гвалту ў дачыненні да прадстаўнікоў гэтай супольнасці, якія таксама могуць адчуваць дадатковыя складанасці пры доступе да тавараў і паслуг. Ёсць цяжкасці з рэалізацыяй свабоды сходаў і асацыяцый.

*Праявы няроўнасці на падставе палітычных поглядаў і перакананняў*

Сацыяльныя актывісты ў Беларусі могуць адчуваць негатыўныя наступствы з-за сваіх поглядаў і перакананняў на рынку працы, у сферы прадпрымальніцтва, у сферы адукацыі (асабліва вышэйшай) і пры рэалізацыі права на свабоду творчасці. З улікам адносна шырокай сацыяльнай базы беларускага рэжыму, дыскрымінатарамі могуць выступаць

і звычайныя грамадзяне. Гэтая група пакуль недастаткова вывучаная пры дапамозе колькасных метадаў сацыялагічных даследаванняў. На рэалізацыю прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі ў Беларусі прыкметна ўплываюць такія фактары, як беднасць і адсутнасць грамадзянства краіны пражывання.

## 3. Заканадаўства, дзяржаўная палітыка і судовая практыка ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі

У гэтай главе аналізуюцца прававыя і практычныя аспекты рэалізацыі ў Беларусі прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі.

*Міжнародна-прававыя абавязкі*

Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам асноўных міжнародных канвенцый ААН, палажэнні якіх накіраваныя на супрацьдзеянне няроўнасці і дыскрымінацыі. Краіна ратыфікавала або далучылася, апроч іншага, да наступных дагавораў: Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (1966 г.), Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (1966 г.), Міжнародная Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (1966 г.), Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (1979 г.), Канвенцыя аб правах дзіцяці (1989 г.), Канвенцыя ЮНЕСКА супраць дыскрымінацыі ў галіне адукацыі (1960 г.), Канвенцыя № 111 МАП аб дыскрымінацыі ў галіне працы і заняткаў (1958 г.). Да гэтых канвенцый не існуе якіх-небудзь агаворак або дэкларацый, якія маюць значэнне для дадзенага даклада. Акрамя таго, Беларусь прыняла на сябе шэраг абавязкаў у межах СНД (шэраг праваабарончых канвенцый) і АБСЕ. Нормы міжнародных дагавораў прызнаныя часткай беларускага заканадаўства. Беларусь прызнае некаторыя працэдуры індывідуальных скаргаў у міжнародныя органы, напрыклад, у Камітэт па правах чалавека ААН.

*Нацыянальнае заканадаўства*

Беларуская Канстытуцыя прадугледжвае ў артыкуле 22 прынцып роўнасці кожнага перад законам. У тым жа артыкуле ўстанаўліваецца права на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў без якой-небудзь





дыскрымінацыі. Канстытуцыя мае прамое дзеянне – яе палажэнні могуць прымяняцца судамі. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь неаднаразова прапаноўваў прагрэсіўнае тлумачэнне артыкулаў Канстытуцыі ў кантэксце праблем няроўнасці і дыскрымінацыі. У Беларусі, аднак, няма спецыяльнага антыдыскрымінацыйнага заканадаўства і няма планаў яго прыняць. Тым не менш, даволі шмат беларускіх законаў змяшчаюць агульныя палажэнні, якія тычацца роўнасці і недыскрымінацыі. У крымінальным праве існуюць нормы, якія дазваляюць змагацца са злачынствамі на падставе нянавісці. Найбольш падрабязна пытанні барацьбы з дыскрымінацыяй прапрацаваныя ў працоўным заканадаўстве. На жаль, спіс забароненых падстаў там з'яўляецца закрытым, што на практыцы можа перашкаджаць эфектыўнай барацьбе з дыскрымінацыяй па некаторых распаўсюджаных падставах, напрыклад, узрост і сексуальная арыентацыя. У інтарэсах уразлівых груп беларускае працоўнае заканадаўства прадугледжвае шэраг пазітыўных мер. У межах грамадзянскага права можна запатрабаваць кампенсацыю за маральную шкоду, звязаную з парушэннем права на роўнасць і недыскрымінацыю. Ніякіх асаблівых працэсуальных правоў і гарантый пры судовым разглядзе спраў аб дыскрымінацыі ў беларускім праве не існуе.

*Дзяржаўная палітыка*

Спецыяльная палітыка, накіраваная на дасягненне роўнасці і роўнага абыходжання, праводзіцца ў Беларусі толькі ў адносінах да жанчын. У цяперашні час рэалізуецца ўжо чацвёрты Нацыянальны план дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці на 2011–2015 гг. Штогод прымаюцца дзяржаўныя праграмы садзейнічання занятасці насельніцтва, якія прадугледжваюць і асаблівыя меры ў інтарэсах сацыяльна неабароненых груп насельніцтва. Комплексная праграма развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011–2015 гг. уключае падпраграму «Папярэджанне інваліднасці і рэабілітацыя інвалідаў». У інтарэсах інвалідаў рэалізуецца таксама чарговая Дзяржаўная праграма па стварэнні безбар'ернага асяроддзя жыццядзейнасці фізічна аслабленых асоб на 2011–2015 гг. У этнаканфесіянальнай вобласці можна адзначыць Праграму развіцця канфесійнай сферы, нацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2011–2015 гг. Увогуле ўсе праграмы выконваюцца на практыцы

і прыносяць пэўную карысць у кантэксце прасоўвання прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі.

*Судовая практыка*

У вытворчасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь былі справы, якія датычацца роўнасці і недыскрымінацыі; у гэтым дакладзе больш падрабязна разглядаюцца толькі тры з іх. У 1994 г. Канстытуцыйны Суд прызнаў неканстытуцыйным звальненне работніка толькі з-за дасягнення ім пэўнага ўзросту; у 2001 г. падобная норма ў дачыненні да публічнага службоўцы (чыноўніка) была прызнаная адпаведнай Канстытуцыі. У 2011 г. парушэннем прынцыпу роўнасці было прызнана заканадаўчае рэгуляванне, згодна з якім бацька мог сысці ў адпачынак па догляде за дзіцем толькі ў тым выпадку, калі маці працавала па дагавору найму (а ў дадзенай справе яна з'яўлялася індывідуальным прадпрымальнікам). У дакладзе разглядаюцца таксама прыклады таго, наколькі нездавальняюча пакуль дыскрымінацыйныя справы разглядаюцца звычайнымі беларускімі судамі.

## 4. Заключэнне і рэкамендацыі

Апошняя частка даклада суміруе пададзеныя ў ім факты, ацэнкі і аналіз. На гэтай аснове для беларускіх уладаў былі сфармуляваны як агульныя рэкамендацыі, так і рэкамендацыі, якія датычацца асобных пытанняў: свабоды сумлення і веравызнання; этнічных і моўных груп; гендарных адносін; інвалідаў і людзей, якія жывуць з ВІЧ; супольнасці ЛГБТ; людзей з апазіцыйнымі поглядамі і перакананнямі.

Усе гэтыя рэкамендацыі пададзены ніжэй:

*Агульныя рэкамендацыі*

- Прыняць асаблівы ўсеабдымны закон па праблематыцы роўнасці і недыскрымінацыі. У гэтым законе варта даць вызначэнне прамой і ўскоснай дыскрымінацыі па адкрытым спісе падстаў, даць вызначэнне прыгнёту і пазітыўных дзеянняў. Закон таксама павінен змяшчаць працэсуальныя гарантыі, якія датычацца доказвання выпадкаў дыскрымінацыі, перш за ўсё зрушэнне цяжару доказвання на адказчыка. У законе варта выразна замацаваць права дыскрымінаванымі на пакрыццё маральнай шкоды пры любой праяве дыскрымінацыі. Закон павінен таксама прадугледзець стварэнне спецыялізаванага незалежнага органа, які аказвае падтрымку ахвярам дыскрымінацыі.

- Укараняць у судовую і іншую правапрымяняльную практыку прамое прымяненне міжнародных дагавораў, у тым ліку тых, якія змяшчаюць антыдыскрымінацыйныя палажэнні і стандарты. Праводзіць спецыяльнае навучанне суддзяў, прадстаўнікоў іншых юрыдычных прафесій і дзяржаўных службоўцаў для павышэння іх узроўню кампетэнцыі ў сферы барацьбы за роўнасць і супраць дыскрымінацыі.

- Прааналізаваць і знайсці шляхі лібералізацыі заканадаўства, якое мае непасрэднае дачыненне да свабоды рэлігіі, асацыяцыі, слова і сходаў. Адмяніць забарону на дзейнасць незарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў і рэлігійных арганізацый, а таксама дэкрыміналізаваць дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый.

- Надаваць асаблівую ўвагу падрыхтоўцы палітыкаў, журналістаў і прадстаўнікоў выканаўчай улады па пытаннях роўнасці і недыскрымінацыі. Падрыхтоўка павінна зыходзіць з таго, што роўны, свабодны і дэмакратычны ўдзел прадстаўнікоў уразлівых груп у палітычным і грамадскім жыцці з'яўляецца адной з неабходных умоў усеабдымнага

ажыццяўлення міжнародных абавязкаў Беларусі.

- Ажыццяўляць гендарны мэйнстрымінг у межах любой дзяржаўнай палітыкі Беларусі.
- Уключыць курс па праблемах роўнасці і недыскрымінацыі на розных падставах у праграмы вышэйшай і сярэдняй адукацыі.
- Праводзіць мэтанакіраваную палітыку для падвышэння ўзроўню цярпімасці насельніцтва да сацыяльных груп, асабліва ўразлівых у кантэксце рэалізацыі права на роўнасць і недыскрымінацыю.
- Гарантаваць роўны доступ грамадзян Рэспублікі Беларусь і неграмадзян да грамадзянскіх, эканамічных, сацыяльных і культурных правоў, асабліва ў сферы працоўнай дзейнасці, сацыяльнага забеспячэння і доступу да адміністрацыйных працэдур.
- Працягваць прыкладаць намаганні да ліквідацыі праблемы беднасці і надаваць асаблівую ўвагу становішчу дзяцей, бацькоў-адзіночак і сельскіх жыхароў.

*Свабода сумлення і веравызнання*

- Спрасціць рэгістрацыю рэлігійных суполак і аб'яднанняў.
- Зняць забароны, звязаныя з ажыццяўленнем рэлігійнай дзейнасці па-за культавых будынкаў або за межамі месца рэгістрацыі, а таксама ліквідаваць бар'еры для працы святароў-замежнікаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.





- Вырашыць праблему недахопу культавых будынкаў іўдаістаў і «новых рэлігійных рухаў» пры падтрымцы публічных фондаў.
- Прадугледзець магчымасць для праходжання альтэрнатыўнай службы. Дэкрыміналізаваць адмову ад службы ў войску па рэлігійных прычынах.

*Нацыянальныя (этнічныя) і моўныя групы*

- Выключыць крытэрый грамадзянства з вызначэння паняцця «нацыянальная меншасць», якое афіцыйна выкарыстоўваецца.
- Гарантаваць неўмяшанне дзяржавы ва ўнутраныя справы грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных меншасцяў.
- Надаваць павышаную ўвагу барацьбе з праявамі антысемітызму, ксенафобіі і нецярпімасці.
- Прыняць рашучыя меры для выкаранення сістэмнай дыскрымінацыі цыганоў. Забяспечыць роўны доступ цыганоў да рэалізацыі правоў чалавека ва ўсіх сферах жыцця, у тым ліку праз прыняцце пазітыўных мер, накіраваных на выкараненне негатыўных стэрэатыпаў у дачыненні да цыганоў у беларускім грамадстве.
- Забараніць практыку этнічнага прафілявання бачных меншасцяў і правесці адпаведнае навучанне сярод супрацоўнікаў праваахоўных органаў.

- Мэтанакіравана працаваць над праблемай інтэграцыі цыганоў-рома ў беларускім грамадстве, асабліва ў сферы адукацыі і на рынку працы, надаючы таксама ўвагу праблеме захавання іх культурнай своеасаблівасці.

- Працягваць падтрымку грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных меншасцяў і навучання на мовах нацыянальных меншасцяў і на замежных мовах у розных формах. Гарантаваць права на навучанне на мовах меншасцяў на ўсіх узроўнях, калі прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў выказалі такое пажаданне.

- Забяспечыць у заканадаўстве і праваапрымяняльнай практыцы субстантыўную роўнасць носьбітаў беларускай і рускай моў, асабліва ў сферы адукацыі і пры доступе да тавараў і паслуг. Аказваць усялякую падтрымку выкарыстання беларускай мовы, а таксама моў нацыянальных меншасцяў у публічнай прасторы.

- Прадугледзець магчымасці для выкарыстання мовы нацыянальнай меншасці ў кантактах з уладамі ў месцах іх кампактнага пражывання. Устанавіць права размяшчаць у публічных месцах інфармацыю на мовах меншасцяў.

*Гендарная роўнасць*

- Прыняць закон аб папярэджанні хатняга гвалту, які замацоўвае канкрэтныя правы ахвяр на дапамогу, абарону і пакрыццё шкоды. Арганізаваць для суддзяў, пракурораў і супрацоўнікаў міліцыі абавязковую падрыхтоўку па пытаннях выканання нарматыўных палажэнняў аб гвалце і дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын і растлумачваць супрацоўнікам міліцыі стандартныя працэдуры абыходжання з жанчынамі, якія пацярпелі ад гвалту. Павысіць даступнасць дзяржаўных прытулкаў, пашырыць супрацоўніцтва дзяржавы з грамадскімі арганізацыямі, якія выдзяляюць ахвярам прытулак і рэабілітацыйныя паслугі.

- Скасаваць любую дыскрымінацыю жанчын пры доступе ў адукацыйныя ўстановы Беларусі.

- Актывізаваць намаганні, накіраваныя на дыверсіфікацыю выбару адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі сярод мужчын і жанчын, і прыняць дадатковыя меры для заахвочвання выбару мужчынамі і жанчынамі нетрадыцыйных сфер адукацыі і прафесійнай дзейнасці.

- Выявіць прычыны і зрабіць адпаведныя крокі, накіраваныя на ліквідацыю розніцы ў аплаце за роўную працу мужчын і жанчын.

- Прыняць канкрэтныя меры, накіраваныя на дасягненне адэкватнага прадстаўніцтва жанчын на вышэйшых прыступках кар'ернай лесвіцы.

- Актыўна процідзейнічаць грамадскім стэрэатыпам, якія датычацца размеркавання хатніх абавязкаў паміж членамі сям'і.

*Людзі з інваліднасцю і людзі, якія жывуць з ВІЧ (ЛЖВ)*

- Працягваць намаганні па стварэнні безбар'ернага асяроддзя для людзей з інваліднасцю.
- Дамагацца большага ўдзелу інвалідаў у працоўным жыцці, ліквідацыі бар'ераў, наяўных для іх на рынку працы.
- Скасаваць дыскрымінацыйныя нормы, якія змяшчаюцца ў Законе «Аб папярэджанні распаўсюджвання захворванняў, якія ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва, віруса імунадэфіцыту чалавека». Забяспечваць захаванасць асабістых звестак ЛЖВ.
- З прыцягненнем грамадскіх арганізацый праводзіць тлумачальную працу з дзяржаўнымі службоўцамі, работнікамі аховы здароўя, сацыяльнай сферы і адукацыі, якія кантактуюць з ЛЖВ і членамі іх сем'яў. Павышаць дасведчанасць такіх асоб у сферы правоў чалавека.

*Супольнасць ЛГБТ*

- Замацаваць у заканадаўстве забарону на дыскрымінацыю па прыкмеце сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, асабліва ў працоўным праве і пры доступе да тавараў і паслуг.
- Дакладна вызначыць, што матыў нянавісці па прыкмеце сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці пры здзяйсненні крымінальных і адміністрацыйных правапарушэнняў з'яўляецца акалічнасцю, якая абцяжарвае віну.





- Арганізоўваць для прадстаўнікоў праваахоўных органаў адукацыйныя праграмы і трэнінгі па працы з ЛГБТ і даследаванні злачынстваў і правапарушэнняў на падставе нянавісці да ЛГБТ.
- Паважаць права прадстаўнікоў супольнасці ЛГБТ на свабоду сходаў і свабоду асацыяцыі.
- Укараняць праграмы дапамогі ЛГБТ у пытаннях адстойвання сваіх правоў, псіхалагічнай падтрымкі ЛГБТ, іх сем'яў і бліжэйшага атачэння. Падтрымліваць няўрадавыя арганізацыі, якія займаюцца пытаннямі прасоўвання правоў ЛГБТ.

*Людзі з апазіцыйнымі палітычнымі поглядамі і перакананнямі*

- У дадатак да Крымінальнага і Працоўнага кодэксаў увесці заканадаўчую забарону на дыскрымінацыю па прыкмеце палітычных поглядаў і перакананняў у іншых сферах грамадскага жыцця, асабліва пры доступе да тавараў і паслуг, у тым ліку публічных.
- На рынку працы і ў сферы адукацыі правесці маніторынг эфектыўнасці прымянення норм недыскрымінацыі ў дачыненні да асоб, якія прытрымліваюцца апазіцыйных палітычных поглядаў і перакананняў. Па выніках маніторынгу прыняць меры, накіраваныя на выкараненне дыскрымінацыйных практык.

# 1. УВОДЗІНЫ

## 1.1 Мэта даклада і яго структура

У Рэспубліцы Беларусь, якая стала незалежнай дзяржавай у 1991 г., тэма раўнапраўя і забароны дыскрымінацыі з'яўляецца адначасова і традыцыйнай, і новай. Яшчэ калі рэспубліка была часткай Савецкага Саюза, яна далучылася да асноўных міжнародных інструментаў па правах чалавека, а ў беларускім заканадаўстве былі пастуляваны ўсеагульная роўнасць і забарона на дыскрымінацыю. У артыкуле 22 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. таксама абвешчаныя роўнасць кожнага перад законам і правы кожнага без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў. Аднак, як і ў савецкі перыяд, канстытуцыйныя гарантыі нялёгка рэалізуюцца на практыцы ў інтарэсах канкрэтных людзей; у краіне адсутнічае дэталёвае антыдыскрымінацыйнае заканадаўства і амаль няма судовай практыкі па справах аб раўнапраўі і недыскрымінацыі.

Вышэйшае кіраўніцтва Беларусі бачыць сваю задачу перш за ўсё ў развіцці эканомікі і ў падтрыманні стабільнасці грамадства на прынцыпах сацыяльнай справядлівасці. Грамадскія адносіны, якія склаліся ў сучаснай Беларусі, пакуль далёкія ад ідэалаў, адлюстраваных у міжнародных праваабарончых інструментах і ў канстытуцыі краіны. Тым не менш, заканадаўства і практыка Беларусі ў сферы раўнапраўя і недыскрымінацыі неадназначныя, і, з пункту гледжання сучасных міжнародных стандартаў, краіна дэманструе як безумоўныя дасягненні, так і відавочныя недахопы. У гэтым дакладзе выяўлены асноўныя сферы, формы і прычыны няроўнасці і дыскрымінацыі ў сучасным беларускім грамадстве, прааналізавана заканадаўства, адміністрацыйная і судовая практыка і сфармуляваны адпаведныя рэкамендацыі.

Варта ўлічваць, што сітуацыя ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі ў Беларусі з'яўляецца прадуктам і гістарычнага развіцця, і сучасных працэсаў нацыябудаўніцтва, прычым у грамадстве працягваецца барацьба паміж рознымі праектамі будучыні краіны. У Беларусі назіраюцца сістэмныя праблемы ў сферы правоў чалавека і прыкметныя аўтарытарныя тэндэнцыі ў дзяржаўным кіраванні, што таксама ад-

біваецца на тыповых праявах няроўнасці. Краіне неабходна пераадолець шэраг бар'ераў на шляху да раўнапраўнага грамадства, вольнага ад дыскрымінацыі.

У гэтым дакладзе чатыры главы: увядзенне (**1**), тыповыя праявы няроўнасці (**2**), заканадаўства, дзяржаўная палітыка і судовая практыка ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі (**3**), а таксама высновы і рэкамендацыі (**4**).

**У першай главе**, акрамя мэты напісання даклада і яго структуры, закранаюцца пытанні канцэптуальных асноваў даклада і метадалогіі яго напісання. Таксама даюцца базавыя звесткі аб Беларусі, яе гісторыі і той палітычнай і эканамічнай сітуацыі, якая склалася.

**Другая глава** падзелена на тры часткі. У першай частцы праз прызму роўнасці і недыскрымінацыі разглядаецца сітуацыя ў дачыненні да розных рэлігійных канфесій, этнічных і моўных груп. У другой частцы главы акцэнтуецца ўвага на групах, праблемы няроўнасці якіх шмат у чым абумоўлены традыцыяналісцкімі ўстаноўкамі ў беларускім грамадстве (жанчыны, інваліды і людзі, якія жывуць з ВІЧ, а таксама прадстаўнікі супольнасці ЛГБТ). У трэцяй частцы другой главы разглядаюцца ў якасці асаблівай групы людзі, якія прытрымліваюцца апазіцыйных палітычных поглядаў і перакананняў.

**Трэцяя глава** даклада спачатку пералічвае асноўныя міжнародна-прававыя абавязкі Рэспублікі Беларусь у сферы роўнасці і недыскрымінацыі на ўзроўні ААН, АБСЕ і Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Далей у гэтай главе разглядаюцца асаблівасці беларускага нацыянальнага заканадаўства ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі, прычым асаблівая ўвага надаецца агульным антыдыскрымінацыйным забаронам і нормам, спецыяльным нормам крымінальнага і працоўнага права, працэсуальным нормам і нормам грамадзянскага права аб кампенсацыі маральнай шкоды. У главе таксама коратка апісваюцца дзяржаўная палітыка і асноўныя дзяржаўныя праграмы ў даследуемай сферы. Магчымасці рэалізацыі права на роўнасць і недыскрымінацыю паказаны на прыкладзе судовай практыкі, у тым ліку разгледжаны некаторыя рашэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь. Варта ўлічваць, што спецыялізаванага дэталёвага антыдыскрымінацыйнага





заканадаўства ў Беларусі пакуль няма, а палітыка, якая праводзіцца ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі, характарызуецца фрагментарнасцю.

**Чацвёртая глава** даклада складаецца з заключэння і рэкамендацый, якія грунтуюцца на аналізе прыкладаў няроўнасці і дыскрымінацыі, прыведзеных у главе 2, але таксама з улікам выяўленых недахопаў беларускага заканадаўства і дзяржаўнай палітыкі, разгледжаных у главе 3.

## 1.2 Канцэптуальныя рамкі і метадалогія даследавання

Канцэптуальныя рамкі дадзенага даклада – гэта адзіны праваабарончы падыход да роўнасці, які вылучае інтэгральную ролю роўнасці пры доступе да ўсіх правоў чалавека і імкнецца пераадолець фрагментацыю ў дачыненні да заканадаўства і палітыкі ў сферы роўнасці. Адзіны праваабарончы падыход да роўнасці мае цэласны характар. Улічваючы спецыфіку розных відаў роўнасці і разнастайных тыпаў неспрыяльнага становішча ў сацыяльным кантэксце, ён імкнецца да больш эфектыўнай рэалізацыі права на роўнасць праз падкрэсліванне агульных аспектаў гэтых розных відаў і тыпаў. У дадзеных канцэптуальных рамках мы зможам разгледзець і супаставіць няроўнасць на розных падставах (напрыклад, з-за этнічнасці, роднай мовы, полу, інваліднасці, сексуальнай арыентацыі, рэлігійных вераванняў і палітычных поглядаў) і ў самых розных галінах, такіх, як праваахоўная дзейнасць, занятасць, адукацыя, грамадская і палітычная актыўнасць, доступ да тавараў і паслуг.

### *Адзіны праваабарончы падыход да роўнасці*

Адзіны праваабарончы падыход да роўнасці знайшоў сваё ўвасабленне ў дакуменце, які называецца Дэкларацыя прынцыпаў роўнасці. Дакумент распрацаваны і выпушчаны ў свет Асацыяцыяй роўных правоў (The Equal Rights Trust) у 2008 г. пасля кансультацый са 128 экспертамі ў сферы правоў чалавека і роўнасці з 47 краін розных рэгіёнаў свету. Прынцып 1 Дэкларацыі вызначае права на роўнасць:

*Права на роўнасць – гэта права ўсіх людзей быць роўнымі ў годнасці, права на паважлівае і ўважлівае абыходжанне і права на ўдзел на роўных з іншымі ў любой сферы грамадзянскай дзейнасці ці эканамічным, сацыяльным, палітычным ці культурным жыцці. Усе людзі роўныя перад законам і маюць права на роўную абарону закона і на роўнае атрыманне законных выгод.*[1]

Вызначанае такім чынам права на роўнасць мае больш шырокае значэнне, чым прынята ў большасці юрысдыкцый: перш за ўсё, яно ўтрымлівае нешта большае, чым проста права на недыскрымінацыю. Вельмі важна адзначыць, што яно ўключае ў сябе права на роўны ўдзел ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, дзе дастасавальныя правы чалавека. У той жа час яно з'яўляецца асаблівым, самастойным правам. Як падкрэсліла Дз. Пятрова ў каментарыях да Дэкларацыі:

*Вызначэнне права на роўнасць як права на ўдзел на роўных з іншымі ў любой сферы грамадзянскай дзейнасці ці эканамічным, сацыяльным, палітычным ці культурным жыцці адпавядае міжнародным правам у сферы правоў чалавека ў тым, што тычыцца вылучэння тых абласцей, якія суадносяцца з правамі чалавека. Аднак Дэкларацыя вызначае сферы ўжывання права на роўнасць без якога-небудзь адрознівання паміж грамадзянскімі і палітычнымі правамі з аднаго боку і эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі правамі з другога, што так доўга выклікала праблемы для міжнароднага права ў сферы правоў чалавека. У той жа час Дэкларацыя ідзе далей разумення дыскрымінацыі і роўнасці як абавязкова звязаных з існуючым у законе правам. (...) На думку аўтараў, выканання права на роўнасць (і на недыскрымінацыі) можна патрабаваць у любой з пяці пералічаных сфер грамадскага жыцця нават пры адсутнасці там вызначаных у законе правоў. (...) Вызначэнне ў прынцыпе 1 не патрабуе, каб права на роўнасць грунтавалася б ці было б звязана з рэалізацыяй якога-небудзь іншага права чалавека.*[2]

1 *Declaration of Principles on Equality*. The Equal Rights Trust, London, 2008. Рускі пераклад тэксту ёсць на: www.equalrightstrust.org.





Такім чынам, права на роўнасць не прадугледжвае толькі роўны доступ да іншых правоў чалавека або роўнае карыстанне правамі, прадугледжанымі ў законе. Дэкларацыя абвяшчае, што гэта права разумеецца шырэй, каб гарантаваць роўнасць ва ўсіх сферах чалавечага жыцця, якія звычайна рэгулююцца правам, і што гэта права павінна рэалізоўвацца з улікам усяго сацыяльнага кантэксту. У рамках гэтага падыходу прызнаецца ўзаемасувязь розных тыпаў няроўнасці, якія праяўляюцца ў розных кантэкстах, і, зыходзячы з гэтага, пастулюецца неабходнасць змагацца ўсімі сродкамі супраць праяў дыскрымінацыі, якія назіраюцца ва ўсіх сферах жыцця. Менавіта таму ў дакладзе даследуецца тое, наколькі дасягнута роўнасць ва ўсіх сферах грамадзянскай дзейнасці ці эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага ці культурнага жыцця.

У дакладзе права на роўнасць у разуменні Дэкларацыі выкарыстоўваецца як першапачатковы пункт адліку для выяўлення і ацэнкі ступені няроўнасці. Аўтары не адчуваюць сябе звязанымі нездавальняючымі азначэннямі роўнасці, якія можна знайсці ў многіх прававых сістэмах. Акрамя свабоды ад дыскрымінацыі ўсіх відаў, вялікая ўвага надаецца практычнаму ажыццяўленню права на субстантыўную (сапраўдную) роўнасць або роўнасць па сутнасці (substantive equality). Як будзе паказана ніжэй, гэта пасоўвае аўтараў даклада правесці аналіз розных тыпаў неспрыяльнага становішча ў сацыяльным кантэксце, якія датычацца розных груп, за межамі таго, што з'яўляецца вынікам бясспрэчных актаў дыскрымінацыі. У такім ракурсе многія тыпы сацыяльнай няроўнасці могуць разглядацца як гістарычна абумоўленыя, але толькі разам з разуменнем, што больш шырока трактуемае ў Дэкларацыі права на роўнасць усё роўна патрабуе ад дзяржаў дзеянняў, накіраваных супраць

2 Petrova D. «The Declaration of Principles on Equality: A Contribution to International Human Rights», in *Declaration of Principles on Equality*. The Equal Rights Trust, London, 2008, pp. 30–31.

такіх тыпаў няроўнасці, нават калі яны не з'яўляюцца прадуктам дыскрымінацыі.

Такім чынам, у рамках адзінага падыходу фактычная няроўнасць, якая з'яўляецца ці не з'яўляецца наступствам дыскрымінацыі, трапляе ў фокус дадзенага даклада.

Што тычыцца ўзаемасувязі паміж правам на роўнасць і правам на недыскрымінацыю, то ў Дэкларацыі свабода ад дыскрымінацыі разглядаецца як складовая частка права на роўнасць (прынцып 4). Такім чынам, разглядаючы сітуацыю канкрэтнай групы, даклад будзе звяртаць увагу як на праблему дыскрымінацыі, так і на праблему няроўнасці, у тым ліку няроўнага ўдзелу, асабліва ў такіх галінах, як рынак працы, адукацыя, грамадская дзейнасць, доступ да тавараў і паслуг.

Адзіны праваабарончы падыход да роўнасці робіць пажаданым і магчымым даць агульнае прававое вызначэнне для ўсіх тыпаў дыскрымінацыі. Прынцып 5 Дэкларацыі прапануе наступныя вызначэнні важных для гэтага даклада паняццяў:

> *Павінна быць забароненая дыскрымінацыя на аснове расы, колеру скуры, этнічнай прыналежнасці, паходжання, полу, цяжарнасці, мацярынства, грамадзянскага, сямейнага статусу або статусу асобы, якая ажыццяўляе догляд, мовы, рэлігіі або вераванняў, палітычных ці іншых поглядаў, нараджэння, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, грамадзянства, эканамічнага статусу, асацыявання з нацыянальнай меншасцю, сексуальнай арыентацыі, палавой ідэнтычнасці, узросту, інваліднасці, стану здароўя, генетычнай або іншай схільнасці да хваробы, або спалучэння якіх-небудзь з гэтых падстаў, або на аснове характарыстык, якія асацыююцца з якой-небудзь з гэтых падстаў.*

*Дыскрымінацыя, што базуецца на якіх-небудзь іншых падставах, павінна быць забароненая, калі такая дыскрымінацыя (а) выклікае ці нязменна захоўвае сістэмнае неспрыяльнае становішча; (б) прымяншае чалавечую годнасць; ці (в) так сур'ёзна ўплывае неспрыяльным чынам на роўнае карыстанне чалавекам правоў і свабод, што гэта параўнальна з дыскрымінацыяй на названых вышэй забароненых падставах.*

*Дыскрымінацыя таксама павінна быць забароненая, калі яна мае месца з-за асацыяцыі асобы з іншымі асобамі, да якіх адносіцца забароненая падстава, альбо на аснове справядлівага або памылковага ўспрымання асобы як той, што мае характарыстыку, якая параўноўвалася з забароненай падставай.*

*Дыскрымінацыя можа быць прамой або ўскоснай.*

***Прамая дыскрымінацыя** мае месца, калі па прычыне, якая тычыцца адной ці больш забароненых падстаў, з асобай або з групай асоб дачыняюцца горш, чым з іншай асобай або з групай асоб дачыняюцца, дачыняліся або сталі б дачыняцца ў супастаўнай сітуацыі; ці калі па прычыне, якая тычыцца адной або больш падстаў, асобе або групе асоб наносіцца ўрон. Прамая дыскрымінацыя дапушчальная толькі ў крайніх выпадках, калі гэта можа быць апраўдана з улікам строга вызначаных крытэрыяў.*

***Ускосная дыскрымінацыя** мае месца тады, калі ўмова, крытэрый або практыка могуць паставіць асоб, якія маюць статус або характарыстыку, што асацыюецца з адной або больш забароненымі падставамі, у асабліва неспрыяльнае становішча ў параўнанні з іншымі асобамі, калі толькі гэтая*

*ўмова, крытэрый або практыка аб'ектыўна не апраўданыя законнай мэтай і калі сродкі для дасягнення гэтай мэты не з'яўляюцца адпаведнымі і неабходнымі.*

***Уціск** складае дыскрымінацыю тады, калі маюць месца непажаданыя паводзіны, якія тычацца якой-небудзь забароненай падставы, мэтай ці вынікам якіх з'яўляецца прыніжэнне годнасці асобы або стварэнне запалохваючай, варожай, зневажальнай, абразлівай або крыўднай абстаноўкі.*

*Дыскрымінацыйнае дзеянне можа здзяйсняцца наўмысна або ненаўмысна.*[3]

Дадзенае вызначэнне дыскрымінацыі шырока трактуе пытанне аб пераліку падстаў, па якіх забароненая дыскрымінацыя (**абароненыя прыкметы**). Яно змяшчае як падрабязны пералік падстаў для дыскрымінацыі, так і «тэст», які трэба прайсці для ўключэння дадатковых падстаў і ў рамках якога «падставы-кандыдаты» павінны адпавядаць хаця б адной з трох умоў.[4] Такім чынам, вызначэнне дазваляе займацца наяўнай праблемай ва ўсёй паўнаце – тут важны менавіта перажыты чалавекам вопыт дыскрымінацыі. Дадзенае вызначэнне прызнае, што асобны чалавек можа атрымаць вопыт дыскрымінацыі як у сілу «камбінавання» падстаў, якія ўзаемадзейнічаюць няяўна, так і на падставах, раней не прызнаных як «забароненыя», і што кумулятыўны эфект дыскрымінацыі на розных падставах можа перавышаць суму яго

3 Гл. спасылку 1, Principle 5.

4 «Вызначэнне дыскрымінацыі ў прынцыпе 5 уключае пашыраны спіс «забароненых падстаў», але не выкарыстоўвае выразу «ці іншага становішча», якім заканчваецца спіс характарыстык, прыведзеных у артыкуле 2 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Імкнучыся пазбегнуць злоўжыванняў у антыдыскрымінацыйным праве праз заявы аб дыскрымінацыі на незлічоных адвольных або ілжывых падставах, вызначэнне, тым не менш, утрымлівае ў сабе магчымасць пашырэння спісу «забароненых падстаў» і называе тры крытэрыі, выканання кожнага з якіх будзе дастаткова для прызнання яшчэ адной характарыстыкі як «забароненай падставы». Падобны падыход быў абумоўлены рашэннем дылемы «адкрыты супраць закрытага спісу «забароненых падстаў», прапанаваным Законам «Аб прасоўванні роўнасці і папярэджанні несправядлівай дыскрымінацыі», прынятаму Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай у 2000 годзе». Гл. спасылку 4, p. 34.





частак. У рамках адзінага падыходу да роўнасці феномен дыскрымінацыі разглядаецца цэласна з тым, каб на яго можна было б даць адэкватны адказ.

Прынцып 5 Дэкларацыі дае магчымасць разгляду ў дадзеным дакладзе некалькіх груп, аб'яднаных агульнай ідэнтычнасцю. Так у розных частках даклада аналізуецца дыскрымінацыя на падставе рэлігіі, этнічнасці, полу, інваліднасці, стану здароўя (ЛЖВ), сексуальнай арыентацыі, палітычных поглядаў. Таксама ў дакладзе асобна разглядаецца дыскрымінацыя, якую адчуваюць беларусы (этнічнай і лінгвістычнай большасцю) з-за іх моўных пераваг у публічнай сферы, хоць такая дыскрымінацыя не зусім падпадае ні пад адну са «звычайных» падстаў для дыскрымінацыі, узятае паасобку, такое як этнічнасць, мова, палітычныя ці іншыя погляды або асацыяванне з нацыянальнай меншасцю.

Дэкларацыя вызначае тры віды забароненых паводзінаў, якія ўяўляюць сабой дыскрымінацыю: прамая дыскрымінацыя, ускосная дыскрымінацыя і ўціск. Усе тры паняцці адлюстроўваюць цяперашні стан экспертнага меркавання наконт азначэнняў розных формаў дыскрымінацыі ў міжнародных[5] і рэгіянальных[6] дакументах аб правах чалавека і роўнасці. Яны выкарыстаны ў главе 2 даклада для ацэнкі дыскрымінацыйных праяў, выяўленых у рамках даследавання, у суаднясенні іх з абавязацельствамі дзяржавы паважаць права на недыскрымінацыю. Яны ж, скарыстаныя ў раздзеле 3 даклада для ацэнкі адэкватнасці прававога рэгулявання, закліканага прадаставіць абарону ад дыскрымінацыі.

Дадзены даклад таксама інкарпараваў некаторыя іншыя важныя паняцці і азначэнні з Дэкларацыі прынцыпаў роўнасці. Так, тэрмін «**раз-**

5 Гл., напр., Комитет по экономическим, социальным и культурным правам. *Замечание общего порядка № 20: Недискриминация экономических, социальных и культурных прав (пункт 2 статьи 2 Международного пакта об экономических, социальных и культурных правах)*, E/C.12/GC/20, 2009, п. 10.

6 Гл., напр., Council Directive 2000/43/EC of 29 June 2000 implementing the principle of equal treatment between persons irrespective of racial or ethnic origin (арт. 2 (a), 2 (b), 3); і Council Directive 2000/78/EC of 27 November 2000 establishing a general framework for equal treatment in employment and occupation (арт. 2 (a), 2 (b), 3).

**умнае прыстасаванне**» разумеецца намі так, як гэта выражана ў прынцыпе 13 Дэкларацыі:

> *Для дасягнення поўнай і эфектыўнай роўнасці ад арганізацый публічнага і прыватнага сектара можа спатрэбіцца забеспячэнне разумнага прыстасавання з улікам наяўнасці ў людзей розных магчымасцяў адносна адной ці больш забароненых падстаў.*
>
> *Прыстасаванне азначае неабходныя і адпаведныя змены і карэкціроўкі, у тым ліку папераджальныя меры з мэтай дапамагчы раскрыць здольнасці кожнага чалавека для ўдзелу ва ўсіх сферах эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага ці культурнага жыцця або грамадзянскай дзейнасці ў роўнай ступені з іншымі людзьмі. Прыстасаванне да адрознення не павінна быць абавязкам, калі для адказнай асобы яно ўяўляе непрапарцыйныя або празмерныя складанасці.*[7]

Адмова ў разумным прыстасаванні разглядаецца ў гэтым дакладзе як дыскрымінацыя ў поўнай адпаведнасці з міжнародным правам у гэтай галіне.[8] Паняцце разумнага прыстасавання, якое адлюстроўвае міжнародны кансэнсус, дасягнуты па гэтым пытанні, «пашыраецца з мэтай ахапіць іншыя формы неспрыяльнага становішча за рамкамі інваліднасці, а таксама іншыя адрозненні, якія перашкаджаюць здольнасці індывідаў да ўдзелу ў любой сферы грамадзянскай дзейнасці або эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага ці культурнага жыцця».[9] Пры гэтым у кантэксце даклада мы маем на ўвазе, што дадзены панятак можа выкарыстоўвацца не толькі ў адносінах да інваліднасці, але і да любой іншай прычыны.

Падобным чынам даклад вызначае пазітыўныя дзеянні, таксама як і Дэкларацыя (прынцып 3). Як і ў выпадку з іншымі прынцыпамі, Дэкларацыя грунтуецца на падыходзе, які з'яўляецца ў міжнародным і рэгіянальным праве ў сферы правоў чалавека (у дадзеным выпадку на канцэпцыі «спецыяльных мер», якая сустракаецца ў розных дакументах).[10] Адначасова з гэтым варта адзначыць, што «Дэкларацыя адлюстроўвае тэндэнцыю разумення «спецыяльных мер», хутчэй як часткі роўнага абыходжання, чым выключэння з яго».[11] Прынцып 3 гаворыць:

> *Права на роўнасць патрабуе пазітыўнага дзеяння, каб быць эфектыўным.*
>
> *Пазітыўнае дзеянне, якое прадугледжвае шэраг заканадаўчых, адміністрацыйных і практычных мер для пераадолення неспрыяльнага становішча, якое склалася ў мінулым, і паскарэння прагрэсу асобных груп на шляху да роўнасці, з'яўляецца неабходнай састаўной часткай права на роўнасць.*[12]

Панятак «пазітыўных дзеянняў» адыгрывае важную ролю ў кантэксце адзінага падыходу да роўнасці і, такім чынам, для мэтаў гэтага даклада. Як ужо абмяркоўвалася вышэй, права на роўнасць – гэта нешта большае, чым недыскрымінацыя, і прадугледжвае магчымасць роўнага ўдзелу ва ўсіх сферах жыцця, якія рэгулююцца правам. Пазітыўныя дзеянні значна спрыяюць пераадоленню такой няроўнасці, у аснове якой неабавязкова ляжыць дыскрымінацыя.

7 Гл. спасылку 1, Principle 13.

8 Конвенция о правах инвалидов (ст. 2). Комитет по экономическим, социальным и культурным правам. Замечание общего порядка № 5: Люди с инвалидностью (пункт 2 статьи 2 Международного пакта об экономических, социальных и культурных правах), E/1995/22, 1995, П. 15: дискриминация на основании инвалидности включает «отказ в разумном приспособлении на основании инвалидности, который приводит к обнулению или преуменьшению признания, пользования или реализации экономических, социальных или культурных прав».

9 Гл. спасылку 2, p. 39.

10 Гл., напр., Международную конвенцию о ликвидации всех форм расовой дискриминации (ч. 4 ст. 1); Конвенцию о ликвидации всех форм дискриминации в отношении женщин (ч. 1 ст. 4); Organisation of African Unity, Protocol to the African Charter on Human and Peoples' Rights on the Rights of Women in Africa, Article 2(1)(d).

11 Гл. спасылку 2, p. 32.

12 Гл. спасылку 1, Principle 3.

Пасля апісання тыповых праяў субстантыўнай няроўнасці ў раздзелах 2 і 3 даклада будзе ацэненая адэкватнасць пазітыўных дзеянняў у дачыненні да іх.

Агляд заканадаўства і практыкі ў раздзеле 3 даклада грунтуецца на ацэнках ва ўвязцы з тымі часткамі Дэкларацыі, якія ўстанаўліваюць **абавязкі дзяржавы** адносна права на роўнасць і права на недыскрымінацыю (перш за ўсё, прынцып 11). Дэкларацыя тут прымяняе тое ж разуменне дзяржаўных абавязкаў, што і Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП) і Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (МПЭСКП), як яны тлумачацца ў Заўвазе агульнага парадку № 3 Камітэта па эканамічных, сацыяльных і культурных правах і ў Заўвазе агульнага парадку № 31 Камітэта па правах чалавека (КПЧ). Як адзначана ў каментарыях да Дэкларацыі:

> *Па аналогіі з інтэрпрэтацыяй абавязкаў дзяржаў, прыведзенай у заўвазе агульнага характару № 3 Камітэта ААН аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, ад дзяржаў патрабуецца прыняць неабходныя меры, у тым ліку ў сферы заканадаўства, з мэтай дамагчыся прымянення права на роўнасць на нацыянальным узроўні і ў іх праграмах міжнароднага супрацоўніцтва. Права на поўную і эфектыўную роўнасць нялёгка ажыццявіць; аднак дзяржавы не маюць апраўданняў, калі ўстрымліваюцца ад канкрэтных крокаў у гэтым кірунку. Патрабаванне рабіць такія крокі безумоўна і павінна выконвацца неадкладна. Невыкананне гэтага абавязку не можа апраўдвацца спасылкамі на культурныя, эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя фактары, фактары бяспекі і іншыя фактары.*[13]

13 Гл. спасылку 2, р. 38.





### *Метадалогія даследавання*

Выкарыстанне адзінага праваабарончага падыходу да роўнасці мае пэўныя наступствы для зместу, структуры даклада і выкарыстанай у ім метадалогіі даследавання.

**Першае такое наступства** адлюстравана непасрэдна ў прадмеце і мэце даследавання – вызначыць праявы дыскрымінацыі і няроўнасці па цэлым шэрагу падстаў, дзе ў адным агульным дакладзе разглядаюцца этнічнасць, пол, сексуальная арыентацыя і г. д. Мэтай даклада зусім не з'яўляецца дэталёвы аналіз дыскрымінацыі і няроўнасці, якія ўзнікаюць на ўсіх магчымых падставах. Наадварот, нашай мэтай было разгледзець тое, што можна назваць самымі істотнымі праявамі дыскрымінацыі і няроўнасці ў Беларусі. У кантэксце некаторых падстаў для дыскрымінацыі было немагчыма звярнуць увагу на кожную ўразлівую групу: напрыклад, пытанні, якія датычацца нацыянальных і этнічных меншасцяў, мы разгледзелі на прыкладзе толькі трох груп, што, аднак, дазваляе нам атрымаць уяўленне аб агульным становішчы беларускіх нацыянальных і этнічных меншасцяў.

Прыводзячы прыклады праяваў дыскрымінацыі ў адным агульным дакладзе, аўтары павінны былі надаваць увагу праблеме дакладнасці сабранай інфармацыі. У раздзеле 2 па магчымасці выкарыстоўваліся дадзеныя ўжо праведзеных даследаванняў, якія сведчаць аб няроўнасці, з якой сутыкаюцца пэўныя групы насельніцтва.

Аднак такія праблемы за рэдкім выключэннем раней не былі аб'ектам пільнай увагі беларускіх і замежных навукоўцаў, міжнародных міжурадавых і праваабарончых арганізацый, а таксама саміх уладаў Рэспублікі Беларусь. Таму, разам з даследаваннем наяўных публікацый і матэрыялаў, аўтарамі былі зробленыя крокі па першасным зборы звестак. На стадыі распрацоўкі праблемы было праведзена экспертнае апытанне, у межах якога галоўнай крыніцай інфармацыі сталі беларускія эксперты-праваабаронцы, актывісты грамадскіх арганізацый, навукоўцы і іншыя кампетэнтныя асобы, чые прафесійныя або тэарэтычныя веды і асабісты вопыт дазваляюць выносіць экспертныя заключэнні ў пэўнай галіне сацыяльных адносін. На стадыі палявых даследаванняў праводзіўся збор звестак з дапамогай

метадаў фокус-групы і інтэрв'ю, якія далі адносна цэласнае ўяўленне аб сутнасці дыскрымінацыйных праяў у пэўных сферах. У цэлым, сабраная рознымі шляхамі ў межах даследавання інфармацыя была прааналізавана з мэтай правесці настолькі праўдзівы агляд дыскрымінацыі і неспрыяльнага становішча ў сацыяльным кантэксце ў Беларусі, наколькі гэта магчыма. Асноўнымі метадамі аналітычнага даследавання сталі сацыякультурны і логіка-прававы аналіз. Аўтары разлічваюць, што даклад зможа высвеціць узаемасувязь паміж прыкладамі няроўнасці на розных падставах, выяўляючы праблемы, якія перакрываюцца, прыклады множнай дыскрымінацыі і сумесны негатыўны або пазітыўны вопыт прадстаўнікоў розных сацыяльных груп.

**Другім наступствам** выкарыстання адзінага праваабарончага падыходу да роўнасці стала такое ўяўленне аб прымяненні права на роўнасць, якое закранае ўсе сферы дзейнасці, якія рэгулююцца правам. У адносінах да кожнай падставы да дыскрымінацыі і няроўнасці даклад імкнецца ацаніць досвед дыскрымінацыі, атрыманы людзьмі ва ўсіх сферах дзейнасці, напрыклад, у сферах дзяржаўнага кіравання, працоўнай занятасці, адукацыі і аховы здароўя. Аднак наяўных сведчанняў адносна пэўных уразлівых груп у некаторых сферах жыцця можа быць зусім няшмат. Гэта можа быць вынікам таго, што прадстаўнікі такіх групаў не знаходзяцца ў асабліва неспрыяльным становішчы ў гэтай сферы ці таму што факты, якія сведчаць аб такім неспрыяльным становішчы, не былі выяўленыя ў межах даследавання. Такім чынам, хоць аўтары імкнуліся да збору звестак аб дыскрымінацыі і няроўнасці ва ўсіх абласцях жыцця, тым не менш, асноўны ўпор быў зроблены на тыя галіны, дзе выяўленыя праблемы ацэньваліся як найбольш істотныя. Пры гэтым без спецыяльнай увагі засталіся ў дакладзе тыя вобласці грамадскага жыцця, у дачыненні да якіх не атрымалася сабраць дастатковых сведчанняў.

**Трэцім наступствам** выкарыстання адзінага праваабарончага падыходу да роўнасці стала патрабаванне правядзення аналізу парушэнняў як права на недыскрымінацыю, так і права на роўнасць. Даклад бярэ за аснову права на роўнасць таму, што яно вызначана ў Дэкларацыі прынцыпаў роўнасці, і выкарыстоўвае гэта вызначэнне для выяўлення ступені няроўнасці. Такім чынам, даклад вывучае прыклады субстантыўнай няроўнасці праз адсылку да патрабавання «ўдзелу на роўных з іншымі ў любой сферы грамадзянскай дзейнасці ці эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага ці культурнага жыцця», тым самым выходзячы за рамкі вопыту ўласна дыскрымінацыі. Напрыклад, разглядаючы пытанне аб гендарнай роўнасці, даклад адлюстроўвае некаторыя сведчанні аб субстантыўнай няроўнасці жанчын і мужчын у сферы працоўнай дзейнасці. Аўтары даклада зыходзяць з таго, што дзяржава павінна прадпрымаць крокі, накіраваныя на дасягненне субстантыўнай роўнасці, г. зн. павінна рабіць больш, чым проста выконваць абавязацельствы па дасягненню фармальнай роўнасці.

Нарэшце, чацвёртым следствам такога падыходу стала апісанне прыкладаў дыскрымінацыі і няроўнасці разам з аналізам наяўных прававых механізмаў і дзяржаўнай палітыкі. Само існаванне і прымяненне законаў, якія забараняюць дыскрымінацыю і ўкараняюць прынцып роўнасці, з'яўляецца вырашальным, хоць і далёка не адзіным фактарам, што спрыяе рэалізацыі права на недыскрымінацыю і права на роўнасць. Абарона людзей ад дыскрымінацыі праз прыняцце і прымяненне такога заканадаўства з'яўляецца асноўным абавязкам дзяржавы ў гэтай сферы. У дакладзе разам з прыкладамі непасрэдна перажытага вопыту дыскрымінацыі і няроўнасці робіцца агляд беларускага права і палітыкі. Гэта трэба для таго, каб выявіць тыя сферы, дзе захоўваецца заканадаўчая дыскрымінацыя, дзе ёсць прабелы і непаслядоўнасць у заканадаўстве і ў наяўных механізмах прававой абароны, а таксама тыя сферы, дзе законы прымяняюцца неналежным чынам. Аналіз прыкладаў праяў дыскрымінацыі ў главе 2 даклада прымушае аўтараў выказаць заклапочанасць з нагоды адэкватнасці і практычнага прымянення некаторых законаў і дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да дыскрымінацыі і роўнасці ў Беларусі. У раздзеле 3 даклада будзе дадзена ацэнка адэкватнасці беларускага права і палітыкі ў святле прынцыпаў 18-25 Дэкларацыі роўных правоў, якія тычацца доступу да правасуддзя для ахвяр дыскрымінацыі. Патрэба ў эфектыўных сродках рэалізацыі права на роўнасць і права на недыскрымінацыю праілюстравана высновамі главы 2 паведамлення, але больш падрабязна адпаведныя пытанні разгледжаны ў главе 3. Глава 4 змяшчае рэкамендацыі, накіраваныя на рэформу заканадаўства і палітыкі, на

паляпшэнне прымянення заканадаўства і рэалізацыі права на роўнасць і права на недыскрымінацыю. Такім чынам, аўтары зыходзяць з таго, што глава 2 прадастаўляе пераканаўчую доказную базу для аналізу эфектыўнасці законаў і палітыкі, якія прадстаўлены ў главе 3, а абедзве гэтыя главы, у сваю чаргу, гарантуюць адэкватнасць і своечасовасць заключэнняў і рэкамендацый у главе 4.

Дадзенае даследаванне з'яўляецца вынікам цеснага супрацоўніцтва Асацыяцыі роўных правоў і РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» (БХК) у 2011-2013 гг. пры рэалізацыі праекта, накіраванага на прасоўванне ў Беларусі прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі. Эксперты БХК сумесна з Асацыяцыяй роўных правоў распрацавалі агульную стратэгію збору першасных дадзеных для даследавання, а таксама арганізавалі і правялі фокус-групы і інтэрв'ю ў розных рэгіёнах Беларусі. Эксперты БХК таксама выканалі першасны аналіз інфармацыі, атрыманай у ходзе эмпірычных даследаванняў, а пазней актыўна ўдзельнічалі ў дапрацоўцы і дапаўненні тэксту гэтага даклада.

Супрацоўніцтва міжнароднай і нацыянальнай арганізацый падае шэраг дадатковых магчымасцяў, паколькі дазваляе выкарыстоўваць як мясцовыя, так і міжнародныя крыніцы інфармацыі, а таксама гарантаваць, што даследаванне належным чынам улічвае як нацыянальны кантэкст, так і важны для параўнальнага аналізу міжнародны вопыт.

***Цяжкасці пры зборы дадзеных для даклада***

Пры зборы дадзеных для даклада аўтары бралі пад увагу некаторыя абставіны, характэрныя для сітуацыі ў Беларусі. Па-першае, асаблівасці цяперашняга беларускага рэжыму прадвызначылі яго канфрантацыйнасць з многімі іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі. Таксама многія вядомыя прадстаўнікі ўразлівых груп, якія валодаюць каштоўнай інфармацыяй па тэме даклада, самі актыўна ўцягнутыя ў палітычныя працэсы. Тэма правоў чалавека і тэма дыскрымінацыі ў Беларусі моцна палітызаваныя і нярэдка выкарыстоўваюцца як элемент унутрыпалітычнай барацьбы і для патрэб знешнепалітычнай дзейнасці. Гэта





прымушае аўтараў даклада па некаторых пытаннях выкладаць аргументы ўсіх уцягнутых бакоў, а таксама рабіць крыніцазнаўчы аналіз.

Па-другое, з прычыны працяглай ізаляванасці Беларусі ў савецкі і ў постсавецкі перыяд, беларускае грамадства сёння характарызуецца значным кансерватызмам. Палітыкі і некаторыя лідары грамадзянскай супольнасці часам дрэнна ведаюць сучасныя сацыяльныя тэорыі і практыкі. Напрыклад, прымардыялісцкія падыходы да этнічнасці абцяжарваюць аб'ектыўнае ўспрыманне праблем этнапалітыкі; стаўленне да гомасексуальнасці як да «вычварэнства» вядзе да «незаўважнасці» цэлага блока сур'ёзных праблем шматлікай уразлівай групы насельніцтва; гендарны традыцыяналізм вядзе да вельмі спрошчаных уяўленняў аб «нармальнай» сацыяльна-эканамічнай актыўнасці жанчын; вельмі завышаныя, зусім не характэрныя для сучаснай сацыяльнай дзяржавы ўяўленні аб адказнасці дзяржавы ў дачыненні да ўразлівых груп не спрыяюць аб'ектыўным ацэнкам і г. д. Аўтары даклада ўлічвалі тую акалічнасць, што стаўленне да праблем роўнасці і недыскрымінацыі ў наяўных пісьмовых крыніцах магло вар'іравацца ад беспадстаўнага алармізму да поўнага адмаўлення існавання якіх-небудзь праблем.

Па-трэцяе, правядзенне палявых даследаванняў не дазволіла цалкам вырашыць праблему недахопу першасных дадзеных і якасных публікацый. Асноўная частка выкарыстаных для даклада матэрыялаў складзена і апублікавана на рускай або беларускай мове або беларускімі спецыялістамі на англійскай мове. Досыць шмат матэрыялаў было апублікавана толькі ў Інтэрнэце. З улікам недахопу наяўнай інфармацыі аўтары былі вымушаны звяртацца да публікацый у СМІ, калі паведамляемая імі інфармацыя верыфікавалася пры дапамозе іншых крыніц.

Для некаторых галін грамадскага жыцця была характэрна адсутнасць наогул якіх-небудзь дадзеных, актуальных для мэт гэтага даклада.

## 1.3 Нацыянальны кантэкст

### *Асноўныя звесткі аб краіне*

Тэрыторыя краіны складае 207,6 тыс. км$^2$. Размешчаная ва Усходняй Еўропе без выхаду да мора, Беларусь мае сухапутную мяжу з Расіяй, Украінай, Польшчай, Літвой і Латвіяй. Беларусь падзелена на шэсць тэрытарыяльных адзінак – абласцей са сваімі адміністрацыйнымі цэнтрамі, сталіца Рэспублікі Беларусь – горад Мінск.[14]

У краіне дзве дзяржаўныя мовы – беларуская і руская (Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, арт. 17).

На пачатак 2011 г. усё насельніцтва Беларусі складала 9481,1 тыс. чал., уключаючы 4408,1 тыс. мужчын і 5073,0 тыс. жанчын.[15] У 2009 г. чаканая працягласць жыцця пры нараджэнні складала 76,4 для жанчын і 64,7 для мужчын.[16]

Асноўнымі этнічнымі групамі («нацыянальнасцямі») Беларусі з'яўляюцца: беларусы – 83,7%, рускія – 8,3%, палякі – 3,1%, украінцы – 1,7%, яўрэі – 0,1% (паводле дадзеных перапісу 2009 г.).[17]

Пераважная большасць вернікаў адносяць сябе да праваслаўных. Другой па колькасці рэлігійнай групай з'яўляюцца рыма-каталікі.[18]

Згодна з паказчыкамі 2011 г., валавы ўнутраны прадукт (ВУП) краіны ў бягучых цэнах склаў 276.009 млрд бел. руб. або 55,48 млрд $ (5 881 $

14 Республика Беларусь. Афіцыйны сайт. Ёсць на: http://www.belarus.by. Адміністрацыйныя цэнтры абласцей: Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна, Магілёў і Мінск.

15 *Беларусь в цифрах. Статистический справочник.* Минск: Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2011. С. 16.

16 *Женщины и мужчины Республики Беларусь. Статистический сборник.* Минск: Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2010. Табл. 1.6.

17 Гл. спасылку 15. С. 22.

18 Гусева А. (ред.). *Республика Беларусь в зеркале социологии. Сборник материалов социологических исследований за 2010 г.* Минск: Белорусский дом печати, 2011. С. 73.





на душу насельніцтва).[19] Па дадзеных ПРААН, Беларусь у 2011 г. займала 65-ю пазіцыю ў свеце па ўзроўні чалавечага развіцця, знаходзячыся на самым высокім месцы сярод усіх краін-удзельніц СНД.[20]

### *Асноўныя гістарычныя факты*

У сучаснай Беларусі адносіны да гісторыі краіны ў розных груп насельніцтва розныя. У гэтым раздзеле мы згадаем некаторыя агульнавядомыя гістарычныя факты, якія не патрабуюць спецыяльных спасылак. Больш падрабязнае выкладанне гістарычных падзей там, дзе гэта неабходна, прыведзена ў главе 2 даклада.

Землі сучаснай Беларусі ўваходзілі ў раннефеадальную дзяржаву Кіеўская Русь, якая размяшчалася на частцы тэрыторый сучасных Украіны, Беларусі і Расіі. Полацкае княства, якое ўзнікла ў IX ст. і існавала на тэрыторыі сучасных Віцебскай і Мінскай абласцей Беларусі, паступова палітычна ўсё больш адасабляецца ад Кіева. У XIII ст. у выніку падпарадкавання шэрагу літоўскіх і старажытнарускіх зямель узнікае Вялікае Княства Літоўскае – мультыэтнічная дзяржава з язычніцкім і хрысціянскім насельніцтвам. Пасля заключэння Люблінскай уніі ў 1569 г. Вялікае Княства Літоўскае разам з Польшчай увайшло ў склад канфедэрацыі, вядомай як Рэч Паспалітая (Rzeczpospolita). Як вынік гэтай падзеі ўзмацніліся працэсы паланізацыі мясцовай эліты, што паступова пераймае польскую мову, культуру і эканамічны ўклад. Для Беларусі таго часу былі характэрныя канфесійныя адрозненні паміж элітай (каталіцтва) і асноўнай масай насельніцтва (праваслаўе, пазней грэка-каталіцызм).

Саслабленая ў ваенным, палітычным і эканамічным плане, Рэч Паспалітая перажыла ў апошняй трэці XVIII ст. тры падзелы сваёй тэрыторыі паміж Аўстра-Венгрыяй, Прусіяй і Расіяй. Тэрыторыя сучаснай Беларусі цалкам увайшла ў склад Расійскай імперыі. Пасля распаду імперыі, заканчэння Першай сусветнай вайны і па выніках Савец-

19 International Monetary Fund. Ёсць на: www.imf.org.

20 UNDP, International Human Development Indicators. Ёсць на: http://hdr.undp.org/en/statistics. У Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД) уваходзяць усе былыя рэспублікі Савецкага Саюза, акрамя Грузіі, Латвіі, Літвы і Эстоніі.

ка-польскай вайны 1919–1920 гг. тэрыторыя сучаснай усходняй часткі Беларусі ўвайшла ў склад СССР як Беларуская ССР, а заходняя частка цяперашняй беларускай тэрыторыі апынулася ў складзе Польшчы (да 1939 г.).

У 1941-1944 гг. тэрыторыя Беларусі апынулася пад нацысцкай акупацыяй, і тут разгарнуўся найбуйнейшы ў Еўропе партызанскі рух. Акупацыя і ваенныя дзеянні нанеслі велізарны ўдар па эканоміцы рэспублікі і прывялі да страты да чвэрці ўсяго даваеннага насельніцтва. У 1945 г. Беларуская ССР стала адной з краін-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Пасля заканчэння вайны на тэрыторыі Беларусі, асабліва заходняй яе частцы, яшчэ некалькі гадоў дзейнічалі антысавецкія партызанскія групы. Да і пасля Другой сусветнай вайны насельніцтва Беларусі падвяргалася маштабным сталінскім рэпрэсіям.

Эканамічная палітыка савецкіх уладаў прывяла да таго, што пасляваенная Беларусь ператварылася ў адну з найбольш індустрыялізаваных рэспублік СССР з высокім узроўнем урбанізацыі і адукаванасці насельніцтва.

У 1986 г. на мяжы Беларускай і Украінскай ССР адбылася катастрофа на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, у выніку якой здарылася радыяцыйнае забруджванне значнай часткі тэрыторыі Беларусі, на якой сёння жыве каля 12% усяго насельніцтва краіны.

## 1.4 Дзяржаўнае кіраванне і палітычная сітуацыя

### *Агульная інфармацыя*

У снежні 1991 г. Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР) спыніў існаванне пасля падпісання Белавежскіх пагадненняў краінамі-заснавальнікамі СССР (Расіяй, Украінай і Беларуссю). Распад СССР канчаткова вывеў на міжнародную арэну незалежную беларускую дзяржаву.

У 1994 г. была прынятая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, а таксама адбыліся першыя прэзідэнцкія выбары. Прэзідэнтам быў абраны





Аляксандр Лукашэнка, які пазней тройчы пераабіраўся на гэтую пасаду. Ініцыяваныя ім у 1995, 1996 і 2004 гг. рэферэндумы прыкметна змянілі палітычны лад, значна ўзмацнілі паўнамоцтвы прэзідэнта і практычна скасавалі з палітычнай сістэмы механізмы стрымлівання і процівагі.

Згодна з Канстытуцыяй, Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўнітарнай прэзідэнцкай дзяржавай. З сярэдзіны 1990-х гг. у беларускай палітыцы абазначыліся відавочныя аўтарытарныя тэндэнцыі. Цяперашні Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка здолеў кансалідаваць палітычную ўладу і ў значнай ступені рознымі метадамі маргіналізаваць у публічнай прасторы палітычную апазіцыю. У краіне афіцыйна зарэгістраваныя 15 палітычных партый,[21] восем з якіх лічацца апазіцыйнымі ў адносінах да дзейнага кіраўніка дзяржавы. Аднак партыі адыгрываюць малую ролю ў палітычным жыцці краіны, яны вельмі нязначна прадстаўлены ў парламенце. Прэзідэнт А. Лукашэнка не з'яўляецца сябрам якой-небудзь партыі.

У Беларусі двухпалатны парламент – Нацыянальны сход – які складаецца з ніжняй Палаты прадстаўнікоў (110 членаў) і верхняй палаты – Савета Рэспублікі (64 члены). У парламенце не ўтворана партыйных фракцый. Ініцыяванне законапраектаў ажыццяўляецца, у асноўным, па зацверджаным Прэзідэнтам плане праз спецыяльна створаны Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь.[22] Прызначэнне кіраўніка ўрада і ўсіх яго членаў знаходзіцца пад кантролем Прэзідэнта, хоць прызначэнне прэм'ер-міністра праводзіцца са згоды ніжняй палаты парламента. Пры гэтым паўнамоцтвы Палаты прадстаўнікоў могуць быць датэрмінова спынены пры адмове ў даверы ўраду, выразе вотуму недаверу ўраду або двухразовай адмове ў дачы згоды на прызначэнне прэм'ер-міністра (арт. 84 і 94 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь).

21 Министерство юстиции Республики Беларусь. *Сведения о политических партиях, зарегистрированных в Республике Беларусь.* Ёсць на: http://minjust.by/ru/site_menu/ about/struktura/obschestv.

22 Цэнтр створаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2007 г. № 630 «О некоторых мерах по совершенствованию правотворческой деятельности и научных исследований в области права».

Мясцовае самакіраванне ў Беларусі мае абмежаваны характар. Мясцовыя саветы дэпутатаў перыядычна абіраюцца жыхарамі. Кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў прызначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады Прэзідэнтам або ва ўстаноўленым ім парадку і зацвярджаюцца на пасадзе адпаведнымі мясцовымі саветамі дэпутатаў (арт. 118 і 119 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь).

***Парламенцкія і прэзідэнцкія выбары***

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў абіраюцца на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Члены Савета Рэспублікі выбіраюцца на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і горада Мінска, прычым восем членаў Савета прызначаюцца прэзідэнтам (арт. 81 і 91 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь).

У апошніх прэзідэнцкіх выбарах 2010 г., акрамя А. Лукашэнкі, удзельнічала дзевяць кандыдатаў, у тым ліку тыя, што прадстаўляюць апазіцыйныя партыі. Паводле афіцыйных дадзеных, за А. Лукашэнку прагаласавала 79,7% выбаршчыкаў. Гэтыя дадзеныя мала адрозніваюцца ад тых, што давала блізкая да ўладаў сацыялагічная служба.[23]

У рэзюмуючай частцы выніковай справаздачы Місіі па назіранні за выбарамі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (БДІПЧ / АБСЕ) сказана, што

> *прэзідэнцкія выбары прадэманстравалі, што Рэспубліцы Беларусь трэба будзе яшчэ прайсці значны шлях, перш чым яна зможа цалкам адпавядаць абавязацельствам у рамках АБСЕ. Адзначана адсутнасць незалежнасці і непрадузятасці ў дзеяннях выбарчай адміністрацыі, нераўнапраўныя ўмовы для кандыдатаў і абмежавальныя ўмовы для сродкаў масавай інфармацыі (СМІ), а таксама*

23 Гл. спасылку 18. С. 73.





> *сістэматычная адсутнасць празрыстасці на ўсіх этапах выбарчага працэсу...*[24]

Чарговыя выбары ў ніжнюю палату беларускага парламента прайшлі ў верасні 2012 г.[25] Па афіцыйных дадзеных, 80% асоб, якія вылучаліся кандыдатамі ў дэпутаты, ініцыятыўныя групы якіх былі зарэгістраваныя, апынуліся беспартыйнымі (па стане на 24 ліпеня 2012 г.).

Аднак пазней асноўныя апазіцыйныя сілы байкатавалі выбары. У парламент не прайшоў ні адзін кандыдат, які б пазіцыянаваў сябе як апазіцыйны.

Згодна з выніковай справаздачай Місіі па назіранні за выбарамі БДІПЧ / АБСЕ,

> *на выбарах 23 верасня многія абавязацельствы АБСЕ, уключаючы правы грамадзян на аб'яднанне, вылучэнне кандыдатур і свабоду выказвання, не былі выкананыя, нягледзячы на некаторыя паляпшэнні ў выбарным заканадаўстве. У той час як было адзначана павелічэнне колькасці кандыдатаў, вылучаных партыямі, вядомыя палітычныя дзеячы, якія, магчыма, маглі б адыграць сваю ролю ў гэтых выбарах, знаходзіліся ў зняволенні або не мелі права рэгістравацца па прычыне наяўнасці ў іх судзімасці. Спектр удзельнікаў быў таксама звужаны адвольнымі адміністрацыйнымі дзеяннямі, што прывяло да абмежавання выбару выбаршчыкаў. Кіраванне выбарамі не было непрадузятым,*

24 БДИПЧ/ОБСЕ. *Республика Беларусь. Президентские выборы 19 декабря 2010 г. Итоговый отчет Миссии по наблюдению за выборами БДИПЧ/ОБСЕ*, Варшава, 2011. С. 1. Ёсць на: http://www.osce.org/ru/odihr/76092.

25 Центральная комиссия Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов. *Сведения о регистрации инициативных групп граждан по сбору подписей избирателей в поддержку лиц, предлагаемых для выдвижения кандидатами в депутаты Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь пятого созыва.* Ёсць на: http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-PPNS5-Sved7.pdf.

*а працэс разгляду скаргаў і апеляцый не гарантуе эфектыўных сродкаў прававой абароны.*[26]

### *Асаблівасці палітычнага працэсу*

У цэлым у Беларусі зарэгістравана каля 2,5 тыс. грамадскіх аб'яднанняў рознай накіраванасці.[27] Аднак у краіне створаны жорсткія абмежавальныя рамкі для рэгістрацыі і функцыянавання некамерцыйных арганізацый, звязаныя, напрыклад, з наяўнасцю юрыдычнага адраса, што ставіць многія грамадскія аб'яднанні і апазіцыйныя палітычныя партыі ў вельмі складаныя ўмовы.[28] На практыцы праваабарончым і іншым апазіцыйна арыентаваным арганізацыям фактычна забаронена атрыманне замежнай дапамогі: дзяржаўныя структуры адмаўляюць у рэгістрацыі грантаў на праваабарончую дзейнасць.[29]

Папраўкі, унесеныя ў Закон[30] «Аб масавых мерапрыемствах»,[31] прыняты ў лістападзе 2011 г., робяць істотна больш жорсткімі правілы іх правядзення. Напрыклад, арганізацыя любога збору людзей (у тым ліку «флэш-мобу» і збору людзей, арганізаванага з выкарыстаннем Інтэрнэту) павінна быць санкцыянаваная ўладамі. Да атрымання дазволу на правядзенне масавага мерапрыемства яго арганізатары не маюць права абвяшчаць, у тым ліку ў Інтэрнэце, пра дату, час і месца яго правядзення. Арганізатары ўсіх масавых мерапрыемстваў, акрамя тых, што праводзяцца дзяржаўнымі органамі, павінны плаціць за ахову грамадскага парадку пры іх правядзенні. Істотна пашыраюцца правы супрацоўнікаў праваахоўных органаў: яны могуць быць у цывільным адзенні, агароджваць тэрыторыю з удзельнікамі санкцыянаванага мерапрыемства, аглядаць іх, весці фота-і відэаздымку.[32]

Праваабаронцы і эксперты ў галіне СМІ неаднаразова крытыкавалі Закон «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму»,[33] які ўводзіць вельмі расплывістую фармулёўку паняцця «экстрэмізм» (арт. 1). Мэтай супрацьдзеяння экстрэмізму дэкларуецца абарона правоў, свабод і законных інтарэсаў асобы, канстытуцыйнага ладу і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь. Аднак шэраг фармулёвак у вызначэнні (напрыклад, «распальванне сацыяльнай розні», «перашкода законнай дзейнасці дзяржаўных органаў») можа мець занадта шырокае тлумачэнне і нават весці да злоўжыванняў.

Асаблівы прэзідэнцкі ўказ «Аб удасканаленні кадравага забеспячэння ідэалагічнай працы ў Рэспубліцы Беларусь» ад 20 лютага 2004 г. прадугледжвае, «што кіраўнікі дзяржаўных і іншых арганізацый Рэспублікі Беларусь нясуць персанальную адказнасць за стан ідэалагічнай работы ў калектывах работнікаў. Непасрэдная арганізацыя гэтай работы ў дадзеных калектывах ускладаецца на аднаго з намеснікаў кіраўніка» (арт. 1).

Па афіцыйных дадзеных, у 2010 г. у краіне было 1377 друкаваных СМІ, прычым 68% з іх складалі СМІ недзяржаўнай формы ўласнас-

26 БДИПЧ/ОБСЕ. *Республика Беларусь. Парламентские выборы 23 сентября 2012 г.. Итоговый отчет Миссии по наблюдению за выборами БДИПЧ/ОБСЕ,* Варшава, 2012. С. 1. Ёсць на: http://www.osce.org/ru/odihr/elections/98395.

27 *Общая информация о Республике Беларусь, 15 декабря 2011 г.* HRI/CORE/BLR/2011. С. 29.

28 Белорусский Хельсинкский Комитет. Экспертное заключение по ст. 193–1 УК РБ. Ёсць на: http://belhelcom.org/ru/node/13067. Amnesty International, *Belarus: What is not Permitted is Prohibited: Silencing Civil Society in Belarus,* 18 April 2013, EUR 49/002/2013. Ёсць на: http://www.amnesty.org/en/library/info/EUR49/002/2013/en.

29 Ассамблея демократических неправительственных организаций, РПОО «Белорусский Хельсинкский Комитет», Правозащитный центр «Вясна», Центр правовой трансформации. *Анализ изменений и дополнений, предлагаемых к внесению в законодательство Беларуси*, 17 октября 2011 г. Ёсць на: http://belhelcom.org/ru/node/14430.

30 У тэксце гэтага даклада могуць выкарыстоўвацца скарочаныя версіі афіцыйных назваў беларускіх прававых актаў, напрыклад, без указання яго даты прыняцця, нумары і без словазлучэння «Рэспубліка Беларусь». Поўную назву ўсіх выкарыстаных у гэтым дакладзе прававых актаў гл. у Бібліяграфіі. Большасць беларускіх прававых актаў даступна ў Інтэрнэце на рускай мове на афіцыйным партале www.pravo.by. Усе прававыя акты цытуюцца ў рэдакцыі, якая дзейнічала на момант напісання даклада, калі асобна не пазначана іншае. Тэрміны «Канстытуцыя» і «Асноўны закон» выкарыстоўваюцца ў дакладзе як узаемазаменныя сінонімы.

31 Закон Республики Беларусь от 30 декабря 1997 г. № 114–З «О массовых мероприятиях в Республике Беларусь».

32 Для разгорнутай крытыкі закона з пункту гледжання міжнароднага права ў сферы правоў чалавека гл.: European Commission for Democracy through Law (Venice Commission) and OSCE Office for Democratic Institutions and Human Rights (OSCE/ODIHR). *Joint Opinion on the Law on Mass Events of the Republic of Belarus*, Strasbourg, Warsaw, 20 March 2012, CDL–AD(2012)006.

33 Закон Республики Беларусь от 4 января 2007 г. № 203–З «О противодействии экстремизму».

ці; у Беларусі таксама распаўсюджваюцца больш за 6 тыс. замежных друкаваных выданняў, транслююцца больш за 90 замежных тэлеканалаў.[34] Тым не менш, дзяржаўныя СМІ, якія атрымліваюць фінансаванне з дзяржаўнага бюджэту, знаходзяцца ў непараўнальна лепшым становішчы. Нешматлікія недзяржаўныя выданні грамадска-палітычнай накіраванасці пастаўлены ў відавочна няроўныя эканамічныя ўмовы і маюць значна меншыя сукупныя наклады ў параўнанні з дзяржаўнымі СМІ. Гэта прыводзіць да крытычнага дысбалансу ў магчымасці выказвання думкі палітычнымі апанентамі ўлады.[35]

Для разумення беларускай сітуацыі варта ўлічваць, што ў палітычнай прасторы дзейнасць многіх апазіцыйных партый адкрыта трактуецца ўладамі як дзейнасць, звязаная з уплывам і ціскам на Беларусь з краін Захаду. Выказванні Прэзідэнта А. Лукашэнкі сведчыць пра яго ўпэўненасць у несамастойнасці беларускай апазіцыі, яе дзейнасці ў інтарэсах замежных дзяржаў:

> *І ў які раз хачу вам пацвердзіць, дай бог кожнаму прэзідэнту такую апазіцыю. Кажуць: навошта вам самім думаць, старацца і працаваць, лепш перакроіць краіну па ўказцы Захаду – і ўсе адразу ў нас стануць багатымі і шчаслівымі. Скажу шчыра: апазіцыя, якая існуе на замежныя грошы (а гэта нават ніхто не стане сярод вас адмаўляць), – гэта не апазіцыя, гэта – баявыя атрады па правядзенні чужых інтарэсаў і палітыкі ў нас у краіне. Гэтым яны і займаюцца. Вы можаце спытаць: а чаму Вы гэта церпіце? Церпім, пакуль гэта трываецца… Я ім часта кажу: будзеце дэстабілізаваць становішча ў краіне – атрымаеце пад завязку…*[36]

34 Гл. спасылку 27. С. 28.

35 Беларуская асацыяцыя журналістаў. Асвятленне прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. у беларускіх СМІ. Выніковая справаздача. Ёсць на: http://baj.by/be/monitoring.

36 *Выступление Президента Беларуси Александра Лукашенко на встрече со студентами и преподавателями БГУ*, 12 февраля 2008 г. Официальный сайт Президента Республики Беларусь. Ёсць на: http://www.president.gov.by/press55946.html.





У Крымінальным кодэксе[37] Рэспублікі Беларусь прадугледжана пакаранне за паклёп у адносінах да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (арт. 367) і за абразу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (арт. 368). Арыштам на тэрмін да шасці месяцаў або пазбаўленнем волі[38] на тэрмін да двух гадоў караецца «дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь», г. зн. прадастаўленне замежнай дзяржаве, замежнай або міжнароднай арганізацыі загадзя ілжывых звестак аб палітычным, эканамічным, сацыяльным, ваенным ці міжнародным становішчы Рэспублікі Беларусь, прававым становішчы грамадзян у Рэспубліцы Беларусь, што дыскрэдытуюць Рэспубліку Беларусь або яе органы ўлады (арт. 369-1).

### *Эканамічная сітуацыя ў цяперашні час*

Да ліку агульнапрызнаных асаблівасцяў беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі належыць захаванне ў ёй шмат якіх рыс ранейшага савецкага ўкладу. У адрозненне ад іншых еўрапейскіх постсавецкіх краін, у Беларусі адкрыта адмовіліся ад ліберальнай мадэлі рынкавых адносін і планаў маштабнай прыватызацыі, захавалі вырашальную прысутнасць дзяржавы ў эканоміцы. Вялікае значэнне для эканомікі і напаўняльнасці бюджэту краіны маюць буйныя прамысловыя прадпрыемствы, якія працуюць з часоў СССР. На вёсцы пераходу ад калгасна-саўгаснай вытворчасці да фермерскай гаспадаркі не адбылося. Многія галіны эканомікі арыентаваны на экспарт. Дзяржава гарантуе насельніцтву права на працу, бясплатную адукацыю і лячэнне.

Паводле ацэнкі Міжнароднага валютнага фонду, зробленай у маі 2012 г.,

> *за чатыры гады Беларусь перажыла два крызісы. Эканамічны крызіс 2008-2009 гг. быў выклікан*

37 Уголовный кодекс Республики Беларусь от 9 июля 1999 г. № 275–З.

38 Розніца паміж арыштам і пазбаўленнем волі тлумачыцца ў адпаведных артыкулах Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Арышт прадугледжвае ўтрыманне асуджанага ва ўмовах строгай ізаляцыі і ўстанаўліваецца на тэрмін ад аднаго да шасці месяцаў (арт. 54). Пазбаўленне волі ўстанаўліваецца на тэрмін ад шасці месяцаў да (у асаблівых выпадках) дваццаці пяці гадоў. Паўналетнім асобам адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі прызначаецца ў папраўчых калоніях ва ўмовах пасялення, у папраўчых калоніях або ў турме (арт. 57).

*сусветным фінансавым крызісам (...) Эканамічны крызіс 2011 г. меў унутраныя прычыны (...) У параўнанні з 2008 г. знешні доўг павялічыўся больш за два разы і ў 2011 г. дасягнуў 61,4% ВУП (...) Два эканамічныя крызісы падарвалі грамадскі давер да палітыкі ўладаў і да беларускага рубля. Беларусь стала больш залежаць ад фінансавай дапамогі з боку Расіі (...) Пераслед апазіцыі пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. прывёў да таго, што ЕС і ЗША скарацілі ўзаемадзеянне з уладамі Беларусі на афіцыйным узроўні і зрабілі больш жорсткімі санкцыі ў дачыненні да фізічных і юрыдычных асоб, хоць значнага ўплыву гэтых мер на эканоміку не чакаецца.*[39]

### Удзел у рэгіянальных інтэграцыйных структурах

Беларусь з'яўляецца чальцом Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). У 1997 г. падпісаны дагавор аб Саюзе Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, а ў 1999 г. створана Саюзная дзяржава дзвюх краін.

Са студзеня 2012 г. Беларусь, Расію і Казахстан аб'яднала Адзіная эканамічная прастора (АЭП) Еўразійскай эканамічнай супольнасці (ЕўрАзЭС). Паміж трыма краінамі, што раней стварылі Мытны саюз, знятыя амаль усе абмежаванні, якія тычацца перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталу і працоўнай сілы. Членамі ЕўрАзЭС, але не АЭП з'яўляюцца дзве іншыя былыя рэспублікі СССР – Кыргызстан і Таджыкістан.[40]

Беларусь з'яўляецца членам ваенна-палітычнага саюза – Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), куды ўваходзяць таксама Арменія, Казахстан, Кыргызстан, Расія і Таджыкістан.[41]

39 Международный валютный фонд. *Доклад МВФ по стране № 12/113*, май 2012 г. С. 4. Ёсць на: www.imf.org.

40 ЕўрАзЭС. Ёсць на: www.evrazes.com.

41 АДКБ. Ёсць на: http://www.odkb-csto.org.





Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам праграмы Усходняга партнёрства, ініцыяванай Еўрапейскім Саюзам (ЕС) у 2008 г. Усходняе партнёрства павінна стаць сігналам салідарнасці ЕС у дачыненні да правядзення краінамі-партнёрамі рэформаў, якія спрыяюць развіццю дэмакратыі, рынкавых адносінаў, умацавання іх дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці. Усходняе партнёрства заклікана развівацца паралельна са стратэгічным партнёрствам ЕС і Расіі.[42]

42 Communication from the Commission to the European Parliament and the Council: Eastern Partnership, Brussels, 3.12.2008 (2008) 823 final, Section 2. Варта адзначыць, што ўдзел Беларусі ва Усходнім партнёрстве першапачаткова было менш актыўным у параўнанні з іншымі краінамі.

## 2. ТЫПОВЫЯ ПРАЯВЫ НЯРОЎНАСЦІ

Аналіз тыповых праяў няроўнасці ў Беларусі немагчымы без уліку гісторыі краіны і асаблівасцяў сучаснага нацыябудаўніцтва.

Пасля атрымання незалежнасці ў Беларусі былі магчымыя розныя мадэлі развіцця, і спецыялісты звычайна вылучаюць два асноўных падыходы да беларускага нацыябудаўніцтва, якім адпавядаюць два тыпы ідэнтычнасцяў, якія характарызуюцца арыентацыяй або на заходні, або на ўсходні (расійскі) напрамак, а таксама розныя прамежкавыя або камбінаваныя варыянты гэтых ідэнтычнасцяў.[43]

Аналіз дзвюх асноўных стратэгій нацыябудаўніцтва, праведзены Н. Лешчанкай (яна іх называе «нацыянальным» і «савецкім») паказваюць, што ў іх аснове ляжаць розныя міфы пра паходжанне беларусаў (змешванне балтыйскіх і славянскіх плямёнаў / толькі славянскае паходжанне), адрозненні ў фокусе гістарычных міфаў (Вялікае Княства Літоўскае / Старажытная Русь), розныя ўяўленні аб кульмінацыйных момантах гісторыі (сярэднявечныя бітвы з крыжакамі і рускімі / Вялікая Айчынная вайна[44]), пра ворага («капіталістычны Захад» / «імперскія амбіцыі Расіі») і нават пра мову (беларуская мова старой граматычнай сістэмы / руская мова). Будучыня бачыцца альбо ў інтэграцыі на Захад, у Еўрасаюз, альбо ў форме інтэграцыі з Расіяй; у эканамічным плане ліберальныя эканамічныя рэформы супрацьпастаўляюцца эканоміцы, якая кантралюецца дзяржавай.[45]

На сённяшні момант для Прэзідэнта А. Лукашэнкі ў межах афіцыйнага праекта нацыябудаўніцтва характэрная эканамічная інтэграцыя з Расіяй. Аднак пры гэтым ён не адмаўляецца ад спробаў умацавання беларускага суверэнітэту, што шмат у чым пазбаўляе празаходнюю апазіцыю важнага фактару для магчымай мабілізацыі патэнцыйных прыхільнікаў.[46] Усё гэта не адмяняе таго, што на фоне сусветнага фінансавага крызісу эканамічная залежнасць Беларусі ад Расіі толькі ўзрастала,[47] таксама як і таго, што міждзяржаўныя адносіны паміж Расіяй і Беларуссю зусім не заўсёды былі бясхмарнымі пасля 1994 г.

Няма ніякіх сумневаў, што для значнай часткі беларускага грамадства Прэзідэнт А. Лукашэнка персаніфікуе парадак і стабілізацыю пасля сацыяльна-эканамічных хваляванняў пачатку 1990-х гг., калі ва ўладзе знаходзіліся апазіцыйныя цяпер сілы.[48] Спецыялісты адзначалі таксама харызматычнасць фігуры А. Лукашэнкі.[49] Можна меркаваць, што ў апошнія гады беларускі рэжым паспяхова пашыраў свой сацыяльны базіс, калі апеляваў менавіта да ўсходняга, «савецкага», або прарасійскага тыпу ідэнтычнасці. Даследаванні 2004 г. паказалі, што «еўрапейцамі» ў пэўнай або значнай ступені адчувалі сябе адпаведна 9 і 25% беларускіх рэспандэнтаў.[50] У межах іншага даследавання ў 2007 г. рэспандэнтам было прапанавана выбіраць паміж двума варыянтамі: аб'яднанне з Расіяй або ўступленне ў Еўрасаюз. Першы варыянт абралі крыху менш за палову рэспандэнтаў, другі –

43 Напр., Buhr R. L., Shadurski V. and Hoffman S. «Belarus: an Emerging Civic Nation?», *Nationalities Papers*, May 2011, Vol. 39 (3); Bekus N. «East, West or "In Between"? Three PostCommunist Concepts of the Belarusian Nation», in Maxwell A. (ed.), *The East-West Discourse: Symbolic Geography and its Consequences. Nationalisms across the Globe,* Vol. 8, Oxford, Bern, Berlin, Bruxelles, Frankfurt am Main, New York, Wien, 2011.

44 Вялікая Айчынная вайна – афіцыйны тэрмін, які выкарыстоўваецца ў Беларусі і ў шэрагу іншых краін для абазначэння ўдзелу СССР у Другой сусветнай вайне ў 1941-1945 гг.

45 Leshchenko N. A. «Fine Instrument: Two Nation-Building Strategies in Post-Soviet Belarus», *Nations and Nationalism*, 2004, Vol. 10 (3), p. 339.

46 Bohdan S. «Belarus Reloaded. Evolution of Belarusian Culture and Different Projects of Belarus», in Dynko A. *The Generation Gap, or Belarusian Differences in Goals, Values and Strategy*, Warsaw: Elipsa, 2008, p. 133.

47 Международный валютный фонд. *Доклад МВФ по стране № 12/113*, май 2012 г. С. 4. Ёсць на: http://www.imf.org.

48 Ioffe G. "Nation-Building in Belarus: A Rebuttal", in *Eurasian Geography and Economics*, 2007, Vo. 48 (1), p. 68.

49 Bugrova, I., *Politische Kultur in Belarus. Eine Rekonstruktion der Entwicklung vom Großfürstentum Litauen zum Lukaschenko-Regime. Untersuchungen des FKKS 18/1998, Forschungsschwerpunkt Konflikt- und Kooperationsstrukturen in Osteuropa an der Universität Mannheim*, Oktober 1998, S. 41.

50 Працэнт ад рэспандэнтаў, якія далі пэўны адказ на пытанне. Апытанне праводзілася ў сакавіку-красавіку 2004 г. па рэпрэзентатыўнай выбарцы (1597 чал.): Korosteleva J. And White S. "'Feeling European': the View from Belarus, Russia and Ukraine", *Contemporary Politics*, 2006, Vol. 12(2), table 1. Ёсць на: http://eprints.gla.ac.uk/5266.

каля трацiны. Таксама i iншыя даследаваннi сведчаць аб «усходняй арыентацыi» большай часткi беларускага грамадства.[51]

Прасоўваючы свой праект нацыябудаўнiцтва, цяперашнi беларускi прэзiдэнт разглядае «канкурэнтныя» праекты, прапанаваныя палiтычнай апазiцыяй, як здраду нацыянальных iнтарэсаў дзеля краiн Захаду. Напрыклад, у пачатку 2013 г., у адказе на пытанне журналiсткi, з кiм з апазiцыйных палiтыкаў ён гатовы дыскутаваць, не разглядаючы iх як прадстаўнiкоў «пятай калоны», Прэзiдэнт А. Лукашэнка сказаў:

> *Што датычыцца так званых, як вы сказалi, апазiцыйных кандыдатаў, я, як беларус, iх на нейкiх кiруючых пасадах у Беларусi наогул бачыць не хачу. Разумееце? Гэта здраднiкi iнтарэсаў беларускага народа. А я хачу бачыць людзей, якiя змагаюцца за незалежную краiну! Не проста мовай ляпаюць, гаворачы аб гэтай барацьбе, а рэальна змагаюцца за сваю краiну!*[52]

Разглядаючы законы i практыку беларускiх уладаў у дачыненнi да любой грамадскай актыўнасцi, трэба ўлiчваць таксама «аранжавую рэвалюцыю» ў суседняй Украiне ў 2004 г.[53] Беларускiя ўлады

51 Дадзеныя агульнанацыянальнага апытання па рэпрэзентатыўнай выбарцы (студзень 2007 г.) даюцца па: Bekus N. *European Belarus versus State Ideology: Construction of the Nation in the Belarusian Political Discourses, Working Paper No. 1*, Warsaw: Polish Academy of Sciences, Institute of Philosophy and Sociology, 2008, p. 22.

52 *Пресс-конференция Президента Беларуси Александра Лукашенко белорусским и зарубежным средствам массовой информации*, 15 января 2013 г., Президент Республики Беларусь. Ёсць на афіцыйным сайце: http://president.gov.by/press140878.html.

Па-трэцяе, хоць Закон дазваляе рэлігійным аб'яднанням запрашаць дзамежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў мэтах выканання рэлігійнай дзейнасці ў адпаведных рэлігійных аб'яднаннях (па агульнаму правілу на адзін год з магчымасцю падаўжэння), гэта робіцца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь (арт. 29). Гэтым правам не надзелены асобныя рэлігійныя абшчыны. Таксама Закон дазваляе толькі рэлігійным аб'яднанням ствараць духоўныя навучальныя ўстановы для прафесійнай падрыхтоўкі святароў, тэолагаў і царкоўнага персаналу.

Па-чацвёртае, хоць артыкул 26 Закона дэкларуе свабоду распаўсюду рэлігійнай літаратуры, пры ўвозе такой літаратуры з-за мяжы і пры яе паступленні ў бібліятэчныя фонды правядзенне дзяржаўнай рэлігіязнаўчай экспертызы з'яўляецца абавязковым. Камерцыйныя

105 Закон Республики Беларусь «О свободе совести и религиозных организациях» (ст. 17).





арганізацыі па выпуску рэлігійнай літаратуры і вытворчасці прадметаў культавага прызначэння могуць ствараецца толькі рэлігійнымі арганізацыямі. Пры гэтым распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры і іншых адпаведных матэрыялаў можа ажыццяўляцца рэлігійнымі арганізацыямі альбо ў іх памяшканнях, альбо ў іншых адведзеных ім уладамі месцах. Вядомыя, напрыклад, выпадкі забароны на ўвоз некаторых выданняў сведкамі Яговы, паколькі ў іх, на думку ўладаў, абмяркоўваліся палітычныя пытанні, якія выходзяць за межы дзейнасці рэлігійнай арганізацыі.[106]

Такім чынам, нягледзячы на абвешчаную роўнасць, на ўзроўні прававых актаў адсутнічае роўнасць паміж «традыцыйнымі» і буйнымі канфесіямі і ўсімі іншымі канфесіямі, што можа прыводзіць да дыскрымінацыі жыхароў краіны па рэлігійнай прыкмеце.

### *Адміністрацыйныя перашкоды пры рэгістрацыі*

Артыкул 17 Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» сярод патрабаванняў для рэгістрацыі суполкі паказвае на «дакумент, які пацвярджае права размяшчэння рэлігійнай абшчыны па месцы знаходжання, указанаму ў статуце». Патрабаванні да памяшкання раскрываюцца ў адпаведных падзаконных актах. Наяўныя абмежаванні нацэлены, перш за ўсё, на «новыя рэлігійныя рухі» і яны добра ўпісваюцца ў агульныя мерапрыемствы па кантролі над любымі аб'яднаннямі жыхароў краіны. Акрамя чыста заканадаўчых перашкод для рэгістрацыі, варта ўлічваць і абмежавальныя адміністрацыйныя практыкі, якія не дазваляюць прайсці рэгістрацыю нават тым арганізацыям, што адпавядаюць усім фармальным патрабаванням закона. Аб практычных праблемах, звязаных з ужываннем дадзеных патрабаванняў, сведчаць нядаўнія Меркаванні Камітэта ААН па правах чалавека па паведамленні членаў Мінскага аб'яднання свядомасці Крышны. Аўтары паведамлення хацелі зарэгістраваць рэлігійнае аб'яднанне, якое складаецца з некалькіх суполак, каб атрымаць доступ да дадатковых правоў па беларускім заканадаўстве (гл. вышэй). Ім было адмоўлена ў рэгістрацыі на той падставе, што іх офіс не адпавядае афіцыйным патрабаванням. Камітэт па правах чалавека заключыў, што

106 Гл. спасылку 99.

адмова ў рэгістрацыі роўная абмежаванню права аўтараў вызнаваць рэлігію (гл. ніжэй). Падобная адмова таксама ўяўляе сабой прыклад дыскрымінацыі па рэлігійнай падставе.





**Прыклад 1.**
**Вытрымка з Паведамлення № 1207/2003**
**(справа аб рэгістрацыі Мінскага аб'яднання свядомасці Крышны)**

*Меркаванні, прынятыя Камітэтам па правах чалавека на яго 106-й сесіі (11-29 ліпеня 2005 г.)**

7.4 У гэтай справе абмежаванні, накладзеныя на права аўтараў [паведамлення] вызнаваць іх рэлігію, складаюцца з некалькіх умоў, якія звязаны з рэгістрацыяй рэлігійнага аб'яднання. Адным з крытэрыяў, якому не змаглі адпавядаць аўтары паведамлення, з'яўлялася патрабаванне мець пацверджаны афіцыйны адрас, [памяшкання], якое адпавядала б пэўным стандартам бяспекі здароўя і пажарнай бяспекі, неабходным для памяшканняў, якія выкарыстоўваюцца для такіх мэтаў, як рэлігійныя цырымоніі. Гэтыя абмежаванні варта ацэньваць у святле тых наступстваў, што вынікаюць для аўтараў [паведамлення] і для іх рэлігійнага аб'яднання.

7.5 Камітэт лічыць, што папярэдняя ўмова, згодна з якой права рэлігійнага аб'яднання займацца рэлігійнай дзейнасцю залежыць ад наяўнасці памяшканняў, для якіх выконваюцца адпаведныя стандарты бяспекі здароўя і пажарнай бяспекі, з'яўляецца абмежаваннем, неабходным для аховы грамадскай бяспекі, і прапарцыйна гэтай неабходнасці.

7.6 Камітэт адзначае, аднак, што Дзяржава-ўдзельніца не прывяла якіх-небудзь аргументаў адносна таго, чаму для мэтаў часткі 3 артыкула 18 [Міжнароднага Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах] рэлігійнаму аб'яднанню для рэгістрацыі неабходна мець афіцыйны адрас, [памяшканне], якія не толькі адпавядаюць стандартам, што патрабуюцца для цэнтра адміністравання аб'яднання, але і тыя, што неабходныя для памяшканняў, якія выкарыстоўваюцца для рэлігійных цырымоній, рытуалаў і іншых групавых мерапрыемстваў. Адпаведныя памяшканні для гэтых мэтаў могуць быць атрыманы пасля рэгістрацыі. Камітэт таксама адзначае, што аргумент Дзяржавы-ўдзельніцы, прыведзены ў яе каментарыях да паведамлення, што абшчына аўтараў імкнулася манапалізаваць прадстаўніцтва вішнуізму ў Беларусі, не разглядаўся ў межах працэдур на нацыянальным узроўні. Прымаючы таксама пад увагу наступствы адмовы ў рэгістрацыі, а менавіта не-

магчымасць выканання такой дзейнасці, як заснаванне адукацыйных устаноў і запрашэнне замежных рэлігійных прэлатаў наведаць краіну, Камітэт заключае, што адмова ў рэгістрацыі роўная абмежаванню права аўтараў вызнаваць рэлігію згодна з часткай 1 артыкула 18 [Пакта], якое мае непрапарцыйны характар і таму не адпавядае патрабаванням часткі 3 артыкула 18. Такім чынам, былі парушаныя правы аўтараў [паведамлення], прадугледжаныя часткай 1 артыкула 18.

**Human Rights Committee, Communication No. 1207/2003: Belarus, 23 August 2005, Views of the Human Rights Committee under the Optional Protocol to the International Covenant on Civil and Political Rights, CCPR/C/84/D/1207/2003 (Malakhovsky and Pikul v. Belarus).*

### *Пазастатутная дзейнасць і незарэгістраваныя арганізацыі*

Улады Беларусі ў апошнія гады здолелі запаволіць рост колькасці пратэстанцкіх арганізацый, а таксама распаўсюджванне ў краіне новых рэлігійных накірункаў, што адбіваецца на статыстыцы афіцыйна зарэгістраваных супольнасцяў (гл. вышэй). Больш за тое, за апошнія гады не была зарэгістравана ніводная новая канфесія.

Беларускае заканадаўства прадугледжвае шэраг досыць жорсткіх мер, накіраваных на недапушчэнне парушэння заканадаўства, што датычыцца дзейнасці рэлігійных арганізацый. Артыкул 9.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях[107] (КаАП) прадугледжвае, апроч іншага, адказнасць за пазастатутную дзейнасць рэлігійных арганізацый – штраф у памеры ад чатырох да дзесяці базавых велічыняў.[108]

Паводле адносна нядаўна прынятага артыкула 193-1 Крымінальнага кодэкса (КК) штрафам, або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў,

107 Кодекс Республики Беларусь об административных правонарушениях от 21 апреля 2003 г. № 194–З.

108 Базавая велічыня – гэта перыядычна зменная грашовая сума, якая выкарыстоўваецца для разліку грашовага эквівалентна прызначанага штрафу. На момант напісання даклада базавая велічыня складала 100 тыс. бел. руб. (каля $12).





або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў караецца арганізацыя дзейнасці або ўдзел у дзейнасці рэлігійнай арганізацыі, якая не была зарэгістраваная, была ліквідаваная або дзейнасць якой была прыпыненая. Пад такой дзейнасцю маюцца на ўвазе дзеянні, накіраваныя на дасягненне мэтаў названых аб'яднанняў, арганізацый ці фондаў, у тым ліку вызначаных у іх статутных і іншых дакументах.

Улады Беларусі неаднаразова выносілі т. зв. афіцыйныя папярэджанні ў кантэксце артыкула 193-1 КК для аказання ўздзеяння на кіраўнікоў незарэгістраваных рэлігійных абшчын. Афіцыйнае папярэджанне (як мера індывідуальнай прафілактыкі правапарушэння) прадугледжана артыкулам 25 Закона «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў».[109] Такое папярэджанне выносіцца ў пісьмовай форме і даводзіцца пад распіску чалавеку, які стаіць на «прафілактычным уліку», у выпадках здзяйснення ім правапарушэння ці калі ёсць дастатковыя падставы меркаваць аб яго намеры здзейсніць правапарушэнне.[110] Прывядзём толькі некалькі нядаўніх прыкладаў. У красавіку 2011 г. аб недапушчальнасці парушэння арт. 193-1 КК быў афіцыйна папярэджаны М. Варушын:

> *Я з'яўляюся пастарам абшчыны Савета Цэркваў евангельскіх хрысціян-баптыстаў у Гомелі. Сваю дзейнасць мы ажыццяўляем без дзяржаўнай рэгістрацыі, паколькі яна супярэчыць нашым перакананням. 21 красавіка 2011 г. да нас на сход прыйшлі супрацоўнікі міліцыі і людзі ў цывільным і заявілі, што яно незаконнае, паколькі мы незарэгістраваныя. Гаспадар дома, дыякан нашай абшчыны, і я былі папярэджаны пракуратурай Чыгуначнага раёна г. Гомеля аб недапушчальнасці парушэння арт. 193-1 КК. Судом Чыгуначнага раёна г. Го-*

109 Закон Республики Беларусь от 10 ноября 2008 г. № 453-З «Об основах деятельности по профилактике правонарушений».

110 Прафілактычныя гутаркі, пастаноўка на прафілактычны ўлік і афіцыйныя папярэджанні актыўна выкарыстоўваліся праваахоўнікамі яшчэ ў савецкі час, у тым ліку ў дачыненні да асоб, сацыяльная актыўнасць якіх выклікала заклапочанасць уладаў.

*меля я быў пазней аштрафаваны на 30 базавых велічыняў.*[111]

У лістападзе 2011 г. аб недапушчальнасці парушэння артыкула 193-1 КК быў афіцыйна папярэджаны А. Някрасаў:

*Я з'яўляюся кіраўніком арганізацыі школы Карма Каг'ю будызму Дыяментавага шляху ў г. Гомелі. 2 лістапада 2011 г. я быў папярэджаны пракуратурай Цэнтральнага раёна г. Гомеля аб недапушчальнасці парушэння заканадаўства і магчымасці адказнасці па арт. 193-1 КК (кіраўніцтва і ўдзел у незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі).*[112]

Незарэгістраваныя арганізацыі «традыцыйных» канфесій адчуваюць на сабе такі ж ціск з боку ўладаў, як і прадстаўнікі іншых рэлігій. Вось што паведаміў РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» (БХК) С. Несцяровіч, кіраўнік Праабражэнскага брацтва ў г. Гомелі:

*Мы дзейнічаем без рэгістрацыі. 21 сакавіка 2007 г. на наш сход, які адбываўся на прыватнай кватэры, прыйшлі супрацоўнікі КДБ і зрабіліператрус з адабраннем нататніка з запісамі і здыманнем дадзеных з кампутара. 19 красавіка 2007 г. намеснік пракурора г. Гомеля Елісееў вынес мне афіцыйнае папярэджанне аб недапушчальнасці парушэння закона са спасылкай на арт. 193-1 КК. Пасля вынясення папярэджання мяне выклікаў кіраўнік аддзела па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Гомельскага аблвыканкама Міхаіл Жукевіч і прасіў напісаць распіску, што ў нас няма незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі «Праабражэнскае брацтва». Я на гэта адказаў, што мы лічым сябе часткай праваслаўнай царквы, якая зарэгістравана, і я не бачу неабходнасці ў распісцы. У нас адбылася нармальная размова. Я сказаў, што не хачу ўступаць у канфлікт з законам, цяпер мы зарэгістравацца не можам, аднак зробім гэта пры першай магчымасці.*[113]

111 Мікалай Варушын, інтэрв'ю БХК ад 20 лістапада 2011 г., Гомель.

112 Андрэй Някрасаў, інтэрв'ю БХК ад 5 лістапада 2011 г., Гомель.





Артыкул 23 Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» вызначае ўмовы недобраахвотнай (па рашэнні суда) ліквідацыі рэлігійнай арганізацыі: паўторнае на працягу года парушэнне заканадаўства або ажыццяўленне рэлігійнай арганізацыяй дзейнасці, якая супярэчыць яе статуту; ажыццяўленне прапаганды вайны або экстрэмісцкай дзейнасці; ажыццяўленне дзейнасці, якая звязана з парушэннем правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян, а таксама перашкаджае выкананню грамадзянамі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў або наносіць шкоду іх здароўю і маральнасці; у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.[114] Орган, які рэгіструе, таксама мае права звярнуцца ў суд з заявай аб ліквідацыі рэлігійнай арганізацыі, калі ёй было пададзена пісьмовае папярэджанне аб парушэннях і калі гэтыя парушэнні не былі на працягу шасці месяцаў ліквідаваныя альбо былі новыя парушэнні. Да прыняцця рашэння аб ліквідацыі дзейнасць арганізацыі можа быць прыпыненая (частка 2 артыкула 37 Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях»). Пасля вынясення пісьмовага папярэджання рэлігійная арганізацыя як «традыцыйных», так і іншых канфесій знаходзіцца ў асабліва ўразлівым становішчы.

Напрыклад, у 2006 г. Саюзу евангелісцка-лютэранскіх абшчын Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь вынес пісьмовае папярэджанне аб парушэнні Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях». Пазней высветлілася, што гэтае папярэджанне немагчыма аспрэчыць: Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь адзначыў, што сам закон такой маг-

113 Сяргей Несцяровіч, інтэрв'ю БХК ад 16 кастрычніка 2011 г., Гомель.

114 Падобныя спасылкі на няпэўную колькасць «іншых прававых актаў» даволі характэрныя для беларускага права. Такія адсылкі часцяком пазбаўляюць як звычайных людзей, так і юрыстаў яснага разумення наяўных заканадаўчых абмежаванняў, якія могуць быць унесены ў самыя розныя прававыя акты.

чымасці наўпрост не прадугледжвае.[115] Хутка выканаць прадпісанне таксама было складана, хоць гэтая акалічнасць праз нейкі час магла прывесці да прыпынення дзейнасці саюза і нават да яго ліквідацыі. У адпаведнасці з пісьмовым папярэджаннем рэлігійны саюз, акрамя іншага, павінен быў прывесці сваю пячатку і штамп у адпаведнасць з інструкцыяй МУС ад 2000 г. Аднак просьба зацвердзіць узор новай мадэлі пячаткі была пададзеная саюзам некалькімі месяцамі раней, а папярэдняя «няправільная» пячатка была зацверджаная ўладамі яшчэ ў 2002 г. Усе спробы вырашыць пытанне ў беларускіх судах былі беспаспяховымі. У 2007 г. саюзу было адмоўлена ў разглядзе просьбы адобрыць запрашэнне для паездкі ў Беларусь дзевяці пратэстанцкіх актывістаў для ўдзелу ў мерапрыемствах саюза. Адмова разглядаць просьбу грунтавалася на тым, што пячатка саюза не прыведзена ў адпаведнасць з патрабаваннямі інструкцыі МУС. У выніку сакратар кансісторыі саюза звярнуўся з паведамленнем у Камітэт па правах чалавека (КПЧ) з указаннем на парушэнне часткі 1 артыкула 18 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (свабода рэлігіі), а таксама часткі 1 артыкула 14 (роўнасць перад судом). Аднак КПЧ не стаў разглядаць паведамленне па сутнасці,[116] прызнаўшы яго непрымальным па фармальных падставах.[117]

### *Мерапрыемствы па-за культавымі будынкамі*

Артыкул 25 Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» устанаўлівае, што набажэнствы, рэлігійныя абрады, рытуалы і цырымоніі бесперашкодна праводзяцца ў культавых будынках, збудаваннях і на тэрыторыях, якія да іх адносяцца, у іншых месцах, дадзеных рэлігійным арганізацыям для гэтых мэтаў, у месцах паломніцтва, на могілках і ў крэматорыях. Рэлігійныя абрады, рытуалы і цырымоніі (але не набажэнствы) «пры неабходнасці» могуць праводзіцца па месцы жыхарства грамадзян па іх просьбе пры ўмове захавання норм супольнага жыцця і грамадскага парадку, калі яны не носяць «масавага і сістэматычнага характару». Акрамя таго, набажэнствы, рэлігійныя абрады, рытуалы і цырымоніі ў спецыяльна не прызначаных для гэтых мэтаў месцах пад адкрытым небам і ў некультавых будынках могуць праводзіцца толькі з дазволу мясцовых уладаў.

На практыцы правядзенне мерапрыемстваў па-за культавых будынкаў ускладнена як для «традыцыйных» канфесій (праваслаўных і каталікоў), так і для іншых груп. Рэлігійныя акцыі, якія з пункту гледжання ўладаў маюць палітычны складнік, знаходзяцца пад асабліва жорсткім кантролем і часам спыняюцца ўладамі. Напрыклад, з канца 1980-х гг. дзень памінання памерлых (Дзяды) у свядомасці многіх грамадзян Беларусі звязваецца з памінаннем ахвяр палітычных рэпрэсій. Усе мерапрыемствы, у тым ліку малебны, нашэнні і ўстаноўка крыжоў на Дзяды, адсочваюцца сілавымі структурамі. Як паведаміў у інтэрв'ю БХК прадстаўнік каталіцкай абшчыны Гомеля А. Яўсеенка,

> *З 1992 г. я разам з іншымі сябрамі каталіцкай абшчыны Гомеля на Дзяды (2 лістапада) прыходзіў на 9-ты кіламетр Чарнігаўскай шашы, на месца, дзе ў гады сталінскіх рэпрэсій расстрэльвалі жыхароў Гомельскай вобласці. У 2009 г. адміністрацыя Навабеліцкага раёна Гомеля, са спасылкай на Закон «Аб масавых мерапрыемствах», забараніла нам збірацца, таму што мы загадзя не папрасілі дазволу. Людзі сабраліся самастойна і маліліся.*[118]

Ю. Клімовіч у інтэрв'ю БХК таксама адзначае павышаную цікавасць уладаў да гэтых мерапрыемстваў:

> *У 2010 г. мы панеслі крыж, каб устанавіць яго на 9-м кіламетры Чарнігаўскай шашы. Неслі яго праз*

115 Сёння падобныя праблемы знайшлі сваё частковае вырашэнне ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 28 кастрычніка 2008 г. № 433–З «Об основах административных процедур».

116 Комитет по правам человека, *Сообщение № 1749/2008: Беларусь, 21 ноября 2011 г. Решение, принятое Комитетом 31 октября 2011 г.* CCPR/C/103/D/1749/2008 (V.S. v. Belarus).

117 У дадзеным выпадку можна было гаварыць пра парушэнне правоў Саюза евангелісцка-лютэранскіх абшчын, які, як юрыдычная асоба, аднак, не валодаў праваздольнасцю ў дадзенай працэдуры. Парушэнне ж правоў аўтара паведамлення – сакратара кансісторыі саюза – як асобнага паслядоўніка лютэранскай веры ў кантэксце разгляданых падзей было прызнана невідавочным.

118 Аляксандр Яўсеенка, інтэрв'ю БХК ад 14 лістапада 2011 г., Гомель.

*увесь Гомель. Нас суправаджалі некалькі машын з міліцыяй. На ўваходзе ў Навабеліцкі раён горада нас сустрэў кіраўнік адміністрацыі гэтага раёна і некалькі разоў настойліва пытаўся, ці не збіраемся мы ўстанаўліваць крыж у яго раёне. Падчас устаноўкі крыжа ў лесе за горадам нас здымалі на кінакамеру людзі ў цывільным.*[119]

Ад названых вышэй заканадаўчых абмежаванняў на правядзенне рэлігійных мерапрыемстваў па-за культавымі будынкамі могуць асабліва пакутаваць пратэстанцкія арганізацыі. Не маючы магчымасці прайсці рэгістрацыю з-за патрабаванняў закона або абструкцыі ўладаў або зарэгістравацца ў досыць вялікіх памяшканнях, яны збіраюцца ў прыватных дамах альбо ў іншых (у т. л. арандаваных) памяшканнях без папярэдняга дазволу ўладаў. Ніжэй прыведзены сведчанні, якія былі сабраныя БХК у межах праекта Асацыяцыі роўных правоў.[120]

Шматлікім абшчынам органы ўлады беспадстаўна адмаўляюць у выданні дазволаў для правядзення рэлігійных мерапрыемстваў у памяшканнях, якія знаходзяцца ў будынках някультавага характару. Яркай ілюстрацыяй таму служыць сітуацыя, у якой апынулася мінская пратэстанцкая абшчына «Царква “Новае Жыццё”» (журналісты назвалі яе «Царква ў кароўніку»). Канфлікт беларускіх уладаў з «Новым жыццём» атрымаў шырокую вядомасць, у тым ліку за мяжой: сітуацыя, якая склалася, была апісана, напрыклад, у дакладзе міжнароднай праваабарончай арганізацыі «Форум 18»[121] (гл. ніжэй).

119 Юрый Клімовіч, інтэрв’ю БХК ад 10 лістапада 2011 г., Гомель.

120 Васіль (прозвішча не даецца), інтэрв’ю БХК ад 24 снежня 2011 г., Бабруйск, Магілёўская вобл.; Юрый Рашэтнікаў, інтэрв’ю БХК ад 17 снежня 2011 г., Гомель; Дзмітрый Падлобка, інтэрв’ю БХК ад 29 лістапада 2011 г., Гомель; Аляксандр (прозвішча не даецца), інтэрв’ю БХК ад 22 снежня 2011 г., Пінск, Брэсцкая вобл.

121 Гл. спасылку 99.





**Прыклад 2.**
**Сведчанні рэлігійных дзеячаў**

**Васіль:** Я з'яўляюся адным з старэйшынаў рэлігійнай арганізацыі «Сведкі Яговы» ў Бабруйску. У 2009 г. на адзін з нашых сходаў, які адбываўся ў прыватным доме і на якім прысутнічала каля 60 чал., прыйшла міліцыя. Сход быў сарваны, я быў аштрафаваны на 175 тыс. бел. руб. за правядзенне мерапрыемства па-за культавым будынкам.

**Юрый Рашэтнікаў:** Я з'яўляюся старшынёй абшчыны сведак Яговы ў Гомелі. Мы арандуем памяшканне для нашых сходаў, але таксама збіраліся і ў прыватным доме. Гэтыя сходы праводзіліся з тымі, хто не меў магчымасці збірацца ў памяшканні, якое арандуецца. У 2009 г. на наш сход прыехала міліцыя (пяць міліцыянтаў і людзі ў цывільным). У іх было прадпісанне намесніка пракурора Чыгуначнага раёна Гомеля на агляд памяшкання. Перамовы з імі вёў я, а таксама прадстаўнік гаспадара дома – Сяргей Байкоў. Мы адмовіліся адчыняць дзверы, міліцыя выклікала супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях (МНС), і дзверы былі выразаныя балгаркай. Мне прапанавалі падпісаць пратакол, я адмовіўся. Тады на наступны дзень да мяне на працу прыехалі начальнік аддзела па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Гомельскага аблвыканкама А. Прусаў, загадчык аддзела нерухомасці Гомельскага гарвыканкама і начальнік 3-га аддзялення міліцыі Чыгуначнага раёна Гомеля. Яны запатрабавалі, каб я падпісаў пратакол, размаўлялі са мной груба. А. Прусаў мацюкаўся. Рашэннем суда Чыгуначнага раёна Гомеля я як арганізатар сходу быў аштрафаваны на 1 млн бел. рублёў. Штраф у мяне вылічвалі з заробку два гады.

**Дзмітрый Падлобка:** Я з'яўляюся пастарам царквы «Новае жыццё» Хрысціянаў поўнага Евангелля ў Гомелі. 9 кастрычніка 2007 г. я быў папярэджаны пракурорам Савецкага р-на Гомеля М. Пруса аб недапушчальнасці парушэння закона. Наша царква знаходзіцца ў доме, які не пераведзены ў нежылы фонд. Згодна з рашэннем суда, сваёй дзейнасцю ў якасці пастара я парушыў артыкул 25 Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях».

**Аляксандр:** Я – пастар аўтаномнай абшчыны Хрысціян веры евангельскай (пяцідзясятнікаў) у Пінску. З пачатку 2001 г. мы займаемся рэгістрацыяй абшчыны. Гэта вельмі забюракратызаваны працэс. Напрыклад, у памяшканні па санітарных нормах на кожнага з членаў абшчыны павінен прыходзіцца адзін квадратны метр плошчы. Акрамя таго, мы павінны ўзгадніць наша памяшканне з МНС і ўстанавіць пажарную сістэму. Акрамя таго, паколькі мы не ўваходзім у аб'яднанне Хрысціян веры евангельскай у Беларусі, наша веравучэнне павінна прайсці экспертызу ў экспертным савеце пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. А пакуль мы не зарэгістраваныя, то не маем права збірацца на службы. У гарвыканкаме мне сказалі, што калі мы будзем служыць, то намі зацікавіцца міліцыя. Відаць, працэс рэгістрацыі для нашай абшчыны будзе доўгім!

**Прыклад 3.**
**Сітуацыя з абшчынай «Царква “Новае жыццё”»**

Становішча з захаваннем свабоды рэлігіі па-ранейшаму наглядна дэманструе сітуацыя вакол пяцідзясятніцкай суполкі «Царква “Новае жыццё”», якая аб'ядноўвае ў Мінску тысячу чальцоў.

«Новае жыццё» вядомая сваёй барацьбой за кантроль над сваёй прыватнай царкоўнай уласнасцю, якая працягваецца з 2002 г. Гэта будынак былога кароўніка на ўскрайку горада, які, паводле заявы ўладаў, не можа змяніць сваё прызначэнне і стаць царквой. Пры гэтым культавы будынак Беларускай праваслаўнай царквы (Маскоўскі патрыярхат) у перарobленым чыгуначным вагоне, што знаходзіцца непадалёк у пяцістах метрах, з падобнымі цяжкасцямі не сутыкнулася.

Улады горада Мінска – пры падтрымцы рэспубліканскага ўрада – байкатавалі ўсе спробы «Новага жыцця» выкарыстоўваць гэты будынак у адпаведнасці з беларускім правам, тым самым пазбаўляючы царкву яе правоў уласнасці. Галадоўка членаў «Новага жыцця», наведванні замежных дыпламатаў і лісты падтрымкі з усяго свету ўтрымала ўлады ад захопу будынка ў кастрычніку 2006 г.





Фармальна «Новае жыццё» не валодала ні сваёй зямлёй з 2005 г., ні будынкам з 2009 г. Тым не менш з сярэдзіны 2009 г. улады ў цэлым прыпынілі ціск на царкву. Яны таксама не распачалі ніякіх дзеянняў пасля таго, як «Новае жыццё» адмовілася плаціць прызначаны ў лютым 2010 г. велізарны штраф за меркаванае забруджванне [зямлі] нафтапрадуктамі; царква катэгарычна аспрэчыла гэта абвінавачванне.

Падчас візіту ў снежні 2010 г. «Форум 18» пераканаўся, што сябры [абшчыны] могуць арганізоўваць хрысціянскія святы пры дапамозе пераносных генератараў электраэнергіі (улады адключылі царкву ад электразабеспячэння ў 2004 г.). Шырока вядомая кампанія грамадзянскага непадпарадкавання «Новага жыцця», мабыць, прымусіла ўлады адмовіцца ад канфрантацыі. Мясцовы пастар-пяцідзясятнік ахарактарызаваў у размове з «Форумам 18» гэтую царкву як «адзіную тэрыторыю ў краіне, дзе не дзейнічаюць беларускія законы».

Аднак 27 лістапада 2012 г. «Новае жыццё» атрымала новае рашэнне аб высяленні ў рамках маштабнай кампаніі супраць палітычнай апазіцыі: услед за прызначэннем у сярэдзіне лістапада новага шэфа спецслужбы КДБ Валерыя Вакульчыка, вядомая праваабарончая арганізацыя «Вясна» была выселена са сваіх памяшканняў у Мінску 26 лістапада. Тым не менш улады зноў выйшлі з канфліктнай сітуацыі з суполкай; праз некалькі дзён мясцовыя органы адмянілі рашэнне аб высяленні.

Такім чынам, залішняе і часам нягнуткае рэгуляванне і адміністраванне ў канфесійнай сферы Беларусі можа прыводзіць да сістэмных цяжкасцяў для асоб, якія жадаюць адкрыта вызнаваць у публічнай прасторы тую ці іншую рэлігію. Такія цяжкасці могуць таксама весці да прамой або ўскоснай дыскрымінацыі на падставе рэлігіі або веравання, нярэдка ў сукупнасці з іншымі прыкметамі, напрыклад, з-за апазіцыйных палітычных поглядаў (гл. ніжэй).

### *Рэлігія і апазіцыйная дзейнасць*

Для рэлігійных арганізацый і іх членаў уразлівасць узрастае, у першую чаргу, з-за грамадскай, у тым ліку апазіцыйнай, актыўнасці вернікаў. Дыскрымінацыйнаму стаўленню ў асноўным падвяргаюцца пратэстанты

і іншыя «новыя рэлігійныя рухі», што нярэдка тлумачыцца іх актыўнай празеліцкай, дабрачыннай, асветніцкай актыўнасцю. Калі рэлігійныя арганізацыі або асобныя вернікі абмяжоўваюцца адпраўленнем культу, не выказваюцца па актуальных грамадскіх праблемах, дэманструюць лаяльнасць да ўлады і падтрымку яе дзеянняў, то ўлада звычайна не стварае ім значных цяжкасцяў. Таксама па заяве Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў ім сумесна з Міністэрствам юстыцыі «вядзецца праца па папярэджанні рэгістрацыі рэлігійных арганізацый пад выглядам грамадскіх аб'яднанняў».[122]

На фоне ўзмацнення жорсткасці заканадаўства, якое рэгулюе рэлігійнае жыццё, у пачатку 2000-х гг., а таксама пакаранняў за яго парушэнні пратэстная актыўнасць прывяла шэраг грамадскіх актывістаў (напрыклад, звязаных з ініцыятывай «За свабоднае веравызнанне») у шэрагі палітычнай апазіцыі.[123] Важную ролю ў кансалідацыі апазіцыйных рэлігійных сілаў адыгрываюць інтэрнэт-рэсурсы, напрыклад, сайт незарэгістраванай партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя».[124] Пратэстанцкія актывісты змаглі сабраць 50 тыс. подпісаў за ўнясенне паправак у Закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях». Па ацэнцы міжнароднай праваабарончай арганізацыі «Форум 18», у апошнія гады палітыка ўладаў стала менш абмежавальнай: відаць, адбіваецца нежаданне падштурхоўваць палітычна нейтральныя групы да апазіцыйнай дзейнасці.[125]

### *Альтэрнатыўная служба*

Пункт 11 Заўвагі агульнага парадку № 22 КПЧ прысвечаны праблеме адмовы ад ваеннай службы па перакананнях сумлення (conscientious objection). Камітэт прызнае, што дадзенае права не ўстаноўлена ў пакце наўпрост, аднак лічыць, што яно можа быць выведзена з артыкула 18 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах пастолькі, паколькі абавязак выкарыстоўваць смяротную зброю можа сур'ёзна супярэчыць свабодзе сумлення і праву вызнаваць рэлігію.

Відавочна, што непрадастаўленне магчымасці праходжання альтэрнатыўнай службы можа весці да ўскоснай дыскрымінацыі на падставе рэлігіі або веравання. Адмова ў праходжанні такой службы можа разглядацца і як непрадастаўленне разумнага прыстасавання,[126] што таксама з'яўляецца формай дыскрымінацыі на падставе рэлігіі і веравання.

Згодна з артыкулам 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, «парадак праходжання вайсковай службы, падставы і ўмовы вызвалення ад вайсковай службы ці замена яе альтэрнатыўнай вызначаюцца законам». Тым не менш у грамадзян Беларусі няма магчымасці прайсці альтэрнатыўную службу. Канстытуцыйны Суд у сваім рашэнні, прынятым яшчэ 26 мая 2000 г., паказаў на неабходнасць неадкладнага прыняцця закона аб альтэрнатыўнай службе або ўнясення змяненняў у іншыя законы.[127] Распрацоўка адпаведнага закона запланавана ў зацверджаным Прэзідэнтам плане законатворчасці на 2013 г.[128] Варта ўлічваць, што папярэднія спробы прыняцця закона былі непаспяховымі з-за вайсковага лобі. На практыцы адсутнасць альтэрнатыўнай службы ўлады спрабуюць кампенсаваць праз прадастаўленне магчымасці служыць там, дзе навабранец не павінен дачыняцца са зброяй (напрыклад, у чыгуначных частках).

У апошнія гады ў Беларусі мелі месца выпадкі крымінальнага пераследу маладых людзей, якія адмаўляюцца ад праходжання вайсковай службы па перакананнях сумлення (conscientious objection). У групе рызыкі ў Беларусі знаходзяцца, перш за ўсё, сведкі Яговы і прадстаўнікі некаторых напрамкаў іўдаізму. Можна прывесці ў якасці прыкладу паведамленне, зробленае ў інтэрв'ю БХК А. Бойнічавым:

122 Гл. спасылку 81.

123 Верещагина А., Гурко А. «О тенденциях в развитии конфессиональной структуры» // *Бюллетень Сети этнологического мониторинга и раннего предупреждения конфликтов*, март-апрель 2007 г., № 72. С. 88–89.

124 Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Ёсць на: http://bchd.info.

125 Гл. спасылку 99.

126 Аб разумным прыстасаванні: гл. раздзел 1.2 гэтага даклада.

127 Решение Конституционного Суда Республики Беларусь от 26 мая 2000 г. № Р–98/2000.

128 Гл. Указ Президента Республики Беларусь от 3 января 2013 г. № 1 «Об утверждении плана подготовки законопроектов на 2013 год», п. 3. Ёсць на: http://center.gov.by/ lawplans2013.html.

*У 2001 г. я быў прызваны ў армію. Медыцынскай камісіяй быў прызнаны прыдатным. Неаднаразова заяўляў, што я з'яўляюся сябрам рэлігійнай арганізацыі «Сведкі Яговы» і па сваіх перакананнях не магу служыць у войску. Прасіў даць мне магчымасць прайсці альтэрнатыўную службу, якая не перашкаджала б майму сумленню. (...) Некалькі гадоў маё здароўе правяралі, спадзеючыся знайсці якую-небудзь хваробу, каб мяне можна было камісаваць, але нічога не знайшлі. У 2003 г. праходзіў прызыўную камісію. Заявіў, што не магу служыць у войску па сваіх перакананнях і папрасіў даць мне магчымасць прайсці альтэрнатыўную службу. Присутны там прадстаўнік міліцыі сказаў, што мяне даставяць у войска ў кайданках. Распісаўся за атрыманне позвы на адпраўку у войска, але сказаў, што не прыйду. У 2003 г. я быў прыцягнуты да суда па артыкуле 72.2 старога КК (ухіленне ад вайсковай службы). Суддзя Чыгуначнага раёна г. Гомеля С. Мальцаў мяне апраўдаў. Пракурор падаў пратэст. Абласны суд мяне таксама апраўдаў, а калегія абласнога суда накіравала справу на перагляд у суд Чыгуначнага раёна. Я доўга чакаў, калі мяне выклічуць, потым прыйшоў у суд сам, і мне сказалі, што мая справа спынена з прычыны дэкрымiналiзацыi (адменены стары КК).*[129]

Варта адзначыць, што новы Крымінальны кодэкс у артыкуле 435 таксама прадугледжвае адказнасць за «ўхіленне ад мерапрыемстваў прызыву на вайсковую службу». Такім чынам аргументацыя судовых органаў не цалкам юрыдычна выверана. Аднак маецца прыклад і апраўдання «ўхілістаў» беларускім судом нават пры адсутнасці відавочных да таго магчымасцяў у рамках дзеючага заканадаўства. Дз. Смык распавёў у інтэрв'ю БХК:

129 Аляксандр Бойнічаў, інтэв'ю БХК ад 17 снежня 2011 г., Гомель.





*Я з'яўляюся сябрам рэлігійнай арганізацыі «Сведкі Яговы» і па рэлігійных перакананнях не магу служыць у войску. Вясной 2009 г. я быў прызваны ў армію. Рэгулярна з'яўляўся па позвах, прайшоў медкамісію. Неаднаразова заяўляў аб сваіх перакананнях. На адпраўку ў войска не з'явіўся. 6 лістапада 2009 г. судом Цэнтральнага раёна Гомеля я быў прызнаны вінаватым па частцы 1 артыкула 435 (ухіленне ад мерапрыемстваў прызыву на вайсковую службу) і аштрафаваны на 100 базавых велічыняў (3,5 млн бел. руб.). Падаваў скаргу, быў вынесены новы прысуд, і я быў апраўданы суддзёй А. Цалковай з-за адсутнасці складу злачынства.*[130]

**Прыклад 4.**
**Вытрымка з Прысуду ад 31 мая 2010 г.**
**суда Цэнтральнага раёна г. Гомеля па абвінавачванні**
**Смыка Дз. У. у здзяйсненні злачынства,**
**прадугледжанага ч. 1 арт. 435 КК Рэспублікі Беларусь***

На думку суда, дзеянні Смыка Дз. У. звязаны з рэалізацыяй ім свайго канстытуцыйнага права на замену вайсковай службы альтэрнатыўнай па рэлігійных перакананнях. Яго рэлігійныя перакананні ў гэтым напрамку і факт прыналежнасці да адпаведнай рэлігійнай канфесіі знайшлі сваё поўнае пацверджанне ў судовым пасяджэнні і не выклікаюць у суда сумневаў.

Як вынікае з паказанняў дапытаных у судзе сведак Н., Р., Р. і П., а таксама лістоў Рэспубліканскага аб'яднання Сведак Яговы ў Рэспубліцы Беларусь, сваё стаўленне да выканання воінскага абавязку павінен абраць сам абвінавачваны Смык Дз. У. Абшчына Сведак Яговы да гэтага рашэння абвінавачанага не датычная.

130 Дзмітрый Смык, інтэв'ю БХК ад 18 снежня 2011 г., Гомель.

Аднак сёння на заканадаўчым узроўні не вырашана пытанне аб замене вайсковай службы альтэрнатыўнай службай, г. зн. на практыцы не рэалізавана палажэнне ч. 2 арт. 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Таксама прымаецца пад увагу тое, што Смык Дз. У. штогод, акрамя прадстаўленай ва ўстаноўленым парадку адтэрміноўкі, праходзіў усе мерапрыемствы па прызыву, добраахвотна з'яўляўся ў ваенкамат па позвах, усё гэта сведчыць аб адсутнасці ў яго намеру ўхілення ад мерапрыемстваў прызыву на вайсковую службу. Пры такіх абставінах адмову ад прызыву на вайсковую службу нельга разглядаць як злачынства, і ён падлягае апраўданню за адсутнасцю ў дзеянні складу злачынства.

**Архіў РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт», люты 2013.*

### *Высновы*

На падставе прыведзеных вышэй дадзеных відавочна, што Беларусь па законе і на практыцы не забяспечвае пакуль роўнасці паміж паслядоўнікамі «традыцыйных» і іншых канфесій, выкарыстоўваючы розныя механізмы для абмежавання правоў, найважнейшымі з якіх з'яўляюцца юрыдычныя і адміністрацыйныя перашкоды для абавязковай рэгістрацыі, пераслед за адсутнасць рэгістрацыі, непрапарцыйна жорсткія патрабаванні ў дачыненні да рэлігійнай дзейнасці за межамі культавых будынкаў і да саміх культавых будынкаў. Дзейнасць уладаў, магчыма, рэзка абмежавала распаўсюджванне ў краіне «новых рэлігійных рухаў», прычым матывы абароны дзяржаўнай бяспекі і асаблівай версіі беларускай ідэнтычнасці тут адыгрываюць не апошнюю ролю. Магчымасці для абскарджання адміністрацыйных рашэнняў, якія прымаюцца ў дачыненні да рэлігійных арганізацый, рэзка абмежаваны. Тым не менш у апошні час відавочна таксама жаданне ўладаў пазбягаць адкрытага канфлікту і супрацьстаяння з рэлігійнымі суполкамі.

Для Беларусі характэрна асаблівая ўразлівасць прадстаўнікоў рэлігійных груп і рэлігійных арганізацый, як «традыцыйных», так і новых, за іх патэнцыйную ці рэальную сувязь з палітычнымі апазіцыйнымі рухамі. Надаючы асаблівую ўвагу супрацоўніцтву з «традыцыйнымі» канфесіямі, дзяржава, тым не менш, ставіць іх у вельмі цвёрдыя рамкі нароўні з «нетрадыцыйнымі» канфесіямі (напрыклад, у тым, што тычыцца патрабаванняў рэгістрацыі або правядзення мерапрыемстваў па-за культавымі будынкамі). Дзяржава можа ўмешвацца ва ўнутраныя справы асацыяванай з польскай меншасцю каталіцкай царквы, выкарыстоўваючы для гэтага абмежавальную візавую палітыку ў адносінах да замежных членаў яе кліру.

Як паказана вышэй, пытанне аб альтэрнатыўнай службе ў Беларусі да гэтага часу заканадаўча не ўрэгулявана, што ставіць прадстаўнікоў пэўных рэлігійных меншасцяў пад пагрозу парушэння іх рэлігійных правоў і свабод, уключаючы пагрозу дыскрымінацыі па рэлігійнай прыкмеце.

### 2.1.2 Нацыянальныя (этнічныя) меншасці

Сёння доля беларусаў у насельніцтве Беларусі вельмі высокая (звыш 4/5). У краіне таксама пражываюць некалькі буйных груп нацыянальных (этнічных) меншасцяў. Ёсць усе падставы лічыць, што ўлады імкнуцца да ўмацавання грамадзянскай, а не этнічнай ідэнтычнасці сярод усіх асноўных груп насельніцтва, уключаючы этнічных беларусаў. Афіцыйна выяўленае імкненне да «ўмацавання адзінай супольнасці «беларускі народ»,[131] па сутнасці, з'яўляецца калькай з афіцыйнай савецкай канцэпцыі «новай гістарычнай супольнасці людзей – савецкага народа».[132] Хоць самі па сабе задачы па ўмацаванню грамадзянскай ідэнтычнасці і пабудове грамадзянскай нацыі зусім не супярэчаць міжнародным стандартам абароны правоў чалавека і меншасцяў, беларускія ўлады і дамінуючыя этнічныя групы нярэдка праяўляюць абыякавасць да імкнення груп

131 Менавіта гэтая тэрміналогія выкарыстоўваецца, напрыклад, у Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (гл. вышэй).

132 Паводле прэамбулы Канстытуцыі СССР ад 7 кастрычніка 1977 г. у Савецкім Саюзе было пабудавана развітое сацыялістычнае грамадства, якое, апроч іншага, уяўляла сабой «грамадства сталых сацыялістычных грамадскіх адносін, у якім на аснове збліжэння ўсіх класаў і сацыяльных слаёў, юрыдычнай і фактычнай роўнасці ўсіх нацый і народнасцяў, іх братняга супрацоўніцтва склалася новая гістарычная супольнасць людзей – савецкі народ».

меншасці да захавання сваёй асаблівай ідэнтычнасці, мовы і культуры. Больш за тое, любыя формы публічнай самаарганізацыі прадстаўнікоў груп меншасцяў, як і любыя іншыя формы грамадскай дзейнасці ў краіне, кантралююцца ўладамі, а амаль любая актыўнасць, што асацыюецца з палітычнай апазіцыяй, падвяргаецца абструкцыі або забароне.

Розныя групы меншасцяў могуць адрозніваецца адна ад адной асаблівасцямі іх гістарычнага шляху ў Беларусі, колькасцю і тыпам рассялення, удзелам у адукацыі і культурнай дзейнасці, характарам іх узаемадзеяння з уладамі.

У гэтым раздзеле пасля апісання агульных праблем мы нададзім асаблівую ўвагу становішчу трох груп нацыянальных меншасцяў – палякаў, яўрэяў[133] і цыганоў (рома)[134] для таго, каб прадэманстраваць розныя аспекты этнічнай палітыкі ўладаў і звязаныя з ёй праблемы ў кантэксце барацьбы з няроўнасцю і дыскрымінацыяй.

У гэтай частцы даклада мы будзем абапірацца на агульнапрызнаныя міжнародныя нормы і стандарты ў адносінах права на роўнасць і правоў нацыянальных (этнічных) меншасцяў. У кантэксце захавання прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі варта асабліва вылучыць палажэнні ратыфікаванага Беларуссю Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП), паводле якіх

> *у тых краінах, дзе існуюць этнічныя, рэлігійныя і моўныя меншасці, асобам, якія належаць да такіх меншасцяў, не можа быць адмоўлена ў праве сумесна з іншымі членамі той жа групы карыстацца сваёй культурай, вызнаваць сваю рэлігію і выконваць яе абрады, а таксама карыстацца роднай мовай.*[135]

133 Па гістарычных прычынах, якія будуць растлумачаны ў гэтым дакладзе, яўрэі ў сучаснай Беларусі самімі членамі гэтай групы і іншымі сацыяльнымі групамі разглядаюцца, перш за ўсё, як нацыянальная / этнічная (а не рэлігійная) меншасць. Таму становішча гэтай групы апісваецца ў дадзеным дакладзе менавіта ў раздзеле, прысвечаным этнічным групам.

134 Тэрмін «цыганы» ў Беларусі пастаянна выкарыстоўваецца самімі прадстаўнікамі гэтай групы. Ён не лічыцца ў гэтай краіне абразлівым і не мае негатыўнай канатацыі. Таму ў дакладзе мы таксама будзем выкарыстоўваць гэты тэрмін.





Маніторынгавы орган для МПГПП – Камітэт па правах чалавека – апублікаваў у 1993 г. Заўвагі агульнага парадку (ЗАП) № 23, якія тычацца артыкула 27 Пакту.[136] У пункце 5.1 ЗАП асабліва падкрэсліваецца, што дадзены артыкул абараняе не толькі грамадзян, але і якія пражываюць у краіне неграмадзян. Пункт 6.1 паказвае, што выкананне дадзенага артыкула мае на ўвазе не толькі абавязак самой дзяржавы выконваць правы меншасцяў, але і абарону гэтага права ад трэціх асоб. Пункт 6.2 паказвае на магчымую неабходнасць для дзяржаў абараняць ідэнтычнасць груп меншасцяў і правы іх членаў карыстацца і развіваць сваю мову і культуру, вызнаваць сваю рэлігію сумесна з іншымі членамі групы.

Беларусь як краіна-член АБСЕ звязана прынятымі ў рамках гэтай арганізацыі палітычнымі абавязацельствамі, у прыватнасці Дакумент Капенгагенскай нарады СБСЕ 1990 г.[137] Гэты Дакумент лічыцца адным з найбольш поўных каталогаў агульнапрызнаных правоў меншасцяў. Капенгагенскі дакумент, у прыватнасці, асабліва вылучае правы асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцяў: вольна карыстацца сваёй роднай мовай у асабістым і грамадскім жыцці; ствараць і падтрымліваць свае ўласныя адукацыйныя, культурныя і рэлігійныя ўстановы, арганізацыі або асацыяцыі; вызнаваць сваю рэлігію; устанаўліваць і падтрымліваць бесперашкодныя кантакты паміж сабой у межах сваёй краіны, а таксама праз межы з грамадзянамі іншых дзяржаў, з якімі яны маюць агульнае этнічнае або нацыянальнае паходжанне, культурную спадчыну ці рэлігійныя вераванні; распаўсюджваць інфармацыю, мець доступ да яе і абменьвацца інфармацыяй на сваёй роднай мове; ствараць і падтрымліваць арганізацыі або асацыяцыі ў межах сваёй краіны і ўдзельнічаць у дзейнасці міжнародных няўрадавых арганізацый (п. 32). Згодна з пунктам 34 Дакумента, дзяржавы-ўдзельніцы

135 Международный пакт о гражданских и политических правах (ст. 27).

136 Human Rights Committee, *General Comment No. 23: The Rights of Minorities (Art. 27)*, UN Doc. CCPR/C/21/Rev.1/Add.5, 1994.

137 *Документ Копенгагенского совещания конференции по человеческому измерению СБСЕ*, Копенгаген, 1990 г.

будуць імкнуцца гарантаваць, каб асобы, якія належаць да нацыянальных меншасцяў, мелі адпаведныя магчымасці для навучання сваёй роднай мове або на сваёй роднай мове, а таксама, там, дзе гэта магчыма і неабходна, для выкарыстання яе ў дзяржаўных органах у адпаведнасці з дзеючым нацыянальным заканадаўствам. Дзяржавы-ўдзельніцы таксама заявілі аб намеры актывізаваць намаганні па барацьбе з расавай і этнічнай нянавісцю, антысемітызмам, ксенафобіяй і дыскрымінацыяй, прызнаючы ў дадзеным кантэксце асаблівыя праблемы цыганоў (п. 40).

### *Этнічны склад насельніцтва да набыцця незалежнасці*

У XIX – пачатку XX стст. насельніцтва цяперашняй тэрыторыі Беларусі было ў значнай ступені гетэрагенным. Пры даволі слабой этнічнай ідэнтычнасці ў той час важным індыкатарам была родная мова. Па дадзеных усеагульнага перапісу насельніцтва 1897 г., па ўсёй Расійскай імперыі беларуская была роднай мовай для 5.885.547 чал. Беларускамоўныя падданыя былі большасцю ва ўсіх трох «беларускіх» губернях (Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай),[138] а таксама ў «літоўскай» Віленскай губерні. У «літоўскай» Гродзенскай губерні яны складалі крыху менш за палову. Іншымі буйнымі моўнымі групамі былі людзі, якія размаўлялі на мове ідыш, рускай, польскай, нямецкай, а таксама латышскай і літоўскай (у асноўным, на тэрыторыях, якія ўваходзяць у сучасную Латвію і Літву).[139]

Паводле разлікаў беларускага гісторыка А. Смаленчука, «з улікам польскага перапісу 1931 г., які праводзіўся ва ўмовах палітыкі нацыянальнай асіміляцыі, у канцы 1931 г. на тэрыторыі сучаснай Беларусі пражывала каля 8,5 млн чал. З іх беларусы складалі 71,5%, палякі – 13,0%, яўрэі – 8,0%, рускія – 5,6%. Такім чынам, лік насельніцтва беларускіх зямель з 1897 па 1931 гг. узрос на 33,5%. Вельмі

138 Умоўны падзел губерняў на беларускія і літоўскія стаў неабходным пасля далучэння да Расійскай імперыі тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XVIII – пачатку XIX стст. Назвы «Літва» і «Беларусь» былі забароненыя імп. Мікалаем I (гады праўл. 1825–1855). У афіцыйным кантэксце Літву і Беларусь звычайна называлі Паўночна-Заходнім краем. Битнер В. (ред.). *Природа и население России в 4-х частях. Ч. 3. Народы Европейской России.* Вып. II. С-Пб.: Издание «Вестника знания», 1906. С. 42.

139 Дадзеныя аб размеркаванні насельніцтва па рэлігіях і рэгіёнах. Гл. спасылку 55.





высокі натуральны прырост здолеў кампенсаваць з перавышэннем буйныя дэмаграфічныя страты часоў Першай сусветнай вайны і рэвалюцыі...»[140]

У гады Другой сусветнай вайны з-за баявых дзеянняў і палітыкі нямецкага акупацыйнага рэжыму, якія прывялі да маштабнага партызанскага руху, страты насельніцтва Беларусі мелі катастрафічны характар, хоць спрэчка аб дакладных лічбах страт працягваецца (па некаторых ацэнках яны складаюць ¼ усяго даваеннага насельніцтва). У пасляваенны час этнічны склад насельніцтва Беларусі ў цэлым заставаўся стабільным.[141] Пасляваенныя перапісы насельніцтва Беларусі паказвалі ўсе тыя ж чатыры найбуйнейшыя этнічныя групы, аднак яўрэі страцілі статус самай вялікай меншасці ў выніку генацыду ў гады нацысцкай акупацыі. Доля этнічных беларусаў па перапісах 1959 і 1970 гг. склала прыкладна 81%, у 1979 г. – 79,4%, у 1989 г. – 77,9%. Доля рускіх у насельніцтве вырасла з 8,2% у 1959 г. да 13,2% у 1989 г. Доля палякаў скарацілася за той жа час з 6,7% да 4,1%, а яўрэяў – з 1,9 да 1,1%. Доля ўкраінцаў тады ж некалькі вырасла (з 1,7 да 2,9%). З 1959 па 1989 гг. усё насельніцтва Беларусі вырасла з 8 млн да 10 млн чал.[142]

140 Смалянчук А. «Нацыянальная структура насельніцтва Беларусі у XX ст.» // *Беларусь у XX стагоддзі*, 2002, Вып. 1. Ёсць на: http://www.homoliber.org/ru/xx/xx010119.html.

141 Паводле ацэнак створанай савецкімі ўладамі Дзяржаўнай надзвычайнай камісіі, на тэрыторыі Беларусі ў гады нацысцкай акупацыі было знішчана (расстраляна, павешана, спалена) 1,4 млн жыхароў рэспублікі. Аб жорсткасці таго часу можа сведчыць і такі факт: нацысцкія акупанты спалілі звыш 9,2 тыс. вёсак, прычым 619 вёсак было спалена разам з жыхарамі. У дадзеныя Дзяржаўнай надзвычайнай камісіі не ўваходзяць загінулыя на фронце і ў партызанскіх атрадах, тыя, хто загінуў і памёр на прымусовых работах у Германіі, а таксама памерлыя натуральнай смерцю на тэрыторыі Беларускай ССР і ў савецкім тыле. Паводле ацэнак А. Літвіна, з улікам гэтых дадатковых дадзеных страты сярод насельніцтва Беларусі могуць дасягаць ¼ ад яго агульнай колькасці. Литвин А. «К вопросу о количестве людских потерь Беларуси в годы Великой Отечественной войны (1941–1945 гг.)» // *Беларусь у XX стагоддзі*, 2002, Вып. 1. Ёсць на: http://www.homoliber.org/ru/xx/xx010115.html.

142 *Перепись населения 2009 г. Национальный состав населения Республики Беларусь, Т. III.* Минск: Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2011. Табл. 1.2.

### *Этнічны склад насельніцтва пасля набыцця незалежнасці*

Колькасць насельніцтва Рэспублікі Беларусь па дадзеных другога пасля атрымання незалежнасці перапісу насельніцтва 2009 г. складае 9,5 млн чал. Пераважная большасць насельніцтва з'яўляецца этнічнымі беларусамі (84%). Іншымі буйнымі групамі з'яўляюцца рускія – 8%, палякі – 3%, украінцы – 2% і яўрэі – 0,1%. Да груп звыш 5 тыс. чал. належаць таксама армяне, татары, цыганы, азербайджанцы і літоўцы. Для буйных этнічных груп Беларусі характэрна адсутнасць абавязковай узаемасувязі паміж этнічнасцю і вызначанай роднай мовай. Выключэнне складаюць толькі рускія, 96% якіх гавораць на рускай як на роднай. Руская мова як родная дамінуе ва ўкраінцаў і яўрэяў, а беларуская – у палякаў (гл. таксама табліцу ніжэй).[143]

*Табліца 2.*
*Найбуйнейшыя этнічныя групы па роднай мове (перапіс 2009 г.)*

| Этнічная група | Усяго | % к насельніцтву | Родная мова (% да групы) | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Сваёй «нацыянальнасці» | Беларуская | Руская |
| Беларусы | 7 957 252 | 83,7 | 60,8 | – | 37,0 |
| Рускія | 785 084 | 8,3 | 96,3 | 2,8 | – |
| Палякі | 294 549 | 3,1 | 5,4 | 58,2 | 33,9 |
| Украінцы | 158 723 | 1,7 | 29,2 | 7,9 | 61,2 |
| Яўрэі | 12 926 | 0,1 | 1,9 | 9,1 | 86,1 |
| Усё насельніцтва | **9 503 807** | 100 | 59,9 | 2,3 | 33,6 |

*Крыніца: Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь*[144]

143 Там жа. Табл. 1.2 і 5.2.

144 Там жа. Табл. 1.2.





У параўнанні з апошнім савецкім перапісам 1989 г. доля беларусаў ва ўсім насельніцтве вырасла амаль на 6%; доля рускіх зменшылася на 5% (з 13,2 да 8,3%), паменшылася таксама доля ўкраінцаў, палякаў і яўрэяў. У цэлым насельніцтва зменшылася на 647.999 чал. і 86% гэтага памяншэння прыйшлося на рускіх.[145] Гэтыя змены варта, мабыць, аднесці не толькі на міграцыю ці адмоўны прырост насельніцтва, але і на змену ідэнтычнасці.

Для ўсіх рэгіёнаў Беларусі характэрна поліэтнічнасць.[146]

Асаблівасцю сітуацыі ў Беларусі з'яўляецца вельмі нязначная доля т. зв. бачных меншасцяў. Асноўны міграцыйны абмен Беларусі адбываецца з краінамі СНД. У 2010 г. на гэтыя краіны прыйшлося 83% усіх імігрантаў (у 2000 г. – 90%).[147] У 2011 г. у Беларусі пражывала 141317 замежных грамадзян і 7397 асоб без грамадзянства. На ўліку ў органах па грамадзянстве і міграцыі былі 594 бежанцы з 12 дзяржаў (па стане на 1 студзень 2012).[148]

Паводле маніторынгу ІАЦ у 2010 г. найбольшую занепакоенасць стан «міжнацыянальных стасункаў» выклікаў толькі ў 2% рэспандэнтаў.[149] 79% рэспандэнтаў былі перакананы, што ў Беларусі няма дыскрымінацыі па «нацыянальнай» прыкмеце (у 2009 г. – 76%).[150] 94% называлі «міжнацыянальныя адносіны» ў Беларусі спакойнымі і толькі 2,4% – напружанымі. 74% рэспандэнтаў не адчувалі непрыязнасці да прадстаўнікоў іншых «нацыянальнасцяў»; 87% не дапускалі

145 Там жа. Табл. 1.2 і 5.2.

146 Там жа.

147 *Беларусь в цифрах. Статистический справочник.* Минск: Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2011. С. 25.

148 *Объединенный восемнадцатый и девятнадцатый периодический доклад Республики Беларусь о выполнении положений Международной конвенции о ликвидации всех форм расовой дискриминации*, Минск, 2012, пп. 89 и 102.

149 Гл. спасылку 76. С. 25. Дадзеныя рэгулярнага маніторынгу, які праводзіцца інфармацыйна-аналітычным цэнтрам (ІАЦ) пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 2010 г. у рамках розных замераў апытвалі ад 1500 да 2100 рэспандэнтаў ва ўзросце 18 гадоў і старэй па рэпрэзентатыўнай выбарцы.

150 Там жа. С. 71.

магчымасці ўзнікнення канфліктаў на «нацыянальнай глебе» (і дапускалі 4%).[151]

Дадзеныя маніторынгу ІАЦ 2010 г. дазваляюць меркаваць, што ў разуменні беларускага насельніцтва ў канцэпцыі «нацыі» маецца моцны грамадзянскі складнік (хоць у савецкі час «нацыя» і «народ» (акрамя «савецкага народа») традыцыйна апісваліся ў этнічных тэрмінах). Для 70% апытаных быць прадстаўніком сваёй нацыі азначала паважаць сваю краіну і свой народ. Ад трацiны да паловы рэспандэнтаў выбралі варыянт, звязаны з веданнем звычаяў і традыцый народа, гонарам за сваю нацыянальнасць і веданне гісторыі свайго народа. Варыянты «адчуваць адзінства з прадстаўнікамі нацыі» і «пражываць на пэўнай тэрыторыі» абраў кожны сёмы рэспандэнт. І толькі кожны дзясяты выбраў варыянт «размаўляць на мове сваёй нацыянальнасці».[152]

Толькі адзін удзельнік (з 13) фокус-групы студэнтаў Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта[153] (змешанага этнічнага складу) паказаў БХК, што сутыкаўся з дрэннымі адносінамі, матываванымі этнічнай прыналежнасцю. На пытанне аб тым, ці ведаюць удзельнікі людзей, якія сутыкаліся з дрэннымі адносінамі, пяць чалавек адказалі сцвярджальна (аднак падрабязнасці паведаміць не змаглі), а восем чалавек адказалі адмоўна.

***Заканадаўчыя асновы этнічнай палітыкі***

Змененая ў 1996 г. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (1994 г.) стала выкарыстоўваць паняцце «нацыянальная супольнасць» замест «нацыянальная меншасць». Аднак змяненне Канстытуцыі не прывяло да паслядоўна змены тэрміналогіі ў законах і падзаконных актах.

Вызначаючы задачы дзяржавы ў сферы этнапалітыкі, Канстытуцыя аб'яўляе забарону на стварэнне і дзейнасць палітычных партый, а таксама іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць на мэце гвалтоўнае змяненне канстытуцыйнага ладу ці вядуць прапаганду

151 Там жа. С. 72–73.

152 Там жа. С. 72.

153 Фокус-група студэнтаў Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. А. Куляшова (агульная колькасць 13 чал., узрост 18-22 гадоў), праведзена БХК 14 кастрычніка 2011 г.





вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці (арт. 5). Прамой забароны на стварэнне «этнічных партый» артыкул не ўтрымлівае. Дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцяў, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь (арт. 15). Прынцып роўнасці перад законам фармулюецца двойчы. Па-першае, як рэгуляванне адносін паміж сацыяльнымі, нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў і інтарэсаў (арт. 14). Па-другое, як агульны прынцып роўнасці індывідаў перад законам і забарона дыскрымінацыі (арт. 22).

Звяртае ўвагу тое, што ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь артыкул 50, прысвечаны этнічнай («нацыянальнай») ідэнтычнасці, ідзе пасля асобнага артыкула, які гарантуе свабоду сумлення (арт. 31), што ўскосна сведчыць пра большую «важнасць» гэтага права ў гістарычным кантэксце. Артыкул 50 прадастаўляе правы: 1) захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць; 2) адмаўляцца вызначаць і ўказваць нацыянальную прыналежнасць; 3) карыстацца роднай моваю, выбіраць мову зносін. Дзяржава праследуе па законе «абразу нацыянальнай годнасці» і гарантуе выбар мовы выхавання і навучання. Закон «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь»[154] (у рэдакцыі ад 7 мая 2007 г.) мае рамачны характар і змяшчае ўсяго 14 артыкулаў. Закон дае вызначэнне асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцяў: гэта асобы, якія стала жывуць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і маюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь, якія па свайму паходжанню, мове, культуры ці традыцыям адрозніваюцца ад асноўнага насельніцтва рэспублікі (арт. 1).[155] Артыкулы 2 і 5 Закона пацвярджаюць права свабоднай самаідэнтыфікацыі. Артыкул 4 забараняе прамое ці ўскоснае абмежаванне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь за іх прыналежнасць да нацыянальнай меншасці, а таксама спробы асіміляцыі супраць іх волі.

154 Закон Республики Беларусь от 11 ноября 1992 г. № 1926–XII «О национальных меньшинствах в Республике Беларусь».

155 Данное определение лиц, принадлежащих к национальным меньшинствам, схоже с тем, что дано в Конвенции СНГ об обеспечении прав лиц, принадлежащих к национальным меньшинствам от 21 октября 1994 г. (ст. 1). Однако в конвенции также упомянут такой отличительный признак, как «религия».

Такім чынам, Беларусь выключае нядаўнія імігранцкія супольнасці з-пад дзеяння механізмаў абароны нацыянальных меншасцяў, што патэнцыйна можа ствараць праблемныя сітуацыі. Аднак згодна з артыкулам 26 Закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь»[156]: «Гарантуецца захаванне і развіццё культуры на мовах іншых народаў, прадстаўнікі якіх жывуць у рэспубліцы». Згодна з артыкулам 15 Закона «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь» замежнікі маюць права на захаванне і развіццё сваёй нацыянальнай мовы і культуры, захаванне нацыянальных традыцый і звычаяў у адпаведнасці з заканадаўствам. Паводле афіцыйнага даклада, «правы прадстаўнікоў беларускага, рускага, украінскага, польскага, татарскага, рома і іншых народаў, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі на працягу некалькіх стагоддзяў, не адрозніваюцца ад правоў мігрантаў апошніх гадоў».[157]

Артыкул 6 Закона аб нацыянальных меншасцях гарантуе грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія адносяць сябе да нацыянальных меншасцяў, роўныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя правы і свабоды, якія ажыццяўляюцца ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

У савецкіх агульнаграмадзянскіх пашпартах у Беларусі былі абавязковыя адзнакі аб «нацыянальнасці» (этнічнасці). У цяперашні час такія адзнакі ўносяцца ў пашпарт на падставе заявы асобы, якая дасягнула чатырнаццацігадовага ўзросту, пры прад'яўленні ім пасведчання аб нараджэнні з указаннем «нацыянальнасці» бацькоў (п. 22 Палажэння «Аб дакументах, якія сведчаць асобу»[158]).

Пытанні, звязаныя з этнапалітыкай, толькі нязначна згаданыя ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2010 г.). У гэтым дакуменце пастулюецца адсутнасць асновы для этнічнай, канфесійнай, расавай, палітычнай дыскрымінацыі і нецярпімасці, а іх асобныя праявы «носяць несістэмны і адзінкавы характар» (п. 19). У якасці

156 Закон Республики Беларусь от 26 января 1990 г. № 3094-XI «О языках в Республике Беларусь».

157 Гл. спасылку 148, п. 23.

158 Указ Президента Республики Беларусь от 3 июня 2008 г. № 294 «О документировании населения Республики Беларусь», Положения «О документах, удостоверяющих личность».





ўнутраных крыніц пагроз нацыянальнай бяспекі ў палітычнай сферы названыя

> *фарміраванне, пранікненне або распаўсюджванне ідэалогіі экстрэмізму, сепаратызму, нацыянальнай, расавай і рэлігійнай нецярпімасці, узнікненне альбо незаконная дзейнасць арганізацый, груповак, пэўных асоб, якія прытрымліваюцца і распаўсюджваюць названыя погляды.*[159]

Як і ў выпадку рэлігійнай палітыкі,

> *удасканаленне дзяржаўнай палітыкі ў галіне міжнацыянальных і міжканфесійных адносін будзе заключацца ў забеспячэнні ўмоў для ўмацавання адзінай супольнасці «беларускі народ», выхаванні павагі да іншых нацыянальнасцяў, рэлігій і культур, спыненні любых спроб распальвання нацыянальнай і рэлігійнай варожасці.*[160]

### ***Выкарыстанне моў нацыянальных меншасцяў***

Пытанне аб статусе беларускай і рускай мовы (дзяржаўныя мовы Рэспублікі Беларусь) разгледжаны ў наступным раздзеле дадзенага даклада. Непасрэдна зараз мы нададзім увагу прававому рэгуляванню моўных правоў асоб, якія адносяцца да нацыянальных (этнічных) меншасцяў, і звязаным з гэтым рэгуляваннем прыкладам няроўнасці.

Закон «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» не рэгламентуе ўжывання моў у неафіцыйных зносінах, у зносінах членаў працоўных калектываў паміж сабой (арт. 2). Закон паказвае на наступныя магчымасці выкарыстання іншых моў, акрамя беларускай і рускай:

> *Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права карыстацца іх нацыянальнай мовай. Ім гаран-*

159 Концепция национальной безопасности Республики Беларусь (п. 29).

160 Там жа, п. 52.

*туецца таксама права звяртацца ў дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання, на прадпрыемствы, ва ўстановы, арганізацыі і грамадскія аб'яднанні на беларускай, рускай або іншай прымальнай для бакоў мове. Рашэнне па сутнасці звароту афармляецца на беларускай або рускай мове.*[161]

Крытэрый «прымальнасці», аднак, у законе не ўстаноўлены.

Акты органаў мясцовага кіравання і самакіравання могуць «пры неабходнасці» публікавацца і на нацыянальнай мове большасці насельніцтва той ці іншай мясцовасці (арт. 7).

Згодна з артыкулам 32 тапонімы даюцца, а картаграфічныя выданні рыхтуюцца і друкуюцца на беларускай або рускай мове. Артыкул 33 Закона спасылаецца толькі на «беларускія (рускія) імёны».

Такім чынам, Закон, па сутнасці, не гарантуе выкарыстанне іншай мовы, чым беларуская або руская, у кантактах з афіцыйнымі асобамі, у афіцыйным справаводстве і тапаніміцы, нават у месцах традыцыйнага і кампактнага пражывання меншасцяў.

Артыкулы 14 і 15 Закона гарантуюць права выступаць на роднай мове праз перакладчыка ў судах і на разгляд спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях. Юрыдычная (прававая) дапамога можа аказвацца «на прымальнай для бакоў мове» (арт. 18). Артыкул 11 Закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» устанаўлівае, што працоўнымі мовамі з'ездаў, сесій, канферэнцый, пленумаў, пасяджэнняў, нарад, іншых сходаў з'яўляюцца дзяржаўная мова / мовы (і любая мова, дапушчальная на міжнародных мерапрыемствах). І хоць удзельнікам гарантуецца права выбіраць мову выступленняў, павінен быць забяспечаны пераклад на рабочую мову. Беларускі закон не забараняе выкарыстання недзяржаўных моў у СМІ (арт. 27), а таксама на транспарце, у гандлі, у сферы медыцынскага і по бытавога абслугоўвання (арт. 13), але тэксты афіцыйных аб'яў, паведамленняў, плакатаў, афіш, рэклам і г. д. павінны выконвацца на беларускай або рускай мове (арт. 29).

161 Закон Республики Беларусь от 26 января 1990 г. № 3094–XI «О языках в Республике Беларусь» (ст. 3).





Такім чынам, за межамі СМІ абмяжоўваецца выкарыстанне моў меншасцяў у рэкламе, публічных аб'явах і т. п. прыватнага характару і абмяжоўваецца выкарыстанне такіх моў на публічных мерапрыемствах. Забарона на размяшчэнне прыватнай рэкламы і іншай інфармацыі на мовах нацыянальных меншасцяў ёсць відавочнае парушэнне міжнародных абавязацельстваў Беларусі: гэта можа разглядацца як недапушчальнае абмежаванне на свабоду выказвання і свабоду распаўсюджвання інфармацыі.[162]

У цэлым, беларускае моўнае заканадаўства ў дачыненні да выкарыстання моў нацыянальных меншасцяў у прыватнай сферы мае стрымана абмежавальны характар і па змесце нагадвае аналагічныя законы, прынятыя ў іншых рэспубліках СССР у канцы 1980-х гг.[163] У той жа час названыя абмежаванні маюць, мабыць, дэкларатыўны характар. Адзіны «моўны» артыкул Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях (КаАП) (арт. 9.22) прадугледжвае пакаранне толькі за публічную абразу, ганьбаванне дзяржаўных і іншых нацыянальных моў, стварэнне перашкод і абмежаванняў у карыстанні імі, дэклараванне варожасці на моўнай глебе. Пры гэтым дадзены артыкул не выкарыстоўваўся ні разу.[164] Для параўнання: КаАП Латвіі[165] прадугледжвае 14 відаў парушэнняў моўнага заканадаўства, і адпаведныя органы актыўна ўжываюць яго палажэнні на практыцы.

162 Гл., напр., п. 12 Пояснительной записки к Ословским рекомендациям о правах национальных меньшинств в области языка от 1 февраля 1998 г.

163 Об опыте Эстонии и Латвии см.: Kochenov D., Poleshchuk V. and Dimitrovs A. “Do Professional Linguistic Requirements Discriminate? – A Legal Analysis: Estonia and Latvia in the Spotlight”, *European Yearbook of Minority Issues*, Vol. 10.

164 Гл. спасылку 148, п. 52.

165 Latvijas administratīvo pārkāpumu kodekss, Ziņotājs, № 51, 20.12.1984. Ёсць на: http://www.likumi.lv/doc.php?id=89648.

### *Адукацыя на мовах нацыянальных меншасцяў*

Артыкулы Закона «Аб мовах Рэспублікі Беларусь», якія датычацца адукацыі нацыянальных меншасцяў, былі ўдакладнены з прыняццем ў ліпені 2012 г. спецыяльных паправак. Артыкул 21 Закона прадугледжвае права асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцяў і якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, на атрыманне адукацыі на роднай мове ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам. У адпаведнасці з пажаданнямі выхаванцаў, вучняў і іх законных прадстаўнікоў па рашэнню мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, узгодненаму з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, могуць стварацца ўстановы дашкольнай, агульнай сярэдняй адукацыі або групы ва ўстановах дашкольнай адукацыі, класы, групы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на мове нацыянальнай меншасці або вывучаецца мова нацыянальнай меншасці. Больш за тое, навучанне і выхаванне пры атрыманні дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі «пры наяўнасці ўмоў і па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі» могуць ажыццяўляцца на замежнай мове (арт. 22). Пры гэтым навучанне і выхаванне ў прафесійна-тэхнічных вучылішчах, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца на беларускай і (або) рускай мовах (арт. 23). Гэтыя палажэнні паўтораны ў Кодэксе аб адукацыі (арт. 90).[166]

Такім чынам, права навучацца на мове нацыянальнай меншасці не з'яўляецца правам, але прадугледжанай законам магчымасцю, якая залежыць ад «пажаданняў грамадзян» і рашэння органаў улады. Пры гэтым у законе не прапісаны нормы, якія рэгламентуюць парадак уліку чыноўнікамі «пажаданняў грамадзян» па гэтым пытанні. Неабгрунтаваныя абмежаванні на выкарыстанне любых моў, акрамя дзяржаўных, на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі як у дзяржаўных, так і ў прыватных школах маюць дыскрымінацыйны характар безадносна ад стаўлення да гэтых норм саміх прадстаўнікоў меншасцяў.

166 Кодекс Республики Беларусь об образовании от 13 января 2011 г. № 243–З.





Паводле дадзеных маніторынгу спецыялістаў,

> *у многіх навучальных установах Беларусі ў цяперашні час вывучаюцца ў розных формах іўрыт, польская, літоўская, новагрэцкая, украінская і іншыя мовы. Дзве агульнаадукацыйныя сярэднія школы ў краіне функцыянуюць цалкам на польскай мове. Грамадскімі аб'яднаннямі арганізаваны каля 65 школ выхаднога дня, у якіх родную мову, гісторыю і культуру вывучаюць больш за 5 тыс. чал. (азербайджанцы, армяне, афганцы, грузіны, грэкі, яўрэі, карэйцы, літоўцы, латышы, малдаване, немцы, палякі, татары, украінцы). Універсітэты ў Брэсце, Гродне, Мінску рыхтуюць кадры выкладчыкаў літоўскай, польскай, украінскай моў. Польская мова вывучаецца ў дзесяці ВНУ ў сталіцы і ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі... Выдаткі на дзеючы ў навучальных установах этнакампанент аплачваюцца з бюджэту краіны па артыкуле «Адукацыя».*[167]

Акрамя сярэдніх школ на польскай мове ў Беларусі дзве школы цалкам функцыянуюць таксама на літоўскай мове (у в. Пеляса і ў в. Рымдзюны).

### *Польская меншасць*

*Гістарычная даведка*. На тэрыторыі Беларусі польская мова была вельмі распаўсюджана з часоў адзінай польска-літоўскай дзяржавы, у склад якой уваходзіла і сучасная Беларусь. Добра вядома, што ў часы Расійскай імперыі ўрад лічыў патрэбным змагацца з польскім і каталіцкім уплывам. Адным з аспектаў гэтай палітыкі была шматбаковая падтрымка праваслаўнай царквы. Падазронасць у дачыненні да польскай меншасці пасля Савецка-польскай вайны 1919-1920 гг. пра-

167 Осипов А. «Этнокультурная политика в Беларуси: сопоставление с международным контекстом» // *Вопрос меньшинств в Республике Беларусь, Европе и мире. Сборник материалов*, Минск: Медисонт, 2012. С. 193.

яўлялі і ўлады БССР, хоць і праводзілі спробы саветызацыі польскага насельніцтва, якія, на думку арганізатараў, спрыялі б удзелу палякаў у грамадскім і палітычным жыцці.[168] У канцы 1930-х гг. у БССР дзясяткі тысяч палякаў былі высланы з прымежных альбо стратэгічна важных тэрыторый і / або рэпрэсаваныя. Антыпольскія рэпрэсіі ахапілі таксама частку асоб, якія раней кваліфікаваліся ўладамі як «беларусы-каталікі». Рэпрэсіі закранулі таксама, напрыклад, этнічных немцаў і латышоў.[169]

У пасляваенныя гады па дадзеных перапісаў доля палякаў у насельніцтве Беларусі вагалася ў межах 2,7–3,4% усяго насельніцтва.[170]

*Цяперашні час.* Паводле дадзеных перапісу 2009 г., палякі складаюць 3,1% насельніцтва (295 тыс. чал.) і большая іх частка (78%) сканцэнтраваная ў заходняй частцы краіны ў Гродзенскай вобласці, якая мяжуе з Польшчай,[171] дзе польская меншасць мае параўнальна нізкі для Беларусі ўзровень урбанізацыі – 61,4% (у цэлым па краіне 88,8%). Для параўнання: у гарадах жыве 73,1% этнічных беларусаў, 84,9% рускіх, 77,2% украінцаў і 97,6% яўрэяў.[172]

Паводле перапісу 2009 г., польскую мову назвалі ў якасці роднай 5,4% палякаў, у якасці асноўнай мовы хатняга ўжытку 1,3% і яшчэ 15% валодаюць ёй як замежнай.[173] Такім чынам, польскай мовай валодаў амаль кожны пяты паляк Беларусі. Асноўнай мовай хатняга ўжытку для 50,9% палякаў была руская, а для 40,9% – беларуская мова.[174] Аднак беларускую мову ў якасці роднай назвалі больш за палову ўсіх палякаў.[175]

168 Жук В. «Участие поляков в общественно-политической жизни Советской Белоруссии в 1921–1929 гг.» // *Беларусь у ХХ стагоддзі*, 2005, Вып. 3. Ёсць на: www.homoliber.org/ru/xx/xx030109.html.

169 Раманава І. «Рэпрэсіі супраць нацыянальных меншасцей Беларусі ў міжваенны перыяд» // *Беларусь у ХХ стагоддзі*, 2002, Вып. 1. Ёсць на: www.homoliber.org/ru/xx/ xx010118.html.

170 Гл. спасылку 142. Табл. 1.3.

171 Там жа. Табл. 1.2.

172 Там жа. Табл. 1.2 і 1.3.

173 Там жа. Табл. 5.2, 5.5 і 5.8.

174 Там жа. Табл. 5.5.





Асноўнай каардынуючай арганізацыяй польскай нацыянальнай меншасці з'яўляецца Саюз палякаў Беларусі (СПБ). На польскай мове выдаюцца шэсць друкаваных СМІ, у тым ліку друкаваны орган СПБ – штотыднёвая газета «Głos znad Niemna» з накладам 2260 экз.[176]

Сёння зноў узрасла падазронасць уладаў у дачыненні да актывістаў з польскай меншасці, што звязана, перш за ўсё, з канфліктнымі сітуацыямі вакол польскіх грамадскіх аб'яднанняў (гл. ніжэй). Праблемы, з якімі сутыкаецца рымска-каталіцкая царква ў Беларусі, у тым ліку ў кантэксце польскай меншасці, былі прадстаўлены вышэй, у раздзеле даклада, прысвечаным рэлігійнаму жыццю.

Становішча польскай нацыянальнай меншасці як самай буйной пасля рускай было аб'ектам пільнай увагі ў Беларусі і за мяжой, у прыватнасці ў Польскай Рэспубліцы (і дзякуючы ёй у Еўрасаюзе). Паміж Беларуссю і Польшчай ў 1992 г. быў заключаны дагавор аб добрасуседскіх адносінах і супрацоўніцтве, якая ўключала асобныя палажэнні, прысвечаныя абароне нацыянальных меншасцяў.[177] У апошнія гады Польшча выступала ў ролі крытыка палітыкі беларускіх уладаў у дачыненні да польскай меншасці. Найбольшыя супярэчнасці ва ўзаемаадносінах дзвюх краін тычыліся сітуацыі вакол СПБ і т. зв. Карта паляка (гл. ніжэй).

*Дыскрымінацыйнае стаўленне ўладаў да грамадскіх арганізацый палякаў*. Беларуска-польскія адносіны абвастрыліся ў 2005 г. пасля расколу ў Саюзе палякаў Беларусі. Павышаную цікавасць да ўнутраных спраў СПБ узнікла з-за палітычнай дзейнасці шэрагу яго членаў, якія падтрымліваюць цесныя сувязі з беларускай апазіцыяй. Улады Беларусі ў асобе Міністэрства юстыцыі не прызналі выбары галоўнага савета СПБ, якія прайшлі ў сакавіку 2005 г. у Гродне. У траўні

175 Там жа. Табл. 5.2.

176 Гл. спасылку 167. С. 193.

177 Там жа. С. 181.

таго ж года з Беларусі быў высланы польскі дыпламат, што прывяло пасля да высылкі беларускіх і ў адказ – да высылкі польскіх дыпламатаў. На паўторным з'ездзе ў жніўні 2005 г. у Ваўкавыску было абрана кіраўніцтва СПБ, прызнанае беларускімі (але не польскімі) уладамі.[178]

Прадстаўляючы аргументы ўсіх зацікаўленых бакоў, І. Міхеева адзначыла, што для афіцыйнай Варшавы, якую ў дадзеным пытанні падтрымалі структуры Еўрасаюза, сітуацыя, якая склалася вакол СПБ, сведчыць аб прыгнёце нацыянальнай меншасці і найбуйнейшай апазіцыйнай сілы. Афіцыйны Мінск, наадварот, указваў на ўмяшальніцтва ў свае ўнутраныя справы і ўспрымаў дадзеную праблему як штучную падставу, што выкарыстоўваецца Польшчай для прамога ціску на Беларусь. Пры гэтым не выклікае сумненняў, што беларускія ўлады засакрэцілі праблему СПБ, бачачы ў магчымых дзеяннях «непрызнанага» імі кіраўніцтва СПБ пагрозу нацыянальнай бяспекі. У практычным плане сітуацыя вакол СПБ удала выкарыстоўвалася беларускімі ўладамі для ўзмацнення ў грамадстве антызаходніх настрояў.[179]

На жаль, жорсткае супрацьстаянне паміж афіцыйным Мінскам і Варшавай па пытанні СПБ паставіла ў цяжкае становішча актывістаў мясцовай польскай меншасці. Як было паказана ў раздзеле даклада, прысвечаным рэлігійнаму жыццю, жорсткае заканадаўчае рэгуляванне ў Беларусі крыміналізуе любую дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі (арт. 193-1 КК), ад чаго непасрэдна пакутуюць лідары «незарэгістраванага» СПБ. У той жа час, па паведамленні беларускага Міністэрства замежных спраў (МЗС), многія грамадзяне Беларусі польскага паходжання ўнесены Польшчай у «чорныя спісы» асобаў, якім забаронены ўезд у Шэнгенскую зону.[180] Сярод такіх асоб шмат актывістаў, якія супрацоўнічаюць з «зарэгістраваным» СПБ.

178 Гурко А., Верещагина А. «Белоруссия» // Тишков, В., Филиппова, Е. (ред.), *Этническая ситуация и конфликты в государствах СНГ и Балтии. Ежегодный доклад 2005*, М.: УОП ИЭА РАН, 2006. С. 372.

179 Михеева И. *«Польский вопрос» в Беларуси?»*. Ёсць на: http://cscr.tk/?p=308.

180 Гурко А., Верещагина А. «Белоруссия» // Тишков В., Степанов В. (ред.) *Этнополитическая ситуация в России и сопредельных государствах в 2010 году. Ежегодный доклад*, М.: ИЭА РАН, 2011. С. 458.





Паводле экспертнай ацэнкі К. Клысінскага, падзеі вакол СПБ уяўляюць сабой не рэпрэсіі на нацыянальнай (этнічнай) глебе, але дзеянні, накіраваныя супраць найбуйнейшай беларускай грамадскай арганізацыі.[181] В. Фрыц асабліва адзначыла фактар украінскай «аранжавай рэвалюцыі» 2004 г., наступствам якой стала асабліва насцярожанае стаўленне беларускіх уладаў да грамадскіх арганізацый, што фінансуюцца з-за мяжы (Польшча дазваляла сабе публічна падтрымліваць ідэі змены рэжыму ў Беларусі).[182] Але ў любым выпадку, падзеі вакол СПБ выяўляюць усю ўразлівасць грамадскіх арганізацый беларускіх меншасцяў у выпадку ўмяшання ў іх унутраныя справы як мясцовых уладаў, так і ўладаў краіны паходжання. Таксама менавіта лідэрам польскай меншасці давялося сутыкнуцца з неабгрунтаванымі абмежаваннямі іх права на трансгранічнае супрацоўніцтва, прычым з боку як беларускіх, так і польскіх уладаў.

*Карта паляка*. У красавіку 2011 г. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь сфармуляваў сваю пазіцыю[183] па Закону Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка»,[184] прыняцце якога стала яшчэ адным з фактараў ускладнення і так напружаных адносін паміж Польшчай і Беларуссю. Мэтай закона, згодна з прэамбулай, з'яўляецца ўмацаванне сувязяў, якія аб'ядноўваюць палякаў на ўсходзе з Радзімай, а таксама падтрымка іх намаганняў па захаванню польскай мовы і развіццю нацыянальных традыцый. Уладальнікі карт, выдадзеных консульскімі ўстановамі па прадстаўленні ўпаўнаважаных грамадскіх арганізацый, атрымліваюць ільготы, якія тычацца атрымання доўгатэрміновай польскай візы, працаўладкавання, ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, атрымання розных формаў адукацыі, карыстання медыцынскім абслугоўваннем.

181 Клысінскі (Klysinski) К. «Польска-беларускія стасункі: працяг прагматызму» // *Белорусский ежегодник 2009*, Минск: Белорусский институт стратегических исследований, Сайт экспертного сообщества Беларуси «Наше мнение», 2010. С. 87.

182 Fritz V. *State-Building: A Comparative Study of Ukraine, Lithuania, Belarus, and Russia,* Budapest, New York: Central European University Press, 2007, p. 222.

183 Решение Конституционного Суда Республики Беларусь от 7 апреля 2011 г. № П–258/2011.

184 Ustawa z dnia 7 września 2007 r. o Karcie Polaka. Dzennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej z 2007 r. Nr 180, poz. 1280, z 2008 r. Nr 52, poz. 305, Nr 214, poz. 1348, Nr 216, poz. 1367.

Варта адзначыць, што Венецыянская камісія[185] ў дакладзе, прысвечаным прывілеяваным адносінам да нацыянальных меншасцяў з боку дзяржаў паходжання (kin-states), прыйшла, акрамя іншага, да высновы, што аднабаковыя меры ў дачыненні да такіх меншасцяў, якія пакуль нельга разглядаць як міжнародную практыку, легітымныя толькі пры выкананні прынцыпаў міжнароднага права, а таксама пры павазе асноўных правоў і свабод чалавека, і асабліва патрабавання забароны дыскрымінацыі.[186]

Канстытуцыйны Суд Беларусі палічыў, што «прыняцце дзяржавай паходжання заканадаўчых актаў, што ўстанаўліваюць пэўныя прывілеі для суайчыннікаў, якія пражываюць за мяжой, адпавядае нормам міжнароднага права і з'яўляецца дастаткова распаўсюджанай міжнароднай практыкай. Аднак пры гэтым магчымасць устанаўлення дзяржавай пэўных прывілеяў і льгот па прыкмеце этнічнага паходжання для грамадзян замежных дзяржаў звязваецца з неабходнасцю захавання прынцыпаў суверэннай роўнасці дзяржаў, добрасумленнага выканання міжнародных абавязацельстваў, захавання дружалюбных адносін паміж дзяржавамі, павагі правоў і асноўных свабод чалавека, забароны дыскрымінацыі».[187] Канстытуцыйны Суд прыйшоў да высновы, што польскі Закон закранае інтарэсы Рэспублікі Беларусь і яго асобныя нормы не адпавядаюць некаторым агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права. У нашы задачы не ўваходзіць падрабязны разбор аргументаў беларускіх суддзяў, акрамя ўласна пытанняў дыскрымінацыі (гл. ніжэй).

Сапраўды, пад дзеянне польскага Закона фактычна падпадаюць людзі, якія падтрымліваюць актыўныя сувязі з Польшчай, выказваючы цікавасць да польскай мовы і культуры, альбо якія звязаны з польскай меншасцю. Натуральна гэта будуць у пераважнай большасці этнічныя палякі Беларусі і члены іх сем'яў. Уяўляецца абгрунтаваней крытыка беларускім Канстытуцыйным Судом таго, што польскі Закон закладвае магчымасць дыскрымінацыі прадстаўнікоў пэўнай групы грамадзян Беларусі на падставе іх палітычных поглядаў і грамадскай дзейнасці. Па Законе Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка» немагчымы доступ да статусу для тых, чые паводзіны былі «шкоднымі для базавых інтарэсаў Рэспублікі Польшча» (п. 6 арт. 19), а адным з падстаў для анулявання статусу – паводзіны, «якія ганяць Польшчу ці палякаў» (п. 1 ч. 1 арт. 20). Крытэрыі сфармуляваны настолькі расплывіста, што гэта дапускае магчымасць іх суб'ектыўнага пашыральнага тлумачэння, пры гэтым гэтыя крытэрыі маюць відавочную адсылку да палітычных і іншых перакананняў «ненадзейнага» просьбіта або ўладальніка статусу. Таксама адзначым, што дзеянне польскага Закона экстэрытарыяльна распаўсюджваецца не толькі на беларускіх грамадзян, але на ўсіх асоб, якія знаходзяцца пад беларускай юрысдыкцыяй.

185 Афіцыйная назва: Еўрапейская камісія за дэмакратыю праз права (European Commission for Democracy through Law).

186 European Commission for Democracy through Law (Venice Commission). *Report on the Preferential Treatment of National Minorities by Their Kin-State*, Strasbourg, 22 October 2001, CDLINF(2001)19, p. 22.

187 Решение Конституционного Суда Республики Беларусь от 7 апреля 2011 г. № П–258/2011.

**Прыклад 5.**
**Вытрымка з рашэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 7 красавіка 2011 г.**
**«Аб пазіцыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь па Закону Рэспублікі Польшча "Аб Карце паляка"»**

У Законе адным з крытэрыяў, якім павінны адпавядаць асобы, што прэтэндуюць на атрыманне Карты паляка, устаноўлена пэўная ўмова – «актыўны ўдзел у дзейнасці на карысць польскай мовы і польскай культуры ці польскай нацыянальнай меншасці на працягу не менш трох апошніх гадоў», пацверджаная адпаведнай даведкай (пункт 3 часткі 1 артыкула 2); адным з падстаў адмовы ў выдачы Карты паляка – паводзіны заяўніка ў шкоду базавым інтарэсам Рэспублікі Польшча (пункт 6 артыкула 19); адной з падстаў анулявання Карты паляка – паводзіны ўладальніка Карты паляка, якія ганяць Польшчу ці палякаў (пункт 1 часткі 1 артыкула 20).

Такім чынам, магчымасць выдачы, адмовы ў выдачы або анулявання Карты паляка на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь звязана з неабходнасцю пэўных паводзінаў (выканання фактычна пэўных абавязкаў) грамадзян Рэспублікі Беларусь, прычым не толькі польскай нацыянальнасці, перад Рэспублікай Польшча, што не адпавядае агульнапрызнаным прынцыпам павагі правоў чалавека і яго асноўных свабод і недыскрымінацыі. Наяўнасць у Законе ўказаных норм артыкулаў 2, 19 і 20 стварае перадумовы для дыскрымінацыйных праяў на практыцы, калі адрозненні ў падыходах да грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія жадаюць атрымаць Карту паляка, звязваюцца з паводзінамі грамадзяніна, яго жыццёвымі поглядамі і грамадзянскай пазіцыяй, што таксама ў пэўнай меры несумяшчальна і з абавязкамі грамадзян Рэспублікі Беларусь, у тым ліку асоб, што знаходзяцца на дзяржаўнай службе.

Праводзячы пэўную палітыку ў дачыненні «суайчыннікаў», Польшча вольная ўстанаўліваць крытэрыі для доступу да пэўных выгод і прывілеяў. Аднак у практычным плане большасць гэтых магчымасцяў рэалізуецца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, якая абавязаная забяспечваць яе на недыскрымінацыйнай аснове: артыкул 26 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах гарантуе абарону супраць любога роду дыскрымінацыі па палітычных і іншых перакананнях. У дачыненні да асоб, якія знаходзяцца пад яе юрысдыкцыяй, падобныя абавязкі па абароне ад дыскрымінацыі па палітычных і іншых перакананняў маюцца і ў Рэспубліцы Беларусь. Аднак з улікам прынцыпу суверэннай роўнасці дзяржаў яе магчымасці тут будуць вельмі абмежаваныя. Мабыць гэта тлумачыць, чаму разам з выкарыстаннем дыпламатычных каналаў беларускія ўлады разлічвалі на тое, што абгрунтаванае меркаванне членаў Канстытуцыйнага Суда зможа паўплываць на пазіцыю Рэспублікі Польшча.

*Адукацыя на польскай мове.* Школьная адукацыя на мовах меншасцяў у Беларусі даецца на польскай мове і (для значна меншага ліку навучэнцаў) на літоўскай мове. Найбуйнейшая руская меншасць не адчувае складанасцяў з доступам да адукацыі на роднай мове, паколькі руская мова як дзяржаўная выкарыстоўваецца на ўсіх ступенях адукацыі ў Беларусі.

Апошняя польская школа ў Беларускай ССР была зачынена ў 1948 г., а аднаўленне польскай школьнай адукацыі пачалося ў канцы 1980-х гг.[188] У 2005 г. у Беларусі функцыянавалі дзве школы з навучаннем на польскай мове (у Гродне і Ваўкавыску), а ў пяці школах у Мінску, Брэсце, Гродне былі класы з польскай мовай навучання. Польскую мову вывучалі больш за 22 тыс. чал., з іх у дзяржаўных школьных і дашкольных установах – больш за 12 тыс. чал.[189] Польскія сярэднія школы працуюць у межах дзяржаўнай сістэмы адукацыі Беларусі. Усе дысцыпліны ў іх выкладаюцца на польскай мове, за выключэннем беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, гісторыі і геаграфіі Беларусі.[190]

Цікавасць да вывучэння польскай мовы адчуваюць не толькі асобы польскага этнічнага паходжання, але і іншыя жыхары Беларусі, за-

188 Колоцей М., Улейчик Н. «Польское национальное образование на Гродненщине в 1990 – начале 2000-х годов: достижения, проблемы, перспективы» // *Працэсы ўрбанізацыі ў Беларусі: XIX – пачатак XXI ст. Зборнік навуковых артыкулаў*, Гродна: ГрДУ імя Я.Купалы, 2010. С. 341.

189 Там жа. С. 342.

190 Там жа. С. 343.

цікаўленыя ў атрыманні адукацыі, у працаўладкаванні або прадпрымальніцкай дзейнасці ў Польшчы. Польская мова вывучаецца ў дзесяці ВНУ ў сталіцы і ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі. У сямі ВНУ Беларусі ёсць кафедры польскай філалогіі (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт і інш.). Гродзенскі ўніверсітэт з 1994 г. падрыхтаваў 451 настаўніка польскай мовы і літаратуры.[191] Аднак у апошнія гады на фоне эканамічнага крызісу зацікаўленасць жыхароў Беларусі ў атрыманні вышэйшай адукацыі ў Польшчы панізілася. Эксперты таксама адзначаюць, што, напрыклад, у в. Сапоцкін, дзе 80% насельніцтва складаюць палякі, у 1997-1998 гг. набору ў першыя класы з польскай мовай навучання не было.[192]

У практычным плане абмежаваныя магчымасці грамадзянскай супольнасці ўплываць на дзейнасць беларускіх уладаў у тым, што датычыцца прадастаўлення адукацыі на мовах нацыянальных меншасцяў. Пытанне аб мове навучання ў школе, па сутнасці, вырашаецца чыноўнікамі па сваім меркаванні (гл. вышэй), што робіць гэтую працэдуру залежнай ад пабочных абставінаў. Гэта абцяжарвае недыскрымінацыйны доступ да адукацыі на мовах меншасцяў, нават калі такая магчымасць прадугледжана заканадаўствам, а прадстаўнікі меншасцяў выказалі патрэбу ў такім навучанні. Так, спробы пашырыць сетку польскіх школ у Беларусі, якія рабіліся раней грамадскімі актывістамі, былі беспаспяховымі.[193] Прычынай гэтага можа быць і празмерная палітызаванасць пытання аб польскай меншасці ў Беларусі.

На гэтым фоне зразумела, чаму прадстаўнікі польскай меншасці могуць вельмі недаверліва ставіцца да любых змен у сучасных польскіх школах і бачаць у дзеяннях уладаў патэнцыйную пагрозу для захавання польскай адукацыі ў Беларусі.

191 Михеева И. *Существует ли «польский вопрос» в современной Беларуси?* Неопубликованная рукопись.

192 Гл. спасылку 188. С. 345.

193 Ulasiuk I. *Language Policies and Law in Education in Post-Soviet Belarus*, ECMI Working Paper No. 50, September 2011, Flensburg: ECMI, 2011, P. 7. Каментуючы журналістцы сцвярджэнне пра недахоп цікавасці да навучання ў польскіх школах Беларусі, пасол Рэспублікі Польшча Л. Шарэпка сказаў: "Я сутыкаюся з іншай сітуацыяй, калі людзі кажуць, што школы або класы немагчыма адкрыць з-за нязгоды мясцовых уладаў...». Калинкина С. «Лешек Шерепка: «Беларусь теряет время»», *Народная воля*, 22 ноября 2011 г. Ёсць на: http://nv-online.info.





Напрыклад, у 2012 г. абвастрылася сітуацыя вакол сярэдняй школы № 36 у Гродне (функцыянуе як агульнаадукацыйная школа на польскай мове з верасня 1996 г.).[194] Фінансаванне будаўніцтва гродзенскай школы вялося польскім бокам, аднак яе ўтрыманне забяспечвалася за кошт беларускіх бюджэтных сродкаў. У 2012 г. заклапочанасць мясцовай польскай грамадскасці і нават акцыі пратэсту выклікалі планы размяшчэння ў польскай школе класаў пачатковай школы з рускай мовай навучання. Прадстаўнік «незарэгістраванага» СПБ журналіст А. Пачобут ад сваёй арганізацыі выказаў занепакоенасць планамі па размяшчэнні рускамоўных класаў у школе, якая адзіная ў Гродне дае магчымасць прайсці поўны курс навучання на польскай мове. На думку А. Пачобута, сітуацыю з польскай школай трэба разглядаць у кантэксце негатыўнага стаўлення Беларусі да таго, што нацыянальныя меншасці хочуць вывучаць родную мову і навучацца на роднай мове; паводле беларуска-польскага пагаднення школа павінна выкарыстоўвацца толькі для навучання на польскай мове. Аднак па заяве прадстаўніка мясцовых уладаў, плануецца не адкрыццё ў школе № 36 рускіх класаў, а размяшчэнне там на ўмовах арэнды двух класаў суседняй школы, якая працуе ў рэжыме перагрузкі.[195]

### *Яўрэйская меншасць*

*Гістарычная даведка.* Яўрэйская меншасць пачала актыўна сяліцца на тэрыторыі сучаснай Беларусі не пазней за XIV ст.[196] Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) падданымі Расійскай імперыі сталі каля 200 тыс. яўрэяў (людзей іўдзейскага веравызнання), якія пражывалі ва Усходняй Беларусі і Латвіі. За яўрэямі было прызнана права вызнаваць сваю рэлігію, права ўласнасці, унутрана супольнае самакіраванне (кагал), якое выконвала фіскальныя і судовыя функцыі, а таксама кантралявала яўрэйскія рэлігійныя школы.[197]

194 Гл.: Средняя школа № 36 г. Гродно с польским языком обучения. Ёсць на: http://sch36.grodno.unibel.by.

195 Навіны. «Польская школа в Гродно сохранит свой статус, утверждают в районном отделе образования», *Naviny.by*, 25 мая 2012 г. Ёсць на: http://naviny.by.

196 «Белоруссия» // *Электронная еврейская энциклопедия.* Ёсць на: http://www.eleven. co.il/article/10487.

197 Вихнович В. «Иудаизм» // *БРЭ*, Т. «Россия», М.: БРЭ, 2004. С. 237.

Пры імператрыцы Кацярыне II (гады праўлення 1762-1796 гг.) яўрэі атрымалі права выбіраць і быць выбранымі ў органы гарадскога самакіравання. Аднак асаблівым указам імператрыцы месцам для магчымага паселішча яўрэяў была вызначана Беларусь і Наварасійскі край (у асноўным, поўдзень сучаснай Украіны і Расіі), што стала пачаткам рысы аселасці;[198] пасля другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай[199] да рысы аселасці былі далучаны ўсе новыя тэрыторыі. Прыгоннае права на яўрэяў не распаўсюджвалася, г. зн. сярод іх не было прыгонных. З 1827 г. сярод яўрэяў пачаў праводзіцца рэкруцкі набор. У 1844 г. былі ліквідаваныя кагалы, г. зн. скасавана самакіраванне яўрэйскіх абшчын.[200] У другой палове XIX ст. патрабаванні ў дачыненні да рысы аселасці перасталі распаўсюджвацца на некаторыя катэгорыі насельніцтва, у залежнасці ад адукацыі і сацыяльнага статусу. Хуткі рост антысеміцкіх настрояў у канцы XIX ст. прывёў да масавай эміграцыі з краіны.[201] Паводле дадзеных усеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г., толькі ў трох асноўных «беларускіх» губернях (Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай) пражывала звыш 700 тыс. асоб іўдзейскага веравызнання.[202]

Падчас Грамадзянскай вайны і Савецка-польскай вайны (1918-1921 гг.) на тэрыторыі Беларусі былі ўчынены 225 яўрэйскіх пагромаў, у тым ліку 18 – польскімі войскамі.[203]

198 Рыса аселасці з'яўлялася мяжой тэрыторыі (15 губерняў), за межамі якой забаранялася пастаяннае жыхарства яўрэяў – асоб іўдзейскага веравызнання (пазней за некаторымі выключэннямі, напрыклад, для багатых купцоў, рамеснікаў, прадстаўнікоў рэдкіх прафесій). У рысу аселасці ўваходзіла ўся тэрыторыя сучаснай Беларусі.

199 Тэрыторыі Рэчы Паспалітай былі падзелены паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй падчас трох падзелаў (1772, 1793 і 1795 гг.), што прывяло да ліквідацыі гэтай дзяржавы. Па выніках падзелаў тэрыторыя сучаснай Беларусі адышла да Расійскай імперыі.

200 Гл. спасылку 197.

201 Зорин, Ю., Степанов, В., Тишков, В., «Этнокультурные процессы и этническая политика. Этнокультурная политика до нач. 20 в.» // *БРЭ*, Т. «Россия», М.: БРЭ, 2004, С. 173.

202 О распределении населения по вероисповеданиям и регионам. Гл. спасылку 62.

203 Вавренюк И. «Антисемитизм как проблема развития еврейского населения Полесского воеводства (1921–1939 гг.)» // Працэсы ўрбанізацыі ў Беларусі: XIX – пачатак XXI ст. Зборнік навуковых артыкулаў, Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2010. С. 68.





У міжваенны перыяд тэрыторыя сучаснай Беларусі была падзелена паміж СССР і Польшчай. Складанасці, з якімі сутыкалася яўрэйскае насельніцтва па абодва бакі мяжы, мелі істотныя адрозненні. Даследчыца І. Ваўранюк вылучае розныя этапы дзяржаўнай палітыкі Польшчы ў дачыненні да яўрэйскай меншасці пасля 1921 г. Яна мяркуе, што перыяд нявызначанасці (да 1926 г.) і перыяд адноснай стабільнасці, які характарызаваўся адмоўным стаўленнем да антысемітызму (1926–1935 гг.), змяніўся пасля 1935 г.

> *на ўзмацненне ва ўрадавым лагеры нацыяналістычных ідэй і адкрыты антысемітызм на дзяржаўным узроўні. Менавіта ў гэты перыяд хваля пагромаў зноў проста захлынула краіну.*[204]

Сумную вядомасць атрымаў, напрыклад, яўрэйскі пагром у Брэсце-над-Бугам (цяпер г. Брэст), здзейснены 13 мая 1937 г.

У СССР у 1920-я і 1930-я гг. рабіліся спробы барацьбы з антысемітызмам, у тым ліку ў Беларусі. Артыкул 84 Крымінальнага кодэкса БССР[205] (1928 г.) караў за прапаганду ці агітацыю, накіраваную на ўзбуджэнне нацыянальнай або рэлігійнай варожасці або незладоў, а таксама за распаўсюджванне або выраб і захоўванне літаратуры таго ж характару. Аднак на практыцы артыкул ужываўся рэдка, «а судовы пераслед за выяўленыя акты антысемітызму зусім не меў энергічнага характару».[206]

Пры гэтым савецкімі ўладамі ў 1920 г. былі ліквідаваныя яўрэйскія рэлігійныя школы. Хоць першапачаткова стаўленне ўладаў да іўдаізму было параўнальна ліберальнае, у 1930-я гг. палітыка зрабілася больш жорсткай. Напрыканцы XIX ст. сяло Любавічы[207] Аршанскага павета Магілёўскай губерні становіцца буйным цэнтрам хасідскай вучонасці.

204 Там жа.

205 Уголовный кодекс Белорусской ССР, введен в действие с 15 ноября 1928 г.

206 Лившиц А. «Развитие белорусского законодательства против антисемитизма, расовой и национальной вражды или дискриминации» // *Беларусь у XX стагоддзі*, 2002, вып. 1. Ёсць на: http://www.homoliber.org/ru/xx/xx010113.html.

207 Цяпер – вёска ў Руднянскім раёне Смаленскай вобласці Расійскай Федэрацыі, знаходзіцца ў 8 км ад расійска-беларускай мяжы.

У 1928 г. лідар хасідаў Ёсеф Іцхак Шнеерсон, які арганізаваў падпольнае іўдзейскае рэлігійнае навучанне,[208] быў высланы з СССР. Паводле перапісу 1937 г. сярод этнічных яўрэяў ад 16 гадоў і старэй толькі 17,4% былі вернікамі.[209]

Катастрафічнымі для яўрэйскага насельніцтва Беларусі сталі гады нацысцкай акупацыі. Фактычна выжылі толькі эвакуяваныя на ўсход і ўцекачы, схаваныя партызанамі. З 700 тыс. яўрэяў, якія жылі ў БССР напярэдадні Другой сусветнай вайны, засталіся жывымі не больш за 200 тыс. чал.[210] Пасля вайны назіраўся ўздым яўрэйскага рэлігійнага жыцця. Аднак улады асцерагаліся росту «сіяніцкіх нацыяналістычных настрояў», што прывяло да абмежаванняў рэлігійных практык. У 1966 г. у СССР заставалася ўсяго 66 сінагог, а большасць рабінаў былі вымушаныя эміграваць.[211] У пасляваенным СССР яўрэяў сталі канчаткова разглядаць толькі як этнічную (а не рэлігійную) меншасць, што адлюстроўвала, наколькі насамрэч рэзка панізіўся ўзровень рэлігійнасці ўнутры групы разам з захаваннем і культываваннем асаблівай ідэнтычнасці.

У новы Крымінальны кодэкс БССР[212] (1961 г.), увайшоў артыкул 71, які прадугледжвае пакаранне за «прапаганду або агітацыю з мэтай ўзбуджэння расавай або нацыянальнай варожасці або неладоў, а таксама прамое або ўскоснае абмежаванне правоў або ўстаноўка прамых або ўскосных пераваг грамадзян у залежнасці ад іх расавай або нацыянальнай прыналежнасці». Аднак у 1962-1991 гг. у БССР не было ні аднаго выпадку прымянення артыкула 71 КК на практыцы, у той час як у іншых саюзных рэспубліках такія прэцэдэнты былі.[213]

Варта адзначыць, што антысеміцкія практыкі былі звычайнымі для ўладаў пасляваеннага СССР. Не выклікае сумненняў, што ў 1970-я – 1980-я гг. існавалі негалосныя абмежаванні для яўрэяў пры прыёме на працу ў шэрагу абласцей і пры паступленні ў ВНУ. Звесткі перапісу насельніцтва 2009 г. сведчаць, што агульная колькасць яўрэйскага насельніцтва Беларусі за дзесяць гадоў пасля перапісу 1999 г. скарацілася больш чым у два разы (і ў дзевяць разоў у параўнанні з 1989 г.).[214] Асноўнай прычынай зніжэння колькасці яўрэяў з'яўляецца, напэўна, эміграцыя. Руская мова была роднай для 86% яўрэяў; 98% з іх жылі ў гарадах.[215]

*Праявы антысемітызму і барацьба з імі.* Хоць і няма падставаў лічыць, што ў сучаснай Беларусі існуе дзяржаўная антысеміцкая палітыка, яўрэі нярэдка сутыкаюцца з праявамі т. зв. побытавага антысемітызму. Сярод удзельнікаў фокус-групы асоб яўрэйскага паходжання, арганізаванай БХК, пры абмеркаванні абласцей, у якіх магчымая дыскрымінацыя, большасць рэспандэнтаў згадалі працаўладкаванне.[216]

На думку аналітыкаў, у 2009–2010 гг.

> *крымінальны антысемітызм у Беларусі падаўлены «зверху», такія з'явы, як збіццё і забойствы яўрэяў або падпалы сінагог, адсутнічаюць. Адзінай праявай крымінальнага антысемітызму застаюцца акты вандалізму на яўрэйскіх могілках і мемарыялах памяці ахвяр гітлераўскага генацыду.*[217]

Тым не менш экспертамі нярэдка крытыкуецца імкненне беларускіх праваахоўнікаў кваліфікаваць учыненыя на глебе антысемітызму дзеянні як звычайнае хуліганства ці вандалізм без прымянення норм артыкула 130 КК.

208 Armstrong K. *The Battle for God*, New York: Ballantine Books, 2000, p. 212.

209 Гл. спасылку 197. С. 238.

210 Гл. спасылку 140.

211 Гл. спасылку 197. С. 239.

212 Уголовный кодекс Белорусской ССР, принят четвертой сессией Верховного Совета Белорусской ССР пятого созыва 29 декабря 1960 г., введен в действие с 1 апреля 1961 г.

213 Гл. спасылку 206.

214 Гл. спасылку 142. Табл. 1.2.

215 Там жа. Табл. 1.3 і 5.2.

216 Фокус-група членаў Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын (Мінск, агульная колькасць 10 чал.; узрост – 20-27 гадоў – 6 чал.; 43-75 гадоў – 4 чал.), праведзена БХК 27 лістапада 2011 г.

217 Евразиатский еврейский конгресс. *Антисемитизм на постсоветском пространстве: обзор (2009–2010 гг.), ч. 1.* Ёсць на: http://eajc.org/page18/news20230.html.

Паведамленне Агенцтва яўрэйскіх навінаў (АЯН) ад 15 лістапада 2012 г. сведчыць аб тым, што асобныя акты вандалізму па антысеміцкіх матывах могуць мець у Беларусі шырокі грамадскі рэзананс:

> *Ужо некалькі дзён жыхары Гродна ў шоку ад акту вандалізму, які здзейснілі невядомыя, абліўшы карычневай фарбай мемарыяльную дошку, устаноўленую ў памяць аб яўрэях, якія загінулі ў гета ад рук фашыстаў. Мемарыяльная дошка ў памяць аб 29 тысячах яўрэяў, знішчаных у двух гета ў Гродне, устаноўленая на будынку па вуліцы Замкавай, дзе некалі быў уваход у гета. Па словах старшыні іўдзейскай рэлігійнай абшчыны Гродна Барыса Квяткоўскага, у панядзелак раніцай, калі людзі даведаліся пра тое, што адбылося, яны сталі тэлефанаваць у абшчыну, «выказваючы сваё абурэнне гэтым ганебным учынкам. Многія прыносілі свае прабачэнні за таго грэшніка або грэшнікаў, што замахнуліся на памяць аб закатаваных у фашысцкіх гета нявінных старых, жанчынах, дзецях». (...) Нагадваем, што акт вандалізму ў Гродна як дзве кроплі вады падобны на акт вандалізму ў Магілёве, калі ў чэрвені гэтага года там быў абліты карычневай фарбай памятны камень, устаноўлены на месцы гібелі магілёўскіх яўрэяў. Магілёўскія праваахоўныя ўлады тады выказалі меркаванне, што гэта выпадковасць. А як цяпер растлумачыць гэтыя факты?*[218]

У студзені 2007 г. быў прыняты Закон «Аб процідзеянні экстрэмізму».[219] Закон даваў вызначэнне «экстрэмізму», які звязваўся, перш за ўсё, са сферай палітыкі. Аднак закон таксама вызначаў у якасці экстрэмізму

218 Разумовский И. «Акт вандализма в Гродно», *АЕН*, 15 ноября 2012 г. Ёсць на: http://www.aen.ru.

219 Закон Республики Беларусь от 4 января 2007 г. № 203-З «О противодействии экстремизму».





> *распальванне расавай, нацыянальнай або рэлігійнай варожасці або неладоў, а таксама сацыяльнай варожасці, звязаных з гвалтам або заклікамі да гвалту, прыніжэнне нацыянальнага гонару і годнасці, арганізацыю і ажыццяўленне масавых беспарадкаў, хуліганскіх дзеянняў і актаў вандалізму па матывах расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці або неладоў, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці, а таксама па матывах варожасці або неладоў у дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы, прапаганду выключнасці, перавагі або непаўнавартаснасці грамадзян па прыкмеце іх стаўлення да рэлігіі, сацыяльнай, расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці моўнай прыналежнасці, прапаганду і публічнае дэманстраванне, выраб і распаўсюджванне нацысцкай сімволікі або атрыбутыкі.*[220]

Мерамі па супрацьдзеянні экстрэмізму прызнаваліся прадпісанне (арт. 9), афіцыйнае папярэджанне (арт. 10), прыпыненне дзейнасці арганізацыі (арт. 11), забарона дзейнасці беларускай арганізацыі і яе ліквідацыя (арт. 12), забарона дзейнасці замежных і міжнародных арганізацый (арт. 13), процідзеянне выданню і распаўсюджванню экстрэмісцкіх матэрыялаў (арт. 14), недапушчэнне ажыццяўлення экстрэмісцкай дзейнасці пры правядзенні масавых мерапрыемстваў (арт. 15), супрацьдзеянне публічным заклікам службовай асобы арганізацыі да ажыццяўлення экстрэмісцкай дзейнасці (арт. 16) і адказнасць грамадзян за ажыццяўленне экстрэмісцкай дзейнасці (арт. 17).

Пры ўсёй спрэчнасці фармулёвак Закона і яго магчымай палітычнай накіраванасці ёсць станоўчыя прыклады выкарыстання Закона ў справе, датычнай антысемітызму. У снежні 2008 г. суд Савецкага раёна Мінска разглядаў справу аб прызнанні інфармацыйнай прадукцыі, якая распаўсюджваецца ЗАТ «Хрысціянская ініцыятыва», экстрэмісцкай літаратурай, якая спрыяе распальванню міжнацыянальнай варожасці. На разгляд суда былі вынесены 13 кніг, што

220 Там жа. Арт. 1.

рэалізуюцца ў краме «Праваслаўная кніга», якія змяшчаюць абразлівыя для яўрэяў матэрыялы і фарміруюць негатыўны вобраз яўрэяў і ўсёй яўрэйскай культуры. Падставай для праверкі паслужыў зварот, які быў падпісаны кіраўніком Беларускай праваслаўнай царквы Філарэтам, мітрапалітам Мінскім і Слуцкім, Патрыяршым экзархам усяе Беларусі. Грамадзянская справа была распачатая Генеральнай пракуратурай. Асноўная форма экстрэмізму, якая даследавалася ў судзе, – прапаганда антысемітызму. Пазоў пракуратуры быў задаволены судом. Калегія Мінскага гарадскога суда на адкрытым пасяджэнні 26 лютага 2009 г. пацвердзіла рашэнне раённага суда. Судовыя працэсы, якія прайшлі ў 2008-2009 гг., прывялі да пазбаўлення выдавецкай і гандлёвай ліцэнзій ЗАТ «Хрысціянская ініцыятыва», закрыцця крам сеткі «Праваслаўная кніга», якія займаюцца выданнем і распаўсюджваннем антысеміцкай літаратуры.[221]

Па экспертным меркаванні Я. Басіна ў 2007–2010 гг.,

> *палітыка ўладных структур, падтрыманая кіраўніцтвам праваслаўнай епархіі і сілавымі ведамствамі (КДБ, пракуратура, суд), прывяла да сыходу са сваіх пасадаў цэлага шэрагу палітыкаў, дэпутатаў парламента, супрацоўнікаў СМІ, дзеячаў культуры, камерсантаў і інш., шматразова абвінавачаных у прапагандзе антысемітызму, распаўсюджванні антыяўрэйскіх міфаў і распальванні нацыянальнай варожасці.*[222]

*Праблема культавых будынкаў і павагі да культурнай спадчыны.* У Беларусі для яўрэйскіх абшчын востра стаіць пытанне аб культавых будынках. У краіне не праводзілася рэстытуцыя (вяртанне) правоў уласнасці ў дачыненні да рэквізаваных у савецкі час культавых будынкаў. У 2011 г. у Беларусі ў іўдаістаў былі 53 абшчыны, якія належаць да артадаксальнага Любавіцкага хасідызму і прагрэсіўнага кірунку, але толькі дзесяць

221 Басин Я. *Еврейский вопрос в современной Беларуси.* Ёсць на: eajc.org/page18/ news15271.html.

222 Там жа.





культавых будынкаў. Яшчэ дзесяць будынкаў былі перададзеныя дзяржавай для культавых мэтаў.[223]

У 2009 г. эксперт Я. Басін адзначаў

> *адкрыта непаважлівае стаўленне мясцовых уладаў да захавання яўрэямі помнікаў нацыянальнай спадчыны. Былыя сінагогі зносяцца, і ўлады не лічаць патрэбным нават праінфармаваць іх ранейшых уладальнікаў – яўрэйскія абшчыны, на грошы якіх яны ў свой час былі пабудаваныя, хоць будынкі нярэдка ўяўляюць гістарычную каштоўнасць. Прыклад 2009 г.: знос будынка былой любанскай сінагогі, дзе ў свой час працаваў адзін з найбуйнейшых талмудыстаў XX ст. Мошэ Файнштэйн. Гэтая тэндэнцыя датычыцца і яўрэйскіх могілак…*[224]

Я. Басін таксама лічыў, што «ў Беларусі вядзецца адкрытае замоўчванне гісторыі яўрэяў і іх ролі ў дзяржаўным і культурным будаўніцтве, у барацьбе з нацызмам» і што «ўлады не выконваюць уласныя рашэнні па ўвекавечанні памяці дзеячаў яўрэйскай культуры».[225]

Пры гэтым варта ўлічваць, што яўрэйская грамада вядзе актыўнае культурнае жыццё. У краіне выходзіць некалькі яўрэйскіх газет і адзін часопіс; пры кожнай абшчыне існуе бібліятэка, а пры Мінскім яўрэйскім абшчынным доме таксама Музей гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі. Іўрыт, культура і традыцыі яўрэяў вывучаюцца ў сярэдняй школе № 132 Мінска, дзяржаўных дзіцячых садках № 68 («Га-Ціква») Гомеля і № 90 Віцебска, у двух групах дзіцячага садка № 151 у Мінску, у Пінскай недзяржаўнай школе-інтэрнаце «Бейс-Арагон», а таксама ў 17 школах выходнага дня.[226]

223 Гл. спасылку 81.

224 Там жа.

225 Там жа.

226 Міхальчук Л. *Беларусь шматнацыянальная.* Минск: Уполномоченный по делам религий и национальностей Совета Министров Республики Беларусь, 2007. С. 86.

### *Цыганская меншасць*

*Гістарычная даведка і сучаснае становішча.* Цыганы пачалі сяліцца ў Вялікім Княстве Літоўскім, куды ўваходзіла і тэрыторыя сучаснай Беларусі, каля XV ст. (сюды яны траплялі з Польшчы і Германіі, а ў канцы XVI – пачатку XVII ст. ст. ужо з Венгрыі). 25 мая 1501 г. вялікі князь літоўскі выдаў грамату «войту цыганскаму» з дазволам цыганам вандраваць па землях княства.[227]

Першы ўсерасійскі перапіс насельніцтва 1897 г. у беларускіх губернях зафіксаваў каля 3 тыс. цыганоў. У канцы XIX – пачатку XX ст. ст. тут было больш за дзясятак месцаў цыганскай аселасці, у тым ліку вёскі з амаль цалкам цыганскім насельніцтвам. Асноўным заняткам цыганоў, якія засялялі Беларусь у XIX ст., быў конны гандаль. Значная частка цыганоў была знішчана ў гады нацысцкай акупацыі. Да канца 1950-х гг. вандроўныя табары ў Беларусі масава перайшлі да аселага ладу жыцця. Паводле звестак перапісу 1959 г. у Беларускай ССР налічвалася 4 662 цыганы.[228]

У савецкі час колькасць цыганоў увесь час расла, дасягнуўшы, па звестках перапісу 1989 г., 10762 чалавек. У незалежнай Беларусі іх «афіцыйная» колькасць стала скарачацца.[229] Так, па звестках перапісу насельніцтва 2009 г., цыганскае насельніцтва складала 7079 чал.[230] Гэтыя вынікі перапісу пярэчаць дадзеным грамадскага аб'яднання «Беларуская цыганская дыяспара», паводле якога ў Беларусі налічваецца каля 60 тыс. цыганоў.[231] Паводле перапісу 2009 г. найбольшая колькасць цыганоў пражывае ў Гомельскай вобласці – 35% ад агульнай колькасці, найменшая – у Гродзенскай вобласці – 5%.[232] Цыганскае насельніцтва Беларусі ў асноўным гарадское – 68%.[233] Каля 65% сваёй роднай мовай лічаць цыганскую; для 56% – яна таксама з'яўляецца асноўнай мовай зносін дома, разам з рускай (27%) і беларускай (5%).[234]

Улады Беларусі пакуль што не прынялі ніякіх спецыяльных праграм або мер у інтарэсах цыганскага насельніцтва. На сённяшні дзень у Беларусі таксама няма плану захавання культурна-гістарычнай спадчыны цыганоў. Прэзідэнт Міжнароднай грамадскай арганізацыі цыганоў «Адраджэнне» А. Басяцкі, кіраўнікі грамадскага аб'яднання «Беларуская цыганская дыяспара» В. Казлоўскі і А. Гоманаў лічаць неабходным стварэнне цыганскага культурнага цэнтра і музея.[235]

*Дыскрымінацыя*. Цыганы з'яўляюцца ўразлівай этнічнай групай, якая падвяргаецца сістэмнай дыскрымінацыі.[236] Цыганскія абшчыны часта сегрэгаваныя ў публічнай прасторы. Гэтаму спрыяе іх негатыўны вобраз у грамадскай свядомасці.

Цыганы, якія ўдзельнічалі ў фокус-групе БХК, назвалі наступныя вобласці, дзе рызыка сутыкнуцца з дыскрымінацыяй з'яўляецца найбольшай: кантакты з супрацоўнікамі Міністэрства ўнутраных спраў; ахова здароўя, атрыманне тавараў і паслуг (негатыўнае ўспрыманне цыганоў персаналам і наведвальнікамі адпаведных устаноў); гвалт (спробы гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да цыганоў і іх дзяцей, але пры гэтым адзначалася згуртаванасць і гатоўнасць даць адпор крыўдзіце-

227 Там жа. С. 73.

228 Бартош О. «Цыгане Белоруссии» // *Цыгане России.* Ёсць на: http://gypsy-life.net/etno-06.htm. Оригинальная публикация: Bartosh O. "The Roma in Belarus: in the Light of Transformations", *Interstitio: East European Review of Historical Anthropology*, June 2009, Vol. 2, No 2 (4).

229 Гл. спасылку 142. Табл. 1.1.

230 Там жа. Табл. 1.2.

231 Федорович В. Кто цыганского ребенка обидит, тому кладбище будет // *Naviny.by*, 1 июня 2010 г. Ёсць на: http://naviny.by.

232 Гл. спасылку 142. Табл. 1.2.

233 Там жа. Табл. 1.2 і 1.3.

234 Там жа. Табл. 5.2 і 5.5.

235 Прудникова О. «Белорусским цыганам нужна не национальная школа, а культурный центр», *Naviny.by*, 20 мая 2010 г. Ёсць на: http://naviny.by.

236 «Камітэт на рэгулярнай аснове ўстанаўліваў, што дыскрымінацыя ў дачыненні да некаторых груп шырока распаўсюджана і захоўваецца, а таксама глыбока ўкаранілася ў сацыяльных паводзінах і арганізацыі, што часта звязана з бескантрольнай або ўскоснай дыскрымінацыяй. Такую **сістэмную дыскрымінацыю** можна разумець як наяўнасць прававых палажэнняў, палітыкі, практыкі або пануючых культурных традыцый у дзяржаўным ці прыватным сектары, якія ствараюць адносныя нязручнасці для пэўных груп і прывілеі для іншых груп». Комитет по экономическим, социальным и культурным правам, *Замечание общего порядка № 20: Недискриминация экономических, социальных и культурных прав (пункт 2 статьи 2 Международного пакта об экономических, социальных и культурных правах)*, E/C.12/GC/20, 2009, П. 12. Вылучана намі.

лям).[237] Адносіны дзяржаўных органаў да сваёй супольнасці самі цыганы ацэньваюць як абыякавае. Рэспандэнты адзначалі распаўсюджаны стэрэатып, што ўсе цыганы належаць да крымінальнага асяроддзя. Адсутнасць спецыяльных курсаў вывучэння мовы, навучальных установаў, нізкі працэнт цыганоў з вышэйшай адукацыяй не разглядаюцца рэспандэнтамі як дыскрымінацыйныя, хутчэй як асаблівасці традыцыйнага ладу жыцця.[238]

Камітэт ААН па правах дзіцяці ў красавіку 2011 г. выказаў занепакоенасць з нагоды паведамленняў аб фактах пераследу ў Беларусі дзяцей цыганоў (рома) і іх дыскрымінацыі ў плане доступу да аховы здароўя, адукацыі і сацыяльных паслуг. Беларусі было рэкамендавана звяртаць першарадную ўвагу на задачы папярэджання і выкаранення дыскрымінацыі ў адносінах да дзяцей, у прыватнасці да дзяцей рома, праз сістэму адукацыі і сродкі масавай інфармацыі.[239]

*Доступ да адукацыі.* Выклікае трывогу ўзровень адукацыі цыганскага насельніцтва Беларусі. Паводле звестак перапісу насельніцтва 2009 г., 12% цыганоў ва ўзросце 10 гадоў і старэй не ўмеюць чытаць і пісаць; у гэтай жа ўзроставай групе толькі пачатковая адукацыя была ў 41%, а базавая агульная – у 19%. Сярэдняя, прафесійна-тэхнічная або сярэдняя спецыяльная была зафіксавана ў 17%, а вышэйшая – толькі ў 0,5%.[240] Праблемы з доступам да вышэйшых прыступкаў адукацыі могуць сведчыць як аб недастатковай інтэграцыі цыганоў у беларускім грамадстве, так і аб дыскрымінацыйных практыках.

237 Фокус-група цыганоў (Мінск, агульная колькасць 5 чал., узрост – 35-45 гадоў), праведзена БХК 29 снежня 2011 г. Хоць у працы дадзенай фокус-групы ўдзельнічала крыху менш асоб, чым звычайна прынята, яна была арганізавана з захаваннем усіх метадалагічных патрабаванняў, і вынікі яе працы адказваюць крытэрыям навуковай дакладнасці. Гл. больш падрабязна: Onwuegbuzie A. J., Dickinson W. B., Leech N. L., Zoran A. G. “A Qualitative Framework for Collecting and Analyzing Data in Focus Group Research”, *International Journal of Qualitative Methods*, 2009, Vol. 8 (3).

238 Там жа.

239 Комитет по правам ребенка. *Рассмотрение докладов, представленных государствами -участниками в соответствии со статьей 44 Конвенции, Заключительные замечания:* Беларусь, CRC/C/BLR/CO/3-4, 8 апреля 2011 г., пп. 27–28.

240 Национальный статистический комитет Республики Беларусь. *Итоговые данные переписи населения Республики Беларусь 2009 г.*, база дадзеных на: http://belstat.gov.by/ homep/ru/perepic/2009/database.php.





На думку даследчыцы В. Барташ, якая інтэрв'ювала замужніх жанчын 30-40 гадоў, у цыганскай сям'і можна назіраць канфлікт пакаленняў.

> *Дзеці, якія наведваюць школу, звычайна імкнуцца прымаць удзел не толькі ў вучэбнай дзейнасці, але і ў грамадскім жыцці. Старэйшае пакаленне, якое выступае за захаванне этнічнай самабытнасці, патрабуе захавання традыцыйных нормаў паводзін, якія выключаюць сацыякультурнае жыццё па-за межамі цыганскай супольнасці. У матывацыях старэйшага пакалення цыганоў Беларусі, як і ў цыганоў іншых рэгіёнаў, ёсць фармулёўкі, якія сведчаць аб успрыманні школы як асяроддзя распаўсюджвання чужой маралі. Нежаданне атрымліваць адукацыю таксама матывуецца тым, што цыганскія веды і ўменні больш дастасавальныя ў рэальным жыцці, чым веды, атрыманыя ў школе.*[241]

Нізкі ўзровень адукацыі негатыўна ўплывае на магчымасці працаўладкавання цыганоў. Паводле звестак перапісу 2009 г., узровень беспрацоўя сярод іх дасягаў 31,5% (без значных палавых адрозненняў).[242] Для параўнання: сярод усяго насельніцтва Беларусі гэты паказчык быў 6,4%.[243]

*Негатыўныя грамадскія стэрэатыпы і СМІ.* Інтэграцыі цыганоў на рынку працы і ў грамадскім жыцці перашкаджаюць укаранёныя ў грамадскай свядомасці негатыўныя стэрэатыпы ў дачыненні да цыганскага насельніцтва, якія нярэдка транслююцца ў незбалансаваных публікацыях у СМІ. Напрыклад, праваабаронца М. Калінін неаднаразова звяртаўся да Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў у сувязі

241 Гл. спасылку 228.

242 Беспрацоўе сярод эканамічна актыўнага насельніцтва працаздольнага ўзросту (мужчыны 16-59, жанчыны 16-54).

243 Гл. спасылку 240.

з фактамі супрацьпраўнай дзейнасці нацыяналістычных груп і дыскрымінацыяй цыганоў у СМІ.[244]

У лісце міністру інфармацыі беларускія праваабаронцы М. Багдановіч і А. Яўсеенка (РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт») адзначалі:

> *Стэрэатыпы цыгана (нікчэмны гультай, схільны да рабунку) і цыганкі (варажбітка-махлярка, пагарджаюць працай) наносяць крыўду сумленным рома, у тым ліку кваліфікаваным спецыялістам і самаадданым шматдзетным маці. Гэтыя стэрэатыпы з'яўляюцца перашкодай для цыганоў пры спробах уладкавацца на працу. Трэба меркаваць, віна за такую сітуацыю часткова ляжыць і на СМІ. Некаторыя газеты без сарамлівасці зневажаюць гэтую нацыянальную меншасць. Напрыклад, «Гомельская праўда» папярэджвае чытачоў «аб небяспецы зносін з асобамі цыганскай нацыянальнасці» (нумар за 12.11.2011 г.). У газеце «Светлае жыццё» пішацца, што «заўсёды трэба з асцярогай ставіцца да незнаёмых асобаў, і асабліва да асобаў цыганскай нацыянальнасці».*[245]

Аўтары ліста заклікалі правесці з журналістамі гутарку аб недапушчальнасці ксенафобскіх выпадаў, патлумачыць, чаму непажадана паведамляць чытачам аб этнічным паходжанні правапарушальнікаў.[246] У адказе на дадзены зварот, падпісаным намеснікам міністра, паведамлялася, што з рэдактарамі газет былі праведзены гутаркі. Акрамя таго ім паведамілі, што

244 Пушкін І. *Нацыянальныя супольнасці Беларусі*, Магілёў: МДУ імя А. Куляшова, 2007. С. 177; Этносайт, «Цыгане возмущены документальным фильмом ОНТ», *Портал национальных общин*, 23 ноября 2005 г. Ёсць на: http://etnosite.ru.

245 Германович А. «Правозащитники просят Мининформ принять меры по предотвращению дискриминации цыган в СМИ», *TUT.BY*, 7 июня 2012 г. Ёсць на: http://news.tut.by/society/293506.html.

246 Там жа.





> *па інфармацыі названых рэдакцый, публікацыі былі падрыхтаваны на падставе матэрыялаў, прадстаўленых органамі ўнутраных спраў у дачыненні да злачынных схем дзеянняў махляроў з прафілактычнай мэтай – недапушчэння падобных праяў. Такім чынам, гаворка ў публікацыях ідзе толькі пра крымінальны складнік і не закранае цыганскую дыяспару ў цэлым.*[247]

*Этнічнае прафіляванне.* У міжнароднай практыцы пад расавым або этнічным прафіляваннем звычайна разумеюць дзеянні праваахоўных органаў па распрацоўцы версіі аб дачыненні асобы да супрацьпраўнай дзейнасці, хутчэй, з-за яе этнічнага або расавага паходжання, чым з-за яе паводзін або на падставе наяўнай пра яе інфармацыі. Этнічнае прафіляванне з'яўляецца разнавіднасцю расавай дыскрымінацыі.

Беларускія СМІ рэгулярна размяшчаюць інфармацыю аб «прафілактычных рэйдах міліцыі па цыганскім сем'ям». Падобныя рэйды звычайна звязаны з нейкімі падзеямі ці аператыўнай інфармацыяй. Аднак уразлівасць цыганоў пры зносінах з уладамі часта пагаршаецца нізкім узроўнем адукацыі, недастатковай інфармаванасцю аб сваіх правах і беднасцю, якая не дазваляе разлічваць на якасную і кваліфікаваную юрыдычную дапамогу. Цыганы-ўдзельнікі фокус-групы БХК прывялі наступныя прыклады негатыўнага вопыту зносін з супрацоўнікамі Міністэрства ўнутраных спраў: прымусовая дактыласкапія, распаўсюджванне друкаваных матэрыялаў, што перасцерагаюць грамадзян ад зносін з цыганамі, частыя прафілактычныя рэйды супрацоўнікаў МУС.[248]

Напрыклад, арыентаваны на цыганоў рэйд міліцыі быў праведзены ў студзені 2010 г. у Гомелі. Паводле звестак СМІ,

247 Германович А. «Мининформ не усмотрел дискриминации в статьях о цыганах», *TUT.BY*, 27 июня 2012 г. Ёсць на: http://news.tut.by.

248 Фокус-група цыган (Мінск, агульная колькасць 5 чал., узрост – 35-45 гадоў), праведзена БХК 29 снежня 2011 г.

*былі выяўлены шматлікія адміністрацыйныя правапарушэнні. Звыш 500 чалавек асабовага складу РАУС наведалі 724 дамы і кватэры, у якіх жывуць цыганы. Было праверана каля 2 тыс. чалавек. Складзена 25 адміністрацыйных пратаколаў за пражыванне без пашпарта або прапіскі і восем пратаколаў за парушэнне правілаў знаходжання ў Беларусі, а таксама транзітнага праезду праз тэрыторыю краіны. Каля 80 грамадзян не змаглі даць якіх-небудзь дакументаў. Пра гэта былі аператыўна паінфармаваныя аддзяленні па грамадзянстве і міграцыі.*[249]

На апазіцыйным інфармацыйным рэсурсе «Хартыя '97» было змешчана вельмі рэдкае ў беларускіх СМІ сведчанне кіраўніка цыганскай сям'і, якая трапіла пад ранішні рэйд міліцыі ў лютым 2009 г.:

*Не грукалі ў дзверы, адразу ўбеглі, пакідалі ўсіх на падлогу: «Ляжаць, с ***!» Усіх: і дзяцей, і жанчын. Дзеці крычаць. А яны не даюць падысці да дзяцей... Мы так ляжалі на падлозе хвілін 40 амаль голыя, бо многіх забралі з ложкаў. Пачалі рабіць ператрус. Нічога не прад'явілі. Яны нават не казалі, што з міліцыі. У бабулі спыталі: «Дзе тваё золата?!» Потым усіх паставілі ў адзін шэраг і павялі ў аўтобус... Усе суседзі глядзелі на гэта... Прывезлі ў міліцыю, завялі ў актавую залу, а там ужо чалавек 70-80 цыганоў. Нічога не тлумачылі. Сказалі: «Возьмем адбіткі, і пойдзеце дадому». Мы вярнуліся толькі ў 16 гадзін. Казалі: «Вы чулі, што быў тэракт?» Так што мы тэрарысты.*[250]

249 ВГомеле, «Будьте бдительны!», *vGomele.by*, 12 февраля 2010 г. Ёсць на: http://vgomele.by/budte-bditelny.

250 Хартыя’97. «Минская милиция устроила "облаву" на цыган», *Хартыя'97*, 6 февраля 2009 г. Ёсць на: http://www.charter97.org.





Цікава пазнаёміцца з рэакцыяй наведвальнікаў інфармацыйнага рэсурсу «Хартыя '97» на артыкул, дзе былі размешчаны прыведзеныя вышэй сцвярджэнні аб злоўжываннях з боку супрацоўнікаў міліцыі, аб іх прадузятых адносінах да цыганоў. Прывядзём толькі першыя пяць каментарыяў, якія ілюструюць укаранёныя ў грамадстве негатыўныя стэрэатыпы ў дачыненні да прадстаўнікоў цыганскай меншасці ў Беларусі:

**ай нане, 10:58, 6.02**
Самага галоўнага павязалі?

**1, 11:03, 6.02**
А галоўнага адкаталі або пакуль на волі? ;-) Асноўныя віды дзейнасці цыганоў ні для каго не сакрэт: гандаль наркатой, крадзеж, махлярства.

**сокал, 11:11, 6.02**
а чаму нікога не расстралялі? недапрацоўкі.

**ЛЫДЖНЕГ, 11:21, 6.02**
Знайшлі іх, дзе лавіць... У мікрараёне Дразды трэба цыганоў адлоўліваць! : D

**тОўсты, 11:34, 6.02**
Даўно час заняцца гэтымі лайдакамі і прайдзісветамі.[251]

251 Там жа.

*Высновы*

У кантэксце права на роўнасць і недыскрымінацыю беларускае заканадаўства ўтрымлівае шэраг праблемных палажэнняў. Перш за ўсё, на ўзроўні закона поўная абарона правоў нацыянальных меншасцяў гарантуецца толькі грамадзянам краіны (хоць практычнага значэння гэтыя абмежаванні, мабыць, не маюць). Моўнае заканадаўства носіць у цэлым абмежавальны характар, хоць існуючыя забароны не падмацаваныя адміністрацыйнымі або крымінальнымі санкцыямі і могуць ігнаравацца. Тым не менш захаванне дыскрымінацыйных нормаў у заканадаўстве падае няправільны сігнал і прадстаўнікам груп меншасцяў, і ўладным структурам.

Хоць дзяржаўныя школы могуць выкладаць на мовах меншасцяў, рэалізацыя дадзенага права пакінута на меркаванне ўладаў пры адсутнасці якіх-небудзь дзейных механізмаў зваротнай сувязі з грамадзянскай супольнасцю па гэтым пытанні і пры назіранай слабой успрымальнасці да выказаных патрэб у атрыманні адукацыі на роднай (нацыянальнай) мове. Больш за тое, адсутнасць юрыдычнай магчымасці для арганізацыі прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі як у дзяржаўных, так і ў прыватных школах на мовах нацыянальных меншасцяў з'яўляецца дыскрымінацыяй і наўрад ці стымулюе жаданне атрымліваць адукацыю на любых мовах, акрамя дзяржаўных.

Выявіць асноўныя тыпы няроўнасці паміж прадстаўнікамі розных этнічных груп даў магчымасць больш падрабязны разгляд становішча ў Беларусі польскай, яўрэйскай і цыганскай меншасці. Прыклад польскай меншасці наглядна паказвае рызыкі, звязаныя з палітызацыяй праблем асобных нацыянальных меншасцяў, якая можа весці да ўмяшання дзяржавы знаходжання і дзяржавы паходжання ў рэалізацыю права на асацыяцыю і трансгранічнае супрацоўніцтва. Палітызацыяй пытанняў, звязаных з польскай меншасцю, мабыць, тлумачыцца і адносная неразвітасць сістэмы польскай школьнай адукацыі.

На прыкладзе яўрэйскай меншасці відаць жаданне ўладаў змагацца з злачынствамі на глебе нянавісці. Адначасова з гэтым відавочная неабходнасць больш паслядоўнага падыходу да правапарушэнняў, здзейсненых па такіх матывах.

Практыка ўлад у дачыненні да захавання яўрэйскай культурнай спадчыны дэманструе падкрэслена вертыкальны характар узаемаадносін дзяржавы з грамадзянскай супольнасцю, часткай якой з'яўляюцца арганізацыі меншасцяў. Адсутнасць рэстытуцыі правоў уласнасці на культавыя будынкі штучна абмяжоўвае рэлігійнае жыццё іўдзейскіх абшчын (асабліва з улікам заканадаўчых абмежаванняў на рэлігійную дзейнасць за межамі культавых будынкаў – гл. вышэй).

Цыганская меншасць уяўляе сабой прыклад сацыяльна дэпрывіраванай групы, якая пакутуе ад укаранёных у грамадстве негатыўных стэрэатыпаў, з якімі дзяржава не пачала пакуль актыўна змагацца. Праблемы цыганоў з доступам да адукацыі і на рынак працы кантрастуюць з адсутнасцю ў Беларусі пазітыўных мер, якія праводзяцца ў інтарэсах дасягнення роўнасці для прадстаўнікоў гэтай групы. Улады таксама самі не заклапочаныя захаваннем культурнай спадчыны гэтай меншасці. Цыганы з'яўляюцца ахвярай такой дыскрымінацыйнай практыкі, як этнічнае прафіляванне (якая, мабыць, магчымая і ў дачыненні да іншых груп значных меншасцяў у Беларусі).

### 2.1.3 Праявы няроўнасці на падставе выкарыстання беларускай мовы

Беларуская мова з'яўляецца ў Беларусі роднай мовай большасці насельніцтва і мае статус дзяржаўнай. Аднак па гістарычных прычынах сацыялінгвістычная сітуацыя ў краіне разам з асаблівасцямі дзяржаўнай моўнай палітыкі могуць ставіць беларускамоўных жыхароў у розных галінах грамадскага жыцця (асабліва ў адукацыі і пры доступе да тавараў і паслуг) у няроўнае становішча з-за іх мовы. Сітуацыя пагаршаецца тым, што частка грамадства і беларускія ўлады нярэдка звязваюць публічнае выкарыстанне (нарматыўнай) беларускай мовы з апазіцыйнай палітычнай дзейнасцю.

Паводле міжнародных падыходаў забарона моўнай дыскрымінацыі пры рэалізацыі правоў чалавека дастасаваная не толькі да прадстаўнікоў груп меншасцяў, але і да прадстаўнікоў большасці. Напрыклад, ра-

тыфікаваны Беларуссю Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах устанаўлівае:

> *Усе людзі роўныя перад законам і маюць права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону закону. У сувязі з гэтым ўсякага роду дыскрымінацыя павінна быць забаронена законам, і закон павінен гарантаваць усім асобам роўную і эфектыўную абарону супраць дыскрымінацыі па любой прыкмеце, такой як раса, колер скуры, пол, мова, рэлігія, палітычныя ці іншыя перакананні, нацыянальнае або сацыяльнае паходжанне, маёмаснае становішча, нараджэнне або іншыя абставіны.*[252]

***Аб моўнай сітуацыі***

У параўнанні з іншымі ўсходнееўрапейскімі мовамі, якія маюць зараз афіцыйны статус, сучасная беларуская мова прайшла канчатковую стандартызацыю досыць позна, у першай трэці XX ст.[253] У Расійскай імперыі беларусы (як і ўкраінцы і вялікаросы, г. зн. сучасныя рускія) лічыліся часткай рускага народа, а беларуская мова, адпаведна, толькі дыялектам рускай. Інерцыя такога падыходу захоўвалася яшчэ некаторы час пасля падзення Расійскай імперыі. Напрыклад, у лістападзе 1919 г. у Мінску епархіяльны з'езд праваслаўнай царквы паставіў пад сумнеў само існаванне беларускай мовы.[254]

У Савецкім Саюзе ў 1920-я гг. беларуская мова атрымала магутны імпульс развіцця ў межах т. зв. беларусізацыі. Сфера ўжывання беларускай мовы ў грамадскім, палітычным жыцці і ў адукацыі прыкметна

252 Международный пакт о гражданских и политических правах (ст. 26).

253 Mayo P. «Belorussian», in Comrie B. and Corbett G. G. (eds.), *The Slavonic Languages*, London, New York: Routledge, 1993, pp. 888–889.

254 Чернякевич А. «Православная церковь на белорусских землях в условиях польской оккупации 1919–1920 гг.» // Можейко М. (отв. ред.), *Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе*, Гродно: ГрГУ, 2010. С. 240.





пашырылася. Паводле Канстытуцыі Беларускай ССР ад 1927 г.,[255] у дзяржаўных і грамадскіх установах і арганізацыях устанаўлівалася «поўнае раўнапраўе беларускай, яўрэйскай,[256] рускай і польскай моў» (арт. 21). Аднак у 1930-я гг. палітыка беларусізацыі была згорнутая, а нацыянальная інтэлігенцыя моцна пацярпела ад сталінскіх рэпрэсій.[257]

У той частцы сучаснай Беларусі, якая ў міжваенны перыяд знаходзілася пад польскай юрысдыкцыяй, уладамі праводзілася жорсткая асімілятарская палітыка, сведчаннем якой можа паслужыць наступная статыстычная інфармацыя: калі ў 1918/1919 гг. колькасць беларускамоўных і двухмоўных польска-беларускіх школ складала 346, то ў 1937 г. ужо толькі шэсць, у тым ліку адна гімназія.[258]

Пасля смерці І. Сталіна ў 1953 г. палітыка савецкіх уладаў у Беларускай ССР, як і ў іншых саюзных рэспубліках, спалучала ў сабе з аднаго боку, русіфікацыю (накіраваную, аднак, на стварэнне грамадзянска-палітычнай ідэнтычнасці) і, з іншага боку, «пазітыўныя меры» па падтрымцы «карэннага насельніцтва». Як паведамляла савецкая энцыклапедыя,

> *пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ажыццяўляецца паступовае збліжэнне сацыялістычных нацый і народнасцяў Савецкага Саюза, якія маюць агульную мэту – будаўніцтва камунізму. За гады сацыялістычнага будаўніцтва паўстала новая гістарычная супольнасць – савецкі народ.*[259]

255 Конституция (Основной закон) Белорусской Социалистической Советской Республики, принята 11 апреля 1927 г. VII Всебелорусским съездом Советов рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов.

256 Маецца на ўвазе *ідыш*.

257 Мечковская Н. «Почему в постсоветской Беларуси все меньше говорят на белорусском языке?» // Неприкосновенный запас, 2011, № 80 (6). Ёсць на: http://www.nlobooks.ru/node/1586.

258 Даецца па: гл. спасылку 67. S. 44.

259 Прохоров А. (ред.). СССР. Энциклопедический справочник, М: Советская энциклопедия, 1979. С. 27.

У савецкі час у Беларусі няўхільна пашыралася выкарыстанне рускай мовы, у тым ліку этнічнымі беларусамі, і асабліва ў гарадах. Пры гэтым рабіліся спробы ўкаранення беларускай мовы, напрыклад, праз СМІ. У 1977 г. у Беларусі былі выпушчаны 2330 назваў кніг і брашур, з іх на беларускай мове – 393. Аднак з агульнага накладу часопісаў і іншых перыядычных выданняў гадавым тыражом у 36,5 млн экз. на 30 беларускамоўных выданняў даводзілася 29.100.000 экз. У той жа час з 186 газет 128 выходзілі на беларускай мове.[260] Калі па звестках перапісу 1926, 72% беларусаў назвалі роднай беларускую мову, то ў 1970 г. такіх было ўжо 90%. Аднак пазней гэтая лічба стала змяншацца, дасягнуўшы 80% у межах апошняга савецкага перапісу 1989 г.[261]

Другі этап мер па беларусізацыі пачаўся пасля здабыцця рэспублікай незалежнасці – у 1991-1994 гг. Хоць першы пры незалежнасці перапіс 1999 г. засведчыў павелічэнне колькасці тых беларусаў, што назвалі беларускую мову роднай (85%), у межах другога перапісу ў 2009 г. іх працэнт панізіўся да беспрэцэдэнтнага за ўсю гісторыю перапісаў узроўню (61%). Таму, хоць у 2009 г. беларусы складалі 84% насельніцтва, доля ў агульным насельніцтве тых, хто назваў беларускую мову роднай, скарацілася да 53%. Доля тых, для каго беларуская мова з'яўляецца роднай, скарацілася не толькі сярод беларусаў, але і сярод рускіх, палякаў і ўкраінцаў. Беларуская мова была роднай для большасці жыхароў гарадоў і сельскай мясцовасці ў 1999 г., але да 2009 г. яна страціла першае месца ў гарадах.[262]

Вынікі беларускіх перапісаў паказваюць не толькі дадзеныя аб роднай мове, але і аб асноўнай мове штодзённых хатніх зносін. Хоць, па выніках перапісу 2009 г., беларускую назвалі роднай мовай 53%, размаўляла на ёй дома толькі 23%, і яшчэ 14% насельніцтва свабодна валодалі гэтай мовай. Што датычыцца рускай, то яе назвалі роднай 42% усяго насельніцтва, пры гэтым размаўлялі на ёй дома 70% (у гарадах – 82%) насельніцтва, і яшчэ як замежнай ёй вольна валодалі 14% насельніцтва.[263] Іншымі словамі, беларускай мовай свабодна валодала (як роднай, хатняй ці замежнай) каля 70% насельніцтва, рускай – больш за 80%. Пры гэтым рускую мову рашуча выцясняе беларуская ў якасці мовы аўтарытэтнага слоўніка.

Прафесар БДУ Н. Мячкоўская тлумачыла правал палітыкі беларусізацыі тым, што ў пачатку 1990-х гг.

> *для большасці людзей, у тым ліку этнічных беларусаў і змагароў за незалежнасць, якія «ў тэорыі» стаялі за адраджэнне беларускай мовы, праца практычнага авалодання мовай апынулася непасільнай. Беларуская не рабілася службовай мовай у большасці ўстаноў, на яе не пераходзілі суды і міліцыя, гандаль і банкі. Што датычыцца вырашальнай для ўмацавання мовы сферы – адукацыі, асабліва сярэдняй, – то доля беларускамоўных школ і класаў узрастала. Аднак беларусізацыя школы насіла паспешлівы і фармальны характар, без належнай моўнай перападрыхтоўкі настаўнікаў, без належнага забеспячэння беларускімі падручнікамі па прадметах.*[264]

Беларуская мова таксама не змагла канкураваць з рускай у сферы друкаванай прадукцыі і асабліва ў інтэрнэце. У 2010 г. у Беларусі было выпушчана больш за 11 тыс. кніг і брашур накладам больш за 43 млн экз., з іх толькі 9% найменняў на беларускай мове гадавым накладам 4 млн экз. У тым жа годзе выдавалася 713 газет, з іх на беларускай мове – 185 (26%). Гадавы наклад газет склаў 510,3 млн экз., пры гэтым больш за чвэрць накладу выходзіла на беларускай мове. Разавы наклад газет склаў 8,1 млн экз., з іх 1,2 млн асобнікаў – на беларускай мове.[265]

260 Там жа. С. 516.

261 Гл. спасылку 257.

262 Там жа.

263 Гл. спасылку 142. Табл. 5.9 і 5.10.

264 Гл. спасылку 257.

265 Носова М. «По данным Белстата, белорусский язык в качестве разговорного использует 23% населения страны», *Белорусская информационная компания «БелаПАН»*, 21 февраля 2012 г. Ёсць на: http://belapan.com.

Цікавасць да рускай мовы нязменна ўмацоўвае палітычная і эканамічная арыентацыя цяперашняга беларускага кіраўніцтва на Расійскую Федэрацыю.

Ацэнкі моўнай палітыкі ўладаў шмат у чым будуць залежаць ад уяўленняў экспертаў аб сувязі беларускай мовы з беларускай ідэнтычнасцю. Паслядоўныя крытыкі моўнай палітыкі падазраюць, што ўлады працягваюць русіфікатарскую палітыку ў дачыненні да беларусаў. У якасці доказу прыводзіцца, напрыклад, скарачэнне долі выкладання на беларускай мове ў сістэме адукацыі (гл. ніжэй). Прыхільнікі і стрыманыя крытыкі афіцыйнай палітыкі звяртаюць увагу на тое, што пераход беларусаў на рускую мову не падрывае беларускую ідэнтычнасць, але хутчэй сведчыць аб хуткім прасоўванні ў рэспубліцы будаўніцтва грамадзянскай нацыі, не так цесна звязанай уласна з этнічнасцю асноўнай групы насельніцтва.[266]

Беларуская мова класіфікавана ЮНЕСКА як «уразлівая» (vulnerable) у «Атласе моў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення» (гэта найменшая ступень пагрозы па пяцібальнай шкале).[267]

***Фактар змяшанай мовы***

Неабходна ўлічваць, што беларуская мова ў гарадскім асяроддзі канкуруе не толькі з рускай мовай, але і з т. зв. «трасянкай», альбо змяшанай беларуска-рускай мовай,[268] якая развілася ў савецкі час у ходзе ўрбанізацыі, калі выхадцы з беларускай вёскі траплялі ў асяроддзе рускамоўнай гарадской культуры. Выказваліся меркаванні, што трасянка па генезісу падобная з мовамі піджын або з крэольскімі мовамі,[269] але эксперты не

266 Гл. спасылку 257.

267 UNESCO, *Interactive Atlas of the World's Languages in Danger.* Ёсць на: http://www. unesco. org/culture/languages-atlas/en/atlasmap.html.

268 У трасянцы выкарыстоўваецца руская і беларуская лексіка, але беларуская фанетыка і граматыка.

269 Піджын – спрошчаная мова для забеспячэння камунікацыі паміж дзвюма групамі, якія не валодаюць мовай адзін аднаго; паміж групамі першапачаткова назіраецца моўны бар'ер. Крэольскага мова – наступны этап развіцця піджын, калі агульная спрошчаная мова развіваецца і робіцца самастойнай мовай.





згодныя з падобнай трактоўкай хаця б з-за відавочнай блізкасці беларускай і рускай моў.[270]

Праведзенае ў 2008 г. замежнымі навукоўцамі апытанне ў сямі беларускіх гарадах[271] паказвае, што больш за трацінy (37,6%) беларусаў-гараджан лічаць змяшаную мову сваёй роднай мовай (48,6% назвалі ў якасці такой беларускую і 29,6% рускую мову).[272] 43,4% беларускіх рэспандэнтаў у штодзённай практыцы выкарыстоўваюць пераважна рускую мову з даданнем беларускіх слоў; 41,0% выкарыстоўваюць змешаную мову, 11,2% – нарматыўную рускую. Нарматыўную беларускую ці беларускую з даданнем рускіх слоў выкарыстоўваюць усе разам 4,4%. Пры параўнанні розных пакаленняў высвятляецца, што ў самых маладых рэспандэнтаў адбываецца некаторае пераразмеркаванне пераваг ад змешанай мовы (33,4%) на карысць рускай мовы з даданнем беларускіх слоў (50,2%).[273] Пры гэтым адукацыйны ўзровень беларусаў з роднай беларускай, змяшанай і рускай мовай прыкладна аднолькавы (у апошняй групе толькі прыкметна большая доля людзей з вышэйшай адукацыяй).[274] Гэта абвяргае распаўсюджанае меркаванне аб трасянцы як мове толькі малаадукаваных людзей.

Трасянка стыгматызаваная і праўладнымі, і «апазіцыйнымі» спецыялістамі, і яе фактар звычайна ігнаруецца ў навуковых даследаваннях, пры правядзенні перапісаў. Аднак з улікам цяперашняй моўнай сітуацыі і пасіўнай моўнай палітыкі ўладаў у трасянкі маюцца магчымасці стаць аўтаномнай мовай і нават канчаткова замацавацца ў якасці другой асноўнай (разам з рускай) мовай у гарадскім асяроддзі. Калі трасянка стане новай рэгіянальнай мовай, то згодна з найбольш развітым еўрапей-

270 Kittel B., Lindner D., Tesch S., Hentschel G. “Mixed Language Usage in Belarus: The Sociostructural Background of Language Choice”, *International Journal of the Sociology of Language*, 2010, No. 206, pp. 51–52.

271 Апытанне рабілася восенню 2008 г. па рэпрэзентатыўнай выбарцы. Усяго было 1400 рэспандэнтаў (200 у кожным з сямі гарадоў); улічаны адказы толькі 1230 рэспандэнтаў – этнічных беларусаў.

272 Сума працэнтаў перавышае 100, бо было магчыма даць некалькі варыянтаў адказу. Гл. спасылку 270, p. 53.

273 *Ibid.*, p. 63.

274 *Ibid.*, p. 60.

скім стандартам гэта будзе прадугледжваць як пэўную абарону самой мовы, так і моўных правоў яе носьбітаў. Але ў любым выпадку мясцовая экспертная супольнасць не гатова пакуль да абмеркавання гэтага пытання, лічачы трасянку толькі цяжкой (і часовай) спадчынай перыяду моўнай русіфікацыі.

***Статус рускай і беларускай мовы***

Пасля 1994 г. дзяржава, па сутнасці, спыніла беларусізацыю як паслядоўную палітыку па ўмацаванню пазіцый беларускай мовы і пашырэнню яго выкарыстання ў розных сферах жыцця. Моўная палітыка ўладаў стала шмат у чым рэактыўнай. Фактычнае выкарыстанне ў Беларусі дзвюх моў было фармальна прызнана праз унясенне папраўкі у 1996 г. у артыкул 17 Канстытуцыі краіны. Калі на момант прыняцця асноўнага закона за рускай прызнавалася толькі права свабоднага карыстання ў якасці «мовы міжнацыянальных зносін», то зараз яна аб'яўлялася дзяржаўнай мовай, нароўні з беларускай. Застаўся без змен артыкул 50 Канстытуцыі, згодна з якім «кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін. Дзяржава гарантуе ў адпаведнасці з законам свабоду выбару мовы выхавання і навучання».

У адпаведнасці з артыкулам 2 Закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» дзяржава павінна забяспечваць усебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

У адрозненне ад многіх іншых краін, якія маюць больш за адну афіцыйную мову, у Беларусі ў законе ўстаноўленая альтэрнатыўнасць выкарыстання альбо беларускай, альбо рускай мовы (а не абавязковасць выкарыстання абедзвюх моў ці мовы, абранай грамадзянінам). Напрыклад, артыкул 3 гарантуе права звяртацца да ўладаў на беларускай, рускай або іншай прымальнай для бакоў мове. Аднак рашэнне па сутнасці звароту афармляецца на беларускай або рускай мове, г. зн. па меркаванні чыноўнікаў. Тым не менш службовыя асобы і работнікі дзяржаўнай і прыватнай сферы абавязаны валодаць абедзвюма мовамі ў неабходным для працы аб'ёме (арт. 4). Службовыя асобы не маюць права адмаўляцца ад прыёму і разгляду дакументаў на дзяржаўных мовах (арт. 5).





Характэрна, што акты дзяржаўных органаў і органаў мясцовага кіравання і самакіравання павінны друкавацца, а справаводства весціся альбо на абедзвюх дзяржаўных мовах альбо на адной з іх (арт. 7-8). Беларуская або руская з'яўляюцца мовай судаводства (арт. 14), мовай вядзення спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях (арт. 15), мовай натарыяльнага справаводства (арт. 16), мовай пракурорскага нагляду (арт. 17), мовай юрыдычнай дапамогі (арт. 18) і нават вайсковай службы (арт. 20).

Формула «беларуская і (або) руская мова» выкарыстоўваецца для вызначэння мовы навучання і выхавання пры атрыманні дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай, адукацыі пасля ВНУ і дадатковай адукацыі (арт. 22-24), а таксама ў сферы культуры (арт. 26), СМІ (арт. 27), мовы аб'яў, паведамленняў і рэкламы (арт. 29). Пры гэтым маркіроўка тавараў, этыкеткі на таварах, інструкцыі па карыстанню таварамі выконваюцца на беларускай або рускай мове (арт. 30).

Такое заканадаўчае рэгуляванне прыводзіць да таго, што на практыцы ў многіх галінах жыцця па дэмаграфічных, гістарычных і іншых прычынах назіраецца безальтэрнатыўнае выкарыстанне толькі рускай мовы. Толькі ў вельмі нешматлікіх галінах дамінуе беларуская (напрыклад, на геаграфічных паказальніках).[275]

***Сістэма адукацыі***

Згодна з часткай 1 артыкула 90 Кодэкса аб адукацыі, беларуская і руская мовы з'яўляюцца асноўнымі мовамі навучання і выхавання. Пры гэтым дзяржава гарантуе права выбару навучання і выхавання на адной з дзвюх дзяржаўных моў. Мова навучання і выхавання вызначаецца заснавальнікам установы адукацыі.

Па афіцыйных дадзеных, у 2011/2012 навучальным годзе ў групах устаноў дашкольнай адукацыі выхаваўцы мелі зносіны на беларускай

275 Згодна артыкула 17 Закона «О наименованиях географических объектов», тапонімам назвы прысвойваюцца на беларускай мове, з якога спосабам транслітарацыі перадаюцца на рускую. На практыцы назвы населеных пунктаў на вулічных паказальніках звычайна пішуцца толькі на беларускай мове. Гл. Закон Республики Беларусь от 16 ноября 2010 г. № 190–З «О наименованиях географических объектов».

мове з 12% усіх дзяцей. У дзённых установах агульнай сярэдняй адукацыі на беларускай мове вывучалі ўсе прадметы каля 18% школьнікаў. Ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі на пачатак навучальнага года на рускай і беларускай мовах навучалася 14% усіх навучэнцаў, на беларускай мове каля 1%. Ва ўстановах вышэйшай адукацыі гэтыя паказчыкі склалі адпаведна 37% (ад колькасці ўсіх студэнтаў) і 0,9%.[276]

Эксперт І. Уласюк адзначае, што ў сучаснай Беларусі няма ні адной вышэйшай навучальнай установы, дзе б усё навучанне адбывалася па-беларуску. Гэта шмат у чым адлюстроўвае сітуацыю ў сярэдняй школе, дзе нязначная доля навучаецца на беларускай мове. Гэта сітуацыя ўплывае на выбар бацькамі мовы навучання для сваіх дзяцей, асабліва ў старэйшых класах школы.[277] Адзін з удзельнікаў фокус-групы, арганізаванай БХК, паведаміў:

> *Амаль няма магчымасці навучацца па-беларуску. Толькі калі ў вёску ехаць. У вышэйшых навучальных установах – то і пагатоў. Даводзіцца цалкам пераходзіць на рускую мову і пакутаваць ад таго, што нават працы, напісаныя на беларускай мове, не прымаюць. Адмаўляліся прымаць працы ва ўніверсітэце, а абмеркаванне дысертацыі ператваралася ў філалагічны спарынг, які суправаджалі каментарыі зняважальнага характару.*[278]

Хоць прынцып добраахвотнасці выбару адной з дзвюх дзяржаўных моў знаходзіцца ў адпаведнасці з міжнароднымі праваабарончымі стандартамі, адсутнасць паўнавартаснай сістэмы беларускамоўнай адукацыі на ўсіх узроўнях, асабліва ў ВНУ, ставіць розныя групы жыхароў краіны ў няроўнае становішча ў залежнасці ад іх моўных пераваг.

276 Гл. спасылку 265.

277 Ulasiuk I. *Language Policies and Law in Education in Post-Soviet Belarus*, ECMI Working Paper No. 50, September 2011, Flensburg: ECMI, 2011, p. 8.

278 Фокус-група экспертаў (Мінск, агульная колькасць 10 чал., узрост 29-64 гады), праведзена БХК 2-16 снежня 2011 г.





### *Доступ да тавараў і паслуг*

Праблемы з выкарыстаннем беларускай мовы ў сферы гандлю і паслуг былі адзначаны ўдзельнікам фокус-групы БХК:

> *Часам прадаюць не той тавар або адмаўляюцца абслугоўваць з-за таго, што звяртаюся па-беларуску, пры гэтым камэнтуюць: «Вы, што, не можаце па-нармальнаму гаварыць?» Або: «Вы – апазіцыя, БНФ». Пара яркіх выпадкаў – маршрутка не спынілася на маім прыпынку. Паслугі і тавары ў прынцыпе даступныя, але паспрабуй растлумач, калі кажаш «кава», атрымліваеш какаву, а калі «гарбата», то ўвогуле «завісаюць». Асаблівыя складанасці – у адміністрацыйнай і медыцынскай сферах. (...) А лекарам наогул цяжка растлумачыць, што баліць. На ўсялякі выпадак, размаўляю па-руску, раптам што-небудзь не тое адрэжуць.*[279]

Адсутнасць балансу ў выкарыстанні дзвюх дзяржаўных моў у сферы гандлю і паслуг была прызнана і з боку беларускіх судовых інстанцый. Напрыклад, у 2003 г. у Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь звярнулася грамадскае аб'яднанне «Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны». У звароце былі прыведзены прыклады парушэння фактычнай роўнасці дзяржаўных моў, у прыватнасці, на Беларускай чыгунцы, пры атрыманні грамадзянамі страхавых сведчанняў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, выпуску ў абарот банкаўскіх пластыкавых картак, пры маркіроўцы тавараў.

Разгледзеўшы дадзены зварот 4 снежня 2003 г., Канстытуцыйны Суд прызнаў невыкананне балансу пры выкарыстанні дзяржаўных моў пры іх фармальна-юрыдычным раўнапраўі. Пры гэтым суд спасылаўся на артыкул 17 Канстытуцыі (дзяржаўнымі мовамі з'яўляюцца беларуская і руская мовы), на артыкул 2 Закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» (забеспячэнне ўсебаковага развіцця і функцыянавання беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця) і артыкул 13 гэ-

279 Там жа.

тага ж закона (на транспарце, у гандлі, у сферы медыцынскага і пабытавага абслугоўвання ўжываецца беларуская або руская мова). Суд звярнуўся ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з прапановай разгледзець дадзеную праблему і ўнесці ў Закон «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» і іншыя акты заканадаўства змены і дапаўненні, здольныя забяспечыць фактычную роўнасць дзяржаўных моў.[280]

Нягледзячы на зварот Канстытуцыйнага Суда, артыкул 13 Закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» належным чынам зменены не быў. Цяперашняя яго рэдакцыя не дазваляе чалавеку атрымаць інфармацыю канкрэтна на адной з дзяржаўных моў, напрыклад, у гандлі або сферы медыцынскага абслугоўвання. На практыцы праблема ў некаторай ступені здымаецца, дзякуючы шырокаму распаўсюджванню беларускай мовы ў грамадстве, а таксама блізкасцю беларускай і рускай мовы (гэтая блізкасць дазваляе разумець іншую мову нават без спецыяльнай папярэдняй падрыхтоўкі).

***Мова як штучны маркер палітычнай апазіцыйнасці***

Характэрна, што вышэйшае кіраўніцтва, нават тыя, хто добра валодае беларускай мовай, напрыклад, Прэзідэнт А. Лукашэнка, выключна рэдка выкарыстоўваюць яе ў публічных зваротах і заявах.

Асаблівасцю сітуацыі ў Беларусі таксама з'яўляецца суаднясенне ў публічнай прасторы, не толькі ўладамі, але і часткай насельніцтва, выкарыстання беларускай мовы з палітычнай апазіцыяй. Гэтаму ў пэўным сэнсе спрыяе папулярнасць у шэрагах апазіцыянераў розных этнанацыяналістычных канцэпцый.

У ходзе работы фокус-групы экспертаў, якая склікалася БХК, рэспандэнты ўказалі праявы дыскрымінацыйнага стаўлення ў сувязі з публічным выкарыстаннем роднай беларускай мовы[281] (гл. ніжэй). Падобнае

280 Пресс-центр Конституционного Суда Республики Беларусь, «Сообщение от 15 декабря 2003 г. «Проблема равенства русского и белорусского языков»», *Пресс-центр Конституционного Суда Республики Беларусь.* Ёсць на: http://www.kc.gov.by.

281 Фокус-група экспертаў (Мінск, агульная колькасць 10 чал., узрост 29-64 гады), рабілася БХК 2-16 снежня 2011 г.





стаўленне часам гавораць пра агульную праблему недахопу цярпімасці да «іншых» груп насельніцтва.

Закон «Аб мовах Рэспублікі Беларусь» (арт. 6) забараняе ўсялякія прывілеі ці абмежаванні правоў асобы па моўных прыкметах, а таксама загадвае ўстанавіць адказнасць за «публічную абразу, ганьбаванне дзяржаўных і іншых нацыянальных моў, стварэнне перашкод і абмежаванняў у карыстанні імі, пропаведзь варожасці на моўнай глебе». Аднак на практыцы публічнае выкарыстанне (нарматыўнай) беларускай мовы можа паставіць чалавека ў слабое становішча, выступаючы ў якасці маркера палітычнай нелаяльнасці рэжыму. Напрыклад, удзельніца фокус-групы БХК паведаміла:

> *Аднойчы я была арыштаваная ў дзень мітынгу апазіцыі (у 1999 г.): пацвярджэннем майго ўдзелу для супрацоўнікаў міліцыі і для суда было тое, што я размаўляла па-беларуску.*[282]

Такое стаўленне з боку праваахоўнікаў з'яўляецца, па сутнасці, разнавіднасцю расавага (этнічнага) прафілявання.

282 Там жа.

**Прыклад 6.**
**Сведчанні экспертаў па пытанні выкарыстання беларускай мовы**

**Кацярына, 64 гады:** Магчымасць выкарыстання беларускай мовы ёсць, аднак людзі, якія размаўляюць на ёй, разглядаюцца ў грамадстве як апазіцыянеры. Адна з нашых студэнтак гаварыла па-беларуску толькі на першых курсах, пазней перайшла на рускую, патлумачыўшы гэта негатыўнай рэакцыяй з боку астатніх, у тым ліку выкладчыкаў.

**Алег, 40 гадоў:** Выкарыстанне беларускай, моў этнічных груп – цыганоў, народаў Каўказа і Сярэдняй Азіі – выклікае негатыўную рэакцыю ў людзей.

**Наталля, 29 гадоў:** Беларуская мова з'яўляецца не проста сродкам камунікацыі, яна палітычна маркіравана, у яе асаблівы культурны статус, для яе адведзены пэўныя сферы жыцця, напрыклад, у мяне заўсёды пыталіся, ці не з'яўляюся я выкладчыкам беларускай мовы, а таксама не студэнтка я філалагічнага або гістарычнага факультэта, альбо ці не належу я да пэўнай палітычнай партыі.

### *Вывады*

Беларуская дзяржава не забяспечвае на практыцы роўнасць магчымасцяў для атрымання паўнавартаснай адукацыі на беларускай мове на ўсіх узроўнях, а таксама недыскрымінацыйны доступ да тавараў і паслуг для тых жыхароў краіны, якія ў публічнай практыцы аддаюць перавагу беларускай мове. Пры гэтым варта адзначыць, што фармальна-юрыдычная роўнасць дзвюх дзяржаўных моў прадугледжана беларускай Канстытуцыяй і іншымі законамі.

Хоць жыхары з роднай беларускай мовай у маштабах Беларусі не з'яўляюцца меншасцю, яны з'яўляюцца ёю сярод гарадскога насельніцтва. Гэта вымагае ад дзяржавы прыняцця асаблівых мер падтрымкі і абароны іх правоў у гарадах.[283] Таксама негатыўныя наступствы, з якімі сутыкаюцца беларускамоўныя жыхары з-за іх (меркаванай) асацыяцыі з палітычнай апазіцыяй, сведчаць аб нядзольнасці ўладаў процідзейнічаць моўнай дыскрымінацыі такіх асоб у пэўных сітуацыях і патрабуюць прыняцця адпаведных мер па барацьбе з такімі з'явамі.

## 2.2 Няроўнасць на падставе полу, інваліднасці і сексуальнай арыентацыі

Шэраг праяў няроўнасці ў беларускім грамадстве можна растлумачыць традыцыяналісцкімі ўстаноўкамі гэтага грамадства, асабліва ў тым, што тычыцца ўяўленняў аб узаемаадносінах паміж мужчынам і жанчынай, сацыяльнай ролі жанчыны, статусу людзей з абмежаванымі псіхічнымі і фізічнымі магчымасцямі, цярплівасці да іншага стылю жыцця і характару сямейных адносін.

Намаганні па эканамічнай мадэрнізацыі ў беларускай дзяржаве вядуцца шмат у чым з апорай на кансерватыўныя сілы грамадства, што дрэнна спрыяе выкараненню традыцыяналісцкіх установак. Больш за тое, узмоцненая ў апошнія гады эканамічная стратыфікацыя грамадства спрыяе аднаўленню традыцыйных уяўленняў аб маскуліннасці, якія пачалі размывацца ў савецкі перыяд.[284] Патэрналісцкае стаўленне да ўразлівых груп з боку дзяржавы (напрыклад, да інвалідаў) бярэ пачатак яшчэ ў савецкай мінуўшчыне і працягваецца на фоне захавання амаль поўнага дзяржаўнага кантролю над эканомікай. У той жа час апошняя акалічнасць дазваляе дзяржаве ўжываць у інтарэсах уразлівых груп на рынку працы такія меры падтрымкі, якія наўрад ці магчымыя ў дзяржавах з развітай рынкавай эканомікай.

283 Пры гэтым магчымыя меры прымусу і / або паслядоўныя абмежаванні ў дачыненні да іншых моў павінны быць збалансаваным і не павінны весці да моўнай дыскрымінацыі сяброў іншых лінгвістычных груп. Гл., напр., крытыку супярэчлівай моўнай палітыкі Эстоніі: Amnesty International, *Estonia: Linguistic Minorities in Estonia: Discrimination Must End*, 7 December 2006, EUR 51/002/2006. Ёсць на: http://www.amnesty.org/en/library/info/EUR51/002/2006. Руская кароткая версія даклада ёсць там жа.

284 Аб «росце маскуліннасці» ў постсавецкі перыяд: Гл. спасылку 63, pp. 653–654.

### 2.2.1 Праблема гендарнай няроўнасці (жанчыны)

На пачатак 2011 г. усё насельніцтва Беларусі складала 9481,1 тыс. чал., уключаючы 4408,1 тыс. мужчын і 5073,0 тыс. жанчын.[285] У 2009 г. чаканая працягласць жыцця пры нараджэнні складала 76,4 для жанчын і 64,7 для мужчын (для гарадскога насельніцтва гэтыя паказчыкі былі вышэй, чым для сельскага).[286]

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь акрамя агульных прынцыпаў роўнасці перад законам і недыскрымінацыі (арт. 22), абвяшчае:

> *Жанчынам забяспечваецца прадастаўленне роўных з мужчынамі магчымасцяў у атрыманні адукацыі і прафесійнай падрыхтоўцы, у працы і прасоўванні па службе (рабоце), у грамадска-палітычнай, культурнай і іншых сферах дзейнасці, а таксама стварэнне ўмоў для аховы іх працы і здароўя.*[287]

Канстытуцыйныя нормы адлюстраваны ў асобных законах, якія прама ці ўскосна рэгламентуюць пытанні жыццядзейнасці мужчын і жанчын.[288]

У Беларусі сёння дзейнічае Нацыянальны план дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці на 2011–2015 гг.[289] У верасні 2011 г. была створана рабочая група для распрацоўкі праекта Канцэпцыі па забеспячэнні гендарнай роўнасці ў Рэспубліцы Беларусь.[290] Нягледзячы на адсутнасць у беларускім заканадаўстве дыскрымінацыйных палажэнняў у адносінах да жанчын, у рэальным жыцці назіраецца

285 Гл. спасылку 147. С. 16.

286 *Женщины и мужчины Республики Беларусь. Статистический сборник*, Минск: Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2010. Табл. 1.6.

287 Конституция Республики Беларусь (ст. 32).

288 Гл. больш падрабязна ў главе 3 гэтага даклада.

289 Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 16 августа 2011 г. № 1101 «Об утверждении Национального плана действий по обеспечению гендерного равенства в Республике Беларусь на 2011–2015 гг.».

290 Приказ министра труда и социальной защиты Республики Беларусь от 1 сентября 2011 г. № 90. Ёсць на: http://www.mintrud.gov.by.





разрыў паміж фармальна-юрыдычным і субстантыўным раўнапраўем мужчын і жанчын. На думку аўтараў альтэрнатыўнай справаздачы Рэспублікі Беларусь па выкананні Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (2009 г.), найбольш вострымі праблемамі жанчын у сучаснай Беларусі з'яўляюцца: беднасць і дыскрымінацыя на рынку працы; пагаршэнне стану здароўя жанчын, у тым ліку і рэпрадуктыўнага; захаванне ў грамадскай свядомасці традыцыйных гендарных стэрэатыпаў; сур'ёзныя перашкоды на шляху ўдзелу жанчын у дзейнасці няўрадавых арганізацый і палітычных партый; гвалт над жанчынамі.[291]

У цэлым, у беларускіх уладаў няма разумення таго, што пераадоленне дыскрымінацыі і дасягненне роўнасці паміж паламі патрабуюць змены саміх прынцыпаў палітычнага мыслення, якія павінны грунтавацца не на забеспячэнні ўзнаўлення функцый (вытворчай і / або рэпрадуктыўнай), а на развіцці і захаванні правоў кожнага чалавека паасобку. Сучасная сітуацыя ў Беларусі характарызуецца, з аднаго боку, стабільнай занятасцю жанчын у публічнай дзяржаўнай сферы дзякуючы дзяржаўнай сацыяльна арыентаванай палітыцы, а з другога – неаслабным гендарным традыцыяналізмам.

Бясспрэчным міжнародным стандартам у кантэксце гендарнага раўнапраўя з'яўляецца ратыфікаваная Беларуссю Канвенцыі ААН аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын. Артыкул 11 Канвенцыі падкрэслівае, акрамя іншага, права на роўныя магчымасці пры найме на працу; права на свабодны выбар прафесіі або роду працы, на прасоўванне ў службовых адносінах; права на роўнае ўзнагароджанне. Акрамя таго, ад дзяржавы патрабуецца прыняць адпаведныя меры, каб забараніць, пад пагрозай прымянення санкцый, звальненне з працы на падставе цяжарнасці ці адпачынку па цяжарнасці і родах або дыскрымінацыю з прычыны сямейнага становішча пры звальненні. Згодна з артыкулам 10 Канвенцыі дзяржава павінна

291 Петина Л., Тонкачева Е., Смолянко О., Сержан Т., Ефимова Н., Еськова Е. *Альтернативный отчет Республики Беларусь по выполнению Конвенции о ликвидации всех форм дискриминации в отношении женщин. Обзор 2009 г.* Международная гендерная программа «Шаг к равенству». С. 12. Ёсць на: http://gender.do.am/publ/alternativnyj_otchjot_ respubliki_ belarus/4-1-0-164.

забяспечыць на аснове роўнасці мужчын і жанчын, акрамя іншага, доступ да аднолькавых праграм навучання і ліквідацыю любой стэрэатыпнай канцэпцыі ролі мужчын і жанчын на ўсіх узроўнях і ва ўсіх формах навучання.

Згодна з Канвенцыяй дзяржава павінна прыняць адпаведныя меры, каб змяніць сацыяльныя і культурныя мадэлі паводзін мужчын і жанчын з мэтай дасягнення выкаранення стэрэатыпаў і скасавання звычаяў і ўсёй іншай практыкі, заснаваных на ідэі непаўнавартасці ці перавагі аднаго з палоў або стэрэатыпнасці ролі мужчын і жанчын; забяспечыць, каб сямейнае выхаванне ўключала ў сябе правільнае разуменне мацярынства як сацыяльнай функцыі і прызнанне агульнай адказнасці мужчын і жанчын за выхаванне і развіццё сваіх дзяцей пры ўмове, што ва ўсіх выпадках інтарэсы дзяцей з'яўляюцца пераважнымі (арт. 5).

***Сітуацыя на рынку працы***

*Беспрацоўе і заработная плата.* Сітуацыя на беларускім рынку працы ў аспекце полу можа ацэньвацца неадназначна; аднак па цэлым шэрагу параметраў і ў некаторых абласцях жанчыны ў параўнанні з мужчынамі знаходзяцца ў загадзя больш хісткім становішчы.

Афіцыйная беларуская статыстыка аперыруе толькі дадзенымі аб беспрацоўных, зарэгістраваных у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Відавочна, што такія дадзеныя заніжаюць паказчыкі беспрацоўя ў краіне, якія вылічваюцца паводле звычайнай міжнароднай методыкі. Магчымасць параўнаць абедзве методыкі падліку дазваляюць дадзеныя перапісу кастрычніка 2009 г., якія можна супаставіць з бягучымі дадзенымі па беспрацоўным на канец снежня 2009 г. Напрыклад, агульная колькасць «зарэгістраваных» беспрацоўных жанчын складала ў канцы 2009 г. 23 тыс. чал. (57% ад агульнай колькасці). Гэты апошні паказчык быў прыкметна вышэй у 2005 г. (69%), але ніжэй ў 2010 г. (53%).[292] У той жа час дадзеныя перапісу 2009 г. далі вынік у 104.713 беспрацоўных жанчын, статус якіх

292 Гл. спасылку 147. С. 29.





вызначаўся па звычайнай міжнароднай методыцы[293] (36% ад агульнай колькасці беспрацоўных). У цэлым варта адзначыць, што, па дадзеных перапісу, узровень беспрацоўя сярод жанчын быў прыкметна ніжэй, чым у мужчын: адпаведна 4,75 і 7,68% (на вёсцы – 4,48 і 8,59%). Сярод асобаў з вышэйшай адукацыяй у жанчын ўзровень беспрацоўя складаў 2,93%, а сярод мужчын – 4,07%.[294] Можна зрабіць выснову, што ў 2009 г. жанчыны не былі непрапарцыйна прадстаўлены сярод беспрацоўных. Няма падстаў лічыць, што сітуацыя прыкметна пагоршылася да часу напісання гэтага даклада.

У той жа час у Беларусі назіраецца розніца ў аплаце працы мужчын і жанчын, прычым па ўсіх галінах эканомікі. У снежні 2009 г. суадносіны сярэдняга заробку жанчын і заробку мужчын у цэлым складалі 74,6% (924,7 тыс. бел. руб. у жанчын і 1240,2 тыс. бел. руб. у мужчын). Найменшыя адрозненні назіраліся ў сельскай і лясной гаспадарцы, найбольшыя – у такіх галінах, як невытворчыя віды побытавага абслугоўвання насельніцтва, а таксама ў сферы аховы здароўя, фізічнай культуры і сацыяльнага забеспячэння.[295]

Больш нізкі ўзровень сярэдняга заробку жанчын абумоўлены цэлым шэрагам прычын, напрыклад, іх канцэнтрацыяй на малааплатных працоўных месцах, меншай колькасцю жанчын сярод кіраўнікоў, неабходнасцю для многіх жанчын сумяшчаць працу з выкананнем шматлікіх хатніх абавязкаў.

Прыкладам тыповай «жаночай» галіны эканомікі з'яўляецца сфера аховы здароўя. У 2009 г. жанчыны складалі 95,5% ад усяго сярэдняга медыцынскага персаналу. Сярод лекараў іх доля была роўная 67,1%. Пры гэтым жанчыны-лекары былі горш прадстаўлены сярод тых, хто меў вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.[296] Гэтымі фактарамі можна патлумачыць тое, што ў такой галіне эканомікі, як ахова здароўя, фізічная культура і сацыяльнае забеспячэнне сярэдні заробак жанчын

293 Беспрацоўе сярод эканамічна актыўнага насельніцтва працаздольнага ўзросту (мужчыны 16-59, жанчыны 16-54).

294 Гл. спасылку 240.

295 Гл. спасылку 286. Табл. 4.20.

296 Там жа. Табл. 2.20.

у канцы 2009 г. складала 794,6 тыс. бел. руб., а мужчын – 1281,3 тыс. бел. руб.[297] (Варта таксама адзначыць, што заробкі жанчын у гэтай сферы былі ніжэйшымі за сярэднія па эканоміцы, г. зн. меншымі, чым 924,7 тыс. бел. руб. – гл. вышэй). Заўважым, што ў гэтай жа галіне ў канцы 2008 г. кіраўнікамі з'яўляліся 11,3% ад усіх занятых тут мужчын і толькі 4,5% жанчын.[298]

Нізкія заробкі вымушаюць жанчын – медыцынскіх работнікаў, педагогаў і да т. п. – працаваць не на адну, а на паўтары ці дзве стаўкі на шкоду ўласным здароўю і развіццю. Іншы фактар дыскрымінацыі, адзначаны экспертамі, тычыцца каэфіцыентаў і надбавак да асноўнай заработнай платы, якія вызначае наймальнік. Гэтыя надбаўкі з'яўляюцца значнай часткай рэгулярнага зарабку. Іх велічыня нярэдка вызначаецца працадаўцам суб'ектыўна, зыходзячы з яго ўласных гендарных стэрэатыпаў (напрыклад, што мужчына – карміцель сям'і, таму яму патрэбны больш высокі даход і да т. п.).[299]

Пры гэтым варта адзначыць, што на 1 лістапада 2009 г. сярод дзяржаўных служачых, занятых у органах дзяржаўнага кіравання, жанчыны складалі 67,4%, у судовых і юрыдычных установах – 74,0%. Сярод кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іх намеснікаў жанчын было ўсяго 19,6%, але сярод кіраўнікоў галоўных упраўленняў, упраўленняў, аддзелаў, сектараў і іх намеснікаў, памочнікаў кіраўніка арганізацыі, дарадцаў, кансультантаў – 49,8%.[300] У ніжняй і верхняй палаце парламента жанчыны-дэпутаты складалі прыкладна трацін.[301] Жанчына з'яўляецца адным з 24 міністраў цяперашняга ўрада Беларусі.[302]

*Рынак працы і адукацыя.* Узровень адукацыі жанчын, што працуюць, у цэлым вышэй, чым у працоўных мужчын: у 2009 г. сярод жанчын

297 Там жа. Табл. 4.20.

298 Там жа. Табл. 4.4 і 4.5.

299 Гл. спасылку 291. С. 22.

300 Гл. спасылку 286. Табл. 4.13 і 4.14.

301 Там жа. Табл. 4.12. Дадзеныя на 1 студзеня 2010 г.

302 Министр труда и социальной защиты М. Щеткина – гл. сайт Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь на: http://www.government.by.





амаль 55% мелі вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю, а сярод мужчын толькі 37%.[303] Больш высокі адукацыйны ўзровень жанчын у Беларусі захоўваецца на працягу доўгага перыяду, хоць сёння колькасць жанчын, якія вучацца, толькі нязначна пераважае над колькасцю мужчын – 51,1% супраць 48,9%.[304] З аднаго боку, фактар адукаванасці жанчын у Беларусі паўплываў на фарміраванне ў іх каштоўнасцяў прафесіяналізму, што прывяло да некаторага павышэнню іх статусу на рынку працы і даходаў.[305] З іншага – высокі ўзровень адукацыі жанчын некалькі маскіруе глыбіню гендарных праблем у Беларусі, нівеліруючы паказчыкі адрозненняў паміж мужчынам і жанчынай. Калі б узровень адукацыі жанчын і мужчын быў аднолькавым, няроўнасць у сферы працы і асабліва ў сферы прыняцця рашэнняў была б больш відавочная і глыбокая.[306]

Пераважна «жаночымі» з'яўляюцца гуманітарная і сацыяльная сферы адукацыі. Калі разглядаць студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі (на пачатак 2009/2010 навучальнага года), то дзяўчыны-студэнткі дамінуюць на такіх кірунках, як «педагогіка» (76,7%), «гуманітарныя навукі» (81,2%), «камунікацыі», «права», «эканоміка», «кіраванне», «эканоміка і арганізацыя» (72,6%), «экалагічныя навукі» (79,9%), «сацыяльная абарона» (90,9%), «грамадскае харчаванне, гатэльнае і побытавае абслугоўванне» (82,6%). У сферы «тэхнікі і тэхналогій» усяго 28,0% дзяўчат-студэнтак.[307] Такія адрозненні можна растлумачыць дзвюма супрацьлеглымі тэндэнцыямі, якія праявіліся яшчэ ў савецкі час: па-першае, традыцыя савецкай адукацыйнай палітыкі, якая першапачаткова была арыентавана на роўны доступ жанчын і мужчын да адукацыі; па-другое, нізкі ўзровень аплаты працы спецыялістаў многіх галін і, адпаведна,

303 Гл. спасылку 286. Табл. 4.10 и 4.11.

304 Там жа. Табл. 3.1. Дадзеныя на пачатак 2009/2010 навучальнага года.

305 Терещенко О. *Вверх по лестнице, ведущей вниз? Парадоксы эмансипации по-советски*, Минск, 2000; Терещенко О. «Профессионализм – новая составляющая успеха?» // *Социологическая наука и современность: тезисы международной научной конференции*, Минск, 2002.

306 Терещенко О. *Гендерные аспекты бедности в белорусском обществе*, [С. 10]. Ёсць на: un.by/pdf/statistics/8/text2.doc. Артыкул напісаны ў 2005 г. у якасці справаздачы для Праекта ПРААН «Садзейнічанне ў падрыхтоўцы асноўных напрамкаў нацыянальнай стратэгіі папярэджання беднасці ў Рэспубліцы Беларусь».

307 Гл. спасылку 286. Табл. 3.2.

нізкі прэстыж вышэйшай адукацыі з 1970-х гг. Такім чынам, жанчыны былі выцесненыя ў тыя сферы дзейнасці, якія сталі менш аплатнымі і менш прэстыжнымі.

Наяўныя ўстаноўкі ў сферы адукацыі, па сутнасці, аднаўляюць гендарны дысбаланс на рынку працы. Гендарныя стэрэатыпы замацоўваюцца ўжо ў школе, дзе ў выкарыстоўваемай вучэбнай літаратуры і дапаможніках часам ёсць гендарна незбалансаваныя палажэнні.[308] Гендарныя аспекты школьнай праграмы па многіх дысцыплінах патрабуюць сур'ёзнай перапрацоўкі.

Камітэт ААН па правах дзіцяці рэкамендаваў Беларусі ўзмацніць барацьбу з сексісцкімі і расісцкімі ўстаноўкамі і паводзінамі.[309]

Прамая і ўскосная палавая дыскрымінацыя выяўляецца ў існаванні ў Беларусі спецыяльных устаноў адукацыі і прадметаў, у аснову якіх пакладзены прынцып паасобнага навучання. Напрыклад, у Кодэксе аб адукацыі прапісваюцца асаблівасці дзейнасці сувораўскіх вучэльняў, якія набіраюць толькі хлопчыкаў для падрыхтоўкі па спецыяльнасцях ваеннага і спартыўнага профілю.[310] Асноўнымі заказчыкамі гэтай адукацыйнай установы выступаюць розныя воінскія фарміраванні, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях). Хоць у беларускіх жанчын таксама ёсць права і магчымасць трапіць у гэтыя структуры, у іх няма магчымасці атрымаць для гэтага спецыяльную падрыхтоўку.

У Беларусі ўяўленне аб прафесіі, напрыклад, работніка міліцыі звязана з формамі маскуліннасці і грунтуецца на сацыяльна сканструяваным стэрэатыпе, згодна з якім супрацоўнік праваахоўных органаў павінен валодаць фізічнымі ўласцівасцямі менавіта мужчыны. Гэта прыводзіць да адкрытай дыскрымінацыі жанчын пры доступе да спецыялізаванай адукацыі і падтрымлівае палавую сегрэгацыю ў праваахоўнай сферы. Прыкладам такой дыскрымінацыі з'яўляецца прыём у Акадэмію МУС Рэспублікі Беларусь.

У 2010 г. на навучанне ў Акадэмію МУС падалі заявы 1367 кандыдатаў. Па выніках уступных экзаменаў было залічана 627 чалавек. Асобы жаночага полу склалі 5% ад агульнай колькасці залічаных абітурыентаў. На факультэт міліцыі, спецыяльнасць «правазнаўства», прахадны бал для 199 мужчын быў роўны 146, а для 11 прынятых жанчын – 268. На спецыяльнасць «эканамічнае права» прахадны бал для асоб мужчынскага полу быў роўны 165, жаночага – 340 для гараджанак і 248 для асоб з сельскай мясцовасці. На спецыяльнасць «судовая экспертыза» залічаны 27 абітурыентаў (26 мужчын і толькі 1 жанчына). Прахадны бал для асоб мужчынскага полу быў 169, жаночага – 365.[311] Інакш кажучы, для асоб жаночага полу прахадны бал першапачаткова быў значна вышэйшы за прахадны бал для мужчын.

Актывізацыя грамадскай цікавасці да праблемы паступлення жанчын у Акадэмію МУС зусім не прывяла да змены дыскрымінацыйных практык: у 2011 г. наогул не было набору жанчын на факультэт міліцыі і крымінальна-выканаўчы факультэт. Што тычыцца следча-экспертнага факультэта, то прахадныя балы засталіся па-ранейшаму рознымі: на спецыяльнасць «правазнаўства» 170 балаў для мужчын, і 328 для жанчын; на спецыяльнасць «судовая экспертыза» – 180 для мужчын і 311 для жанчын.[312] У 2012 г. набор жанчын на дзённую форму атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ажыццяўляўся толькі па спецыяльнасці «судовая экспертыза» пры прахадным бале 304 (для мужчын 222).[313] Такім чынам, палавая дыскрымінацыя абітурыентаў пры паступленні ў Акадэмію МУС Рэспублікі Беларусь (завы-

308 Гл. напр., наст. выд.: Коновальчик Е. *Воспитание гендерной культуры учащихся*, Минск: Нац. ин-т образования, 2008.

309 Гл. спасылку 239, п. 28.

310 «В суворовские училища принимаются несовершеннолетние граждане Республики Беларусь мужского пола, которым по состоянию на 1 сентября соответствующего учебного года исполняется двенадцать лет (но не более тринадцати лет) и которые завершили обучение в VII классе на II ступени общего среднего образования» (ч. 7 ст. 159 Кодекса об образовании).

311 Интерфакс. «Гендерные страсти в Академии МВД», *Интерфакс.* Ёсць на: http://www.interfax.by.

312 Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь, «Проходной балл, 2011 год, дневная форма получения образования». Ёсць на: http://academy.mia.by.

313 Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь, «Проходной балл, 2012 год, дневная форма получения образования; План приема в Академию МВД Республики Беларусь на 2012 год, бюджетная форма обучения». Ёсць на: http://academy.mia.by.

шаны прахадны бал, адсутнасць прыёму на шэраг спецыяльнасцяў) працягваецца па сёння.

*Дыскрымінацыйныя ўстаноўкі.* На статус жанчын на рынку працы ўплывае гендарная дыскрымінацыя пры працаўладкаванні, прасоўванні па службовай лесвіцы і звальненні. Факты дыскрымінацыйных адносін зафіксаваныя на прадпрыемствах незалежна ад формы ўласнасці, хоць у большай ступені яны, мабыць, характэрныя для недзяржаўнага сектара эканомікі.

У беларускім праве існуюць меры абароны жанчыны з-за яе цяжарнасці, родаў і з-за неабходнасці выконваць сямейныя абавязкі. Працоўны кодэкс[314] устанаўлівае забарону адмаўляць жанчынам у заключэнні працоўнага дагавора і зніжаць ім заробак па матывах, звязаных з цяжарнасцю або наяўнасцю дзяцей ва ўзросце да трох гадоў. Пры адмове ў заключэнні працоўнага дагавора названым катэгорыям жанчын наймальнік абавязаны паведаміць ім матывы ў пісьмовай форме, адмова можа быць абскарджана ў судовым парадку.[315] Аднак паколькі ў краіне няма развітога антыдыскрымінацыйнага заканадаўства, наяўныя сродкі абароны цяжка прымяніць на практыцы. Больш за тое, разлічваючы на беспакаранасць, наймальнік спрабуе пазбегнуць любых абавязацельстваў перад сваімі працаўніцамі-жанчынамі, звальняючыся іх ці адмаўляючы ім у працаўладкаванні па надуманых прычынах (звычайна спасылаючыся на «недастатковы» вопыт працы або ўзровень адукацыі[316]). У цэлым, жанчыны дзетароднага ўзросту асабліва ўразлівыя на рынку працы. Удзельніца фокус-групы жанчын паведаміла БХК:

> *Па першай адукацыі я медыцынскі псіхолаг. Шукала працу ў школе або ў дзіцячых садках. Не памятаю, колькі я прайшла гэтых гутарак, напэўна, каля дзесяці. На працягу двух месяцаў я кожны тыдзень хадзіла на нейкае сумоўе. І ўсюды – адмова. Але ўсюды прычынай адмовы было два моманты: адсутнасць у мяне вопыту, а таксама страх наймальніка, што я выйду замуж, зацяжару і пайду ў дэкрэтны. На кожным сумоўі першае, што пыталіся, гэта замужам я ці не, ці збіраюся замуж і калі збіраюся заводзіць дзяцей. Я казала, што замуж не збіраюся, а дзяцей заводзіць і пагатоў. І вось тут пачыналася самае цікавае: «Усе вы так гаворыце». Пасля гэтага проста не ведаеш, што казаць, як пераканаць наймальніка.*[317]

Дасягненне роўнасці мужчын і жанчын у працоўных адносінах немагчыма без выкаранення патрыярхальных стэрэатыпаў у сям'і. Паводле высноваў В. Цярэшчанкі,

> *Традыцыйныя погляды на месца жанчыны ў сям'і і грамадстве, заніжанае значэнне каштоўнасці грамадскай працы жанчын прыводзіць да несправядлівага размеркавання неаплатнай хатняй працы, што стварае перавагі для мужчын і зніжае канкурэнтаздольнасць жанчын на рынку працы.*[318]

Удзельніца фокус-групы БХК пацвярджае, што жанчыны часам самі згаджаюцца прытрымлівацца такіх патрыярхальных стэрэатыпаў:

> *Вось, ведаеце, жанчыны расказваюць, што мужы сабе мыюць шкарпэткі, трусы. (...) Я ніколі гэтага не дазваляла. Гэта, можа быць, вясковае: жаночая праца ёсць жаночая, мужчынская ёсць мужчынская. Я проста вырасла ў сям'і, дзе адны мужчыны, і ў мужа – усе браты і адна толькі дзяўчынка ў сям'і. У нас два сыны. (...) Я сабе не дазваляла*

314 Трудовой кодекс Республики Беларусь от 26 июля 1999 г. № 296–З.

315 Артыкулы 16 і 268 ПК.

316 Чистякова И., Чуткова И. «Гендерная экспертиза законодательства, регулирующего трудовые отношения» // *Отдел кадров*, апрель 2003, № 4 (27). Ёсць на: otdelkadrov.by/number/2003/4/335.

317 Фокус-група жанчын (Віцебск, агульная колькасць 12 чал., узрост – 25-40 гадоў), праведзена БХК 9 лістапада 2011 г.

318 Гл. спасылку 306.

*трэціраваць мужыкоў, прымушаць іх прыбіраць, мыць і гэтак далей. Гэта проста залішняе, я лічыла, што нельга нахабнічаць. Я і так занадта шмат раблю для сябе, займаюся навукай (…) і яшчэ нешта буду рабіць.*[319]

### *Сямейнае жыццё і хатні гвалт*

У беларускім грамадстве пераважаюць традыцыйныя мадэлі сямейных адносін. Па дадзеных перапісу 2009 г., былі ў шлюбе 61,7% мужчын і 52,4% жанчын. Гэтыя паказчыкі ніжэйшыя за дадзеныя перапісу 1999 г. (адпаведна 65,7 і 56,1%). У 2009 г. 26,7% мужчын і 18,0% жанчын ніколі не былі ў шлюбе, адпаведна 3,6 і 18,4% былі ўдовымі, 7,3 і 10,5% складалі асобы, якія развяліся і разышліся са сваімі сужэнцамі.[320] У тым жа годзе на тысячу жыхароў прыходзілася 8,3 шлюбаў і 3,7 разводаў.[321] Для Беларусі не характэрна вельмі ранняе замужжа: сярэдні ўзрост уступлення ў першы шлюб у 2009 г. быў 24,2 для жанчын і 26,4 для мужчын.[322]

Паводле дадзеных даследавання 2008 г.,[323] галоўным матывам, якім кіруюцца пры ўступленні ў шлюб жанчыны і мужчыны, была «любоў да будучага сужэнца».[324] Апытанне таксама паказала, што для большасці жанчын «ідэальная» і «жаданая» колькасць дзяцей – двое.[325]

319 Фокус-група жанчын (Віцебск, агульная колькасць 12 чал., узрост – 25-40 гадоў), праведзена БХК 9 лістапада 2011 г.

320 Гл. спасылку 147. С. 21.

321 Гл. спасылку 286. Табл. 1.20.

322 Там жа. Табл. 1.29.

323 Даследаванне прычын распаду сем'яў, тэндэнцый змены псіхалогіі ўнутрысямейных паводзін з'явілася мэтай сацыялагічнага даследавання, праведзенага Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ ў ліпені-жніўні 2008 г. Для гэтага даследавання ўжывалася шматступенная камбінаваная выбарка, у якую было ўключана 1500 чалавек, з іх 500 чалавек (250 мужчын і 250 жанчын), якія знаходзяцца ў афіцыйна зарэгістраваным разводзе; 500 чалавек (250 мужчын і 250 жанчын), якія знаходзяцца ў афіцыйна зарэгістраваным шлюбе; 500 чалавек (250 мужчын і 250 жанчын) ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў, якія не ў шлюбе і ніколі не былі ў шлюбе.

324 Гл. спасылку 286. Табл. 7.1.

325 Там жа. Табл. 7.3.





У апошнія гады ў Беларусі хутка скарачалася ўдзельная вага абортаў. Калі паводле афіцыйных дадзеных у 1995 г. на 1 тыс. жанчын ва ўзросце 15-49 гадоў даводзілася 74,9 абортаў і толькі 39,7 родаў, то ў 2009 г. адпаведныя паказчыкі былі 14,1 і 42,4.[326] У Беларусі вельмі нізкі ўзровень мацярынскай смяротнасці: у 2009 г. на 100 тыс. народжаных жывых немаўлятаў толькі адна жанчына памерла ад «ускладненняў, звязаных з цяжарнасцю, родамі або пасляродавага перыяду», што было самым нізкім паказчыкам ва ўсіх краінах СНД, уключаючы Расію.[327]

Даследаванне 2008 г. таксама сведчыць аб традыцыяналісцкіх падыходах да размеркавання абавязкаў у сям'і. Сярод рэспандэнтаў 62% жанчын і 67% мужчын прытрымліваліся такой думкі, што асноўная нагрузка па фінансаваму забеспячэнню сям'і ляжыць на мужу (толькі каля траціны рэспандэнтаў абралі варыянт «на мужу і на жонцы»). Пры гэтым 85% жанчын і 81% мужчын лічылі, што ў асноўным абавязкам жанчыны з'яўляецца абслугоўванне сям'і (падрыхтоўка ежы, мыццё, прыборка). Некалькі больш збалансаваным было стаўленне да праблемы догляду за дзецьмі і іх выхавання: 57% жанчын і 48% мужчын лічылі, што гэта ў асноўным абавязак жанчыны. Аднак адпаведна 41% і 50% лічылі, што гэты абавязак павінны дзяліць муж і жонка.[328]

Вось прыклад тыповых уяўленняў аб размеркаванні абавязкаў у сям'і, дадзены ўдзельніцай фокус-групы БХК:

*Ён [муж] мне казаў, што я павінна прыбіраць у хаце, так не павінна быць, каб мужчына варыў есці, мужчыны не прыбіраюць, я павінна там рабіць тое і тое. І вось калі я гэта ўсё буду рабіць, то тады ён са мной будзе жыць, мне трэба быць белай і пухнатай, а я не такая (…) Я яму кажу, давай пагаворым, разбярэмся, а ён маўчыць ці кажа,*

326 Там жа. С. 120.

327 Там жа. Табл. 8.3.

328 Там жа. Табл. 7.5.

*што трэба рабіць толькі так, і інакш ён са мной не будзе. І ўсё.*[329]

Для Беларусі характэрна праблема сямейнага (хатняга, побытавага) гвалту. Па афіцыйных дадзеных, у 2007 г. праваахоўнымі органамі было зарэгістравана 2115 жанчын, якія пацярпелі ад гвалту ў побыце.[330] Хоць Крымінальны кодэкс не ўтрымлівае адмысловага складу злачынства, якое тычыцца гвалту ў сям'і, адпаведныя дзеі могуць карацца, напрыклад, па артыкулах КК, якi прадугледжвае адказнасць за забойства (арт. 139), наўмыснае прычыненне цяжкага (арт. 147), менш цяжкага (арт. 149 ) і лёгкага (арт. 153) цялеснага пашкоджання, катаванне (арт. 154), згвалтаванне (арт. 166), прымус да дзеянняў сексуальнага характару (арт. 170), незаконнае пазбаўленне волі (арт. 183) і абразу (арт. 189). Менш сур'ёзныя правапарушэнні могуць карацца паводле Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, напрыклад, па артыкулах 9.1 (наўмыснае прычыненне цялеснага пашкоджання) і 9.3 (абраза).

Далей мы даем некалькі прыкладаў выпадкаў сямейнага гвалту. Удзельніца фокус-групы жанчын паведаміла БХК:

*Мой былы партнёр ударыў мяне галавой аб сценку. (...) Калі я паехала ў бальніцу праз некаторы час на здымак галавы, то жанчына, якая аглядала мяне, (...) пачуўшы маю гісторыю, сказала, што гэта звычайная справа, і я павінна радавацца, што лёгка адрабілася. І наогул, я, напэўна, сама вінаватая.*[331]

Сур'ёзнай праблемай для расследавання выпадкаў сямейнага гвалту з'яўляецца нежаданне ахвяр заяўляць пра іх уладам. Удзельніца фокус-групы распавяла БХК аб такім асабістым вопыце:

329 Фокус-група жанчын (Мінск, агульная колькасць 12 чал., узрост – 27-50 гадоў), праведзена БХК 8 снежня 2011 г.

330 *Седьмой периодический доклад Республики Беларусь об осуществлении положений Конвенции о ликвидации всех форм дискриминации в отношении женщин*, Минск, 2009, пп. 347–348 (информация к рекомендациям Комитета).

331 Фокус-група жанчын (Мінск, агульная колькасць 12 чал., узрост – 27-50 гадоў), праведзена БХК 8 снежня 2011 г.





*Мне не хацелася выходзіць, мне сорамна было паказвацца. (...) Мне сорамна выходзіць было з сінякамі на твары, я не рабіла ніякіх заяваў, таму што мне была непрыемная гэтая сітуацыя...*[332]

Нярэдка нежаданне паведамляць пра выпадкі сямейнага гвалту звязана з нявер'ем у здольнасць праваахоўнай сістэмы займацца гэтымі пытаннямі. Адна з удзельніц фокус-групы жанчын выказала думку, што беларускае права

*не гатова да вырашэння праблем, звязаных з жанчынамі, тым больш, з гвалтоўнымі адносінамі да жанчын. Цалкам можа здарыцца так, што, прыйшоўшы ў міліцыю, каб напісаць заяву, ты сутыкнешся з такой непавагай, што зробіш сабе яшчэ горш. Я чула пра такія сітуацыі.*[333]

Па меркаванні беларускіх уладаў, перашкоды для барацьбы з выпадкамі сямейнага гвалту могуць быць звязаныя з тым, што крымінальныя справы па некаторых складах злачынства, характэрных для сямейнага гвалту (напрыклад, арт. 153 і 189 Крымінальнага кодэкса), з'яўляюцца справамі прыватнага абвінавачвання, г. зн. яны ўзбуджаюцца толькі па заяве асобы, якая пацярпела ад злачынства (або па заяве яе законнага прадстаўніка). Апроч таго, члены сям'і і блізкія сваякі асобы, якая ўчыніла злачынства, не падлягаюць крымінальнай адказнасці за адмову ад дачы паказанняў (арт. 402 КК) або неданясенне аб дакладна вядомым учыненні асабліва цяжкага злачынства альбо аб дакладна вядомай асобе, якая ўчыніла гэтае злачынства (арт. 406 КК).[334] Хоць гэты прынцып крымінальнага права адпавядае міжнародным стандартам, на практыцы ён можа значна перашкаджаць расследаванню адпаведных правапарушэнняў.

Для папярэджання разгледзеных інцыдэнтаў Міністэрствам унутраных спраў у свой час выкарыстоўвалася спецыяльная сістэма кантролю

332 Там жа.

333 Там жа.

334 Гл. спасылку 330, пп. 347–348.

за хатнім гвалтам і побытавымі злачынствамі. Па афіцыйных звестках (апублікаваных у 2009 г.), на ўліку ў органах унутраных спраў стаіць 20,4 тыс. чалавек, якія ўчынілі гвалтоўныя дзеянні ў побыце. З імі праводзіцца прафілактычная праца: вынясенне афіцыйных папярэджанняў, прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці, накіраванне ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі, пазбаўленне бацькоўскіх правоў. У тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва прадугледжваецца наяўнасць аддзяленняў сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі з «крызіснымі пакоямі».[335] Яны ствараюцца ў мэтах дапамогі асобам, якія знаходзяцца ў стане, небяспечным для здароўя і жыцця, у стане канфлікту з іншымі членамі сям'і альбо якія пацярпелі ад псіхафізічнага гвалту, сталі ахвярамі гандлю людзьмі ці тэрарыстычных актаў, пацярпелі ад злачыннай дзейнасці. На 1 студзеня 2013 г. у Беларусі функцыянавала 50 такіх пакояў. За 2012 г. у «крызісныя пакоі» па ўсёй краіне па розных пытаннях звярнуліся 124 чалавек.[336]

У цяперашні час у Беларусі ажыццяўляюцца два праекты Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА):[337]

- Павышэнне нацыянальнага патэнцыялу дзяржавы па супрацьдзеянні хатняму гвалту ў Рэспубліцы Беларусь (2012-2015 гг.). Мэтай праекта з'яўляецца нарошчванне нацыянальнага патэнцыялу ў галіне процідзеяння хатняму гвалту і прафілактыкі яго праяў, асабліва ў дачыненні да жанчын і дзяцей.

- Развіццё нацыянальнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь у мэтах процідзеяння хатняму гвалту ва ўмовах дасягнення гендарнай роўнасці (2012-2015 гг.). Мэтай гэтага праекта з'яўляецца павышэнне нацыянальнага патэнцыялу па прафілактыцы і прадухіленні хатняга гвалту, асабліва ў дачыненні да дзяўчат і жанчын, ва ўмовах дасягнення гендарнай роўнасці.

335 Там жа.

336 Министерство труда и социальной защиты Республики Беларусь. *Гендерное равенство, Бюллетень № 2-2013.* С. 6. Ёсць на: http://www.mintrud.gov.by.

337 Гл. больш падрабязна сайт ЮНФПА ў Беларусі. Ёсць на: http://unfpa.by/ru/about/projects/gendernoe-ravenstvo.





У 2011 г. Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын выказаў сур'ёзную трывогу ў сувязі з захаваннем у Беларусі практыкі гвалту ў адносінах да жанчын, асабліва ў сувязі з унутрысямейным і сексуальным гвалтам, рэдкай рэгістрацыяй такіх выпадкаў, шматлікасцю жанчын, якія загінулі ў выніку побытавага гвалту, адсутнасцю пераследу па фактах праяў гвалту ў сям'і. Гучала крытыка таго, што ў крымінальным заканадаўстве няма спецыяльных палажэнняў аб побытавым гвалце і згвалтаванні ў шлюбе, што згвалтаванне пераследуецца ў межах прыватнага абвінавачвання і што не хапае прытулкаў для ахвяраў побытавага гвалту.[338]

### *Высновы*

Як паказана вышэй, сітуацыю беларускіх жанчын на рынку працы характарызуе сістэмная дыскрымінацыя, якая выяўляецца ў больш нізкіх прыбытках, недастатковым прадстаўніцтве на самых верхніх прыступках кар'ернай лесвіцы і канцэнтрацыі ў менш прэстыжных і менш прыбытковых галінах эканомікі. У асабліва ўразлівым становішчы знаходзяцца жанчыны дзетароднага ўзросту. Пры гэтым гендарны дысбаланс на рынку працы шмат у чым рэалізуецца праз сістэму адукацыі. Значна лепшая сітуацыя назіраецца, мабыць, у тых сектарах на рынку працы, якія непасрэдна кантралююцца дзяржавай.

Праблема гендарнай роўнасці ў Беларусі атрымала публічнае і дзяржаўнае прызнанне, хоць прынятыя меры пакуль не прывялі да карэннага пералому ў становішчы жанчын на рынку працы і да дасягнення субстантыўнай (а не фармальнай) роўнасці мужчын і жанчын у сферы працоўнай занятасці.

338 Комитет по ликвидации дискриминации в отношении женщин. *Заключительные замечания Комитета по ликвидации дискриминации в отношении женщин: Беларусь*, UN Doc. CEDAW/C/BLR/CO/7, 4 февраля 2011 г., п. 19.

У заключных заўвагах ад 4 лютага 2011 г. па Беларусі Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын выказвае сваю занепакоенасць у сувязі з

> *устойлівасцю стэрэатыпаў адносна роляў і адказнасці жанчын і мужчын у сям'і і грамадстве, якія празмерна падкрэсліваюць традыцыйныя ролі жанчын як маці і жонак, падрываюць сацыяльны статус жанчын і перашкаджаюць іх роўнаму ўдзелу ў палітычным і эканамічным жыцці…*[339]

Прыведзеныя ў гэтым дакладзе звесткі пацвярджаюць справядлівасць заклапочанасці Камітэта па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын. Беларускім уладам варта таксама працягваць прыкладаць намаганні для вырашэння праблемы хатняга (побытавага) гвалту.

### 2.2.2 Інваліды і людзі, якія жывуць з ВІЧ

***Агульная інфармацыя***

Па стане на жнівень 2012 г. на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Рэспублікі Беларусь стаялі 515,4 тыс. інвалідаў, у тым ліку: інвалідаў I групы – 75,0 тыс., II групы – 273,6 тыс., III групы – 140,9 тыс., дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў – 25,8 тыс.[340] Такім чынам, удзельная вага інвалідаў у агульнай колькасці насельніцтва краіны складае каля 5%. У Беларусі ёсць 76 стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання для састарэлых і інвалідаў камунальнай і 1 установа рэспубліканскай уласнасці (45 псіханеўралагічных, 22 для састарэлых

339 Там жа, п. 17.

340 Найбольш цяжкія недахопы – гэта I група інваліднасці. Гл. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. *Численность инвалидов, состоящих на учете в органах по труду и социальной защите.* Ёсць на: http://www.mintrud.gov.by. Далей у тэксце даклада выкарыстоўваюцца як тэрмін «інвалід» (з прычыны ўжывання яго ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, а таксама ў аўтэнтычным рускамоўным тэксце Канвенцыі аб правах інвалідаў (ААН, 2006 г.), так і «чалавек з інваліднасцю». Пры гэтым ППУ «Офіс па правах людзей з інваліднасцю» лічыць больш карэктным і адпаведным разуменню інваліднасці як праблемы правоў чалавека тэрмін «чалавек / асоба з інваліднасцю».





і інвалідаў і 10 для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця), у якіх пражываюць 17,7 тыс. чалавек.[341] Такім чынам, пераважная большасць інвалідаў пражывае па-за межамі спецыяльных устаноў.

У адпаведнасці з беларускай Канстытуцыяй,

> *грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на сацыяльнае забеспячэнне ў старасці, у выпадку хваробы, інваліднасці, страты працаздольнасці, страты карміцеля і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам. Дзяржава праяўляе асаблівы клопат аб ветэранах вайны і працы, а таксама аб асобах, якія страцілі здароўе пры абароне дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў.*[342]

Закон «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў», з улікам папраўак ад 17 ліпеня 2009 г., вызначае «інваліда» як асобу з устойлівымі фізічнымі, псіхічнымі, інтэлектуальнымі ці сэнсарнымі парушэннямі, якія пры ўзаемадзеянні з рознымі бар'ерамі перашкаджаюць поўнаму і эфектыўнаму ўдзелу яго ў жыцці грамадства нароўні з іншымі грамадзянамі (арт. 1). Гэта вызначэнне амаль цалкам супадае з тым, якое даецца ў артыкуле 1 Канвенцыі ААН аб абароне правоў інвалідаў, якую Беларусь плануе ратыфікаваць у хуткім часе.[343]

Артыкул 21 Закона «Аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў»[344] прадугледжвае, што прызнанне асобы інвалідам ажыццяўляецца медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіяй па вызначаным ура-

341 Министерство по труду и социальной защите Республики Беларусь, *Стационарные учреждения социального обслуживания.* Ёсць на: http://www.mintrud.gov.by.

342 Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (арт. 47).

343 Спасюк Е. «Беларусь намерена присоединиться к Конвенции о правах инвалидов», *Naviny.by*, 1 апреля 2012 г. Ёсць на: http://naviny.by.

344 Закон Республики Беларусь от 23 июля 2008 г. № 422–З «О предупреждении инвалидности и реабилитации инвалидов».

дам парадку.[345] Артыкул 23 прадугледжвае складанне індывідуальнай праграмы рэабілітацыі інваліда, якая складаецца з трох раздзелаў: праграма медыцынскай рэабілітацыі; праграма прафесійнай і працоўнай рэабілітацыі; і праграма сацыяльнай рэабілітацыі. Як будзе паказана ніжэй, змест індывідуальнай праграмы рэабілітацыі будзе мець значэнне ў кантэксце доступу інваліда на рынак працы і аказання яму ўладамі дапамогі пры працаўладкаванні.

Артыкул 4 Закона «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў»[346] вызначае прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне: выкананне правоў чалавека; забарона дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці; забеспячэнне даступнасці медыцынскай, сацыяльнай, прафесійнай і працоўнай рэабілітацыі; роўныя правы інвалідаў, нароўні з іншымі грамадзянамі, на ахову здароўя, адукацыю і свабодны выбар працоўнай дзейнасці; узаемадзеянне дзяржаўных органаў з грамадскімі аб'яднаннямі інвалідаў.

Варта адзначыць, што інтарэсы інвалідаў асабліва ўлічваюцца ў межах Комплекснай праграмы развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011-2015 гг., зацверджанай урадам у 2010 г.[347] У яе межах была прынятая спецыяльная падпраграма «Папярэджанне інваліднасці і рэабілітацыя інвалідаў», мэтай якой заяўлена «павышэнне якасці і ўзроўню жыцця інвалідаў, стварэнне ўмоў для іх рэабілітацыі і інтэграцыі ў грамадства». Сацыяльная значнасць згаданай мэты ўвязваецца са стварэннем умоў для развіцця працэсу сацыялізацыі асобы інваліда, павышэння яго канкурэнтаздольнасці, рэалізацыі права роўнасці і паўнапраўнага ўдзелу ў жыцці грамадства (раздзел «Мэты і задачы падпраграмы»).

345 Постановление Министерства здравоохранения Республики Беларусь от 25 октября 2007 г. № 97 «Об утверждении Инструкции о порядке и критериях определения группы и причины инвалидности, перечне медицинских показаний, дающих право на получение социальной пенсии на детей-инвалидов в возрасте до 18 лет, и степени утраты их здоровья».

346 Закон Республики Беларусь от 11 ноября 1991 г. № 1224–XII «О социальной защите инвалидов в Республике Беларусь».

347 Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 ліпеня 2010 г. № 1126 «Аб зацвярджэнні Комплекснай праграмы развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011-2015 гг.».





У Беларусі заканадаўча абмежаваны доступ да сацыяльнай дапамогі і адукацыі для тых асоб, чыя інваліднасць наступіла ў выніку супрацьпраўных дзеянняў, па прычыне алкагольнага, наркатычнага, таксічнага ап'янення, целашкодніцтва.[348]

Сацыяльная абарона на практыцы ўключае грашовыя выплаты, тэхнічныя сродкі сацыяльнай рэабілітацыі (крэслы-вазкі, пратэзна-артапедычныя вырабы, друкаваныя выданні са спецыяльным шрыфтам, гукаўзмацняльная апаратура), сацыяльныя паслугі і паслугі жыллёва-побытавага абслугоўвання. Крытыкі дзяржаўнай палітыкі лічаць, што наяўная сістэма льгот, якая ў нечым бярэ пачатак яшчэ ў савецкім перыядзе, не заўсёды адпавядае рэальным патрэбам грамадства і часамі не забяспечвае для інвалідаў эфектыўнай абароны ад дыскрымінацыі, спараджае ўтрыманскі падыход з боку саміх людзей з інваліднасцю і робіцца прычынай іх маргіналізацыі ў вачах іншых прадстаўнікоў грамадства.

Кадыфікацыя сучасных міжнародных нормаў і стандартаў у дачыненні да людзей з інваліднасцю была ажыццёўлена шляхам прыняцця ааназўскай Канвенцыі аб правах інвалідаў. Гэты дакумент мае вялікае значэнне і для Беларусі, бо, як ужо адзначалася вышэй, дзяржава плануе ў хуткім часе да яе далучыцца. Артыкул 9 Канвенцыі абавязвае дзяржавы прыняць належныя меры для забеспячэння для інвалідаў доступу нароўні з іншымі да фізічнага асяродку, да транспарту, да інфармацыі і сувязі, у тым ліку інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі і сістэмы, а таксама да іншых аб'ектаў і паслуг, якія з'яўляюцца адкрытымі або прапаноўваюцца для насельніцтва, як у гарадскіх, так і ў сельскіх раёнах.

348 Паводле артыкула 12 Закона «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» такія асобы пазбаўляюцца льгот па санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні; у адпаведнасці з артыкулам 15 – ільгот на праезд у пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных міжгародніх зносін; у адпаведнасці з артыкулам 18 – ільгот па плаце за карыстанне кватэрным тэлефонам і за паштовыя адпраўленні. Згодна з артыкулам 42 Кодэкса аб адукацыі такія інваліды, у адрозненне ад іншых інвалідаў, пазбаўленыя права на атрыманне сацыяльнай стыпендыі (прызначаецца асобе, якая засвойвае змест адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі і не атрымлівае вучэбнай стыпендыі, калі гэта асоба адносіцца да адной з ільготных катэгорый). Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 г. № 239-З «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян».

Адносна працы і занятасці артыкул 27 Канвенцыі абавязвае дзяржаву забяспечваць і заахвочваць да рэалізацыі інвалідамі права на працу, апроч іншага, праз забарону дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці ў кантэксце занятасці, надзяленне інвалідаў магчымасцю эфектыўнага доступу да агульных праграмаў тэхнічнай і прафесійнай арыентацыі, службаў працаўладкавання, прафесійнага і бесперапыннага навучання, пашырэнне на рынку працы магчымасцяў для працаўладкавання інвалідаў, стымуляванне іх працаўладкавання ў прыватным і грамадскім сектарах, забеспячэнне для інвалідаў разумнага прыстасавання працоўнага месца, падтрымка праграм прафесійнай і кваліфікацыйнай рэабілітацыі.

У гэтым раздзеле мы падрабязней спынімся на трох пытаннях: даступнасць грамадскай інфраструктуры, доступ на рынак працы і спецыфіка становішча людзей, якія жывуць з ВІЧ.

***Даступнасць грамадскай інфраструктуры***

Значнай праблемай для беларускіх інвалідаў застаецца непрыстасаванасць грамадскай інфраструктуры да патрэбаў людзей з абмежаванымі магчымасцямі для перасоўвання, з парушэннямі зроку і слыху, хоць пэўныя крокі па вырашэнні гэтых праблем уладамі ажыццяўляюцца. Паводле афіцыйных звестак, удзельная вага аб'ектаў, прыстасаваных да доступу інвалідаў і іншых катэгорый фізічна аслабленых асоб, павялічылася з 19,9% у 2006 г. да 35% у 2009 г. у сярэднім па Беларусі.[349] У 2010 г. была зацверджана ўжо другая Дзяржаўная праграма па стварэнні безбар'ернага асяроддзя жыццядзейнасці фізічна аслабленых асоб на 2011–2015 гг.[350]

Тым не менш, на практыцы ўлады могуць перабольшваць свае дасягненні. Напрыклад, Мазырскай міжраённай арганізацыяй ГА «Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-вазочнікаў» былі даследаваныя 642 аб'екты

349 Национальный доклад о положении инвалидов в Республике Беларусь, [2010], п. 129. Ёсць на: http://www.disright.org/ru/source.

350 Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 1 ноября 2010 г. № 1602 «О Государственной программе по созданию безбарьерной среды жизнедеятельности физически ослабленных лиц на 2011–2015 гг.».





гарадской інфраструктуры. Даследаванне паказала, што даступнымі былі толькі 5% аб'ектаў, у той час як па афіцыйных звестках – 35%.[351]

Асабліва вылучаецца ў Беларусі праблема забеспячэння безбар'ернага доступу да жылля. Арганізацыя «Офіс па правах людзей з інваліднасцю» прыводзіць такі прыклад:

> *Сям'я К. з дачкой-інвалідам жыве ў г. Бяроза Брэсцкай вобласці ў доме, не абсталяваным пандусам. Бацька дзяўчынкі – вайсковец, які па абавязку службы часта не бывае дома. Камандзір вайсковай часткі, у якой служыць бацька, адправіў хадайніцтва мясцовым уладам з мэтай вырашэння пытання з пандусам. На яго быў атрыманы адказ, у якім калегам было прапанавана «прыняць долевы ўдзел у вырабе праектна-каштарыснай дакументацыі і ўстаноўцы пандуса або пад'ёмніка».*[352]

Апісанае вышэй рашэнне праблемы супярэчыць дзейснаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь. Паводле Закона «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў», менавіта рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі

> *забяспечваюць для інвалідаў неабходныя ўмовы для свабоднага доступу да аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, жылых, грамадскіх, вытворчых будынкаў і збудаванняў, бесперашкоднага карыстання грамадскім транспартам і транспартнымі камунікацыямі, сродкамі сувязі і інфармацыі, месцамі адпачынку і вольнага часу...*[353]

351 Інфармацыя аб маніторынгу даступнасці інфраструктуры, праект «Даступнае жыццё», Мазырскай міжраённай арганізацыі ГА «РАІВ» прыводзіцца па: Шевко, Е. *Доступность и инвалидность*, 6 март. 2012 г. Офис по правам людей с инвалидностью. Ёсць на: http://disright.org/ru/info/dostupnost-i-invalidnost.

352 Офис по правам людей с инвалидностью, *Альтернативный доклад о состоянии обеспечения и исполнения прав людей с инвалидностью в Республике Беларусь, 2011 год.* Ёсць на: http://disright.org/sites/default/files/doklad_alternativnyj.pdf.

353 Закон Республики Беларусь «О социальной защите инвалидов» (ст. 24).

Застаюцца праблемы і адносна дарожнай інфраструктуры. У жніўні 2012 г. жыхар Бабруйска інвалід-вазочнік С. падаў пазоўную заяву ў суд на Бабруйскае ўнітарнае камунальнае даччынае дарожна-эксплуатацыйнае прадпрыемства аб кампенсацыі маральнай шкоды. Перасякаючы праезную частку па пешаходным пераходзе, ён сутыкнуўся з бардзюрным каменем вышынёй больш за пяць сантыметраў. Паспрабаваўшы заехаць на бардзюр, С. упаў і заставаўся ляжаць на праезнай частцы сярод патоку аўтамабіляў каля трох хвілін, пакуль яму не дапамаглі падняцца. У выніку С. адчуў моцны стрэс, галавакружэнне і млоснасць.[354]

Практыка, аднак, паказвае, што выпатрабаванне маральнай кампенсацыі за дыскрымінацыю інвалідаў у беларускіх судах неэфектыўна. Напрыклад, у 2009 г. суд Фрунзенскага раёна Мінска прыйшоў да высновы, што Грамадзянскі кодэкс[355] змяшчае вычарпальны пералік падстаў для кампенсацыі маральнай шкоды, прычым дыскрымінацыя інвалідаў туды не ўваходзіць.[356] Падобная інтэрпрэтацыя ГК не можа не выклікаць пытанняў у спецыялістаў.[357]

***Працоўная дзейнасць***

У Працоўным кодэксе асаблівасцям рэгулявання працы інвалідаў прысвечана некалькі артыкулаў (перш за ўсё, арт. 283-288). Паводле артыкула 283 Кодэкса:

> *Інвалідам з улікам індывідуальных праграм рэабілітацыі інвалідаў забяспечваецца права працаваць у наймальнікаў са звычайнымі ўмовамі працы, а таксама ў спецыялізаваных арганізацыях, цэхах і на ўчастках.*

354 Спасюк Е. «Колясочник подал в суд на дорожников», *Naviny.by*, 9 августа 2012 г. Ёсць на: http://naviny.by.

355 Гражданский кодекс Республики Беларусь от 7 декабря 1998 г. № 218–З.

356 Навіны. «Суд не удовлетворил иск инвалида к Театру оперы и балета», *Naviny.by*, 1 июня 2009 г. Ёсць на: http://naviny.by.

357 Гл. у главе 3 гэтага даклада апісанне магчымасцяў запатрабаваць кампенсацыю маральнай шкоды ў кантэксце недыскрымінацыі.





> *Адмова ў заключэнні працоўнага дагавора або ў прасоўванні па працы, скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка, перавод інваліда на іншую працу без яго згоды па матывах інваліднасці не дапускаюцца, за выключэннем выпадкаў, калі выкананне працоўных абавязкаў супрацьпаказана па індывідуальнай праграме рэабілітацыі інваліда.*
>
> *Не дапускаецца скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка з інвалідамі, якія праходзяць медыцынскую, прафесійную, працоўную і сацыяльную рэабілітацыю ў адпаведных арганізацыях незалежна ад тэрміну знаходжання ў іх.*

Паводле Кодэкса, наймальнікі, якія актыўна выкарыстоўваюць працу інвалідаў, атрымліваюць істотныя падатковыя льготы (арт. 284). З мэтай працаўладкавання інвалідаў і з улікам мясцовых асаблівасцяў органы дзяржаўнай службы занятасці і наймальнікі ствараюць дадатковыя працоўныя месцы (у тым ліку спецыялізаваныя), спецыялізаваныя арганізацыі, цэхі і ўчасткі для выкарыстання працы інвалідаў (арт. 286). Мінімальная колькасць такіх працоўных месцаў вызначаецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі або спецыяльнымі дзяржаўнымі праграмамі. Выдаткі на стварэнне такіх працоўных месцаў звыш 3% ад сярэдняй колькасці работнікаў кампенсуюцца за кошт сродкаў, якія накіроўваюцца на фінансаванне мерапрыемстваў па забеспячэнні занятасці насельніцтва, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. За кошт гэтых сродкаў таксама кампенсуюцца затраты на набытае спецыялізаванае абсталяванне для стварэння працоўных месцаў для інвалідаў (артыкул 31 Закона «Аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў»). Вялікае значэнне для працаўладкавання інвалідаў мае сістэма браніравання для інвалідаў працоўных месцаў, падрабязна апісаная ў раздзеле 3 гэтага даклада.

У артыкуле 287 Працоўнага кодэкса для работнікаў-інвалідаў вызначаны шэраг ільготаў: адсутнасць выпрабавальнага тэрміну пры найманні; стварэнне для іх умоў працы ў адпаведнасці з індывідуальнымі праграмамі рэабілітацыі інвалідаў, у тым ліку шляхам арганізацыі іх прафесійнага навучання на вытворчасці, працы ў хатніх умовах; заба-

рона на стварэнне горшых у параўнанні з іншымі работнікамі ўмоваў працы, у тым ліку горшай аплаты і горшага рэжыму працоўнага часу; абмежаванні для прыцягнення да звышурочнай працы, працы ў начны час, у дзяржаўныя святы і святочныя дні і таксама для адпраўкі ў камандзіроўку. Для некаторых груп інвалідаў устанаўліваецца скарочаная працягласць працоўнага часу з захаваннем поўнага памеру заробку. Характэрна, што пры скарачэнні колькасці або штату работнікаў інвалідам пры роўнай прадукцыйнасці працы і кваліфікацыі даецца перавага ў пакіданні на працы, а інваліды, якія працуюць у спецыялізаваных арганізацыях, цэхах, на ўчастках, якія прымяняюць працу інвалідаў, маюць пераважнае права на пакіданне на працы незалежна ад прадукцыйнасці працы і кваліфікацыі (арт. 287). Артыкул 288 Кодэкса раскрывае змест правоў і абавязкаў наймальнікаў па сацыяльным забеспячэнні людзей з інваліднасцю.

Такім чынам, працоўнае заканадаўства Беларусі заахвочвае да выкарыстання розных пазітыўных мер, накіраваных на павышэнне ўзроўню занятасці інвалідаў. У 2006-2010 гг. уладамі рэалізоўвалася спецыяльная праграма па прафесійнай і працоўнай рэабілітацыі інвалідаў.[358] Адным з інструментаў далучэння людзей з інваліднасцю да працоўнай сферы з'яўляюцца дзяржаўныя праграмы садзеянню занятасці насельніцтва.[359] Паводле афіцыйных звестак за студзень-верасень 2011 г. у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне былі зарэгістраваны 2,9 тыс. інвалідаў, якія жадалі працаўладкавацца, прычым садзейнічанне ў працаўладкаванні было аказана 2,6 тыс. і каля паловы працоўных месцаў было забяспечана за кошт устаноўленай дзяржавай броні для працаўладкавання інвалідаў.[360]

358 Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 27 сентября 2006 г. № 1269 «Об утверждении Государственной программы по предупреждению инвалидности и реабилитации инвалидов на 2006–2010 гг.».

359 Гл. падрабязней у главе 3 гэтага даклада.

360 *Общая информация о Республике Беларусь, 15 декабря 2011 г.* HRI/CORE/BLR/2011. С. 15.





Прамое патрабаванне адносна *разумнага прыстасавання* працоўнага месца[361] ўстанаўліваецца для працадаўцы толькі тых інвалідаў, якія атрымалі інваліднасць з прычыны працоўнага калецтва або прафесійнага захворвання: для іх наймальнік абавязаны стварыць працоўныя месцы на гэтай вытворчасці (арт. 20 Закона «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў»). Існуюць таксама палажэнні, якія вызначаюць асобныя элементы сістэмы разумнага прыстасавання працоўнага месца,[362] але яны звычайна не могуць абараніць правы канкрэтнага інваліда. Напрыклад, Алена паведаміла ў інтэрв'ю БХК:

> *Я знайшла па вакансіі неблагую працу бухгалтара. Нягледзячы на вазок, дырэктар пагадзілася ўзяць на працу. Але ў першы ж дзень – бухгалтарскія кнігі на верхняй паліцы, да стэлажа – не праехаць паміж сталамі. Супрацоўніцы перазірнуліся, патэлефанавалі дырэктару. На наступны дзень, пасля нялёгкай размовы з дырэктарам, я ўжо там не працавала.*[363]

Працоўны кодэкс вызначае забароненую дыскрымінацыю як абмежаванне ў працоўных правах, у тым ліку, у залежнасці ад недахопаў фізічнага характару, «якія не перашкаджаюць выкананню адпаведных працоўных абавязкаў» (арт. 14). Відавочна, што ў апісаным вышэй выпадку Алена можа выконваць абавязкі бухгалтара: у практычным плане дастаткова было толькі перакласці бухгалтарскія кнігі на іншае месца. Аднак дырэктар палічыў, што будзе лепш яе звольніць.

361 Напрыклад, еэсаўская дырэктыва 2000/78 патрабаванне разумнага прыстасавання працоўнага месца сфармулявала наступным чынам: «Каб гарантаваць адпаведнасць прынцыпу роўнага абыходжання адносна інвалідаў, неабходна ажыццяўляць разумнае прыстасаванне да патрэбаў інвалідаў. Гэта значыць, што працадаўцы павінны прымаць неабходныя меры, каб там, дзе ў канкрэтным выпадку гэта неабходна, даць магчымасць інвалідам атрымліваць працу, працаваць, атрымліваць падвышэнне па службе або праходзіць навучанне, калі толькі гэтыя меры не накладаюць непрапарцыйнай нагрузкі на працадаўцу. Гэтая нагрузка не з'яўляецца непрапарцыйнай, калі яна дастаткова папаўняецца мерамі, якія існуюць у межах палітыкі адпаведнай дзяржавы-члена адносна інвалідаў». Council Directive 2000/78/EC of 27 November 2000 establishing a general framework for equal treatment in employment and occupation (арт. 5). Гл. таксама главу 1 гэтага даклада.

362 Аб разумным прыстасаванні працоўнага месца ў кантэксце беларускага права: гл. главу 3 гэтага даклада.

363 Фокус-група людзей з інваліднасцю (Мазыр, агульная колькасць 16 чал., узрост – 20–38 гадоў), праведзена БХК 1 кастрычніка 2011 г.

Гэта відавочны прыклад важнасці і патрэбнасці замацавання абавязку разумнага прыстасавання працоўнага месца наймальнікам. Правілы разумнага прыстасавання не дадуць магчымасці беспадстаўна спасылацца на «перашкоды для выканання працоўных абавязкаў» там, дзе яны могуць быць пераадолены без празмернага абцяжарвання наймальніка.

Увогуле адсутнасць дэталёвых антыдыскрымінацыйных нормаў у беларускім працоўным праве і адсутнасць юрыдычна абавязковага патрабавання аб разумным прыстасаванні працоўнага месца на практыцы вельмі ўскладняюць для інваліда даказванне выпадкаў дыскрымінацыі. Пры гэтым звесткі даследаванняў ускосна сведчаць аб вялікай распаўсюджанасці дыскрымінацыйных практык у адносінах да інвалідаў на рынку працы.

Выбарачнае апытанне, праведзенае Навукова-даследчым інстытутам (НДІ) працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны,[364] прадэманстравала, што з агульнай колькасці інвалідаў ва ўзросце 18 гадоў і больш, якія пражываюць у хатніх гаспадарках, працуюць толькі 17,2%. Сярод працуючых інвалідаў 54,7% склалі мужчыны, 45,3% – жанчыны. Цяжкія формы захворванняў і траўмаў істотна абмяжоўваюць магчымасць інвалідаў ажыццяўляць працоўную дзейнасць, таму сярод інвалідаў I і II групы адзначана вельмі нізкая ўдзельная вага працуючых – 4,3% і 5,7% адпаведна. Сярод інвалідаў з больш лёгкімі формамі інваліднасці (III група) узровень занятасці склаў 46,7%.[365] Для інвалідаў працаздольнага ўзросту (18-60 гадоў) інваліднасць як прычына незанятасці займае першае месца: 78,3% непрацоўных інвалідаў у працаздольным узросце звязваюць сваю незанятасць з наяўнасцю ў іх інваліднасці.[366] Пры гэтым трэба ўлічваць, што ўзровень працаўладкавання інвалідаў, якія звярнуліся па дапамогу ў спецыялізаваныя органы,[367] дастаткова высокі: ён павялічыўся з 26% ад інвалідаў, якія мелі патрэбу ў працаўладкаванні ў 1995 г. да 42% па звестках за студзень-верасень 2011 г.[368]

У межах апытання НДІ працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны людзям з інваліднасцю задаваліся пытанні, датычныя негатыўнага стаўлення да іх і агрэсіі з боку людзей навокал па прычыне інваліднасці. Сярод усіх апытаных 18% адзначылі, што хаця б аднойчы зведвалі негатыўнае, нядобразычлівае стаўленне з боку людзей навокал з-за інваліднасці, 5% – пацярпелі ад агрэсіўных дзеянняў і гвалту з-за інваліднасці. У большай ступені ад негатыўных адносінаў церпяць дзеці-інваліды.[369]

### *Людзі, якія жывуць з вірусам імунадэфіцыту чалавека (ВІЧ)*

Па стане на 1 студзеня 2012 г. у Рэспубліцы Беларусь былі зарэгістраваны 12955 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі, прычым паводле ацэнак паказчык распаўсюджанасці ВІЧ ва ўзроставай групе 15–49 гадоў быў на ўзроўні 0,2-0,3%. У апошнія гады захоўваецца рост захворвання ВІЧ-інфекцыяй з 11,1 на 100 тыс. насельніцтва ў 2009 г. да 12,6 на 100 тыс. насельніцтва ў 2011 г. Найбольш пацярпелай групай насельніцтва з'яўляюцца асобы, якія ўжываюць наркотыкі ўнутрывенна (шляхам ін'екцый): у гэтай групе распаўсюджанасць ВІЧ-інфекцыі складае 13,3%. Інфікаванасць ВІЧ сярод жанчын секс-бізнесу – 2,4%, сярод групы мужчын, якія маюць секс з мужчынамі, – 2,8%.[370]

---

364 На працягу снежня 2009 г. і студзеня 2010 г. адмыслова падрыхтаванымі інтэрв'юерамі з ліку работнікаў тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і НДІ працы было праведзена выбарачнае апытанне больш за 5 тыс. інвалідаў, а ў Віцебскай вобласці, акрамя таго, суцэльнае апытанне ўсіх інвалідаў, якія пражываюць у Чашніцкім раёне – больш за 1000 чал. Для забеспячэння поўнага ўдзелу інвалідаў у працэсе збору дадзеных апытваліся як інваліды дарослыя (ва ўзросце 18 гадоў і старэй), так і дзеці – інваліды ва ўзросце да 18 гадоў. Пры гэтым дзеці апытваліся ў прысутнасці (альбо з удзелам) бацькоў або іх законных прадстаўнікоў. Гэтая ўмова ўжывалася ў асобных выпадках і пры апытанні інвалідаў-дарослых.

365 Программа развития ООН, Министерство труда и социальной защиты Республики Беларусь, *Обследование положения инвалидов в Республике Беларусь*, Минск: Тесей, 2010. С. 68.

366 Там жа. С. 50.

367 Тут могуць улічвацца толькі тыя, хто вырашыў звярнуцца па дапамогу, і чыя індывідуальная праграма рэабілітацыі не перашкаджала працаўладкаванню.

368 Гл. спасылку 360. С. 15.

369 Гл. спасылку 365. С. 78–79.

370 *Национальный отчет о достигнутом прогрессе в осуществлении глобальных мер в ответ на СПИД: Республика Беларусь. Отчетный период: январь 2010 г. – декабрь 2011 г.* Минск, 2012. С. 8. Ёсць на: https://www.unaids.org.

У Рэспубліцы Беларусь выконваецца Дзяржаўная праграма прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі на 2011-2015 гг., мэта якой – стрымліванне распаўсюджвання ВІЧ-інфекцыі і зніжэнне смяротнасці ад СНІД.[371]

*Прымусовы агляд і лячэнне*. У канцы 2011 г. у Беларусі прыняты Закон «Аб папярэджанні распаўсюджвання захворванняў, якія ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва, віруса імунадэфіцыту чалавека».[372] У ім ВІЧ прыроўнены да сацыяльна небяспечных захворванняў. Артыкул 19 Закона прадугледжвае магчымасць прымусовага медыцынскага агляду асобы, у дачыненні да якой маюцца дастатковыя падставы меркаваць аб наяўнасці ў яго ВІЧ. Прымусовы агляд павінен праводзіцца ўстановай аховы здароўя з санкцыі пракурора. Дастатковай падставай паводле Закона прызнаецца: прамое ўказанне асобы, якая мае ВІЧ, на асобу як на магчымую крыніцу свайго заражэння або як на асобу, што была з ёй у палавым кантакце, ці як на асобу, якая ўводзіла адразам з ёй наркатычныя сродкі, псіхатропныя рэчывы ўнутрывенна адным шпрыцам; вынікі клініка-інструментальных і (або) лабараторных даследаванняў, якія сведчаць аб наяўнасці ў асобы прыкмет ВІЧ (арт. 19).

На думку рэгіянальнага дырэктара Групы падтрымкі ЮНЭЙДС для краін Еўропы і Цэнтральнай Азіі Ж.-Э. Малкіна,

> *паколькі прадугледжваецца магчымасць абавязковага тэставання пры падазрэнні на ВІЧ і прымусовага лячэння, то могуць пачацца працэсы непрыняцця людзей, якія жывуць з ВІЧ, грамадствам і, як вынік, утойванне імі статусу. Гэта, у сваю чаргу, паграseverity далейшым ростам інфекцыі і ў канчатковым выніку ростам выдаткаў аховы здароўя, сістэмы сацыяльнага забеспячэння.*[373]

371 Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 4 марта 2011 г. № 269 «Об утверждении Государственной программы профилактики ВИЧ-инфекции на 2011–2015 гг.».

372 Закон Республики Беларусь от 7 января 2012 г. № 345–З «О предупреждении распространения заболеваний, представляющих опасность для здоровья населения, вируса иммунодефицита человека».

373 Полуян, А. «Минск посетил региональный директор ЮНЭЙДС», *AIDS.BY*, 2 марта 2012 г. Ёсць на: www.aids.by.





Апроч таго, абавязковае тэставанне пры падазрэнні на ВІЧ і прымусовае лячэнне могуць разглядацца як прамая дыскрымінацыя на падставе інваліднасці або стану здароўя. Прамая дыскрымінацыя можа быць апраўданая толькі ў выключных абставінах і з улікам патрабаванняў прапарцыянальнасці. Захаванне падобных гарантый у індывідуальных выпадках беларускі закон, на жаль, не гарантуе.

*Вопыт стыгматызацыі і дыскрымінацыі.* У сучасным беларускім грамадстве людзі, якія жывуць з ВІЧ (ЛЖВ), сутыкаюцца з праявамі стыгматызацыі і дыскрымінацыі. Даследаванні паказваюць, што ВІЧ-статус для іх часта выступае сур'ёзнай перашкодай у розных сферах сацыяльнай актыўнасці. Стыгматызацыя з боку грамадства, а таксама значны ўзровень унутранай стыгмы, якая выклікае негатыўныя перажыванні, з'яўляецца прычынай таго, што ЛЖВ не вераць у эфектыўнасць дзеянняў па абароне сваіх правоў. Многія ЛЖВ аддаюць перавагу неінстытуцыйным формам дапамогі і падтрымкі, г. зн. праяўляюць схільнасць да ўзаемадапамогі. Стыгматызацыя і дыскрымінацыя ЛЖВ мінімізуе эфектыўнасць намаганняў грамадства і дзяржавы па барацьбе з ВІЧ / СНІД, змушае ЛЖВ хаваць свой ВІЧ-статус. Існуе недавер і да арганізацыі абароны асабістых дадзеных ВІЧ-інфікаваных.[374]

Паводле даследавання прафесара БДУ Я. Кечынай, праведзенага ў другой палове 2009 г.,[375] 41,6% рэспандэнтаў паказалі, што за апошні год іх абражалі, пераследавалі і / або пагражалі ў вуснай форме; з 31,6% рэспандэнтаў гэта адбывалася неаднаразова. З іх 16,9% лічаць, што гэта адбывалася з-за іх ВІЧ-статусу, 43,5% – па іншых прычынах, 34,4% – з-за ВІЧ-статусу і па іншых прычынах.

374 Артыкул 23 Закона «Аб папярэджанні распаўсюджвання захворванняў, якія ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва, віруса імунадэфіцыту чалавека» пералічвае і пэўныя правы пацыента, у тым ліку права на паважлівае і гуманнае стаўленне, якое выключае жорсткасць, нялюдскасць і прыніжэнне чалавечай годнасці. Артыкул 26 таго ж Закона абавязвае медыцынскіх работнікаў захоўваць медычную тайну.

375 Даследаванне рабілася ў перыяд з 10 жніўня па 30 лістапада 2009 г. у 13 гарадах: Мінску, 6 абласных цэнтрах і 6 раённых гарадах. У кожнай з абласцей у выбарцы прадстаўлены тыя гарады, дзе эпідэмічная сітуацыя вызначае тэндэнцыю развіцця эпідэмічнага працэсу па вобласці ў цэлым. Аб'ём выбарачнай сукупнасці склаў 370 чал. Сярод рэспандэнтаў пераважалі асобы ва ўзросце 25-39 гадоў (81,7%).

Фізічна пераследваліся, атрымлівалі пагрозы дзеяннем 15,9% рэспандэнтаў, з 8,1% гэта адбывалася неаднаразова. 13,8% рэспандэнтаў пацярпелі ад фізічнага гвалту, з 5,7% рэспандэнтаў гэта адбывалася неаднаразова.[376]

На думку ЛЖВ, прычыны стыгматызацыі і дыскрымінацыі носьбітаў віруса абумоўлены недасведчанасцю насельніцтва і негатыўным стэрэатыпам адносна іх. Паводле таго ж даследавання, 36,7% рэспандэнтаў-ЛЖВ адзначылі, што людзі не разумеюць, як перадаецца ВІЧ, і баяцца заразіцца ад іх ВІЧ з дапамогай выпадковага кантакту. 35,8% адказалі, што людзі лічаць наяўнасць ВІЧ ганебным, таму не кантактуюць з ЛЖВ. Яшчэ 32,8% у якасці прычыны паведамілі аб тым, што людзі баяцца заразіцца ВІЧ ад ЛЖВ.[377]

У Беларусі недастатковасць намаганняў дзяржавы па інфармаванні насельніцтва аб праблеме ВІЧ / СНІД з'яўляецца відавочнай. Гэта прыводзіць да распаўсюджвання і ўмацавання памылковых поглядаў нават сярод медработнікаў сярэдняга ўзроўню.

Даследаванне Я. Кечынай 2009 г. таксама выявіла, што ЛЖВ сутыкаюцца з дыскрымінацыяй на рынку працы і ў сферы аховы здароўя. За папярэдні даследаванню год 83,5% рэспандэнтаў мелі працу па найму або іншаю крыніцу прыбытку. З іх за гэты ж час 27,5% гублялі працу (па найму) ці іншую крыніцу прыбытку, а 11,4% гублялі працу неаднаразова. З тых рэспандэнтаў, хто губляў працу, 11,8% лічаць, што гэта адбылося з-за іх ВІЧ-статусу; 65,9% – па іншых прычынах; 14,1% – з-за ВІЧ-статусу і па іншых прычынах; а 8,2% не змаглі вызначыць прычыну.[378] 17,9% рэспандэнтаў за папярэдні год адмаўлялі ў медыцынскім абслугоўванні, у тым ліку ў стаматалагічнай дапамозе, з-за іх ВІЧ-статусу (16,9% мужчын і 17,5% жанчын). 18,9% рэспандэнтам у той жа час адмаўлялі ў паслугах па планаванні сям'і з-за іх ВІЧ-статусу.[379]

376 Кечина Е. *Определение показателя стигматизации людей, живущих с ВИЧ: отчет об исследовании*, Минск: Минсктиппроект, 2011. С. 17. Ёсць на: http://ecuo.org.

377 Там жа. С. 20.

378 Там жа. С. 21.

379 Там жа. С. 22.





**Прыклад 7.**
**Як перамагчы стыгмы з боку медыцынскага персаналу?**
*Вольга, лідар ініцыятыўнай групы супольнасці ЛЖВ г. Жлобіна (вытрымка з артыкула)**

З фактамі стыгмы і дыскрымінацыі ВІЧ-станоўчыя слаўнага г. Жлобіна (і не толькі) сутыкаюцца пастаянна. І калі ў штодзённым жыцці, на працы ці сярод знаёмых, свой статус мы прызвычаіліся старанна хаваць, то ў медыцынскіх установах не адкрыць яго ўжо не ўяўляецца магчымым з-за дзеючага заканадаўства, паводле якога людзі з ВІЧ абавязаны інфармаваць аб наяўнасці ў іх ВІЧ-інфекцыі.

У пачатку гэтага месяца адзін з сябраў жлобінскай ініцыятыўнай групы РГА «Беларуская супольнасць ЛЖВ» паехаў у г. Гомель для чарговай здачы неабходных для лячэння ВІЧ аналізаў. Жывы арганізм, дарога, час і як вынік – жаданне рэалізаваць свае натуральныя біялагічныя патрэбы. Аднак, калі ён папрасіўся ў прыбіральню ў медустанове, пачуў ад медсястры абурэнне: «А я як пасля цябе пайду?!».

На сённяшні дзень нібыта ў кожнай бальніцы і паліклініцы на сценах вісіць велізарная колькасць плакатаў на тэму ВІЧ / СНІД, якія змяшчаюць інфармацыю, у тым ліку і пра шляхі перадачы гэтай інфекцыі. Ці можа яна падаецца наогул цяжкадаступнай для чалавечай свядомасці? Ці можа гэтая інфармацыя падаецца вельмі аднабока, у рэчышчы прафілактыкі, зусім не дбаючы пра тое, як прыемна будзе чалавеку са станоўчым статусам сустрэцца з такімі вось «адукаванымі» па пытаннях ВІЧ / СНІДу?

**Вольга, «Як перамагчы стыгмы з боку медыцынскага персаналу?», HIV.BY. Ёсць на: http://www.hiv.by.*

## *Высновы*

На аснове прыведзенай вышэй інфармацыі можна зрабіць выснову, што беларускія ўлады ў апошні час ужываюць актыўныя меры для забеспячэння інвалідаў доступам нароўні з іншымі да аб'ектаў і паслуг, ад-

крытых або прапанаваных для насельніцтва. Тым не менш, яны пакуль знаходзяцца ў самым пачатку шляху: роўнасць магчымасцяў інвалідаў і людзей без інваліднасці ў гэтай сферы пакуль не назіраецца, што можа весці да прамой або ўскоснай дыскрымінацыі на падставе інваліднасці ў паўсядзённым жыцці. У гэтым кантэксце варта адзначыць важную і канструктыўную ролю грамадзянскай супольнасці, якая ажыццяўляе маніторынг і дае рэкамендацыі ўладам па вырашэнні праблем даступнасці інфраструктуры.

Узровень занятасці сярод інвалідаў пакуль вельмі нізкі, што таксама можа сведчыць аб распаўсюджанасці дыскрымінацыйных практык. Хоць беларускае заканадаўства прадугледжвае цэлы шэраг мер, накіраваных на інтэграцыю інвалідаў на рынку працы і барацьбу з дыскрымінацыяй па прыкмеце інваліднасці ў сферы працоўнай занятасці, агульная іх эфектыўнасць зніжаецца з-за адсутнасці спецыялізаванага антыдыскрымінацыйнага заканадаўства, а таксама дакладных нормаў, якія датычацца права кожнага інваліда на разумнае прыстасаванне працоўнага месца.

Сацыяльная палітыка адносна інвалідаў можа спараджаць утрыманскія настроі сярод мэтавай групы, хоць дзяржава прымае меры да іх большай сацыяльнай інтэграцыі. На гэтым фоне асабліва вылучаюцца праблемы стыгматызацыі і дыскрымінацыі людзей, якія жывуць з ВІЧ (ЛЖВ) і патрабуюць неадкладнага актыўнага ўмяшальніцтва з боку дзяржавы. ЛЖВ могуць таксама пацярпець ад прамой заканадаўчай дыскрымінацыі (прымусовы агляд і лячэнне).

### 2.2.3 Супольнасць ЛГБТ

#### *Агульная інфармацыя*

Для Беларусі характэрна вельмі высокая ступень закрытасці супольнасці лесбіянак, геяў, бісексуалаў і трансгендараў (ЛГБТ). Колькасць ЛГБТ у Беларусі невядомая. Адзінай даследаванай групай з'яўляюцца мужчыны, якія маюць сексуальныя адносіны з мужчынамі (МСМ). МСМ прынята лічыць асоб мужчынскага біялагічнай полу, рэгулярна (не радзей за адзін раз у 12 месяцаў) якія ўступаюць у сексуальныя адносіны з асобамі мужчынскага біялагічнага полу. У даследаванні 2009 г.,





якое праводзілася ў рамках Нацыянальнай сістэмы маніторынгу і ацэнкі сітуацыі па ВІЧ / СНІД у Рэспубліцы Беларусь, былі атрыманыя звесткі аб колькасці групы МСМ – ад 35822 да 57820 прадстаўнікоў.[380] Аднак кіраўнікі ЛГБТ-арганізацый Беларусі лічаць, што методыкі вызначэння колькаснага складу групы МСМ, якя выкарыстоўваліся ў даследаванні, з'яўляліся няякаснымі, і ў рэальнасці група МСМ налічвае значна болей людзей.[381]

У прававым полі Беларусі сексуальная арыентацыя і гендарная ідэнтычнасць ніяк не згадваюцца сярод забароненых для дыскрымінацыі падстаў. Артыкул 190 Крымінальнага кодэкса, аднак, крыміналізаваў наўмыснае прамое або ўскоснае парушэнне, альбо абмежаванне правоў і свабод, альбо ўстаноўка прамых ці ўскосных пераваг грамадзян, апроч іншага, абумоўленых прыналежнасцю да грамадскіх аб'яднанняў (пры ўмове, што нанесена істотная шкода правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна). Артыкулы Крымінальнага кодэкса за забойства (арт. 139) і наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання (арт. 147) прадугледжваюць больш строгае пакаранне, калі яны здзейсненыя па матывах варожасці або неладоў у дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы. Аднак адсутнічае інфармацыя, якая б сведчыла, што гэты артыкул калі-небудзь ужываўся ў кантэксце абароны правоў асоб, якія належаць да арганізацый ЛГБТ або да супольнасці ЛГБТ.

Добраахвотныя сексуальныя адносіны паміж дарослымі мужчынамі былі дэкрыміналізаваныя ў Беларусі ў 1994 г.;[382] палавыя адносіны паміж жанчынамі не былі крыміналізаванымі ніколі. На сённяшні момант няма якіх-небудзь заканадаўчых адрозненняў адносна ўзросту дазволу добраахвотных сексуальных кантактаў («узросту згоды») для гома- і гетэрасексуальных адносін, а таксама адносна адказнасці за крымінальныя злачынствы супраць палавой недатыкальнасці або

380 ГейБеларусь. «Сколько геев в Беларуси?», ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект, 13 июня 2001 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

381 ГейБеларусь. «Три белорусские ЛГБТ-организации обратились с письмом в Минздрав и ПРООН», *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 25 октября 2010 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

382 Щурко Т. «ЛГБТ-движение за равные права», *Экспертное сообщество Беларуси «Наше мнение»*, 26 октября 2012 г. Ёсць на: http://nmnby.eu/news/analytics/4984.html.

палавой свабоды (глава 20 Крымінальнага кодэкса). Характэрна, што КК выкарыстоўвае такія тэрміны, як «палавыя зносіны», «мужаложства», «лесбіянства» і «іншыя дзеянні сексуальнага характару». Артыкул аб «згвалтаванні» (арт. 166 КК) прымяняецца толькі ў выпадку недобраахвотнага гвалтоўнага гетэрасексуальнага палавога кантакту. Аналагічнае злачынства пры гомасексуальным кантакце падпадае пад састаў артыкула аб «гвалтоўных дзеяннях сексуальнага характару» (арт. 167).

Па выніках апытання, праведзенага Беларускім інстытутам стратэгічных даследаванняў у пачатку 2010 г., 62% апытаных беларусаў выказалася за крыміналізацыю аднаполых сувязяў. У красавіку 2002 г., па звестках Беларускай лігі сексуальнай роўнасці «Лямбда», падобныя погляды падзяляла 47% насельніцтва.[383] Улады Беларусі не праводзяць ніякіх мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне талерантнасці ў дачыненні да супольнасці ЛГБТ. Хоць дамінуючыя ў Беларусі праваслаўная і каталіцкая цэрквы ўвогуле негатыўна ставяцца да «гомасексуальнага ладу жыцця», невысокі ўзровень «актыўных праяў» рэлігійнасці беларускага насельніцтва (гл. раздзел аб рэлігійным жыцці ў гэтым дакладзе) вымушае шукаць прычыны негатыўнага стаўлення да супольнасці ЛГБТ найперш у захаванні ў грамадстве традыцыяналісцкіх установак, а не ўласна ў рэлігіі, а таксама ў нізкім узроўні цярпімасці да стыляў жыцця і да тыпаў сямейнага жыцця, нязвыклых для большасці насельніцтва. Негатыўным адносінам спрыяе і памяць аб крыміналізацыі гомасексуальных сувязяў у недалёкім мінулым.

Да нядаўняга часу ў Беларусі гома- і бісексуальнасць лічыліся псіхічнымі адхіленнямі. Аднак гомасексуальнасць (і, адпаведна, бісексуальнасць) была дэпаталагізаваная ў Беларусі ў 2002 г. пасля пачатку выкарыстання чарговай рэдакцыі Міжнароднай класіфікацыі хвароб.[384] Паводле гэтай класіфікацыі транссексуальнасць, аднак, прызнаецца псіхічным захворваннем.

383 Бортник В. «Проведение гей-парада в Гомеле в ближайшее время не планируется», *Стратегическая мысль*, 13 августа 2012 г. Ёсць на: http://gomel-experts.org.

384 Международная статистическая классификация болезней и проблем, связанных со здоровьем. Ёсць на: http://www.mkb10.ru.





Беларускае заканадаўства не прызнае магчымасці заключэння шлюбаў ці афіцыйна прызнанага партнёрства паміж асобамі аднаго біялагічнага полу. Кодэкс аб шлюбе і сям'і[385] (1999 г.) вызначае шлюб як добраахвотны саюз мужчыны і жанчыны (арт. 12). У розных галінах жыцця законы і іншыя нарматыўныя акты даюць разнастайныя перавагі людзям, якія знаходзяцца ў шлюбе, у той час як аднаполыя пары пазбаўляюцца такіх пераваг.

Удзельнікі фокус-груп, праведзеных БХК, паказалі, што найбольш распаўсюджанымі формамі дыскрымінацыі адносна ЛГБТ з'яўляецца разнастайны фізічны і псіхалагічны гвалт. Звяртае на сябе ўвагу высокая распаўсюджанасць выпадкаў псіхалагічнага гвалту ў сям'і. Падлеткам і маладым людзям, якія вырашылі распавесці аб сваёй арыентацыі самым блізкім людзям, часта даводзіцца цярпець значны ціск.[386]

У цэлым, ЛГБТ-актывісты нярэдка сутыкаюцца з тымі ж праблемамі, што і іншыя сацыяльна актыўныя жыхары Беларусі: празмерныя цяжкасці з рэгістрацыяй грамадскіх арганізацый, адмовы ў правядзенні вулічных мерапрыемстваў, псіхалагічны ціск з боку праваахоўных органаў. Пры гэтым актывісты могуць сутыкацца з непрыманнем не толькі з боку ўладаў, але і некаторых апазіцыйных актывістаў. Напрыклад, 19 красавіка 2010 г. на прэс-канферэнцыі, прысвечанай правядзенню шэсця «Чарнобыльскі шлях», Зміцер Дашкевіч, лідар апазіцыйнай моладзевай арганізацыі «Малады фронт», заявіў: «Прысутнасць анархістаў і прадстаўнікоў сексуальных меншасцяў мы будзем расцэньваць як правакацыю».[387]

Нягледзячы на звычайныя складанасці з правядзеннем вулічных мерапрыемстваў, Беларусь стала першай дзяржавай СНД, дзе адбыўся гей-прайд («Мінскі гей-прайд – 2001»).

385 Кодекс о браке и семье Республики Беларусь от 9 июля 1999 г. № 278–З.

386 Фокус-групы па пытаннях ЛГБТ (Мінск, Гомель, Віцебск, агульная колькасць 47 чал., узрост – 18-33 гады), праведзены БХК 29 лістапада, 15 і 22 снежня 2011 г.

387 ГейБеларусь. «На Чарнобыльскім шляху-2010 абяцаюць звязваць гомасэксуалаў і здаваць у міліцыю», *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 19 апреля 2010 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

*Момантам зараджэння беларускага руху за правы секс-меншасцяў можна лічыць узнікненне ў 1999 г. Беларускай лігі сексуальнага раўнапраўя «Лямбда» (БЛЛ), куды ўваходзілі таксама прадстаўнікі з Гомеля. Мінюст адмовіў у рэгістрацыі БЛЛ, што не перашкодзіла ёй у 2001 г. правесці Мінскі гей-парад, першае мерапрыемства падобнага кшталту на постсавецкай прасторы. Як не дзіўна, шэсце з 300 чалавек прайшло па цэнтральным сталічным праспекце без эксцэсаў. Усе іншыя публічныя акцыі беларускіх секс-меншасцяў – да параду і пасля яго – забараняліся ўладамі альбо душыліся праваахоўнымі органамі, калі праводзіліся несанкцыянавана. Выключэннем з'яўляецца пікет за правы ЛГБТ, які атрымаў дазвол мінскіх уладаў і прайшоў 14 лютага 2011 г.*[388]

### *Міжнародныя стандарты ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі*

Хоць пытанне аб роўнасці сяброў супольнасці ЛГБТ і аб дыскрымінацыі па прыкмеце сексуальнай арыентацыі на міжнародным узроўні было ўзнята адносна нядаўна, абарона іх правоў чалавека магчымая ў межах наяўных механізмаў, пра што сведчаць і рашэнні адпаведных маніторынгавых органаў. Усе згаданыя ў гэтым раздзеле канвенцыі ратыфікаваныя Беларуссю.

Напрыклад, паводле Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, Беларусь абавязана паважаць і забяспечваць усім асобам, якія знаходзяцца ў межах яе тэрыторыі і пад яе юрысдыкцыяй, прызнаныя ў Пакце правы без якога-небудзь адрознення па шэрагу падстаў, у тым ліку пол (ч. 1 арт. 2). Роўнасць перад законам па-за залежнасці ад полу гарантуе таксама артыкул 26 Пакту. У 1994 г. Камітэт па правах чалавека ў адным са сваіх паведамленняў адзначыў, што

388 Гл. спасылку 383.





тэрмін «пол» у гэтых артыкулах пакрывае таксама сексуальную арыентацыю.[389]

Частка 2 артыкула 2 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (МПЭСКП) абавязвае дзяржавы гарантаваць, што правы, абвешчаныя ў гэтым Пакце, будуць ажыццяўляцца без якой-небудзь дыскрымінацыі на любых падставах. Камітэт ААН па эканамічных, сацыяльных і культурных правах неаднаразова тлумачыў, што ўзгаданыя ў частцы 2 артыкула 2 «іншыя абставіны» ўлічваюць сексуальную арыентацыю.[390] Таксама МПЭСКП гарантуе права на працу (арт. 6) і на адукацыю (арт. 13).

Паводле артыкула 1 Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, нялюдскіх відаў абыходжання і пакарання, альбо тых, якія прыніжаюць годнасць, катаванне – гэта любое дзеянне, пры якім асобе наўмысна наносіцца моцны боль альбо пакута, фізічная ці маральная, у тым ліку, па любой прычыне, заснаванай на *дыскрымінацыі любога характару*, калі такі боль альбо пакута прычыняюцца дзяржаўнай службовай асобай ці іншай асобай, якая выступае ў афіцыйнай якасці, альбо па іх матывацыі, або з іх ведама ці маўклівай згоды. Такім чынам, гэтая Канвенцыя дастасоўная і ў выпадку дыскрымінацыі з-за сексуальнай арыентацыі, што пацвярджаў і Камітэт ААН супраць катаванняў.[391]

Акрамя таго, згодна з Канвенцыяй па правах дзіцяці, правы, якія прызнаюцца ёю, гарантуюцца кожнаму дзіцяці, г. зн. непаўнагадовай асобе да

389 Human Rights Committee, *Communication No. 488/1992: Australia, 4 April 1994, Views of the Human Rights Committee under article 5, paragraph 4, of the Optional Protocol to the International Covenant on Civil and Political Rights*, CCPR/C/50/D/488/1992 (Toonen v. Australia).

390 Гл. спасылку 236, п. 21.

391 Гл., напр.: «Часткай абавязкаў па папярэджанні катаванняў або жорсткага абыходжання з'яўляецца абарона некаторых асоб або слаёў насельніцтва, якія належаць да меншасцяў ці маргіналізаваных груп, якім асабліва сур'ёзна пагражаюць катаванні. Дзяржавам-удзельнікам варта забяспечыць, каб у адпаведнасці з абавязкамі, якія вынікаюць з Канвенцыі, іх законы ўжываліся на практыцы ў дачыненні да ўсіх асоб, незалежна ад (...) сексуальнай арыентацыі...» Камітэт супраць катаванняў, *Конвенция против пыток и других жестоких, бесчеловечных или унижающих достоинство видов обращения и наказания: Замечание общего порядка № 2. Имплементация статьи 2 государствами-участниками*, CAT/C/GC/2, 2008, п. 21.

18 гадоў, без якой-небудзь дыскрымінацыі па любых абставінах (арт. 2). Сярод такіх абставінаў можа быць і сексуальная арыентацыя дзіцяці (падлетка). Камітэт ААН па правах дзіцяці тлумачыў, што забароненае артыкулам 19 Канвенцыі «псіхалагічны гвалт» у адносінах да дзіцяці ўключае, апроч іншага, «адмову ад эмацыйных зносін»; «абразу, абразлівы зварот, прыніжэнне, знявагу, высмейванне і абразу пачуццяў дзіцяці».[392]

***Праблемы гвалту і даверу да праваахоўных органаў***

Узбуджэнне варожасці ў адносінах да супольнасці ЛГБТ не з'яўляецца ў Беларусі крымінальным злачынствам. Геі ў Беларусі нярэдка становяцца ахвярамі побытавага і вулічнага гвалту. Пры гэтым ёсць сведчанні, што міліцыя часам не лічыць патрэбным умешвацца ў падобныя канфлікты. На сайце праваабарончага праекта «ГейБеларусь» можна знайсці такія прыклады:

- 13 жніўня 2011 г. група п'яных людзей спрабавала штурмаваць сталічны клуб «Каста Дзіва», папулярны сярод гей-супольнасці. Міліцыя, якая прыбыла на выклік, не прыняла ніякіх мер, а потым і зусім з'ехала.[393]

- Сяргей А. паведаміў пра выпадак з яго знаёмымі геямі, якія сталі ахвярамі збіцця, як яны мяркуюць, па гомафобных матывах. Пры гэтым пацярпелыя не змаглі дамагчыся расследавання інцыдэнту. Тыя, хто нападаў, заявілі ў міліцыі, што пацярпелыя геі самі справакавалі напад тым, што прыставалі да іх. Міліцыянты сталі на бок тых, хто нападаў і закрылі справу.[394]

392 Комитет по правам ребенка, *Замечание общего порядка № 13: Право ребенка на свободу от всех форм насилия*, CRC/C/GC/13, 2011, П. 21.

393 ГейБеларусь. «Гомофобы пытались прорваться в минский гей-клуб», *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 18 августа 2011 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

394 ГейБеларусь. «Гомельская милиция встала на сторону гомофобов», *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 12 июня 2010 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.





Актывістамі супольнасці ЛГБТ неаднаразова фіксавалася інфармацыя пра збіццё маладых хлопцаў з-за асаблівасцяў іх выгляду і манер, па якіх можна меркаваць аб іх гомасексуальнасці. У чэрвені 2008 г. у Мінску былі збітыя два маладых чалавекі па матывах гомафобіі каля гей-клуба. Абодвум спатрэбілася медыцынская дапамога, адзін з іх атрымаў чэрапна-мазгавую траўму, страсенне галаўнога мозга. У міліцыю яны не звярталіся, паколькі былі ўпэўненыя, што супрацоўнікі не прымуць бок пацярпелых, улічваючы іх гомасексуальнасць.[395] У той жа час у Мінску на адкрыцці гей-клуба «Шакалад» адбылося масавае збіццё наведвальнікаў, пацярпелымі былі 13 чалавек.[396]

Узровень недаверу да органаў міліцыі з боку прадстаўнікоў ЛГБТ вельмі высокі. Асобы, якія падвергліся гвалту на падставе гомафобіі, не чакаюць ад органаў правасуддзя адэкватнага расследавання такіх выпадкаў і не гатовыя звяртацца ў міліцыю за абаронай. Акрамя таго, стаўленне міліцыі да супольнасці ЛГБТ можа характарызавацца насцярожанасцю і часамі гомафобіяй. Факты дрэннага абыходжання з боку міліцыі зафіксаваныя праваабарончым праектам «ГейБеларусь»:

- У красавіку 2009 г. падчас рэйду спецназа ў гей-клуб «Фартуна» было затрымана каля 40 чалавек для высвятлення асобы. Ніякіх правапарушэнняў наведвальнікі клуба не здзяйснялі. Пасля высвятлення асобы затрыманыя былі адпушчаныя без складання пратаколаў.[397]

- Пасля маніфестацыі «Славянскага гей-прайду – 2009» у Маскве кіраўніка праваабарончага праекта «ГейБеларусь» і іншых удзельнікаў выклікалі ў міліцыю і на размовы ў КДБ.

395 ГейБеларусь. «У цэнтры Менску зьбілі двух геяў», *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 15 июня 2008 г.; «Ахвяра гамафобіі 14 чэрвеня ў Менску атрымала сутрасеньне мозгу», 1 сентября 2008 г. *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект.* Ёсць на: http://gaybelarus.by.

396 Андросенка С., Прадзед С. *Аглядны даклад па дыскрымінацыі геяў, лесьбіянак, бісэксуалаў і транссэксуалаў у Беларусі ў 2008 г. ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 22 апреля 2009 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

397 Там жа.

У кватэрах двух гродзенскіх удзельнікаў былі праведзены вобшукі, ім выказвалі падазрэнні, што яны могуць выробляць парнаграфію з удзелам непаўналетніх. Актывістамі былі пададзены скаргі ў пракуратуру.[398]

- Падчас вулічнай акцыі фестывалю «Славянскі гей-прайд–2010» дванаццаць удзельнікаў былі затрыманыя з асаблівай жорсткасцю. Пецярых адпусцілі без складання пратаколаў, а семярых затрымалі на двое сутак і пакаралі штрафамі. Гэтая сітуацыя не ёсць рэдкай для Беларусі, аднак абыходжанне з затрыманымі было асабліва прыніжальным, у іх адрас гучалі шматлікія гомафобныя абразы.[399]

### *Праблема псіхалагічнага гвалту ў сям'і*

Даволі часта ЛГБТ сутыкаюцца з маральным гвалтам у сям'і пасля раскрыцця сваёй сексуальнай арыентацыі або гендарнай ідэнтычнасці. Асабліва гэта характэрна для падлеткаў і моладзі. Нярэдка яны аказваюцца адрынутымі і цалкам пазбаўленымі падтрымкі сям'і. Вядомыя, напрыклад, выпадкі, калі бацькі, даведаўшыся аб гомасексуальнасці сына прымушалі яго прайсці сеанс экзарцызму («адчытку») у праваслаўнай царкве, забаранялі зносіны з сябрамі, прымушалі да кансультацый у псіхолага.[400]

Канстанцін распавёў у інтэрв'ю БХК аб сваім досведзе стасункаў з маці пасля раскрыцця ёй інфармацыі аб сваёй гомасексуальнасці:

398 ГейБеларусь. «Гей–актывістаў дапытваюць у КДБ і выклікаюць у міліцыю», *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 1 июля 2009 г.; «Гродзенскія гей-актывісты напісалі скаргі на дзеянні мясцовай міліцыі», 28 мая 2009 г. *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект.* Ёсць на: http://gaybelarus.by.

399 ГейБеларусь, «Затрыманыя на гей-парадзе: «Яны нас за людзей не лічылі»», *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 18 мая 2010 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

400 Прыклад прыведзены ўдзельнікам фокус-групы па пытаннях ЛГБТ (Віцебск, агульная колькасць 13 чал., узрост – 19-33 гады), праведзенай БХК 22 снежня 2011 г.





> *Калі мне было чатырнаццаць, мяне збілі некалькі хлопцаў на вуліцы за тое, што гей. У мяне проста выгляд такі характэрны, хада, напэўна, таксама выдае. Збілі вельмі моцна, білі нагамі, доўга потым ляжаў у лякарні. Высветлілася, што пазванок зламаны. Незадоўга да гэтага я сказаў маці, што я гей. Яна вельмі хвалявалася, была бурная рэакцыя. Доўга са мной не размаўляла. І нават у шпіталі не размаўляла. Толькі прыносіла ежу, моўчкі даглядала за мной, і ўсё...*[401]

Нярэдка ахвярамі псіхалагічнага гвалту ў сям'і робяцца сябры і знаёмыя ЛГБТ. Людміла распавяла ў інтэрв'ю БХК аб сваім досведзе:

> *Сярод маіх сяброў шмат геяў і лесбіянак. З нядаўніх часоў я з'яўляюся актывісткай руху за роўнасць ЛГБТ. Гэта выклікае рэзкае непрыняцце маіх бацькоў, пастаянныя нападкі. Дома мне кажуць: «Усе твае сябры – п***, і ты прынясеш дадому СНІД». З-за пастаянных канфліктаў мне давялося сысці з дому і жыць асобна.*[402]

### *Рынак працы і доступ да тавараў і паслуг*

Якога-небудзь поўнага ўяўлення аб маштабах дыскрымінацыі прадстаўнікоў ЛГБТ на рынку працы, у сферы гандлю і пры прадастаўленні паслуг скласці немагчыма з-за адсутнасці адпаведных даследаванняў. Аднак можна ўпэўнена сцвярджаць, што нярэдка ў грамадскай свядомасці гомасексуальнасць увязваецца з педафіліяй і парнаграфіяй. Ахвярамі дыскрымінацыі па прыкмеце сексуальнай арыентацыі можна стаць у Беларусі і па асацыяцыі з супольнасцю ЛГБТ. Так, Юрый распавёў у інтэрв'ю БХК:

> *У мяне шмат сяброў-геяў. Але сам я – гетэрасексуал. З аднаго месца працы мяне звольнілі тады, калі*

401 Канстанцін (прозвішча не пазначана), інтэрв'ю БХК ад 28 лістапада 2011 г., Брэст.

402 Людміла (прозвішча не пазначана), інтэрв'ю БХК ад 5 снежня 2011 г., Мінск.

> *з'явілася фатаграфія, па якой можна было зрабіць выснову, што я – гей. Іншых магчымых прычын звальнення не бачу.*[403]

Беларускаму Хельсінкскаму Камітэту таксама стаў вядомы выпадак Аляксандра, выкладчыка ўніверсітэта: ён быў выкліканы да дэкана з нагоды таго, што на сайце знаёмстваў была размешчана яго анкета з фатаграфіяй. З анкеты было зразумела, што ён гей. Дэкан запатрабаваў прыбраць фатаграфію, што і было зроблена.[404]

Прывядзём некалькі іншых прыкладаў, сабраных беларускімі праваабаронцамі, ЛГБТ-актывістамі, а таксама ў межах праекта Асацыяцыі роўных правоў:

> *У 2010 г. адміністрацыя рэсурсу vceti.by закрыла некалькі сеткавых супольнасцяў (груп) ЛГБТ «за распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў», хоць ніякіх парнаграфічных матэрыялаў у групах не было.*[405]

> *У кастрычніку 2010 г. у Мінску маладому чалавеку было адмоўлена ў прыватным друкаваным салоне ў друкаванні фатаграфій, на якіх было выяўлена шэсце Славянскага гей-прайду, разагнанае пасля міліцыяй.*[406]

Прыватная выдавецкая фірма адмовілася аказаць паслугі па друку ўлётак, прысвечаных фестывалю «Мінскі гей-прайд–2011».[407] У ліпені

403 Юрый (прозвішча не пазначана), інтэрв'ю БХК ад 11 снежня 2011 г., Мінск.

404 Аляксандр (прозвішча не пазначана), інтэрв'ю БХК ад 15 лістапада 2011 г., Мінск.

405 ГейБеларусь, «Vceti.by закрыла ЛГБТ-группы «за распространение порнографических материалов или предметов»». *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 6 июля 2010 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

406 ГейБеларусь. «В Минске в полиграфическом салоне отказались печатать изображения разгона Славянского гей-прайда», *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 15 октября 2010 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

407 Матэрыялы фокус-груп (Мінск, Гомель, Віцебск, агульная колькасць 47 чал., узрост – 18–33 гадоў), праведзены БХК 29 лістапада, 15 і 22 снежня 2011 г.





2011 г. адміністрацыя кавярні «Дзень і ноч» у грубай форме запатрабавала ад траіх хлопцаў сысці з установы па прычыне іх гомасексуальнасці. Інцыдэнт адбыўся пасля таго, як маладыя людзі зрабілі замову. На пытанне хлопцаў да афіцыянткі дзяўчына адказала, што «іх столік перакупілі і ім лепш пакінуць установу».[408]

### *Свабода сходаў і асацыяцый*

Правы на мірныя сходы і стварэнне грамадскіх аб'яднанняў у Беларусі вельмі абмежаваны на практыцы. Таму калі парушаецца права на мірныя сходы ў дачыненні да ЛГБТ-актывістаў, цяжка адназначна сцвярджаць, што гэта звязана менавіта з-за іх сексуальнай арыентацыі. Аднак можна меркаваць, што гомафобныя матывы пры забаронах публічных ЛГБТ-акцый могуць мець месца, хоць адкрыта чыноўнікі аб іх не заяўляюць. 16 студзеня 2009 г. у Мінску каля іранскай амбасады ЛГБТ-актывісты правялі мірны сход у выглядзе пікету супраць пакаранняў смерцю гомасексуалаў у Іране. Удзельнікі акцыі і журналістка, што асвятляла мерапрыемства, былі затрыманыя, нягледзячы на мірны характар пікета. На ўдзельнікаў былі складзеныя пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэнні, пазней яны былі аштрафаваныя. Сёння скаргі двух удзельнікаў на парушэнне права на мірныя сходы знаходзяцца на разглядзе ў Камітэце па правах чалавека ААН.[409]

Летам 2011 г. Мінгарвыканкам адхіліў каля 100 заяваў ЛГБТ-актывістаў на пікеты.[410] У кастрычніку 2011 г. было забаронена правядзенне шэсця ў межах фестывалю «Мінскі гей-прайд – 2011».[411]

408 ГейБи. «В "День и ночь" столики для натуралов», *Белорусский гей-лесби портал GAYBY.NET*, 23 июля 2011 г. Ёсць на: http://www.news.gayby.net.

409 ГейБеларусь. «У Мінску затрымалі ўдзельнікаў акцыі ў абарону асуджаных на смерць геяў Ірана і журналістку незалежнай газеты», *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 16 января 2009 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

410 ГейБеларусь. «Гей-актывісты атрымалі 100 адмоў на ўсе 100 заявак аб правядзенні акцыі ў Мінску», *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 14 мая 2011 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

411 ГейБеларусь. «Шэсце Мінскага гей-прайда 22 кастрычніка забаронена Мінгарвыканкамам». *ГейБеларусь – беларускі праваабарончы праект*, 17 октября 2011 г. Ёсць на: http://gaybelarus.by.

15 кастрычніка 2011 г. сябры праваабарончага праекта «ГейБеларусь» з усёй краіны правялі ў Мінску ўстаноўчы сход, на якім прынялі статут праваабарончай арганізацыі, абралі старшыню, членаў савета, кантрольна-рэвізійнай камісіі, а таксама прэзентавалі асноўныя напрамкі дзейнасці і стратэгію развіцця рэспубліканскага моладзевага праваабарончага грамадскага аб'яднання «Праваабарончы цэнтр Альтэрнатыва плюс». У рэгістрацыі актывістам ЛГБТ было адмоўлена. Прычынай было названа тое, што ў дакументах няправільна быў паказаны дзень нараджэння аднаго з 61 заснавальніка, а таксама была зроблена памылка ў напісанні імя іншага заснавальніка. Чыноўнікі палічылі пададзеныя ў Міністэрства дакументы недакладнымі, а таму не адпаведнымі Закону[412] «Аб грамадскіх аб'яднаннях».[413]

Праваабаронцы заявілі аб істотна больш жорсткім стаўленні беларускіх уладаў да арганізацый і актывістам ЛГБТ на пачатку 2013 г.[414]

### *Высновы*

На падставе прыведзеных у дакладзе звестак можна зрабіць выснову, што беларускія ўлады нярэдка праяўляюць пасіўнасць у тых выпадках, калі прадстаўнікі супольнасці ЛГБТ, у тым ліку дзеці, сутыкаюцца з фізічным і псіхалагічным гвалтам з боку праваахоўнікаў, іншых членаў грамадства і сям'і. Улады могуць таксама альбо самі ўдзельнічаць, альбо не перашкаджаць дыскрымінацыі такіх людзей на рынку працы, у сферы гандлю і паслуг, пры рэалізацыі права на свабоду сходаў і асацыяцыі. Агульныя прынцыпы роўнасці і недыскрымінацыі ў беларускім праве могуць быць малаэфектыўнымі для абароны сябраў супольнасці ЛГБТ з-за агульнай атмасферы нецярпімасці да іх у беларускім грамадстве.

412 Закон Республики Беларусь от 4 октября 1994 г. № 3254-XII «Об общественных объединениях».

413 Андросенко С. «Белорусскую республиканскую ЛГБТ-организацию не зарегистрировали», пресс-релиз от 1 января 2012 г. *Sunshine.* Ёсць на: http://sunshine. by/gej-novosti/belarus-lgbt-20120101.

414 Гл., напр.: Bortnik V. “State Campaign against LGBT Organisation”, *Ilga Europe*, 1 February 2013. Ёсць на: http://ilga-europe.org.





## 2.3 Няроўнасць на падставе палітычных поглядаў і перакананняў

З сярэдзіны 1990-х гг. у развіцці палітычнай сістэмы Беларусі пазначыліся відавочныя аўтарытарныя тэндэнцыі. Ва ўмовах сфарміраванага ў краіне палітычнага рэжыму апазіцыйная палітычная і грамадская дзейнасць робіцца сур'ёзным фактарам рызыкі пацярпець ад дыскрымінацыі з-за палітычных поглядаў і перакананняў. Аднак у Беларусі не праводзілася якіх-небудзь колькасных сацыялагічных даследаванняў сітуацыі з выкананнем правоў асоб у залежнасці ад палітычных поглядаў і перакананняў. Амаль уся наяўная інфармацыя аб канкрэтных выпадках сабрана беларускімі і міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі.

Артыкул 26 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП) прадугледжвае ў якасці самастойнага права і роўнасці перад законам і права на роўную і эфектыўную абарону супраць дыскрымінацыі, апроч іншага, на падставе палітычных ці іншых перакананняў. У Заўвазе агульнага характару № 18 Камітэт па правах чалавека адзначыў, што выкарыстаны ў МПГПП тэрмін «дыскрымінацыя» мае на ўвазе любое адрозненне, выключэнне, абмежаванне або перавагу па шэрагу падстаў, у тым ліку палітычныя ці іншыя перакананні, мэтай ці вынікам якога будзе ліквідацыя ці прымяншэнне прызнання або выкарыстання ўсімі людзьмі ў роўнай ступені ўсіх правоў і свабод.[415] Акрамя таго, артыкул 18 МПГПП абвяшчае свабоду думкі, а артыкул 19 прадугледжвае асаблівае права бесперашкодна прытрымліваецца сваіх меркаванняў, свабодна выказваць сваё меркаванне пры захаванні канкрэтнага спіса абмежаванняў, які мае канчатковы характар.

Пры гэтым і Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (ч. 1 арт. 2), і Міжнародны пакт аб сацыяльных, эканамічных і культурных правах (ч. 2 арт. 2) забараняюць дыскрымінацыю па палітычных і іншых перакананнях пры ажыццяўленні гарантаваных гэтымі пактамі правоў. Такім чынам, адпаведная забарона да-

415 Human Rights Committee, *General Comment No. 18: Non-discrimination*, 1989, Para 7, UN Doc. HRI/GEN/I/Rev./at 26.

тычыцца ўсіх сфер грамадскага жыцця, урэгуляваных гэтымі дакументамі, а таксама кожнага з названых у пактах асобнага права чалавека.

Міжнародная супольнасць мела магчымасць вывучаць выпадкі і практыку дыскрымінацыі з-за палітычных перакананняў у Беларусі часцей, чым па якой-небудзь іншай падставе. Асабліва гэта датычылася захавання міжнародных нормаў і стандартаў, звязаных з правам на свабоду слова і выказвання, свабоду асацыяцый і свабоду сходаў, з правам на справядлівае судовае разбіральніцтва і г. д. Парушэнні беларускімі ўладамі адпаведных палажэнняў Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах неаднаразова ў апошнія гады адзначаліся ў паведамленнях Камітэта ААН па правах чалавека.[416] Цікавасць магла ўзнікаць і ў іншых міжнародных арганізацый з канкрэтнай нагоды, як, напрыклад, у выпадку з маніторынгам судовых працэсаў у сакавіку-ліпені 2011 г., які ажыццяўляла Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ.[417]

Большасць дакладаў і даследаванняў нацыянальных і міжнародных няўрадавых арганізацый так ці інакш прысвячаліся пытанню выканання грамадзянскіх і палітычных правоў і / або абмежаванняў і парушэнняў, звязаных з рэалізацыяй такіх правоў, у тым ліку з-за дыскрымінацыі на падставе палітычных перакананняў. Прыкладам тут можа паслужыць нядаўні даклад Міжнароднай амністыі, прысвечаны свабодзе мірных сходаў і свабодзе асацыяцый у Беларусі.[418] Вялікую ўвагу міжнародных праваабаронцаў звярнулі на сябе і падзеі вакол асобных арганізацый, напрыклад, нядаўняе высяленне з свайго офіса праваабарончага цэнтра «Вясна», якое стала часткай выканання прысуду ў дачыненні да лідара арганізацыі А. Бяляцкага, асуджанага за

416 Гл. падрабязней: ООН, Права человека, Управление Верховного комиссара по правам человека. Беларусь: Главная страница. Ёсць на: http://www.ohchr.org/RU/countries/ENACARegion/Pages/BYIndex.aspx.

417 БДИПЧ/ОБСЕ, *Отчет. Мониторинг судебных процессов в Республике Беларусь (март – июль 2011 г.)*, Варшава, 2011. Ёсць на: http://www.osce.org/odihr/84874, П. 18.

418 Amnesty International, *Belarus: What is not Permitted is Prohibited: Silencing Civil Society in Belarus*, 18 April 2013, EUR 49/002/2013. Ёсць на: http://www.amnesty.org/en/library/info/EUR49/002/2013/en.





«ўтойванне прыбыткаў у асабліва буйным памеры».[419] З улікам вышэйсказанага ў гэтым раздзеле даклада аўтары хутчэй сфакусіруюць сваю ўвагу на менш даследаваных пытаннях, якія датычацца доступу да сацыяльных і эканамічных правоў для асоб, якія прытрымліваюцца апазіцыйных поглядаў і перакананняў. Такім чынам, мы прэзентуем шмат у чым новую інфармацыю. У сувязі з гэтым варта нагадаць, што частка 2 артыкула 2 Міжнароднага пакта аб сацыяльных, эканамічных і культурных правах забараняе дыскрымінацыю на падставе, апроч іншага, палітычных і іншых перакананняў пры рэалізацыі права на працу (арт. 6), на адукацыю (арт. 13) і на свабоду творчай дзейнасці (ч. 3 арт. 15).

У беларускім заканадаўстве адсутнічаюць палажэнні, якія можна трактаваць як прамую дыскрымінацыю па прыкмеце палітычных поглядаў і перакананняў. Беларуская канстытуцыя забараняе дыскрымінацыю на любой падставе (арт. 22). Артыкул 190 Крымінальнага кодэкса прадугледжвае пакаранне (штраф або папраўчыя работы, або абмежаванне волі, або пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю) за наўмыснае прамое або ўскоснае парушэнне ці абмежаванне правоў і свабод, альбо ўстаноўка прамых ці ўскосных пераваг грамадзян, апроч іншага, у залежнасці ад перакананняў, прыналежнасці да грамадскіх аб'яднанняў (пры ўмове, што гэтыя дзеянні нанеслі істотную шкоду правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна). Працоўны кодэкс забараняе і дыскрымінацыю, г. зн. абмежаванне ў працоўных правах або атрыманне якіх-небудзь пераваг у залежнасці ад палітычных поглядаў, якія не перашкаджаюць выкананню адпаведных працоўных абавязкаў (арт. 14).

### *Працоўная і прафесійная дзейнасць*

Многія палітычна актыўныя людзі ў Беларусі адчуваюць сябе неабароненымі ў сферы працоўных і прафесійных адносін. Неабходна адзначыць, што доказы дыскрымінацыі зафіксаваць даволі складана.

419 Amnesty International. “Belarus Evicts Leading Human Rights Organization”, *Amnesty International News*, 26 November 2012. Ёсць на http://www.amnesty.org.

Адной з формаў дыскрымінацыйных дзеянняў у адносінах да палітычнай апазіцыі з'яўляецца фарміраванне негатыўнага рэзанансу па месцы іх жыхарства і працы. К. Локцеў з Бабруйска паведаміў фокус-групе БХК:

> *Мая грамадская актыўнасць у сувязі з апошнім Народным сходам 8 кастрычніка 2011 г., на якім я быў старшынёй і за які адседзеў трое сутак арышту, адразу выклікала пільную ўвагу сілавых структур. 8 кастрычніка па месцы майго жыхарства прыехалі высокія міліцэйскія чыны – маёры і палкоўнікі – і распытвалі пра мяне суседзяў, маўляў, хто такі, чым займаецца. Сталі цікавіцца ў майго непасрэднага кіраўніка, чаму ў мяне ёсць адгулы, як я працую і які заробак атрымліваю. Акрамя таго, падчас маёй вучобы на курсах павышэння кваліфікацыі ў Мінску людзі з КДБ правяралі табель маёй наведвальнасці.*[420]

Ціск на актывістаў нярэдка ажыццяўляецца праз наймальнікаў: адмова ад заключэння ці падаўжэння кантрактаў, невыдзяленне адпачынку за свой кошт, звальненне, нярэдка з указаннем іншага абгрунтавання, ніяк не звязанага з поглядамі і перакананнямі работнікаў. Уздзеянне на апанентаў улады праз наймальнікаў палягчае нядаўні амаль поўны пераход на кантрактную сістэму найму на працу, г. зн. на сістэму тэрміновых працоўных дагавораў.

Паводле Працоўнага кодэкса,

> *тэрміновая працоўная дагавор складаецца ў выпадках, калі працоўныя адносіны не могуць быць устаноўленыя на няпэўны тэрмін з улікам характару будучай працы або ўмоў яе выканання, а таксама ў выпадках, прадугледжаных дадзеным Кодэксам. Разнавіднасцю тэрміновага працоўнага дагавора з'яўляецца кантракт, які заключаецца ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных заканадаўствам аб працы.*[421]

Аднак неаднаразова дапоўнены Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г.[422] дае магчымасць наймальнікам складаць кантракты на тэрмін не менш за адзін год (арт. 1). Пры гэтым у тым жа артыкуле прама адзначаецца магчымасць заключэння кантрактаў з работнікамі, працоўныя дагаворы з якімі былі раней заключаны на няпэўны тэрмін.

Па паведамленні праваабаронцаў,

> *пачынаючы з 2004 г. міністэрствы, ведамствы, наймальнікі па ўказанні Адміністрацыі Прэзідэнта паўсюдна пад пагрозай звальнення ў выпадку адмовы вымусілі работнікаў перайсці на кантрактную форму працоўнага дагавора... Тэрміновыя кантракты на сённяшні дзень з'яўляюцца асноўнай формай працоўнага дагавора ў краіне. (...) Кантрактная сістэма на ўзроўні прадпрыемстваў выкарыстоўваецца наймальнікамі для барацьбы з актывістамі незалежных прафсаюзаў, сябрамі апазіцыйных партый і грамадскіх арганізацый. За перыяд дзеяння сістэмы тэрміновых кантрактаў было звольнена мноства прадстаўнікоў незалежных арганізацый, у тым ліку і жанчын.*[423]

Кантракт – тэрміновы працоўны дагавор – заключаецца на перыяд 1-3 гады, але не больш чым на 5 гадоў. Пасля яго сканчэння працадаўца можа звольніць работніка без дадатковых абгрунтаванняў. Ёсць усе падставы лічыць, што актывісты апазіцыйных рухаў могуць стаць

420 Фокус-група палітычных і грамадскіх актывістаў (агульная колькасць 13 чал., узрост 30–35 гадоў), праведзена БХК 29 снежня 2011 г.

421 Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь (арт. 17).

422 Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г. № 29 «О дополнительных мерах по совершенствованию трудовых отношений, укреплению трудовой и исполнительской дисциплины».

423 Гл. спасылку 291. С. 23–24.

ахвярамі дыскрымінацыйнага падыходу і нярэдка атрымліваюць адмову ў працягненні кантрактаў не па дзелавых якасцях, а з улікам іх грамадска-палітычнай актыўнасці. Пасляхова аспрэчыць адмову ў працягу кантрактаў на практыцы вельмі складана. Так, у студзені 2011 г. не быў працягнуты кантракт з Н. Іллініч, настаўніцай гісторыі Талькаўскай сярэдняй школы Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці, вядомай сваімі педагагічнымі заслугамі і шырокай грамадска-культурнай дзейнасцю. Н. Іллініч паведаміла ў інтэрв'ю праваабарончаму інтэрнэт-рэсурсу:

> *З вынесеным наймальнікам загадам я не згодная і лічу, што сапраўднай прычынай прыняцця рашэння аб маім звальненні і адмовы ў заключэнні новага працоўнага кантракта з'яўляецца абмежаванне мяне ў працоўных правах па палітычных перакананнях у сувязі з маёй актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасцю. Лічу сваё звальненне незаконным і заснаваным на дыскрымінацыйным падыходзе да мяне з боку наймальніка і іншых дзяржаўных устаноў. (…) Пры гэтым мая грамадска-палітычная дзейнасць, мае палітычныя перакананні ніякім чынам не адбіваліся на маёй прафесійнай дзейнасці падчас працы настаўнікам у школе. Аднак, нягледзячы на гэта, я ўвесь час сутыкалася з ціскам з боку Мінскага абласнога ўпраўлення адукацыі і мясцовых выканаўчых органаў улады, якія неаднаразова пагражалі мне звальненнем з працы ў сувязі з маёй грамадскай і палітычнай дзейнасцю, у сувязі з маімі палітычнымі перакананнямі і поглядамі.*[424]

З улікам адносна шырокай сацыяльнай базы беларускага палітычнага рэжыму некаторыя прыклады дыскрымінацыйных практык могуць быць ініцыятывай прыватных асоб, а не уладаў. Аднак відавочна ёсць і выпадкі ўздзеяння прадстаўнікоў уладаў на прыватных працадаўцаў.

424 Вясна. «Учитель Наталья Ильинич будет добиваться восстановления на работе через суд», Правозащитный центр «Вясна», 24 февраля 2011 г. Ёсць на: http://spring96.org/ru/news/41162.





Звальненне ў сувязі са сканчэннем тэрміну дзеяння кантракту асоб, якія займаюцца «апазыцыйнай» грамадскай дзейнасцю, практыкуецца і на прыватных прадпрыемствах.

Напрыклад, у пачатку верасня 2011 г. адміністрацыя ПУА «БІП – Інстытут правазнаўства» не працягнула кантракт з дацэнтам кафедры тэорыі і гісторыі права А. Завадскім і старэйшым выкладчыкам Н. Васілевіч. Гэта не было матывавана ні скарачэннем вучэбнай нагрузкі, ні парушэннямі працоўнай дысцыпліны з іх боку. А. Завадскі, аўтар шматлікіх публікацый па пытаннях развіцця мясцовага самакіравання і канцэпцый, якія распрацоўваюцца няўрадавай грамадскай арганізацыяй «Фонд імя Льва Сапегі» і Н. Васілевіч, рэдактар сайта «Царква», дырэктар цэнтра «Экумена», лічаць, што сутыкнуліся з дыскрымінацыяй па палітычных падставах.[425]

Іншы нядаўні прыклад датычыцца А. Камбалавай, кіраўніка Баранавіцкай гарадской арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП), актывісткі Народнага сходу з Брэсцкай вобласці. У лістападзе 2011 г. яе звольнілі з працы ў прыватнай фірме «Белснабпадшыпнік», не працягнуўшы з ёй кантракт. Гэта рашэнне яна лічыць палітычна матываваным, бо перад падрыхтоўкай першага Народнага сходу, скліканага апазіцыяй, да яе на працу прыходзілі супрацоўнікі міліцыі. Пасля гэтага кіраўнік адзначыў А. Камбалавай немагчымасць сумяшчэння працы і палітычнай актыўнасці.[426]

У Беларусі вядомыя выпадкі, калі негатыўныя наступствы наступалі з-за выканання прафесійных абавязкаў у інтарэсах прадстаўнікоў палітычнай апазіцыі. Пасля чарговых прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня 2010 г. у Беларусі адбылася несанкцыянаваная ўладамі акцыя пратэсту апазіцыі, якая перарасла ў сутычку дэманстрантаў з міліцыяй і ў беспарадкі. Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ арганізавала маніторынг судовых працэсаў над удзельнікамі акцыі, падчас якога высветлілася, што

425 Усе матэрыялы ў архіве РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт», люты 2013 г.

426 Анжэла Камбалава, інтэрв'ю ад 16 лістапада 2011 г., Мінск, база дадзеных Праваабарончага цэнтра «Вясна».

> *ў шэрагу выпадкаў рэалізацыя права на выкарыстанне дапамогі адваката па ўласным выбары была ўскладнена ў сувязі са скасаваннем ліцэнзій у адвакатаў. Гэта з'яўляецца непрыстойным умяшальніцтвам выканаўчай улады ў прафесійную незалежнасць дзейнасці і этычныя абавязкі юрыстаў. Шэрагу адвакатаў на працягу доўгага часу было адмоўлена ў доступе да падабаронных.*[427]

Адным з такіх абаронцаў стала Т. Сідарэнка, кліентам якой быў былы кандыдат у прэзідэнты У. Някляеў, а таксама шэраг іншых актывістаў апазіцыі. 5 студзеня 2011 г. Міністэрствам юстыцыі на яе адрас быў накіраваны Загад аб выпраўленні выяўленага парушэння. У загадзе адзначалася, што ў інтэрнэце былі размешчаны вытрымкі з інтэрв'ю Т. Сідарэнкі, у якім яна выказала здагадкі пра мэтанакіраваны нядопуск яе да падабароннага. Размешчаная ў СМІ інфармацыя, на думку міністэрства, выйшла за межы, вызначаныя задачамі адвакатуры, палажэннямі Закона «Аб адвакатуры»,[428] які дзейнічаў тады, і не адпавядала патрабаванням Правілаў прафесійнай этыкі адваката.[429] Гэтымі правіламі вызначаны абавязкі адваката па падтрыманні годнасці прафесіі і асабістай годнасці. У сувязі з гэтым Міністэрства юстыцыі прадпісала адвакату Т. Сідарэнцы прыняць меры «па недапушчэнні фактаў скажэння інфармацыі» і паведаміць аб выкананні прадпісання ў тэрмін да 15 студзеня 2011 г. пад пагрозай прыпынення дзеяння выдадзенай ліцэнзіі на ажыццяўленне адвакацкай дзейнасці. 19 ліпеня 2011 г. Міністэрства юстыцыі накіравала на адрас Т. Сідарэнкі другое прадпісанне, у якім адзначалася здзяйсненне адвакатам шэрагу парушэнняў пры афармленні фінансавых дакументаў і пагадненняў з кліентамі. А ўжо 1 верасня 2011 г. Т. Сідарэнка атрымала паведамленне аб спыненні дзеяння выдадзенай ёй ліцэнзіі на права займацца адвакацкай дзейнасцю. Падставай для гэтага паслужыла паўторнасць допушчаных адвакатам парушэнняў. Абскарджанне гэтага паведамлення ў судзе станоўчага выніку не дала.[430]

### *Адукацыя*

Адной з формаў дыскрымінацыі па палітычных прычынах з'яўляецца адлічэнне студэнтаў і навучэнцаў з вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Маладыя людзі, якія праяўляюць актыўнасць у апазіцыйных рухах, могуць быць адлічаныя за такія парушэнні вучэбнай дысцыпліны, пры якіх у адносінах да звычайных студэнтаў адміністрацыя навучальных устаноў абмяжоўваецца вымовамі і не перашкаджае працягу навучання. Напрыклад, у снежні 2009 г. Т. Шапуцька, прэс-сакратар актыўна дзеючай апазіцыйнай моладзевай арганізацыі «Малады фронт», была адлічана з юрыдычнага факультэта БДУ. Прычынай паслужыў яе ўдзел у Форуме грамадзянскай супольнасці праграмы «Усходняе партнёрства» ў Бруселі (Бельгія), для ўдзелу ў якім былі запрошаныя незалежныя грамадскія арганізацыі. Выступ прадстаўніка Еўракамісіі ў абарону Т. Шапуцькі не быў успрыняты беларускімі ўладамі.[431] Падобныя выпадкі адзначаліся і раней (гл. ніжэй).

427 БДИПЧ/ОБСЕ. Отчет. *Мониторинг судебных процессов в Республике Беларусь (март – июль 2011 г.)*, Варшава, 2011, п. 200. Ёсць на: http://www.osce.org/odihr/84874.

428 Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 1993 г. № 2406-XII «Аб адвакатуры».

429 Пастанова Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 27 чэрвеня 2001 г. № 15 «Аб зацвярджэнні Правілаў прафесійнай этыкі адваката».

430 Усе матэрыялы ў архіве РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт», люты 2013 г.

431 Таццяна Шапуцька, інтэрв'ю БХК ад 29 лістапада 2011 г., Мінск.

**Прыклад 8.**
**Што будзе са студэнтамі, якія ўдзельнічалі ў акцыі?**
*Алена Спасюк, Naviny.by (вытрымка з артыкула)**

Некаторыя студэнты, якія ўдзельнічалі ў акцыі 19 снежня і былі затрыманыя пасля яе, ужо выйшлі свабоду. Частка яшчэ адбывае адміністрацыйнае пакаранне. Ці могуць быць студэнты спакойныя за сваё навучанне або ім варта рыхтавацца да адлічэння? «Па палітычных матывах з беларускіх ВНУ не адлічваюць», – адказаў на гэтае пытанне дарадца міністра адукацыі па сувязях са СМІ і грамадскасцю Віктар Іўчанкаў. Сапраўды, у Беларусі для адлічэння непажаданых у сістэме студэнтаў прымяняюцца іншыя матывы. (...)

Актывіст апазіцыі студэнт-выдатнік Зміцер Жалезнічэнка быў двойчы адлічаны з Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Скарыны. У верасні 2007 г. яго адлічылі, у канцы студзеня 2008 г. рашэннем суда аднавілі, але праз чатыры дні зноў адлічылі і прызвалі ў армію.

У 2008 г. з Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Сухога быў адлічаны студэнт 3-га курса, актывіст моладзевага дэмакратычнага руху Мікіта Бусакоў. Падставай для адлічэння, у адпаведнасці з загадам рэктара, паслужыла акадэмічная непасняховасць. Па словах самога Баграва, ён не здаў адзін экзамен, які яму не далі магчымасць пераздаць.

У лютым 2008 г. моладзевы актывіст Франак Вячорка быў адлічаны з 3-га курса спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» факультэта журналістыкі БДУ, дзе навучаўся на дзённым аддзяленні за кошт бюджэту. «З афіцыйнай матывіроўкай "за акадэмічную непаспяховасць" я быў адлічаны пасля таго, як прапусціў два экзамены з-за незаконнага затрымання і 15-сутачнага адміністрацыйнага арышту», – распавядаў тады Вячорка. Сярэдні бал студэнта Вячоркі пры адлічэнні складаў 8,7. Моладзевы актывіст восем разоў падаваў заявы на аднаўленне, аднак атрымліваў нязменную адмову. Толькі нядаўна кіраўніцтвам БДУ яму быў прапанаваны варыянт працягу вучобы – на філфаку, завочна і за свой кошт.





Naviny.by звярнуліся ў БДУ з пытаннем, што плануе кіраўніцтва ўніверсітэта адносна студэнтаў, якія ўдзельнічалі ў акцыі 19 снежня. У прэс-службе БДУ адказалі, што кіраўніцтва не мае намеру адлічваць з універсітэта студэнтаў, якія ўдзельнічалі ў акцыі. Затрыманыя студэнты, якія ўжо выйшлі на свабоду, напісалі кіраўніцтву ўніверсітэта тлумачальныя запіскі адносна свайго ўдзелу ў акцыі. Па дадзеных прэс-службы, аналіз ужо прадастаўленых запісак сведчыць, што сярод затрыманых студэнтаў было шмат выпадковых людзей.

** Спасюк, А. «Што будзе са студэнтамі, якія ўдзельнічалі ў акцыі?», Naviny.by, 28 снежня 2010 г. Ёсць на http://naviny.by.*

### *Свабода творчасці*

Асобы з апазіцыйнымі поглядамі і перакананнямі, якія займаюцца творчай дзейнасцю, таксама могуць сутыкацца з дыскрымінацыйным стаўленнем уладаў. Напрыклад, ёсць усе падставы лічыць, што вясной 2011 г. з'явілася сакрэтнае распараджэнне забараніць выступы ў падкантрольных дзяржаве СМІ і на FM-радыёстанцыях шэрагу беларускіх і замежных музыкаў, артыстаў, пісьменнікаў, дзеянні якіх маглі выклікаць незадавальненне уладаў. Мяркуецца, што ў выніку дзеяння гэтага сакрэтнага распараджэння адмены канцэртаў апальных музыкантаў у беларускіх клубах сталі рэгулярнымі.[432] Пры гэтым невядома ніводнага выпадку падобных адмен у дачыненні музыкантаў, якія ўдзельнічаюць у афіцыйных святочных мерапрыемствах. Прэзідэнт А. Лукашэнка публічна адмаўляў, што яму нешта вядома аб «чорных спісах» ці што ён даваў падобныя даручэнні падначаленым.[433]

Удзельнік папулярнага гурту «Крама», якая патрапіла ў магчымы «чорны спіс», паведамляе:

432 Заміраўская Т. «Молчаливая ге:акция», БелГазета, 16 студзеня 2012 г. С. 7, 9.

433 *Прэс-канферэнцыя Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі беларускім і замежным сродкам масавай інфармацыі*, 15 студзеня 2013 г. Афіцыйны сайт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ёсць на: http://president.gov.by/press140878.html.

*Зараз мы практычна цалкам пазбаўленыя магчымасці выступаць. Не можам правесці канцэрт па квітках – адміністрацыі клубаў і канцэртных залаў адмаўляюць у памяшканні па розных прычынах. Нас не транслююць FM-станцыі, а гэта значыць, што нас проста няма. Мы не атрымліваем ніякіх аўтарскіх грошай. Я гэта тлумачу «забароненым спісам» непажаданых уладзе музыкаў. Я яго сам бачыў у Інтэрнэце і перакананы, што ён рэальна дзейнічае. Так, мы заўсёды прытрымліваліся і ў творчасці, і ў грамадскіх пазіцыях ідэй свабоды, дэмакратыі, незалежнасці Беларусі і годнага становішча беларускай нацыянальнай культуры і беларускай мовы.*[434]

***Высновы***

З улікам прыведзеных у гэтым дакладзе звестак можна зрабіць выснову аб наяўнасці ў Беларусі сістэмных праблем з выкананнем палажэнняў часткі 2 артыкула 2 Міжнароднага пакта аб сацыяльных, эканамічных і культурных правах. Нагадаем, што дадзены артыкул утрымлівае, апроч іншага, забарону дыскрымінацыі з-за палітычных і іншых перакананняў пры ажыццяўленні гарантаваных Пактам правоў, у тым ліку права на працу (арт. 6), на адукацыю (арт. 13) і на свабоду творчай дзейнасці (ч. 3 арт. 15). Вырашэнне гэтых праблем, мабыць, немагчыма без агульнага паляпшэння дэмакратычнай прававой культуры ў краіне і без выразна выяўленага імкнення вышэйшага кіраўніцтва Беларусі да змены дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да грамадзян, якія думаюць апазіцыйна.

## 2.4 Уплыў фактараў беднасці і грамадзянства ў кантэксце роўнасці і недыскрымінацыі

Беднасць і адсутнасць грамадзянства краіны пражывання ў Беларусі могуць выступаць дадатковым фактарам ці падставай для ўзнікнення няроўнасці розных тыпаў. Пры гэтым пытанне аб дыскрымінацыі і няроўнасці, звязаных з беднасцю або са статусам неграмадзяніна, даследавана пакуль недастаткова, таму мы толькі пазначым тыя агульныя праблемы, з якімі прадстаўнікі ўразлівых сацыяльных груп могуць сутыкацца ў гэтай галіне.

434 Сяргей (прозвішча не пазначана), інтэрв'ю БХК ад 3 снежня 2011 г., Мінск.





У кантэксце беднасці варта спаслацца, напрыклад, на частку 1 артыкула 11 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, які прызнае права кожнага «на дастатковы жыццёвы ўзровень для яго самога і яго сям'і, які ўключае дастатковае харчаванне, адзенне і жыллё, і на бесперапыннае паляпшэнне ўмоў жыцця».

Хоць у міжнародным праве дапускаецца ўстанаўліваць розны рэжым доступу да пэўных правоў для грамадзян і неграмадзян, замежнікі і асобы без грамадзянства тым не менш падпадаюць пад безумоўную абарону ад дыскрымінацыі па іншых падставах, такіх як раса і этнічнае паходжанне. Напрыклад, прадстаўнікі расавых меншасцяў абаронены ратыфікаванай Беларуссю Міжнароднай канвенцыяй аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі па-за залежнасці ад статусу грамадзяніна або неграмадзяніна. Увогуле варта таксама адзначыць, што адвольнае і/або непрапарцыйнае абмежаванне правоў неграмадзян у параўнанні з правамі грамадзян будзе відавочна супярэчыць сучасным стандартам правоў чалавека.

Адносна доступу неграмадзян да абароны сваіх правоў можна адзначыць падыход, які ўключае асноўныя праваабарончыя канвенцыі ААН. Напрыклад, правы, гарантаваныя Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах, дзейнічаюць у дачыненні да ўсіх асоб, якія знаходзяцца пад юрысдыкцыяй дзяржавы, калі ў адпаведных артыкулах пакта не ўстаноўлена іншае. У Заўвазе агульнага парадку № 23 Камітэт па правах чалавека асабліва адзначыў, што статус грамадзяніна краіны пражывання не павінен з'яўляцца ўмовай для таго, каб патрапіць пад абарону артыкула 27 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. Гэты артыкул прадугледжвае для прадстаўнікоў этнічных, рэлігійных і моўных меншасцяў гарантыі права карыстацца сваёй культурай, вызнаваць сваю рэлігію і выконваць яе абрады, а таксама карыстацца роднай мовай.[435]

435 Гл. спасылку 136, Art. 5.1.

### *Фактар беднасці*

Як і іншыя краіны Усходняй Еўропы, Беларусь сутыкаецца з сур'ёзнай праблемай беднасці, што можа стаць важным фактарам, які ўплывае на роўны доступ да асноўных правоў і свабодаў чалавека. Паводле высноваў беларускага офіса Праграмы развіцця ААН,

> *у параўнанні з іншымі краінамі з пераходнай эканомікай узровень беднасці ў Беларусі з'яўляецца адным з самых нізкіх. Менш за 1% насельніцтва краіны жыве ў крайняй беднасці, пад якой разумеюць прыбытак менш чым $ 2 на дзень. У той жа час значная колькасць беларускіх грамадзян трапляе ў катэгорыю з нізкім узроўнем прыбытку: паводле дадзеных афіцыйнай статыстыкі, у сярэдзіне 2000-х гг. колькасць насельніцтва з прыбыткам ніжэй за бюджэт пражытковага мінімуму заставалася параўнальна высокай і складала больш за 1,7 мільёна чалавек ці 17,8% ад агульнай колькасці насельніцтва краіны. Як і ў іншых краінах СНД, з рызыкай беднасці найчасцей сутыкаюцца жыхары сельскіх раёнаў, дзеці і няпоўныя сем'і.*[436]

Сітуацыя прыкметна палепшылася да канца 2000-х гг. Так, па афіцыйных статыстычных дадзеных, апублікаваных у 2010 г., удзельная вага малазабяспечанага насельніцтва (г. зн. з узроўнем сярэднедушавых наяўных рэсурсаў ніжэй за бюджэт пражытковага мінімуму) у працэнтах да агульнай колькасці насельніцтва няўхільна скарачалася з 41,9% у 2000 г. да 5,4% у 2009 г. Гэтая праблема ў 2009 г. была больш актуальнай для сельскага насельніцтва (9,5%), у параўнанні з гарадскім (4,0%), і для мужчын (5,9%), у параўнанні з жанчынамі (5,1%).[437] Паводле той жа крыніцы, доля малазабяспечаных хатніх гаспадарак у 2009 г. была 3,7%, прычым рызыка патрапіць у гэтую катэгорыю была дастаткова нізкай для хатніх гаспадарак без дзяцей (2,0% ад агульнай колькасці такіх хатніх гаспадарак) і яшчэ ніжэй для сем'яў пенсіянераў без дзяцей (0,4%). Аднак рызыка значна ўзрастала для хатніх гаспадарак з непаўналетнімі дзецьмі (7,5%), асабліва пры наяўнасці двух і больш дзяцей (12,6%) або пры наяўнасці толькі аднаго дарослага члена хатняй гаспадаркі (9,9%).[438]

Сусветны эканамічны крызіс, які пасля 2009 г. закрануў і Беларусь, негатыўна паўплываў на сітуацыю з беднасцю ў краіне. Аднак у 2012 г. ужо назіралася некаторае паляпшэнне сітуацыі: доля малазабяспечаных хатніх гаспадарак склала 4,6%, у тым ліку ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу – 3,8%, у сельскіх населеных пунктах – 6,7%. Пры гэтым, у структуры малазабяспечаных хатніх гаспадарак больш за палову (65,1%) склалі хатнія гаспадаркі, якія маюць непаўналетніх дзяцей, 22,1% – хатнія гаспадаркі без дзяцей і 12,8% – хатнія гаспадаркі, якія складаюцца з аднаго чалавека.[439]

З улікам вышэйсказанага справядлівым падаецца падыход Камітэта ААН па правах дзяцей. У Заключных заўвагах па Беларусі (2011 г.) Камітэт станоўча ахарактарызаваў скарачэнне колькасці дзяцей, якія жывуць ніжэй мінімальнага пражытковага ўзроўню. Адначасова з гэтым Камітэт адзначыў, што, нягледзячы на выплату дапамогі на дзіцяі іншых відаў дапамогі шматдзетным сем'ям, сем'і з трыма ці больш дзецьмі і адзінокія бацькі з дзецьмі непрапарцыйна пакутуюць ад беднасці. Таму Камітэт рэкамендуе Беларусі

> *актывізаваць намаганні па забеспячэнні дастатковага і ўстойлівага ўзроўню жыцця ўсім дзецям, якія знаходзяцца на яе тэрыторыі, надаючы асаблівую ўвагу маргіналізаваным і бяздольным сем'ям у мэтах забеспячэння іх права на развіццё. Ён рэкамендуе вывучыць асноўныя прычыны беднасці і заняцца іх ліквідацыяй.*[440]

---

436 Праграма развіцця ААН у Беларусі. *Зніжэнне беднасці.* Ёсць на: http://undp.by/ ru/undp/ focus-areas/povertyreduction.

437 *Социальное положение и уровень жизни населения Республики Беларусь, Статистический сборник*. Минск: Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2010. Табл. 5.19.

438 Там жа. Табл. 5.21.

439 Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь. *Прэс-рэліз «Аб змяненні ўзроўню жыцця насельніцтва Рэспублікі Беларусь у 2012 г.»*, 1 сакавіка 2013 г.

440 Гл. спасылку 239, п. 64.

Беларускія ўлады вырашаюць праблему беднасці, апроч іншага, развіваючы сістэму дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі насельніцтву. Такая дапамога ажыццяўляецца ў выглядзе штомесячнай і/або аднаразовай сацыяльнай дапамогі ці сацыяльнай дапамогі на аплату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі (для інвалідаў або дзяцей з адпаведнымі медыцынскімі паказаннямі). Дапамога выдаецца на набыццё прадуктаў харчавання, лекавых сродкаў, адзення, абутку, школьных прылад і на іншыя патрэбы для забеспячэння нармальнай жыццядзейнасці, а таксама на аплату (поўную або частковую) жыллёва-камунальных паслуг.[441] Напрыклад, за I квартал 2013 г. адрасная дапамога была аказаная 73292 чал., пры гэтым 25037 чал. атрымалі штомесячную сацыяльную дапамогу, 5679 чал. – аднаразовую, 6174 чал. атрымалі асаблівую дапамогу на набыццё памперсаў, 5249 чал. – на аплату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, а 31153 чал. былі забяспечаныя прадуктамі харчавання для дзяцей першых двух гадоў жыцця.[442]

Беларуская дзяржава таксама спрыяе працоўнай інтэграцыі прадстаўнікоў сацыяльна непасляховых слаёў насельніцтва, асабліва праз сістэму броні, падрабязна апісаную ў главе 3 гэтага даклада.

Праблема беднасці ў беларускім кантэксце асвятляе важнасць комплекснага падыходу да праблемы роўнасці і недыскрымінацыі, прынятага Асацыяцыяй роўных правоў: неспрыяльнае становішча ў сацыяльным плане можа ўзнікаць з прычыны кумулятыўнага эфекту ад няроўнасці розных тыпаў і на розных падставах, часам не звязаных адна з адной непасрэдна. Напрыклад, негатыўнымі фактарамі могуць стаць адначасова і ўзрост, і пражыванне ў шматдзетнай сям'і, і месца жыхарства (сельская мясцовасць).

### *Фактар грамадзянства*

Як ужо адзначалася вышэй, асноўны міграцыйны абмен Беларусі адбываецца з краінамі СНД: у 2010 г. на іх прыйшлося 83% усіх імігрантаў.[443]

441 Указ Президента Республики Беларусь от 19 января 2012 г. № 41 «О государственной адресной социальной помощи», ст. 1.

442 Министерство труда и социальной защиты Республики Беларусь. *Государственная адресная социальная помощь.* Ёсць на: www.mintrud.gov.by.

443 Гл. спасылку 147. С. 25.





У 2011 г. у Беларусі пражывала 141317 замежных грамадзян і 7397 асоб без грамадзянства. На ўліку ў органах па грамадзянстве і міграцыі сталі 594 уцекачы з 12 дзяржаў (па стане на 1 студзеня 2012 г.).[444] Як паведаміў прадстаўнік міграцыйных уладаў, у Беларусі існуюць надзейныя фільтры, якія не дазваляюць так званым непажаданым асобам (выхадцам з краін трэцяга свету) патрапіць у краіну. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прававым становішчы замежных грамадзян»[445] выбудоўвае цэлы шэраг адміністрацыйных бар'ераў на іх шляху. Таму выхадцаў з краін трэцяга свету ў Беларусі вельмі мала. Акрамя таго, мігранты праходзяць адпаведнае медыцынскае абследаванне. Пры наяўнасці сур'ёзных захворванняў мы маем права адмовіць ім у пераездзе. Такое было неаднаразова.[446]

Вынікам падобнай «стрыманасці» ў міграцыйнай палітыцы ўладаў з'яўляецца вельмі нязначная колькасць бачных мігрантаў, якія пражываюць у Беларусі. Інфармацыі аб іх становішчы вельмі мала. Тым не менш, асобныя выпадкі дыскрымінацыі па колеры скуры былі адзначаныя беларускімі праваабаронцамі. Увогуле нядаўнія імігранты нярэдка становяцца ахвярамі дыскрымінацыі як з-за свайго міграцыйнага статусу, так і з-за расавага/этнічнага паходжання. У пэўнай ступені недапушчальнае абыходжанне з бачнымі меншасцямі з боку некаторых прадстаўнікоў уладаў і звычайнага насельніцтва можна растлумачыць і агульным нізкім узроўнем прававой культуры.

Напрыклад, у 2011 г. у Мінску адбыўся выпадак дыскрымінацыі чарнаскурага грамадзяніна Нігерыі Дж. Эмесібэ з боку праваахоўных органаў, калі міліцыянты зафіксавалі факт няправільнай паркоўкі яго машыны. Нягледзячы на тое, што каля пад'езда было яшчэ некалькі іншых няправільна прыпаркаваных машын, яму патлумачылі, што «для чорных сітуацыя іншая»; жонку грамадзяніна Нігерыі ў прысутнасці дзяцей абразілі за тое, што яна выйшла замуж за чарнаскурага. У судовым парадку прыцягнуць да адказ-

444 Гл. спасылку 148, пп. 89 і 102.

445 Закон Республики Беларусь от 4 января 2010 г. № 105-З «О правовом положении иностранных граждан и лиц без гражданства в Республике Беларусь».

446 Боярович Д. «Беларусь будет платить мигрантам $1000 за их въезд в страну и адаптацию», *TUT.BY*, 3 февраля 2011 г. Ёсць на: http://news.tut.by/society/213788.html.

насці міліцыянтаў не атрымалася, хоць прававую дапамогу ахвяры аказваў Беларускі Хельсінкскі Камітэт. Больш за тое, Дж. Эмесібэ пабаяўся працягваць барацьбу за справядлівасць, таму што на яго пачалі аказваць ціск. Ён спалохаўся, што судовая цяжба прычыніць значныя страты яго бізнесу; апроч таго, ён адчуў сябе ўразлівым з-за свайго статусу замежніка.[447]

Як ужо раней адзначалася ў дакладзе, беларускае заканадаўства прадугледжвае прамую дыскрымінацыю іншаземцаў і асоб без грамадзянства пры рэалізацыі імі сваіх рэлігійных свабод: згодна з артыкулам 14 Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» рэлігійныя абшчыны ўтвараюцца па ініцыятыве не менш дваццаці грамадзян Рэспублікі Беларусь і кіраўніком абшчыны можа быць толькі беларускі грамадзянін. Падобныя абмежаванні нярэдка прыводзяць даўскоснай дыскрымінацыі па этнічнай прыкмеце, бо сярод неграмадзян пераважаюць прадстаўнікі этнічных меншасцяў. Таксама толькі грамадзяне Беларусі прызнаюцца ў якасці прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў (арт. 1 Закона «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь»), чым ужо вызначаецца фармальна-юрыдычная няроўнасць прадстаўнікоў розных этнічных груп, што пражываюць у Беларусі.

У асабліва неспрыяльным становішчы ў Беларусі могуць знаходзіцца асобы без грамадзянства (апатрыды), якія пражываюць тут. Многія набылі такі статус з-за недасканаласці заканадаўства аб грамадзянстве краін, якія ўтварыліся на тэрыторыі былога Савецкага Саюза, сярод такіх асоб нямала этнічных беларусаў. На практыцы яны не могуць рэалізаваць некаторыя свае правы ў самых розных галінах жыцця, зноў-такі з-за прабелаў у заканадаўстве. Напрыклад, беларускія чыноўнікі і суды трактуюць заканадаўства такім чынам, што гэта робіць немагчымым для асоб без грамадзянства прайсці працэдуру змены прозвішча.[448]

447 Усе матэрыялы ў архіве РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт», люты 2013 г.

448 Гл. інфармацыю пра справу Грышчанкі ў частцы III гэтага даклада.





***Высновы***

Прыведзеныя вышэй дадзеныя сведчаць пра больш хісткае становішча ў сацыяльным плане непаўналетніх дзяцей, асабліва тых, якія пражываюць у шматдзетных сем'ях, ці якія выхоўваюцца адным з бацькоў. Яны часцей сутыкаюцца з праблемамі беднасці, якія могуць абмежаваць іх доступ да іншых правоў і свабод і стаць прычынай іх няроўнага становішча ў параўнанні з прадстаўнікамі іншых сацыяльных груп. Праблема беднасці таксама больш востра стаіць перад сельскімі жыхарамі, у параўнанні з гараджанамі. Беларускія ўлады рэагуюць на гэтую праблему праз сістэму адраснай сацыяльнай дапамогі і механізмы стымулявання працаўладкавання прадстаўнікоў сацыяльна ўразлівых груп насельніцтва.

Беларускае заканадаўства мае такія палажэнні, якія наўпрост дыскрымінуюць грамадзян замежных дзяржаў і асоб без грамадзянства ў этнаканфесійнай сферы. Неграмадзяне з-за свайго статусу таксама могуць быць уразлівыя ў кантэксце абароны правоў на роўнасць і недыскрымінацыю. Асобы без грамадзянства могуць сутыкацца з неабгрунтаванымі абмежаваннямі сваіх правоў па прычыне недасканаласці беларускага заканадаўства.

## 3. ЗАКАНАДАЎСТВА, ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА І СУДОВАЯ ПРАКТЫКА Ў ГАЛІНЕ РОЎНАСЦІ І НЕДЫСКРЫМІНАЦЫІ

У гэтай главе даклада аналізуюцца прававыя і практычныя аспекты рэалізацыі ў Беларусі прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі.

### 3.1 Міжнародна-прававыя абавязацельствы Беларусі

*Сістэма ААН*

Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам асноўных міжнародных канвенцый ААН, палажэнні якіх накіраваны на супрацьдзеянне няроўнасці і дыскрымінацыі. Краіна ратыфікавала ці далучылася, апроч іншага, да наступных дагавораў: Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (1966 г.), Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (1966 г.), Міжнародная Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (1966 г.), Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (1979 г.), Канвенцыя аб правах дзіцяці (1989 г.), Канвенцыя ЮНЕСКА супраць дыскрымінацыі ў галіне адукацыі (1960 г.), Канвенцыя № 111 МАП аб дыскрымінацыі ў галіне працы і заняткаў (1958 г.). Да дадзеных канвенцыях не зроблена якіх-небудзь агаворак ці дэкларацый, што маюць значэнне для гэтага даклада.

*Табліца 3.*
*Статус удзелу Рэспублікі Беларусь у асноўных міжнародных пагадненнях, якія закранаюць пытанні роўнасці і недыскрымінацыі*

| Канвенцыя | Падпісанне | Далучэнне / Ратыфікацыя |
|---|---|---|
| Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (1966 г.) | 19.03.1968 г. | 12.11.1973 г. |
| Факультатыўны пратакол № 1 да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах (1966 г.) | | 30.09.1992 г.* |
| Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (1966 г.) | 19.03.1968 г. | 12.11.1973 г. |
| Факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (2008 г.) | Не | Не |





| Канвенцыя | Падпісанне | Далучэнне / Ратыфікацыя |
|---|---|---|
| Міжнародная Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (1966 г.) | 7.03.1966 г. | 8.04.1969 г. |
| Дэкларацыя да артыкула 14 Міжнароднай Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (1966 г.) (права індывідуальных скаргаў) | | Не |
| Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (1979 г.) | 17.07.1980 г. | 4.02.1981 г. |
| Факультатыўны пратакол да Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (1999 г.) | 29.04.2002 г. | 3.02.2004 г. |
| Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання (1984 г.) | 19.12.1985 г. | 13.03.1987 г. |
| Факультатыўны пратакол да Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання (2002 г.) | Не | Не |
| Канвенцыя аб правах дзіцяці (1989 г.) | 26.01.1990 г. | 1.10.1990 г. |
| Факультатыўны пратакол I да Канвенцыі аб правах дзіцяці, што датычыцца ўдзелу дзяцей ва ўзброеных канфліктах (2000 г.) | | 25.01.2006 г.* |
| Факультатыўны пратакол II да Канвенцыі аб правах дзіцяці, што датычыцца гандлю дзецьмі, дзіцячай прастытуцыі і дзіцячай парнаграфіі (2000 г.) | | 23.01.2002 г.* |
| Факультатыўны пратакол III да Канвенцыі аб правах дзіцяці, што датычыцца працэдуры паведамленняў (2011 г.) | Не | Не |
| Міжнародная канвенцыя аб абароне правоў усіх працоўных-мігрантаў і членаў іх сем'яў (1990 г.) | Не | Не |
| Канвенцыя аб правах інвалідаў (2006 г.) | Не | Не |
| Факультатыўны пратакол да Канвенцыі аб правах інвалідаў (2006 г.) | Не | Не |
| Міжнародная канвенцыя для абароны ўсіх асоб ад гвалтоўных знікненняў (2006 г.) | Не | Не |
| Канвенцыя Міжнароднай арганізацыі працы № 29 аб прымусовай або абавязковай працы (1930 г.) | | 21.08.1956 г. |

| Канвенцыя | Падпісанне | Далучэнне / Ратыфікацыя |
|---|---|---|
| Дадатковая Канвенцыя аб скасаванні рабства, гандлю рабамі і інстытутаў і звычаяў, падобных з рабствам (1956 г.) | 7.09.1956 г. | 5.06.1957 г. |
| Канвенцыя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый супраць транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці (2000 г.) | 14.12.2000 г. | 25.06.2003 г. |
| Пратакол аб папярэджанні і спыненні гандлю людзьмі, асабліва жанчынамі і дзецьмі, і пакаранні за яго, які дапаўняе Канвенцыю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый супраць транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці (2000 г.) | 14.12.2000 г. | 25.06.2003 г. |
| Канвенцыя № 182 Міжнароднай арганізацыі працы аб забароне і неадкладных мерах па выкараненні найгоршых формаў дзіцячай працы (1999 г.) | | 31.10.2000 г. |
| Канвенцыя № 183 Міжнароднай арганізацыі працы аб ахове мацярынства (1999 г.) | | 10.02.2004 г. |
| Канвенцыя ЮНЕСКА супраць дыскрымінацыі ў галіне адукацыі (1960 г.) | | 12.12.1962 г.** |
| Канвенцыя № 100 Міжнароднай арганізацыі працы Канвенцыя аб роўнай узнагародзе мужчын і жанчын за працу роўнай каштоўнасці (1951 г.) | | 21.08.1956 г. |
| Канвенцыя № 111 Міжнароднай арганізацыі працы аб дыскрымінацыі ў галіне працы і заняткаў (1958 г.) | | 04.08.1961 г. |

*Заўвага. Гл. падрабязней у бібліяграфіі. * – Далучэнне; ** – Перадача ратыфікацыйнай граматы дэпазітарыю*

Як відаць з табліцы, многія канвенцыі былі ратыфікаваны яшчэ Беларускай ССР, якая ўваходзіла ў склад СССР, аднак логіка савецкага заканадаўства не прадугледжвала прамога дзеяння норм міжнароднага права.[449]

449 Василевич Г. *Источники белорусского права: принципы, нормативные акты, обычаи, прецеденты, доктрина.* Минск: Тесей, 2008. С. 43.





Прынятая пасля атрымання незалежнасці Канстытуцыя 1994 г. у артыкуле 8 прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і патрабуе забяспечваць адпаведнасць ім заканадаўства, пры гэтым не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Асноўнаму закону.

> *Дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы.*[450]

Закон «Аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь»[451] прама ўстанаўлівае, што «нормы права, якія змяшчаюцца ў міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца часткай дзеючага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь заканадаўства» (арт. 33). Агаворкі зроблены толькі для тых выпадкаў, калі з самага дагавора вынікае, што для прымянення яго норм патрабуецца прыняцце (выданне) унутрыдзяржаўнага нарматыўнага прававога акта.

Такім чынам, нормы міжнародных праваабарончых канвенцый, да якіх Беларусь далучылася ці якія яна ратыфікавала, маюць у краіне прамое дзеянне. Пры калізіі норм такой канвенцыі з палажэннямі законаў і падзаконных актаў, прыярытэт павінен быць у міжнародных нормаў: зыходзячы з логікі артыкулаў 8 і 21 Асноўнага закона, такія канвенцыі загадзя не супярэчаць Канстытуцыі, унутранае заканадаўства павінна адпавядаць устаноўленым у іх прынцыпам; больш за тое, гэтыя прынцыпы можна і трэба выкарыстоўваць для ўдакладнення зместу адпаведных канстытуцыйных палажэнняў. Такое разуменне з'яўляецца для юрыстаў Беларусі, у цэлым, агульнапрынятым.

Тым не менш, па заўвазе эксперта, выкарыстанне прамых спасылак на Канстытуцыю і міжнароднае права ў беларускіх судах з'яўляецца рэдкасцю. Выключэннем тут выступае толькі Канстытуцыйны Суд, які актыўна спасылаецца і выкарыстоўвае міжнароднае права, у тым ліку

450 Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (арт. 21).

451 Закон Республики Беларусь от 23 июля 2008 г. № 421–З «О международных договорах Республики Беларусь».

праваабарончага характару.[452] Такім чынам, хоць Беларусь удзельнічае ў найбольш значных міжнародных праваабарончых канвенцыях, практычны эфект ад іх на нацыянальным узроўні можа быць абмежаваным.

Вялікае значэнне мае факт далучэння ўжо незалежнай Беларусі да Факультатыўнага пратакола № 1 да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (1966 г.). Прадугледжаная пратаколам працэдура падачы індывідуальных скаргаў актыўна выкарыстоўваецца жыхарамі Беларусі, у тым ліку ў дачыненні да парушэнняў, якія прама ці ўскосна звязаны з дыскрымінацыяй і раўнапраўем.[453] Жыхары Беларусі, аднак, не маюць магчымасці выкарыстоўваць працэдуру індывідуальных скаргаў згодна з Факультатыўным пратаколам да Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (2008 г.), таму што Беларусь да яго не далучылася.

Што датычыць спецыялізаваных «антыдыскрымінацыйных канвенцый», то Беларусь не прызнала правы падачы індывідуальных скаргаў згодна з артыкулам 14 Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі (1966 г.), тым самым не дала магчымасці падачы паведамленняў ад асобных асоб або груп асобаў адносна магчымых парушэнняў палажэнняў дадзенай Канвенцыі. Аднак Беларусь далучылася ў 2004 г. да Факультатыўнага пратакола да Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (1999 г.), тым самым дала права падачы індывідуальных скаргаў на магчымыя парушэнні гэтай канвенцыі.

У рамках Універсальнага перыядычнага агляду ў 2010 г. Беларусь выказала падтрымку сфармуляваным ужо ў ходзе інтэрактыўнага дыялогу рэкамендацый, што тычацца далучэння да Міжнароднай канвенцыі аб абароне правоў усіх працоўных-мігрантаў і членаў іх сем'яў (1990 г.),

452 Гл. спасылку 449. С. 49, 51.

453 Гл. больш падрабязна: ААН, Права человека, Управление Верховного комиссара по правам человека. Беларусь: Главная страница. Ёсць на: http://www.ohchr.org/RU/countries/ENACARegion/Pages/BYIndex.aspx.





а таксама да Канвенцыі аб правах інвалідаў (2006 г.).[454] Адносна другой рэкамендацыі вядома аб канкрэтных планах Беларусі далучыцца да гэтага дакумента.[455]

У дачыненні да шэрагу іншых рэкамендацый, якія тычацца ратыфікацыі праваабарончых канвенцый, выказаных у рамках Універсальнага перыядычнага агляду ў 2010 г., пазіцыя Беларусі была больш стрыманай ці нават адмоўнай. Напрыклад, на думку беларускіх уладаў ужо наяўныя ўнутраныя меры прававой абароны робяць залішнім далучэнне да Факультатыўнага пратакола да Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання (2002 г.) або да Міжнароднай канвенцыі для абароны ўсіх асоб ад гвалтоўных знікненняў (2006 г.).[456] Такім чынам, далучэнне Беларусі да дадзеных інструментаў у бліжэйшы час уяўляецца малаверагодным.

*Сістэма СНД*

Беларусь у якасці краіны-члена Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД), які аб'ядноўвае большасць былых рэспублік СССР, заключыла шэраг пагадненняў, якія змяшчаюць палажэнні аб абароне жанчын, груп меншасцяў і недыскрымінацыі. Варта асабліва адзначыць наступныя пагадненні і ўстаноўленыя ў іх нормы:

- Канвенцыя СНД аб правах і асноўных свабодах чалавека (1995 г.), асабліва артыкул 20 аб роўнасці і недыскрымінацыі на любой падставе; артыкул 14 аб правах працуючых жанчын; артыкул 21 аб правах асоб, якія адносяцца да меншасцяў.

454 Совет по правам человека. *Доклад Рабочей группы по универсальному периодическому обзору: Беларусь*, UN Doc. A/HRC/15/16, 21 июня 2010 г., пп. 97.1–97.2.

455 Спасюк Е. «Беларусь намерена присоединиться к Конвенции о правах инвалидов», *Naviny.by*, 1 апреля 2012 г. Ёсць на: http://naviny.by.

456 Совет по правам человека. *Доклад Рабочей группы по универсальному периодическому обзору: Беларусь, Добавление: Мнения по выводам и/или рекомендациям, добровольные обязательства и ответы, представленные государством – объектом обзора*, UN Doc. A/HRC/15/16/Add.1, 15 сентября 2010 г. С. 2–3.

- Канвенцыя аб забеспячэнні правоў асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцяў (1994 г.). Артыкул 1 Канвенцыі вызначае такіх асобаў як тых, хто пастаянна пражывае на тэрыторыі дагаворнага боку і мае яго грамадзянства і хто адрозніваецца ад «асноўнага насельніцтва» па этнічным паходжанні, мове, культуры, рэлігіі ці традыцыях.

- Канвенцыя аб прававым статусе працоўных-мігрантаў і членаў іх сем'яў дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў (2008 г.), асабліва артыкул 7 – роўнасць з грамадзянамі прымаючага боку перад законам і судом.

Характэрна, што Канвенцыя СНД аб правах і асноўных свабодах (арт. 34), як і Канвенцыя аб забеспячэнні правоў асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцяў (арт. 13), прадугледжвалі стварэнне маніторынгавага механізму – назіранне з боку Камісіі па правах чалавека СНД. Аднак дадзены механізм так і не запрацаваў (Камісія створаная не была).

Што тычыцца іншых важных рэгіянальных аб'яднанняў, то варта адзначыць, што Беларусь не з'яўляецца сябрам Рады Еўропы і не ўдзельнічае ў яе праваабарончых канвенцыях. Аднак адпаведныя стандарты ўсё ж павінны служыць арыенцірам для мясцовага заканадаўства і практыкі: Беларусь з'яўляецца кандыдатам на ўступленне ў арганізацыю.

***Сістэма АБСЕ***

Прынятыя ў рамках Савета (з 1995 г. – Арганізацыі) па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (СБСЕ і АБСЕ) дакументы з'яўляюцца палітычнымі абавязацельствамі. Важныя палажэнні, асабліва тыя, якія тычацца правоў нацыянальных меншасцяў, утрымліваюцца, напрыклад, у Дакуменце Капенгагенскай нарады канферэнцыі па чалавечым вымярэнні НБСЕ 1990 г., а таксама ў розных рэкамендацыях Вярхоўнага камісара АБСЕ па справах нацыянальных меншасцяў.





Паводле экспертнай ацэнцы А. Восіпава,

> *практычнае значэнне АБСЕ для абароны меншасцяў у Беларусі абмежавана. Спасылкі на дакументы АБСЕ прыводзяцца ў двухбаковых дагаворах, якія заключыла Беларусь, і іх асобных палажэннях аб абароне меншасцяў. Аднак уплыў рэкамендацый на заканадаўства і практычную палітыку застаецца пад пытаннем. Вярхоўны камісар па нацыянальных меншасцях АБСЕ не ажыццяўляе ніякай дзейнасці ў Беларусі. Пры гэтым АБСЕ застаецца каналам камунікацыі з еўрапейскімі ўрадамі па пытаннях меншасцяў…*[457]

Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЕ ў апошні час спрабуе ўплываць на беларускае заканадаўства ў сферы правоў чалавека праз Венецыянскую камісію,[458] у рабоце якой удзельнічае Беларусь. Сумесна з Венецыянскай камісіяй БДІПЧ у 2012 г. прыняло сумеснае меркаванне пра Закон «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь».[459]

## 3.2 Нацыянальнае заканадаўства

### 3.2.1 Канстытуцыя

Згодна з артыкулам 137 Асноўнага закона, Канстытуцыя краіны валодае найвышэйшай юрыдычнай сілай. Больш за тое, законы, дэкрэты, указы і іншыя акты дзяржаўных органаў выдаюцца на падставе і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй. У выпадку разыходжання закона, дэкрэта або ўказа з Канстытуцыяй, дзейнічае Канстытуцыя.

---

457 Осипов А. «Этнокультурная политика в Беларуси: сопоставление с международным контекстом» // *Вопрос меньшинств в Республике Беларусь, Европе и мире. Сборник материалов*, Минск: Медисонт, 2012. С. 181.

458 Афіц. назва: Европейская комиссия за демократию через право (European Commission for Democracy through Law).

459 European Commission for Democracy through Law (Venice Commission) and OSCE Office for Democratic Institutions and Human Rights (OSCE/ODIHR), *Joint Opinion on the Law on Mass Events of the Republic of Belarus*, Strasbourg, Warsaw, 20 March 2012, CDL-AD(2012)006.

Як тлумачыў суддзя Канстытуцыйнага суда Г. Варабей,

> *аналіз канстытуцыйных нормаў паказвае, што многія з іх не толькі даюць магчымасці непасрэднага іх прымянення, але і абавязваюць вырашаць канкрэтныя пытанні на падставе нормаў Канстытуцыі. Гэта датычыцца перш за ўсё асабістых правоў і свабод…*[460]

Старшыня Канстытуцыйнага Суда Р. Васілевіч сцвярджаў, што з аналізу Канстытуцыі можна зрабіць адназначную выснову, што яна не толькі валодае найвышэйшай юрыдычнай сілай, але і «мае прамое прымяненне на ўсёй яе тэрыторыі, а правы і свабоды чалавека і грамадзяніна з'яўляюцца дзеючымі непасрэдна».[461]

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у артыкуле 22 прадугледжвае прынцып роўнасці кожнага перад законам. У тым жа артыкуле ўстаноўлена права на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў без якой-небудзь дыскрымінацыі. Гэты артыкул бясспрэчна мае прамое дзеянне і можа служыць асновай для вырашэння канкрэтных пытанняў.

Артыкул 23 Канстытуцыі пералічвае выпадкі магчымага абмежавання правоў і свабод асобы. Яны павінны быць: 1) прадугледжаны законам; 2) ажыццяўляцца ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маральнасці, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асобаў. Больш за тое, ніхто не можа карыстацца перавагамі і прывілеямі, «якія супярэчаць закону». Такім чынам, беларуская Канстытуцыя ўстанаўлівае агульны прынцып роўнасці перад законам, уключаючы забарону дыскрымінацыі без якога-небудзь пэўнага спісу падстаў. Абмежаванне правоў і свабод асобы, а значыць і права на роўнасць перад законам, і недыскрымінацыю, магчыма толькі на падставе закона і па канчатковым спісе падстаў.

460 Воробей, Г. «Конституция Республики Беларусь – нормативный акт прямого действия» // Право: Теория и практика, 2003, № 11. Ёсць на: http://www.yurclub.ru/docs/pravo/1103. Аўтар артыкула быў суддзёй Канстытуцыйнага Суда на момант публікацыі.

461 Гл. спасылку 449. С. 110. Аўтар артыкула Р. Васілевіч быў старшынёй Канстытуцыйнага Суда на момант публікацыі.





Для тлумачэння адпаведных артыкулаў асноўнага закона звернемся да практыкі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.[462]

У адпаведнасці з Канстытуцыяй беларускай дзяржавы, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Асноўнага закона і прынятых у адпаведнасці з ім актаў заканадаўства (арт. 7). У кантэксце артыкула 22 Канстытуцыйны суд растлумачыў, што

> *канстытуцыйны прынцып роўнасці абумоўлівае патрабаванне дакладнасці і яснасці заканадаўчага рэгулявання, паколькі толькі пры ўмове аднастайнага разумення і тлумачэння прававой нормы ўсімі правапрымяняльнікамі можна забяспечыць такую роўнасць.*[463]

У нядаўнім рашэнні Канстытуцыйны суд таксама прыйшоў да высновы, што канстытуцыйны прынцып роўнасці ўсіх перад законам «азначае роўную для ўсіх абавязковасць канкрэтнага закона з усімі асаблівасцямі прававога статусу розных катэгорый грамадзян, устаноўленымі ў законе».[464]

У іншым рашэнні Канстытуцыйны суд адзначыў, што канстытуцыйны прынцып роўнасці, які гарантуе абарону ад усіх формаў дыскрымінацыі, не стварае для заканадаўцы перашкод для ажыццяўлення спецыяльнага прававога рэгулявання працы, у тым ліку для ўстанаўлення адрозненняў, выключэнняў, пераваг у прававым статусе для асоб, якія належаць да розных па ўмовах і родзе дзейнасці катэгорый. Аднак падобныя адрозненні, выключэнні, перавагі павінны быць аб'ектыўна апраўданыя, абгрунтаваныя і адпавядаць

462 Усе заключэнні і рашэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь. Ёсць на: www.kc.gov.by.

463 Заключение Конституционного Суда Республики Беларусь от 25 октября 2004 г. № З–178/2004.

464 Решение Конституционного Суда Республики Беларусь от 25 апреля 2012 г. № Р–682/2012.

канстытуцыйна значным мэтам.[465] У шэрагу іншых рашэнняў Канстытуцыйны Суд паказваў, што

> *прававыя абмежаванні правоў і свабод могуць быць апраўданыя дзяржаўнымі і грамадскімі інтарэсамі, пералічанымі ў частцы 1 артыкула 23 Канстытуцыі, толькі калі такія абмежаванні адпавядаюць патрабаванням справядлівасці, з'яўляюцца адэкватнымі, суразмернымі і неабходнымі для абароны канстытуцыйна значных каштоўнасцяў, у тым ліку правоў і законных інтарэсаў іншых асоб.*[466]

У іншым рашэнні суда, якое тычылася людзей з псіхічнымі захворваннямі, падкрэслівалася, што абмежаванні па артыкуле 23 павінны быць прапарцыйнымі абараняемым грамадскім і дзяржаўным інтарэсам, правам і свабодам асобы і павінны выключаць любую дыскрымінацыю асобы па якой-небудзь прыкмеце. Пры гэтым абмежаванні павінны быць абгрунтаванымі такімі мэтамі, якія з'яўляюцца для пэўных выпадкаў агульнапрызнанымі.[467]

Такім чынам, беларускаму суду вядомыя асноўныя, прынятыя ў развітых краінах падыходы да вызначэння прапарцыянальнасці абмежавання правоў і свабод чалавека.

Канстытуцыйны Суд ніколі не аспрэчваў, што Асноўны закон забараняе дыскрымінацыю на любой падставе. На практыцы могуць узнікаць неадназначныя калізіі. Напрыклад, пералік забароненых для дыскрымінацыі падстаў у Працоўным кодэксе[468] закрыты (арт. 14), але Канстытуцыйны Суд рэкамендаваў зрабіць яго адкрытым.[469] Ва ўмовах Беларусі пэўнасць у пытанні падставы для дыскрымінацыі можа быць вельмі

465 Решение Конституционного Суда Республики Беларусь от 23 декабря 2011 г. № Р–659/2011.

466 Решение Конституционного Суда Республики Беларусь от 17 мая 2012 г. № Р–704/2012.

467 Решение Конституционного Суда Республики Беларусь от 28 декабря 2011 г. № Р–668/2011.

468 Трудовой кодекс Республики Беларусь от 26 июля 1999 г. № 296–З.

469 Рашэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, 17 ліпеня 2009 г. № Р–360/2009.





важная, бо суды часцяком не схільныя прызнаваць дыскрымінацыю па некаторых падставах, якія непасрэдна не зафіксаваныя ў тэксце закона (напрыклад, дыскрымінацыю па сексуальнай арыентацыі).

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь не згадвае магчымасці пазітыўных мер. Тым не менш, шэраг палажэнняў Асноўнага закона дазваляе выказаць здагадку, што такія меры будуць дапушчальныя, па меншай меры, у дачыненні да шэрагу сацыяльных груп і / або ў шэрагу абласцей.

Толькі адна ўразлівая група насельніцтва згаданая ў Канстытуцыі ў кантэксце роўных магчымасцяў – гэта жанчыны. Ім павінна забяспечвацца прадастаўленне роўных з мужчынамі магчымасцяў у атрыманні адукацыі і прафесійнай падрыхтоўцы, у працы і прасоўванні па службе (рабоце), у грамадска-палітычнай, культурнай і іншых сферах дзейнасці, а таксама стварэнне ўмоў для аховы іх працы і здароўя (арт. 32 ). Адносна моладзі сказана, што дзяржава стварае неабходныя ўмовы для «вольнага і эфектыўнага ўдзелу» моладзі ў палітычным, сацыяльным, эканамічным і культурным развіцці (там жа). Ня замацоўваючы асаблівых правоў моладзі, гэтыя палажэнні, тым не менш, могуць стаць базай для прымянення дзяржаве пазітыўных мер у інтарэсах гэтай групы.

У дачыненні да ўсіх груп насельніцтва важныя прынцыпы ўстаноўлены ў сферы працоўнага рэгулявання. Згодна з Канстытуцыяй (арт. 41), дзяржава не толькі гарантуе права на працу і прызнае права на выбар прафесіі і род заняткаў, але і «стварае ўмовы для поўнай занятасці насельніцтва». Падобныя прынцыпы могуць ляжаць у аснове спецыяльных мер, накіраваных на дасягненне інтэграцыі на рынку працы ўразлівых груп насельніцтва. Характэрна, што беларуская Канстытуцыя асабліва агаворвае недапушчальнасць спецыфічнага віду дыскрымінацыі на рынку працы: жанчыны і мужчыны, дарослыя і непаўналетнія маюць права на роўнае ўзнагароджанне за працу роўнай каштоўнасці (арт. 42). Гэты падыход тыповы для большасці краін былога Усходняга блока, дзе гістарычна розніца ў аплаце дарослых і дзяцей, жанчын і мужчын за працу роўнай каштоўнасці раз-

глядалася і як дыскрымінацыя, і як выклік прынцыпам сацыяльнай справядлівасці.[470]

У кантэксце доступу да паслуг аховы здароўя ў Беларусі варта памятаць, што ў краіне гарантаваная бясплатная дзяржаўная медыцына, а «дзяржава стварае ўмовы даступнага для ўсіх грамадзян медыцынскага абслугоўвання» (арт. 45). Таксама гарантуецца даступнасць і бясплатнасць агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі (арт. 49). Гэта ізноў дае дзяржаве права прымаць асаблівыя меры, накіраваныя на зняцце бар'ераў пры доступе да медыцыны і да адукацыі для ўразлівых груп насельніцтва.

Прынцып роўнасці згаданы таксама ў артыкуле 14 Канстытуцыі, патрабуе ад дзяржавы рэгуляваць адносіны паміж сацыяльнымі, нацыянальнымі і іншымі «супольнасцямі» на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў і інтарэсаў. Такім чынам, на канстытуцыйным узроўні ў Беларусі замацаваны прынцып абароны не толькі індывідуальных, але і «калектыўных правоў». Падобны падыход замацаваны і ў артыкуле 16 Асноўнага закону: «Рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам», хоць, як паказана ў главе 2 даклада, ён не заўсёды ўжываецца на практыцы.

Ніжэй даюцца нормы аб роўнасці і недыскрымінацыі, якія можна знайсці ў беларускіх законах.

470 У гэтым кантэксце варта адзначыць, што некаторыя дзяржавы дазваляюць розную аплату за роўную працу ў залежнасці ад узросту. Напрыклад, у Вялікабрытаніі стаўкі мінімальнай аплаты працы могуць адрознівацца ў залежнасці ад узросту і статусу работніка. Гл.: National Minimum Wage Act 1998, c. 39 (з наступнымі праўкамі). Ёсць на: http://www.legislation.gov.uk.





### 3.2.2 Нормы аб роўнасці і недыскрымінацыі ў беларускіх законах

У Беларусі няма спецыяльнага антыдыскрымінацыйнага заканадаўства. Асобныя палажэнні, якія адлюстроўваюць прынцыпы роўнасці і / або раўнапраўя, можна знайсці, аднак, у цэлым шэрагу беларускіх законаў. Больш за тое, у беларускім крымінальным і працоўным праве ёсць параўнальна дэталёвае рэгуляванне ў сферы, якая нас цікавіць.

У гэтым раздзеле даклада мы спачатку прывядзем агульныя палажэнні, якія тычацца роўнасці і дыскрымінацыі, якія ўключаны ў асобныя законы. Далей мы нададзім асаблівую ўвагу пытанням абароны ад дыскрымінацыі ў беларускім крымінальным і працоўным праве, кампенсацыі маральнай шкоды ў кантэксце дыскрымінацыі, праблеме абароны правоў і ўжо пасля гэтага адкажам на пытанне аб мэтазгоднасці прыняцця ў Беларусі спецыяльнага ўсеабдымнага антыдыскрымінацыйнага заканадаўства.

***Агульныя палажэнні***

У гэтым раздзеле пазначаны палажэнні аб роўнасці і недыскрымінацыі агульнага характару, якія можна знайсці ў розных беларускіх законах.

Закон «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь»[471] (1992 г.) забараняе любое прамое або ўскоснае абмежаванне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь за іх прыналежнасць да нацыянальнай меншасці, а таксама спробы асіміляцыі супраць іх волі (арт. 4). Артыкул 6 гарантуе грамадзянам Беларусі, што адносяць сябе да нацыянальных меншасцяў, роўныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя правы і свабоды, якія ажыццяўляюцца ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку. Як прыклад вызначаны наступныя правы: права на атрыманне дапамогі з боку дзяржавы ў справе развіцця нацыянальнай культуры і адукацыі; права карыстацца роднай мовай, права выбару мовы зносін, а таксама права на свабоду выбару мовы выхавання і навучання; права на заснаванне сродкаў масавай

471 Закон Республики Беларусь от 11 ноября 1992 г. № 1926–XII «О национальных меньшинствах в Республике Беларусь».

інфармацыі, выдавецкую дзейнасць, а таксама на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыі на роднай мове; права на ўстанаўленне культурных сувязяў з суайчыннікамі за межамі Рэспублікі Беларусь; права вызнаваць любую рэлігію ці не вызнаваць ніякай, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў на роднай мове; права на захаванне сваёй гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культуры, у тым ліку прафесійнага і самадзейнага мастацтва; права на стварэнне грамадскіх аб'яднанняў і ўступленне ў дзеючыя грамадскія аб'яднанні; права свабодна выбіраць і быць выбранымі ў дзяржаўныя органы Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога або ўскоснага выбарчага права пры тайным галасаванні; права роўнага доступу да любых пасад у дзяржаўных органах Рэспублікі Беларусь.

Закон «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь»[472] (1990 г.) абавязвае дзяржаву забяспечваць «усебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця» (арт. 2). З гэтага артыкула можна вывесці абавязак дзяржавы гарантаваць субстантыўную (фактычную) роўнасць носьбітаў беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

Закон «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь»[473] (1991 г.) абвяшчае, што адпаведная дзяржаўная палітыка накіравана на забеспячэнне паўнапраўнага ўдзелу інвалідаў у жыцці грамадства і праводзіцца на аснове прынцыпаў захавання правоў чалавека, забароны дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці (арт. 4).

Закон «Аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў»[474] (2008 г.) у артыкуле 24 прадастаўляе інваліду права на роўнае, паважлівае і недыскрымінацыйнае стаўленне да сябе з боку асоб, якія ўдзельнічаюць у правядзенні яго рэабілітацыі.

472 Закон Республики Беларусь от 26 января 1990 г. № 3094–XI «О языках в Республике Беларусь».

473 Закон Республики Беларусь от 11 ноября 1991 г. № 1224–XII «О социальной защите инвалидов в Республике Беларусь».

474 Закон Республики Беларусь от 23 июля 2008 г. № 422–З «О предупреждении инвалидности и реабилитации инвалидов».





Артыкул 6 Закона «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь»[475] (2003 г.) адносіць да прынцыпаў дзяржслужбы роўны доступ грамадзян да любых пасад у дзяржаўнай службе і прасоўвання па дзяржаўнай службе ў адпаведнасці з іх здольнасцямі, прафесійнымі ведамі і адукацыяй.

Роўнасць аднесена да асноўных прынцыпаў дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі (СМІ): СМІ выходзяць з роўнасці правоў усіх фізічных асоб, дзяржаўных органаў, палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іншых юрыдычных асобаў на распаўсюджанне і атрыманне масавай інфармацыі (арт. 4 Закона «Аб сродках масавай інфармацыі»[476] 2008 г.).

Кодэкс аб шлюбе і сям'і[477] (1999 г.) у артыкуле 20-1 устанаўлівае, што

> *ўсе пытанні шлюбных і сямейных адносін сужэнцы вырашаюць сумесна, па ўзаемнай згодзе і на аснове роўнасці. Сужэнцы абавязаны будаваць свае адносіны ў сям'і на аснове ўзаемапавагі, узаемадапамогі, справядлівага размеркавання сямейных абавязкаў, садзейнічання ў рэалізацыі кожным з іх права на мацярынства (бацькоўства), фізічнае і духоўнае развіццё, атрыманне адукацыі, праяўленне сваіх здольнасцяў, працу і адпачынак.*

Артыкул 76 Кодэкса аб шлюбе і сям'і ўстанаўлівае роўнасць правоў і абавязкаў абодвух бацькоў у дачыненні да сваіх дзяцей.

Закон «Аб правах дзіцяці»[478] (1993 г.) абвяшчае роўныя правы ўсіх дзяцей незалежна ад паходжання, расавай, нацыянальнай і грамадзянскай прыналежнасці, сацыяльнага і маёмаснага становішча, полу, мовы, аду-

475 Закон Республики Беларусь от 14 июня 2003 г. № 204–З «О государственной службе в Республике Беларусь».

476 Закон Республики Беларусь от 17 июля 2008 г. № 427–З «О средствах массовой информации».

477 Кодекс о браке и семье Республики Беларусь от 9 июля 1999 г. № 278–З.

478 Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 лістапада 1993 г. № 2570-XII «Аб правах дзіцяці».

кацыі, адносінаў да рэлігіі, месца жыхарства, стану здароўя і іншых абставінаў, якія датычацца дзіцяці і яго бацькоў. Асабліва агаворваецца, што роўнай і ўсебаковай абаронай дзяржавы карыстаюцца дзеці, народжаныя ў шлюбе і па-за шлюбам (арт. 6).

Кодэкс аб адукацыі[479] (2011 г.) тэрмін «дыскрымінацыя» спецыяльна не выкарыстоўвае. Аднак сярод прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі пазначана «забеспячэнне роўнага доступу да атрымання адукацыі» (арт. 2). Сярод асноўных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі асабліва пазначана «стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і аказанне гэтым асобам карэкцыйна-педагагічнай дапамогі», а таксама «забеспячэнне роўнасці беларускай і рускай моў» (там жа). Правы грамадзян Рэспублікі Беларусь на адукацыю забяспечваецца, апроч іншага, «стварэннем умоў для атрымання адукацыі з улікам нацыянальных традыцый, а таксама індывідуальных патрэб, здольнасцяў і запытаў навучэнцаў» і «стварэннем спецыяльных умоў для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, іх інтэграцыі ў грамадства, сацыялізацыі» (арт. 3).

Закон «Аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі»[480] (2009 г.) абвяшчае, што пры атрыманні адукацыі адносіны паміж моладдзю і ўстановамі адукацыі, іншымі арганізацыямі сістэмы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы, «будуюцца на прынцыпах роўнасці і ўзаемнай павагі правоў і свабод» (арт. 17).

Па агульным правіле замежнікі ў Беларусі карыстаюцца правамі і свабодамі, выконваюць абавязкі нароўні з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Аднак беларускай Канстытуцыяй, заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі можа быць вызначана іншае (арт. 4 Закона «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства»[481] 2010 г.).

479 Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13 студзеня 2011 г. № 243–З.

480 Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 снежня 2009 г. № 65-З «Аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі».

481 Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 105-З «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь».





Закон «Аб знешняй працоўнай міграцыі»[482] (2010 г.) у артыкуле 4 адносіць да асноўных прынцыпаў такой міграцыі недапушчальнасць дыскрымінацыі працоўных-эмігрантаў і працоўных-імігрантаў у залежнасці ад полу, расы, нацыянальнасці, мовы, рэлігійных або палітычных перакананняў, удзелу ці няўдзелу ў прафесійных саюзах ці іншых грамадскіх аб'яднаннях, маёмаснага або службовага становішча, узросту, месца жыхарства, недахопаў фізічнага або псіхічнага характару, калі яны не перашкаджаюць выкананню адпаведных працоўных абавязкаў, іншых абставінаў, не звязаных з дзелавымі якасцямі і не абумоўленых спецыфікай працоўных функцый або статусу работніка.

Прынцып роўнасці перад законам, як агульны прынцып, устаноўлены ў артыкуле 4.2 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях,[483] артыкуле 3 Крымінальнага кодэкса,[484] артыкуле 2 Грамадзянскага кодэкса[485] і ў артыкуле 4 Закона «Аб асновах адміністрацыйных працэдур»[486] (2008 г.).

### *Крымінальнае заканадаўства*

*Артыкул 190.* Крымінальны кодэкс (КК) 1999 г. не выкарыстоўвае тэрмін «дыскрымінацыя». Аднак артыкул 190 КК прадугледжвае адказнасць за «парушэнне роўнасці грамадзян». У склад артыкула ўваходзіць наўмыснае прамое або ўскоснае парушэнне ці абмежаванне правоў і свабод, альбо ўстаноўка прамых ці ўскосных пераваг грамадзян, якія прычынілі істотную шкоду правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна. Падобныя адрозненні могуць быць устаноўлены ў залежнасці ад полу, расы, «нацыянальнасці» (этнічнасці), мовы, паходжання, маёмаснага або службовага становішча, месца жыхарства, адносінаў

482 Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2010 г. № 225-З «Аб знешняй працоўнай міграцыі».

483 Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 21 красавіка 2003 г. № 194–З.

484 Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 г. № 275–З.

485 Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 7 снежня 1998 г. № 218–З.

486 Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 кастрычніка 2008 г. № 433-З «Аб асновах адміністрацыйных працэдур».

да рэлігіі, перакананняў, прыналежнасці да грамадскіх аб'яднанняў. У гэтым артыкуле прадугледжана пакаранне ў выглядзе штрафу, або папраўчых работ на тэрмін да двух гадоў, або абмежаванне волі на той жа тэрмін, або пазбаўлення волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

Склад гэтага артыкула сфармуляваны такім чынам, што для прыцягнення асобы да адказнасці спатрэбіцца даказаць наяўнасць намеру, накіраванага на прамое або ўскоснае парушэнне ці абмежаванне правоў і свабод. Для ўжывання артыкула спатрэбіцца таксама даказаць наяўнасць «істотнай шкоды», прычым гэтае паняцце не раскрываецца ні ў самым артыкуле, ні дзе-небудзь яшчэ ў кодэксе.[487] Спіс падстаў для парушэнняў/абмежаванняў канчатковы і не ўключае, напрыклад, інваліднасць, сексуальную арыентацыю ці ўзрост.

*Артыкул 130.* Гэты артыкул Крымінальнага кодэкса прадугледжвае пакаранне за «наўмысныя дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці неладоў, на прыніжэнне нацыянальнага гонару і годнасці». Такія дзеянні караюцца штрафам або арыштам на тэрмін да шасці месяцаў, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін. Тыя ж дзеянні, злучаныя з гвалтам альбо здзейсненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў. А калі гэтыя дзеянні былі выкананыя групай асобаў альбо па неасцярожнасці прывялі да смерці чалавека ці іншых цяжкіх наступстваў, то караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў.

Для прыцягнення асобы да адказнасці па дадзеным артыкуле зноў-такі спатрэбіцца даказаць наяўнасць намеру, накіраванага на ўзбуджэнне

487 У Пастанове Пленума Вярхоўнага Суда (2004 г.) у кантэксце судовай практыкі па справах аб злачынствах супраць інтарэсаў службы сказана, што «істотная шкода можа выяўляцца ў парушэнні канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян, у падрыве аўтарытэту органаў улады, дзяржаўных, грамадскіх і іншых арганізацый, у парушэнні грамадскага парадку» (п. 19). Пастанова Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 16 снежня 2004 г. № 12 «Аб судовай практыцы па справах аб злачынствах супраць інтарэсаў службы (арт. 424–428 КК)». Ёсць на: http://www.supcourt.by.





расавай, нацыянальнай (г. зн. звязанай з этнічнасцю) і рэлігійнай варожасці або неладоў ці прыніжэнне нацыянальнага гонару і годнасці. Беларускі крымінальны закон не канкрэтызуе формы, у якіх можа адбывацца «ўзбуджэнне» і «прыніжэнне», аднак некаторыя тыпы дыскрымінацыі і пераследу, таксама як і заклікі да дыскрымінацыі, заведама пакрываюцца складам дадзенага артыкула. У 2006–2009 гг. па гэтым артыкуле былі асуджаныя шасцёра чалавек.[488]

*Артыкул 193.* Крымінальна караецца арганізацыя альбо кіраванне грамадскім аб'яднаннем, рэлігійнай арганізацыяй, якія пасягаюць на асобу, правы і абавязкі грамадзян.

*Артыкул 64.* Згодна з артыкулам 64 Крымінальнага кодэкса здзяйсненне злачынства па матывах расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці неладоў, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці, а таксама па матывах варожасці або неладоў у дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы з'яўляюцца абцяжарваючай віну акалічнасцю. Абцяжарваючая акалічнасць можа ўлічвацца пры вызначэнні меры адказнасці вінаватага ў любым злачынстве, акрамя выпадкаў, калі такая акалічнасць з'яўляецца прыкметай злачынства, прадугледжанага ў КК. Такім чынам, нават пры адсутнасці спецыяльных артыкулаў КК, гвалт, здзейсненае па матывах варожасці або неладоў у дачыненні, напрыклад, да ВІЧ-інфікаваных, прадстаўнікоў супольнасці ЛГБТ або інвалідаў, павінна прыводзіць да больш строгага пакарання. На практыцы, аднак, праблемай будзе з'яўляцца даказванне падобнага матыву. Таму ў некаторых выпадках больш магчымасцяў даюць менавіта грамадзянска-працэсуальныя нормы (гл. ніжэй).

Артыкулы Крымінальнага кодэкса за забойства (арт. 139) і наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання (арт. 147) прадугледжваюць больш строгае пакаранне, калі яны здзейсненыя па матывах расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці неладоў, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці, а таксама па матывах варожасці або розніцы ў дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы.

488 *Объединенный восемнадцатый и девятнадцатый периодический доклад Республики Беларусь о выполнении положений Международной конвенции о ликвидации всех форм расовой дискриминации.* Минск, 2012. П. 53.

У гэтым кантэксце варта адзначыць, што здзяйсненне адміністрацыйнага правапарушэння па матывах расавай, нацыянальнай альбо рэлігійнай варожасці таксама прызнаецца акалічнасцю, абцяжарваючай адміністрацыйную адказнасць (арт. 7.3 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях 2003 г.).

У 2009 г. беларускімі ўладамі былі зарэгістраваны 72 інцыдэнты на глебе расізму і ксенафобіі; пераследы былі пачаты ў трох выпадках.[489] Што тычыцца афіцыйнай статыстыкі асуджэнняў за здзяйсненне злачынстваў на глебе расавай дыскрымінацыі, то ў 2003 г. былі асуджаныя чацвёра (частка 3 артыкула 130); у 2006 г. – двое (частка 1 артыкула 193); у 2007 г. – пяцёра (2 чалавекі па частцы 1 артыкула 193, 2 чалавекі па пункту 14 частцы 2 артыкула 139 і 1 чалавек па частцы 3 артыкула 147); у 2008 г. – адзін чалавек (частка 2 артыкула 130); у 2009 г. – адзін чалавек (частка 1 артыкула 130).[490]

*Артыкул 197.* Артыкул 197 Крымінальнага кодэкса крыміналізуе некаторыя выпадкі віктымізацыі,[491] а менавіта ўшчамленне службовай асобай правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзяніна за напісанне ім у дзяржаўныя органы або грамадскія аб'яднанні прапаноў, заяў або скаргаў, альбо за крытыку, якая змяшчаецца ў іх, альбо за выступы з крытыкай у іншай форме (пераслед грамадзян за крытыку). Падобныя дзеі караюцца штрафам або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, ці абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў (больш строгае пакаранне прадугледжана, калі пацягнула прычыненне істотнай шкоды правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна). Гэты артыкул рэгулюе толькі ўзаемаадносіны службовых асоб і звычайных людзей, таму не ўжываецца ў службовых адносінах (дзе абодва бакі – службовыя асобы). Аднак дадзеная норма павінна служыць абаронай ад уладаў у выпадку віктымізацыі прадстаўнікоў уразлівых груп насельніцтва. Інфармацыя аб ужыванні гэтага артыкула на практыцы, аднак, адсутнічае.

489 БДИПЧ/ОБСЕ, *Преступления на почве ненависти в регионе ОБСЕ: инциденты и меры реагирования. Годовой отчет за 2009 год*, Варшава, ноябрь 2010. С. 112. Ёсць на: http://www.osce.org/ru/odihr/82040?download=true.

490 Гл. спасылку 488, п. 53.

491 Еэсаўская Дырэктыва 2000/43 / ЕС вызначае віктымізацыю як неспрыяльныя адносіны або неспрыяльныя наступствы, якія сталі рэакцыяй на скаргу або прававыя працэдуры, мэта якіх складалася ў прымусе да захавання прынцыпу роўнага звароту. Council Directive 2000/43/EC of 29 June 2000 implementing the principle of equal treatment between persons irrespective of racial or ethnic origin (Art. 9).





*Артыкул 199.* Крымінальны кодэкс прадугледжвае адказнасць за неабгрунтаваную адмову ў прыёме на працу або звальненне жанчыны па матывах яе цяжарнасці альбо загадзя незаконнае звальненне яе з працы. Якая-небудзь інфармацыя аб ужыванні гэтага артыкула на практыцы адсутнічае. Гэта норма з'явілася яшчэ ў савецкім заканадаўстве як выкананне патрабавання ааанаўскай Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын, якая патрабавала ад дзяржаўудзельніц

> *забараніць, пад пагрозай прымянення санкцый, звальненне з працы на падставе цяжарнасці ці адпачынку па цяжарнасці і родах або дыскрымінацыю з прычыны сямейнага становішча пры звальненні.*[492]

Адзначым, што гэта палажэнне Канвенцыі нельга тлумачыць як патрабаванне менавіта крымінальнага пераследу за ўказаныя віды дыскрымінацыі жанчын на рынку працы. Празмерная жорсткасць санкцый у дадзеным кантэксце відавочна не апраўданая і хутчэй цягне за сабою адсутнасць якой-небудзь правапрымяняльнай практыкі.

*Артыкулы 188 і 189.* У беларускім праве крыміналізаваны паклёп і абраза. Першапачаткова за падобныя дзеі чалавек можа быць прыцягнуты да адказнасці на падставе Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях (за паклёп па артыкуле 9.2 і за абразу па артыкуле 9.3). Аднак калі падобныя дзеянні зноў здзейснены на працягу года пасля накладання мер адміністрацыйнага спагнання, то па патрабаванні пацярпелага яны могуць пацягнуць ужо крымінальную адказнасць (арт. 33, 188 і 189 Крымінальнага кодэкса). Гэтыя нор-

492 Конвенция о ликвидации всех форм дискриминации в отношении женщин (п. а ч. 2 ст. 11).

мы можна ўжываць у некаторых выпадках прыгнёту прадстаўнікоў уразлівых груп насельніцтва, якія часта пакутуюць ад вербальных абраз (напрыклад, яўрэі і цыганы).

***Працоўнае заканадаўства***

*Дыскрымінацыя.* Артыкул 14 Працоўнага кодэкса (1999 г.) непасрэдна прысвечаны забароне дыскрымінацыі ў сферы працоўных адносін. Артыкул вызначае дыскрымінацыю як

> *абмежаванні ў працоўных правах або атрыманне якіх-небудзь пераваг у залежнасці ад полу, расы, нацыянальнага паходжання, мовы, рэлігійных ці палітычных поглядаў, удзелу ці няўдзелу ў прафсаюзах ці іншых грамадскіх аб'яднаннях, маёмаснага або службовага становішча, недахопаў фізічнага або псіхічнага характару, якія не перашкаджаюць выкананню адпаведных працоўных абавязкаў.*[493]

Такім чынам, Кодэкс не адрознівае прамую і ўскосную дыскрымінацыю, а пералік падстаў для забароненай дыскрымінацыі мае закрыты характар і не ўключае, напрыклад, узрост і сексуальную арыентацыю.

Працоўны кодэкс (арт. 14) не лічыць дыскрымінацыяй любыя адрозненні, выключэнні, перавагі і абмежаванні, заснаваныя на ўласцівых дадзенай рабоце патрабаваннях. Таксама Кодэкс дапускае стварэнне асаблівых умоў для некаторых катэгорый работнікаў, абумоўленых неабходнасцю «асаблівага клопату дзяржавы аб асобах, якія маюць патрэбу ў павышанай сацыяльнай і прававой абароне». Прыкладны пералік такіх катэгорый асоб уключае жанчын, непаўналетніх, інвалідаў, асоб, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Працоўны кодэкс устанаўлівае забарону дыскрымінацыі і несапраўднасць дыскрымінацыйных умоў калектыўных дагавораў і пагадненняў (арт. 14). Асобныя ўмовы індывідуальнага працоўнага дагавора таксама

493 Трудовой кодекс Республики Беларусь (ст. 14).





прызнаюцца несапраўднымі, калі яны носяць дыскрымінацыйны характар (арт. 23). Асобы, якія лічаць, што яны падвергліся дыскрымінацыі ў сферы працоўных адносін, маюць права звярнуцца ў камісію па вырашэнні працоўных спрэчак (квазісудовы орган, які складаецца з роўнай колькасці прадстаўнікоў прафсаюза і наймальніка) або ў суд з адпаведнай заявай аб ліквідацыі дыскрымінацыі. Артыкул 241 Кодэкса ўстанаўлівае, аднак, што спрэчкі аб адмове ў заключэнні працоўнага дагавора з асобамі па дыскрымінацыйным матывах і некаторыя іншыя спрэчкі разглядаюцца непасрэдна ў судзе. Пры разглядзе індывідуальных працоўных спрэчак працаўнікі вызваляюцца ад выплаты судовых выдаткаў.

Разумнае прыстасаванне працоўнага месца. Прамое патрабаванне ў дачыненні да разумнага прыстасавання працоўнага месца ўстаноўлена да працадаўцы толькі ў адносінах да тых інвалідаў, якія атрымалі ў яго інваліднасць з прычыны працоўнага калецтва або прафесійнага захворвання: для іх наймальнік абавязаны стварыць працоўныя месцы на вытворчасці (арт. 20 Закона «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў»). Не стварэнне ў такой сітуацыі працоўных месцаў з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем (арт. 9.15 КаАП).

Трэба ўлічваць, што згодна з Законам «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў» пры пэўных умовах выдаткі на стварэнне спецыялізаваных працоўных месцаў для інвалідаў і на набыццё спецыялізаванага абсталявання кампенсуюцца з грамадскіх фондаў (арт. 20). Тым не менш, няма нормаў, якія абавязвалі б працадаўцу ажыццяўляць разумнае прыстасаванне рабочага месца ў дачыненні да любога работніка / сушукальніка працоўнага месца. У нейкай ступені гэтыя недахопы кампенсуюцца праз сістэму броні (гл. ніжэй).

*Сістэма броні.* Прыкладам асаблівага падыходу да ўразлівых груп насельніцтва на рынку працы з'яўляецца сістэма браніравання працоўных месцаў для прадстаўнікоў такіх груп. Гэтым правілам павінны падпарадкоўвацца наймальнікі незалежна ад формаў уласнасці. Па сутнасці, сістэма браніравання з'яўляецца сістэмай квот. Для разумення гэтай сістэмы неабходна памятаць, што беларуская дзяржава непасрэдна кантралюе большую частку эканомікі і, адпаведна, прадпрыемстваў,

прычым апошнія нярэдка знаходзяцца пад кантролем мясцовых органаў улады.

Працоўны кодэкс прадугледжвае, што мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ўстанаўліваецца бронь для прыёму на працу і прафесійнае навучанне на вытворчасці для тых асоб, якія ўпершыню шукаюць працу, ва ўзросце да 21 года, асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў (арт. 280). Закон «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў» прадугледжвае браніраванне працоўных месцаў і стварэнне спецыялізаваных працоўных месцаў для працаўладкавання інвалідаў (арт. 20). Закон «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» прадугледжвае большы спіс людзей, якія маюць асаблівую патрэбу ў сацыяльнай абароне і не могуць на роўных умовах канкурыраваць на рынку працы. У гэты спіс, у прыватнасці, уключаны дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, асобы з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў; бацькі ў шматдзетных і няпоўных сем'ях, а таксама тыя, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў; інваліды; асобы, вызваленыя з месцаў пазбаўлення волі; асобы, якія шукаюць працу ва ўзросце да 21 года; асобы перадпенсійнага ўзросту (за два гады да наступлення ўзросту, які дае права на пенсію па ўзросце на агульных падставах). Для такіх катэгорый, акрамя іншага, прадугледжана ўстанаўленне броні для прыёму на працу (арт. 11).

Парадак устанаўлення броні для сацыяльна ўразлівых груп насельніцтва вызначае спецыяльная ўрадавая пастанова ад 29 лістапада 2006 г.[494] Згодна з ёю мясцовыя органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, зыходзячы з ацэнкі стану і прагнозу развіцця занятасці насельніцтва рэгіёну і з улікам звестак з банка дадзеных беспрацоўных з ліку мэтавай групы, накіроўваюць наймальнікам прапановы аб устанаўленні ім на чарговы каляндарны год броні для прыёму на працу такіх асобаў, а таксама аб стварэнні працоўных месцаў для іх працаўладкавання. Сюды ж уключана і стварэнне спецыялізаваных працоўных месцаў для асобаў з абмежаванай працаздольнасцю (п. 3). Далей наймальнікі

494 Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 29 ноября 2006 г. № 1595 «Об утверждении Положения о порядке установления брони для приема на работу граждан, особо нуждающихся в социальной защите и не способных на равных условиях конкурировать на рынке труда».





аналізуюць прапановы, што паступілі, і інфармуюць службу занятасці аб тым, колькім людзям і з якіх катэгорый яны гарантуюць вакансіі ў чарговым каляндарным годзе і аб магчымасці стварэння працоўных месцаў для іх (п. 4). Пасля гэтага мясцовыя органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне распрацоўваюць праекты рашэнняў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў аб устаноўцы броні, якія павінны быць прыняты да 1 лістапада кожнага года. У прынятых рашэннях паказваюцца канкрэтныя наймальнікі, колькасць асоб, якія падлягаюць працаўладкаванню на вакансіі, і мінімальная колькасць ствараемых рабочых месцаў (п. 5-6). Далей органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне інфармуюць прадстаўнікоў мэтавай групы пра наяўныя магчымасці (п. 9). Працаўладкаванне грамадзян у лік устаноўленай броні ажыццяўляецца толькі па напрамках такіх органаў (п. 11). Неабгрунтаваная адмова ў прыёме на працу чалавека, накіраванага органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў лік броні, з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем (арт. 9.16 (1) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях).

Ёсць усе падставы лічыць, што гэта сістэма актыўна выкарыстоўваецца на практыцы. Напрыклад, па афіцыйных дадзеных за 2006-2011 гг. была ўстаноўлена бронь для працаўладкавання 10,9 тыс. інвалідаў, прычым 7 тыс. інвалідаў былі за кошт броні працаўладкаваны.[495]

*Дадатковыя гарантыі.* Згодна з Працоўным кодэксам пэўныя катэгорыі асоб карыстаюцца дадатковай абаронай, нароўні з абаронай ад дыскрымінацыі па ўказаных вышэй падставах. Артыкул 16 забараняе «неабгрунтаваную адмову» ў заключэнні працоўнага дагавора не толькі з уладальнікамі броні, але і, напрыклад, з жанчынамі па матывах, звязаных з цяжарнасцю або наяўнасцю дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, а адзінокім маці – з наяўнасцю дзіцяці ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў (дзіцяці-інваліда – да васямнаццаці гадоў). Як адзначалася вышэй, такая адмова ў заключэнні працоўнага дагавора можа быць абскарджана ў судзе. Неабгрунтаваная адмова ў прыёме на працу або звальненне жанчыны па матывах яе цяжарнасці альбо загадзя незаконнае звальненне яе з працы з'яўляюцца крымінальн-

495 *Общая информация о Республике Беларусь, 15 декабря 2011 г.* UN Doc. HRI/CORE/BLR/2011, С. 15.

ным злачынствам, якое караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў (арт. 199 КК).

Характэрна, што, даючы дадатковую абарону адзінокім маці, Працоўны кодэкс не прадугледжвае аналагічных гарантый для адзінокіх бацькоў: такое адрозненне само па сабе можа разглядацца як гендарная дыскрымінацыя.

У цэлым беларускае працоўнае заканадаўства ўстанаўлівае асаблівы рэжым працы, адпачынку, забарону ўстанаўлення выпрабавальнага тэрміну і да т. п. для некаторых катэгорый работнікаў, напрыклад, для інвалідаў і непаўналетніх (арт. 28, 276, 277, 287 ПК).

Закон «Аб знешняй працоўнай міграцыі» ў артыкуле 33 гарантуе працоўным-імігрантам[496] роўнае з грамадзянамі і іншаземцамі, якія пастаянна пражываюць у Беларусі: 1) узнагароджанне за працу роўнай каштоўнасці; 2) прадугледжаныя законам выплаты ў сувязі са стратай імі здароўя, прафесійнай працаздольнасці або іх смерцю ў выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў.

***Маральная шкода ў грамадзянскім праве і недыскрымінацыя***

Адным са спосабаў абароны сваіх правоў у выпадку дыскрымінацыі паўсюдна прызнаецца магчымасць выпатрабавання кампенсацыі за прычыненую маральную шкоду.

У Беларусі Грамадзянскі кодэкс (1998 г.) прадугледжвае права асобы патрабаваць грашовую кампенсацыю ад парушальніка яго асабістых немаёмасных правоў або ад асоб, якія робяць замах на іншыя яго нематэрыяльныя правы за створаную яму маральную шкоду. Пад такой шкодай заканадаўца разумее фізічныя або маральныя пакуты. Пры вы-

496 Працаўнік-імігрант – гэта замежнік, які не мае дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь, але ўехаў у Рэспубліку Беларусь для працаўладкавання і ажыццяўлення працоўнай дзейнасці па працоўнаму дагавору ў наймальніка Рэспублікі Беларусь, альбо які ажыццяўляе такую дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь (арт. 1 Закона «О внешней трудовой миграции»).





значэнні памераў кампенсацыі суд павінен прыняць да ўвагі ступень віны парушальніка і іншыя вартыя ўвагі акалічнасці, а таксама ступень фізічных і маральных пакут, звязаных з індывідуальнымі асаблівасцямі пацярпелай асобы (арт. 152).

Артыкул 151 (1) ГК дае пералік нематэрыяльных даброт: жыццё і здароўе, годнасць асобы, асабістая недатыкальнасць, гонар і добрае імя, дзелавая рэпутацыя, недатыкальнасць прыватнага жыцця, асабістая і сямейная таямніца, права свабоднага перамяшчэння, выбар месца знаходжання і жыхарства, права на імя, права аўтарства, іншыя асабістыя немаёмасныя правы і іншыя нематэрыяльныя даброты, якія належаць грамадзяніну ад нараджэння або па заканадаўству. Згодна з пастановай Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь (2000 г.),[497]

> *маральная шкода падлягае кампенсацыі ва ўсіх выпадках, калі яна нанесена дзеяннямі, што парушаюць асабістыя немаёмасныя правы грамадзяніна альбо замахваюцца на іншыя нематэрыяльныя даброты, якія належаць яму ад нараджэння або ў сілу акта заканадаўства. Прыкладны пералік нематэрыяльных даброт змяшчаецца ў п. 1 арт. 151 ГК. Да іх таксама належаць: права на нацыянальную прыналежнасць, на свабоду веравызнання, на свабоду выбару мовы зносін, выхавання і навучання, іншыя правы немаёмаснага характару, гарантаваныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.*[498]

Пленум таксама пацвердзіў, што калі кампенсацыя маральнай шкоды прадугледжана ў іншых нормах ГК, у нормах Працоўнага (арт. 246) і Крымінальнага (арт. 44) кодэксаў ці ў іншых актах заканадаўства, то маральная шкода павінна кампенсавацца ў парадку і на ўмовах,

497 Постановление Пленума Верховного Суда Республики Беларусь от 28 сентября 2000 г. № 7 «О практике применения судами законодательства, регулирующего компенсацию морального вреда». Ёсць на: http://www.supcourt.by.

498 Там жа, п. 3.

прадугледжаных гэтымі нормамі ці актамі. Артыкул 152 ГК павінен прымяняцца тады, калі патрабаванне аб абароне нематэрыяльнай выгоды, што вынікае з гэтых адносін, заснавана на агульных нормах ГК.

Працоўны кодэкс прадугледжвае права работніка патрабаваць ад суда вынесці рашэнне аб кампенсацыі маральнай шкоды ў выпадках звальнення без законнай падставы або з парушэннем устаноўленага парадку звальнення, альбо незаконнага пераводу на іншую працу (арт. 246). Паводле Крымінальнага кодэкса, асуджэнне асобы, якая ўчыніла злачынства, з'яўляецца падставай для спагнання з яе не толькі маёмаснага ўрону, але і матэрыяльнага пакрыцця маральнай шкоды (арт. 44).

Такім чынам, прадугледжаныя Канстытуцыяй і асобнымі законамі роўнасць перад законам, права на роўны доступ да правоў і / або недыскрымінацыя пакрываецца адпаведнымі палажэннямі Грамадзянскага кодэкса аб кампенсацыі маральнай шкоды. Працоўнае заканадаўства дазваляе запатрабаваць маральную кампенсацыю, напрыклад, за незаконнае звальненне, а крымінальнае – кампенсацыю за маральную шкоду, прычыненую злачынным дзеяннем. Аднак беларускія суды пакуль не сфарміравалі практыку прымянення адпаведных нормаў у кантэксце роўнасці і недыскрымінацыі.

### *Абарона правоў*

Сёння ў Беларусі безальтэрнатыўным спосабам абароны сваіх правоў за рамкамі ўласна крымінальнага права з'яўляецца зварот у суд. Як адзначалася вышэй, такое права ахвяры дыскрымінацыі ў сферы працоўных адносін гарантавана ў Працоўным кодэксе. Адпаведныя палажэнні Грамадзянскага кодэкса дазваляюць запатрабаваць кампенсацыю маральнай шкоды ў кантэксце роўнасці і недыскрымінацыі. Гэтая ж магчымасць непасрэдна выводзіцца з нормаў працоўнага і крымінальнага права.

У астатніх выпадках права звяртацца ў суд грунтуецца на агульных прынцыпах права. У свядомасці беларускіх суддзяў і іншых прадстаўнікоў юрыдычнай прафесіі пануе неабмежаваны прававы пазітывізм. Гэта вельмі абцяжарвае абарону законных правоў і інтарэсаў у дачыненні да роўнасці і недыскрымінацыі ўжо таму, што законы нярэдка ўтрымліваюць толькі дэкларатыўныя агульныя палажэнні. Беларускае права не ведае юрыдычна абавязковага агульнаўжывальнага вызначэння «дыскрымінацыі» (акрамя сферы працоўных адносін), а выкарыстанне азначэнняў, прапанаваных у міжнародных праваабарончых дакументах, застаецца вялікай рэдкасцю. Не прымяняюцца спецыяльныя правілы і нормы адносна разгляду спраў аб дыскрымінацыі, якія былі выпрацаваны ў апошнія гады ў іншых еўрапейскіх юрысдыкцыях (напрыклад, перанясенне цяжару даказвання на адказчыка).

Яшчэ адной асаблівасцю беларускай сітуацыі з'яўляецца адсутнасць у ахвяр дыскрымінацыі магчымасці звяртацца ў спецыялізаваныя квазісудовыя органы, якія спецыялізуюцца на пытаннях абароны правоў чалавека ці на абароне ад дыскрымінацыі. Іншымі словамі, у жыхароў Беларусі няма доступу да спецыяльных спрошчаных працэдур вырашэння, звязаных з дыскрымінацыяй канфліктаў; у краіне таксама не створаны інстытут незалежных пасярэднікаў, якія маглі б праводзіць пагаджальныя працэдуры па гэтых пытаннях і мэтанакіравана збіраць інфармацыю аб практычным увасабленні прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі ў Беларусі.

Да станоўчых аспектаў беларускага працэсуальнага права варта аднесці пэўныя магчымасці для грамадскіх арганізацый выступаць у абарону правоў сваіх членаў і магчымасці абмежаванага ўдзелу прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў у грамадзянскім працэсе.

Паводле Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса прафсаюзы могуць звяртацца ў суд з заявамі ў абарону правоў і ахоўваемых законам інтарэсаў іх членаў па спрэчках, якія вынікаюць з працоўных праваадносін і па некаторых іншых пытаннях. Прычым такія ж правы маюць і іншыя грамадскія аб'яднанні адносна абароны адпаведных статутным мэтам правоў і інтарэсаў членаў гэтых аб'яднанняў, але толькі ў выпадках, калі гэта прадугледжана законам (арт. 86). Таксама ў выпадках, прадугледжаных законам, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый могуць выступаць у судзе прадстаўнікамі сваіх членаў і іншых асоб (арт. 72). Пры гэтым Закон «Аб грамадскіх аб'яднаннях» непасрэдна ўпаўнаважвае такія аб'яднанні і саюзы на абарону правоў і законных інтарэсаў, а таксама прадстаўніцтва за-

канных інтарэсаў сваіх членаў у дзяржаўных органах і іншых арганізацыях (арт. 20).

Акрамя таго, беларускі грамадзянскі працэс прызнае права прадстаўнікоў грамадскасці выкладаць думкі грамадскіх аб'яднанняў і працоўных калектываў. Такія прадстаўнікі валодаюць цэлым наборам працэсуальных правоў, але не правам заяўляць адводы і абскарджваць судовыя пастановы (арт. 78 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса).

Беларускае заканадаўства прадугледжвае магчымасць атрымання кліентам на бязвыплатнай для яго аснове прававую («юрыдычную») дапамогу. Адпаведныя правілы ўстаноўлены ў артыкуле 28 Закона «Аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці».[499] Так, за кошт сродкаў калегіяў адвакатаў прававая дапамога павінна аказвацца: пазоўнікам у судах першай інстанцыі пры вядзенні спраў, звязаных з працоўнымі праваадносінамі і аб спагнанні аліментаў; ветэранам Вялікай Айчыннай вайны пры дачы вуснай кансультацыі па пытаннях, не звязаных з прадпрымальніцкай дзейнасцю; любым асобам пры складанні заяў аб прызначэнні пенсій і дапамог; інвалідам I і II групы пры дачы вуснай кансультацыі, якая не патрабуе азнаямлення з дакументамі; непаўналетнім у іх інтарэсах, іх бацькам (апекунам, папячыцелям) у інтарэсах дзяцей. Гэты спіс можа быць дапоўнены па рашэнні калегіі адвакатаў. За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту аказваецца прававая дапамога па пытаннях сацыяльнай абароны і рэабілітацыі ахвярам гандлю людзьмі, а за кошт сродкаў мясцовага бюджэту – падазраванаму або абвінавачанаму ў рамках крымінальнага працэсу.

Такім чынам, устаноўленыя ў Беларусі правілы доступу да бясплатнай прававой дапамогі закранаюць цэлы шэраг уразлівых груп насельніцтва і могуць выкарыстоўвацца, у тым ліку для абароны права на роўнасць і права на недыскрымінацыю (напрыклад, у сферы працоўных адносін).

499 Закон Республики Беларусь от 30 декабря 2011 г. № 334–З «Об адвокатуре и адвокатской деятельности в Республике Беларусь».





### *Да пытання аб спецыяльным антыдыскрымінацыйным заканадаўстве*

У гэтым раздзеле даклада мы паказалі, што беларускія прававыя нормы аб роўнасці і дыскрымінацыі шмат у чым дэкларатыўныя і ў цэлым не падмацаваныя эфектыўным механізмам рэалізацыі. Крыху лепшая сітуацыя назіраецца ў крымінальным і асабліва ў працоўным праве; пэўныя магчымасці адкрывае і права патрабаваць кампенсацыі маральнай шкоды. Але ў цэлым беларускае заканадаўства не раскрывае нават такія найбольш важныя паняцці, як «роўнасць» або «дыскрымінацыя» (акрамя вельмі спрошчанага вызначэння «дыскрымінацыі» ў артыкуле 14 Працоўнага кодэкса). Беларускаму праву невядомыя важныя паняцці, шырока прызнаныя ў іншых еўрапейскіх юрысдыкцыях у кантэксце права на роўнасць, напрыклад, «уціск», «разумнае прыстасаванне» або «віктымізацыя». Сістэма беларускіх прававых нормаў аб роўнасці і недыскрымінацыі не мае цэласнасці і ахоплівае толькі асобныя сферы грамадскага жыцця, прычым нормы розных галін права дрэнна ці зусім не звязаны адзін з адным.

Іншым важным недахопам беларускага заканадаўства ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі з'яўляецца тое, што розныя падставы валодаюць тут рознымі ступенямі абароны ад дыскрымінацыі, а некаторыя падставы, па сутнасці, застаюцца зусім без дзейснай прававой абароны. Гэта асабліва выразна відаць на прыкладзе працоўнага заканадаўства: у адрозненне ад аналагічных законаў у большасці іншых краін Еўропы, беларускі Працоўны кодэкс не бярэ пад абарону магчымых ахвяраў дыскрымінацыі нават па такіх відавочных падставах, як узрост і сексуальная арыентацыя. Нагадаем, што артыкул 22 беларускай Канстытуцыі, наадварот, кажа аб праве на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў без усялякай дыскрымінацыі, г. зн. без дыскрымінацыі на любой падставе. Аднак на практыцы такі падыход не рэалізаваны.

Пры гэтым беларускі ўрад не бачыць неабходнасці прымаць спецыялізаванае заканадаўства для барацьбы з дыскрымінацыяй па якой-небудзь падставе. Напрыклад, каментуючы ў рамках Універсальнага перыядычнага агляду (2010 г.) рэкамендацыю прыняць «канкрэтнае заканадаўства, якое абвяшчае гендарную роўнасць», беларускія ўлады заявілі:

*Пытанне аб законапраекце па гендарнай роўнасці не актуальнае для Беларусі, бо пытанні гендарнай роўнасці ў поўнай меры вырашаны ў галіновым заканадаўстве (напрыклад, сямейным, працоўным і г. д.).*[500]

Іншымі словамі, беларускія ўлады пакуль не ўлічваюць тых дадатковых магчымасцяў, якія прынясе прыняцце спецыяльнага заканадаўства інтэгральнага характару. Для таго, каб растлумачыць пытанне аб страчаных магчымасцях, трэба звярнуць увагу на досвед тых краін, якія ўжо даўно сталі на шлях прыняцця спецыялізаваных законаў і прыйшлі да высновы аб карыснасці ўсеабдымнага падыходу да ўрэгулявання пытанняў аб роўнасці і недыскрымінацыі. У гэтай сувязі можна спаслацца, напрыклад, на вопыт Вялікабрытаніі, якая прыняла ў 2010 г. Закон «Аб роўнасці».[501] Гэты акт замяніў не асобныя раскіданыя па законах нормы (як у сённяшняй Беларусі), але некалькі прынятых раней спецыялізаваных прававых актаў.

У брытанскім Законе «Аб роўнасці» 218 артыкулаў і 28 дадаткаў. Акрамя таго, да яго распрацавана тлумачальная запіска, у якой больш за дзвесце старонак. Дадзены закон дае гарантыі роўнасці і недыскрымінацыі на такіх падставах, як узрост, інваліднасць, змена полу, шлюб і грамадзянская партнёрства, цяжарнасць і мацярынства, раса, рэлігія або вераванні, пол і сексуальная арыентацыя (арт. 4). У раздзеле «Забароненыя паводзіны» падрабязна раскрываецца канцэпцыя дыскрымінацыі і патрабаванне прыстасаванняў для інвалідаў. Цэлыя раздзелы цалкам прысвечаны асобным сферам сацыяльнага жыцця, такім як працоўная занятасць ці адукацыя.

У чым практычная перавага гэтага адзінага ўсеабдымнага закона і чаму такі вопыт выкарыстоўваецца і ў іншых юрысдыкцыях, уключаючы і Беларусь?

Па ацэнцы Б. Хэпла, вартасцю брытанскага Закона «Аб роўнасці» з'яўляецца тое, што ён зыходзіць з адзінага інтэгральнага падыходу да заканадаўства аб роўнасці. У законе не толькі дадзены азначэнні «дыскрымінацыі», «прыгнёту» і «віктымізацыі», але іх дзеянне распаўсюджана на ўсе абароненыя ад дыскрымінацыі падставы. Закон таксама прадугледжвае пазітыўныя абавязацельствы для ўладаў прасоўваць прынцыпы роўнасці ў дачыненні да ўсіх абароненых падстаў. Закон пашырае пералік абставінаў, пры якіх дапушчальныя «пазітыўныя дзеянні». Акрамя таго, ён прадугледжвае абавязак уладаў улічваць неспрыяльнае становішча груп у сацыяльна-эканамічным аспекце пры прыняцці стратэгічных рашэнняў.[502] Да ліку відавочных недахопаў «мадэльнага» брытанскага закона, аднак, варта аднесці наяўнасць у ім закрытага пераліку «абароненых падстаў».[503]

Закон «Аб роўнасці» 2010 г. шмат у чым адпавядае разгледжанай намі раней Дэкларацыі прынцыпаў роўнасці (гл. раздзел 1.2 гэтага даклада). Б. Хэпл адзначае, што канчатковай мэтай дадзенага закона былі

*гарманізацыя, спрашчэнне і мадэрнізацыя заканадаўства аб роўнасці. Гэта, па сутнасці, выражае некалькі прынцыпаў Дэкларацыі, асабліва права на роўнасць усіх людзей (прынцып 1), роўную абарону ад дыскрымінацыі незалежна ад падставы (прынцып 6) і абавязак дзяржаў дамагацца «найбольш поўнай» рэалізацыі права на роўнасць у рамках любой дзейнасці дзяржавы (прынцып 11). Не можа быць якой-небудзь іерархіі роўнасці. Адны і тыя ж правілы павінны прымяняцца ва ўсіх сферах, за выключэннем выпадкаў, калі выключэнне можа быць пераканаўча апраўдана…*[504]

Разглядаемы ў якасці прыкладу брытанскі Закон «Аб роўнасці», з улікам нацыянальнага вопыту і пад уплывам агульнаеўрапейскіх трэндаў і патрабаванняў уключае набор спецыяльных нормаў і працэсуальных га-

500 Гл. спасылку 456. С. 6.

501 Equality Act 2010. P. 15. Ёсць на: http://www.legislation.gov.uk.

502 Hepple B. “The New Single Equality Act in Britain”, *The Equal Rights Review*, 2010, Vol. 5, p. 11. Ёсць на: http://www.equalrightstrust.org/ertdocumentbank/bob%20hepple.pdf.

503 *Ibid.*, p. 16.

504 *Ibid.*, pp. 14–15.

рантый, скіраваных палегчыць абарону ахвяраў дыскрымінацыі ў судовых і дасудовых органах, напрыклад, правілы, якія датычацца цяжару даказвання (арт. 136) або парадку выпатрабавання доказаў (арт. 138). Адзначаная вышэй адсутнасць спецыяльных працэсуальных нормаў і гарантый у Беларусі, як будзе паказана ніжэй, шмат у чым перашкаджае судовай абароне правоў ахвяр дыскрымінацыі.

Наяўныя ў беларускім праве агульныя палажэнні, якія тычацца прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі, звычайна ніяк дадаткова не раскрыты ў тэксце законаў і пазбаўлены эфектыўных мер рэалізацыі. Таму яны не могуць служыць заменай для спецыяльнага ўсеабдымнага антыдыскрымінацыйнага заканадаўства. Без прыняцця такога заканадаўства рэалізацыя прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі ў Беларусі будзе заставацца вельмі ўскладненай.

## 3.3 Дзяржаўная палітыка

У 2005 г. у Беларусі спецыяльным законам былі зацверджаны «Асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь».[505] Сярод іншых прынцыпаў унутранай палітыкі там былі ўказаны «гарантыя канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян» і «сацыяльная справядлівасць» (п. 1). Да стратэгічных мэт унутранай палітыкі аднесены таксама «забеспячэнне правоў і свабод чалавека і гарантыі іх рэалізацыі» (п. 2). Адпаведна і да асноўных задач унутранай палітыкі (на другім месцы) аднесена

> *забеспячэнне абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, правоў і законных інтарэсаў арганізацый, грамадскіх і дзяржаўных інтарэсаў.*[506]

Такім чынам, гарантыя і забеспячэнне права на роўнасць і недыскрымінацыю павінны быць іманентна ўласцівыя ўнутранай палітыцы

505 Закон Республики Беларусь от 14 ноября 2005 г. № 60–З «Об утверждении Основных направлений внутренней и внешней политики Республики Беларусь».

506 Основные направления внутренней и внешней политики Республики Беларусь (п. 3).





Беларусі. Ніжэй мы разгледзім шэраг дзяржаўных праграм, якія выконваюцца на практыцы і прыносяць пэўную карысць у кантэксце прасоўвання прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі.

***Гендарная роўнасць***

Спецыяльная палітыка, накіраваная на дасягненне раўнапраўя і роўнага звароту, праводзіцца ў Рэспубліцы Беларусь толькі ў адносінах да жанчын. Пасля Пекінскай канферэнцыі 1995 г. у Беларусі было рэалізавана тры Нацыянальныя планы дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці: у 1996-2000 гг., у 2001-2005 гг. і ў 2008-2010 гг.

Сёння рэалізуецца чацвёрты план на 2011-2015 гг. Эксперты крытыкавалі выкананне другога плана, акрамя іншага, па наступных падставах:

- адсутнасць мэтавага фінансавання і нізкі прыярытэт плана для дзяржустаноў;
- адсутнасць выразных механізмаў і індыкатараў выканання плана;
- патэрналісцкі падыход, закладзены ў канцэпцыі плана;
- адсутнасць галоснасці пры выкананні гадавых справаздач і рабочых планаў;
- павярхоўны падыход у працы дзяржаўных структур па рэалізацыі палажэнняў асобных раздзелаў праграмы;

- нявырашанасць на заканадаўчым узроўні праблем гвалту ў адносінах да жанчын і рамачнага закона аб гендарнай роўнасці (раўнапраўі).[507]

У дачыненні да выканання трэцяга плана незалежныя эксперты дадаткова адзначалі зніжэнне ролі і ўплыву арганізацый грамадзянскай супольнасці ў рамках агульных для Беларусі тэндэнцый у гэтай сферы.[508]

Цяперашні Нацыянальны план дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці на 2011–2015 гг. быў прыняты толькі ў жніўні 2011 г.[509] Задачамі нацыянальнага плана абвешчана:

- садзейнічанне дасягненню парытэтнага прадстаўніцтва мужчын і жанчын на ўсіх узроўнях кіравання;
- укараненне гендарных ведаў у сістэму адукацыі;
- фарміраванне ў грамадскай свядомасці неабходнасці сацыяльнай роўнасці мужчын і жанчын ва ўсіх сферах грамадскага жыцця;
- захаванне і ўмацаванне рэпрадуктыўнага здароўя жанчын, мужчын і падлеткаў для забеспячэння нармальнага ўзнаўлення насельніцтва і павышэння якасці жыцця;

507 Петина Л., Тонкачева Е., Смолянко О., Сержан Т., Ефимова Н., Еськова Е. *Альтернативный отчет Республики Беларусь по выполнению Конвенции о ликвидации всех форм дискриминации в отношении женщин. Обзор 2009 г.* Международная гендерная программа «Шаг к равенству», С. 10–11. Ёсць на: http://gender.do.am/publ/alternativnyj_otchjot_ respubliki_ belarus/4-1-0-164.

508 Там жа. С. 12.

509 Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 16 августа 2011 г. № 1101 «Об утверждении Национального плана действий по обеспечению гендерного равенства в Республике Беларусь на 2011–2015 гг.».





- умацаванне інстытута сям'і і сямейна-шлюбных адносін, прапаганда каштоўнасцяў шлюбу і сям'і, дасягненне гендарнай роўнасці ў сямейных адносінах, уцягванне мужчын у сферу хатняй працы і працэс выхавання дзяцей;
- садзейнічанне дасягненню гендарнай роўнасці ў эканамічнай сферы, далейшае развіццё прадпрымальніцтва сярод жанчын, павышэнне канкурэнтаздольнасці жанчын на рынку працы;
- трансфармацыя грамадскай свядомасці, выкараненне гендарных стэрэатыпаў, звязаных з ідэяй перавагі і дамінавання аднаго полу над іншым.

Рэалізацыя мерапрыемстваў Нацыянальнага плана павінна ажыццяўляцца ўладамі рэспубліканскага і мясцовага ўзроўню з прыцягненнем навуковых, грамадскіх аб'яднанняў і рэлігійных арганізацый, фінансавага і тэхнічнага патэнцыялу міжнародных арганізацый. Фінансаванне мерапрыемстваў Нацыянальнага плана павінна ажыццяўляцца з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, роўна як і пазабюджэтных крыніц.[510] Спецыяльны Нацыянальны савет па гендарнай палітыцы пры Савеце Міністраў пачаў працаваць з пачатку 2009 г., але ажыццяўляў сваю працу нерэгулярна.

У сярэдзіне 2012 г. у склад Савета пад старшынствам міністра працы і сацыяльнай абароны ўваходзяць 28 чал.: акрамя падначаленых старшыні гэта таксама намеснікі міністраў інфармацыі, архітэктуры і будаўніцтва, культуры, юстыцыі, унутраных спраў, аховы здароўя і адукацыі, прадстаўнікі абедзвюх палат парламента, усіх сямі рэгіёнаў краіны (шасці абласцей і горада Мінска), прадстаўнікі навуковых і статыстычных установ, каардынатар праграм ЮНІСЕФ у Беларусі, адзін прафсаюзны дзеяч і некалькі прадстаўнікоў грамадзянскай суполь-

510 Там жа.

насці.[511] На сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны можна пазнаёміцца з планамі работы савета на 2011, 2012 і 2013 гг., зацверджанымі міністрам.

У 2011 г. частка мерапрыемстваў у рамках выканання Нацыянальнага плана дзеянняў праводзілася сумесна з Фондам ААН у галіне народанасельніцтва. Адпаведныя праекты тычыліся праблем хатняга гвалту, планавання сям'і, фарміравання навыкаў здаровага ладу жыцця сярод падлеткаў і моладзі. Былі пачаты таксама даследаванні становішча дзяцей і жанчын у Беларусі. Акрамя таго ўлады правялі круглы стол «Рэалізацыя гендарнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь» з удзелам 16 грамадскіх і міжнародных арганізацый. Былі праведзены і іншыя мерапрыемствы, у тым ліку ў рамках агульнай палітыкі падтрымкі беспрацоўных, інвалідаў і аховы сям'і.[512]

### *Дзяржаўная праграма садзейнічання занятасці насельніцтва*

Агульныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі на рынку працы вызначаны ў Законе «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь»[513] (2006 г.). Да такіх прынцыпаў належыць

> *забеспячэнне роўных магчымасцяў усім грамадзянам незалежна ад полу, расы, нацыянальнасці, мовы, рэлігійных або палітычных перакананняў, удзелу ці няўдзелу ў прафесійных саюзах ці іншых грамадскіх аб'яднаннях, маёмаснага або службовага становішча, узросту, месца жыхарства, недахопаў фізічнага або псіхічнага характару, калі яны не перашкаджаюць выкананню адпаведных працоўных абавязкаў, іншых абставінаў, не звязаных з дзелавымі якасцямі і не абумоўленых спецыфікай працоўнай функцыі або статусу работніка, у рэалізацыі права на працу, якое азначае права на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэб, а таксама на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы.*[514]

Артыкул 21 гэтага ж Закона абавязвае наймальнікаў, акрамя іншага, аказваць дапамогу ў працаўладкаванні, не дапускаючы ўстанаўлення дыскрымінацыйных умоў, якія абмяжоўваюць гарантыі рэалізацыі права на працу, у прафесійнай падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі, і абавязвае выконваць устаноўленую бронь для прыёму на працу грамадзян, якія асабліва маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне і не могуць на роўных умовах канкурыраваць на рынку працы.

Згодна з артыкулам 12 Закона, дзяржава ажыццяўляе распрацоўку і рэалізацыю дзяржаўнай праграмы садзейнічання занятасці насельніцтва, каардынацыю яе з тэрытарыяльнымі і галіновымі праграмамі садзейнічання занятасці насельніцтва. На практыцы адпаведныя дзяржаўныя праграмы прымаюцца на кожны год.

У якасці прыкладу разгледзім Дзяржаўную праграму садзейнічання занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2013 г.[515] у кантэксце мер, якія прымаюцца ў інтарэсах сацыяльна слабых груп. Праграма зыходзіць з таго, што ў 2013 г. на стан рынку працы, акрамя іншага, будзе ўплываць захаванне нізкай канкурэнтаздольнасці асоб, якія асабліва маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне, – інвалідаў, моладзі, жанчын, асоб, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі, а таксама якія маюць працяглы (больш за год) перапынак у працы (гл. 2).

511 Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 30 июня 2012 г. № 613 «Об утверждении Положения о Национальном совете по гендерной политике при Совете Министров Республики Беларусь и его состава».

512 Министерство труда и социальной защиты Республики Беларусь. «О ходе выполнения в 2011 г. Национального плана действий по обеспечению гендерного равенства на 2011–2015 гг.». Ёсць на: www.mintrud.gov.by.

513 Закон Республики Беларусь от 15 июня 2006 г. № 125–З «О занятости населения Республики Беларусь».

514 Там жа, арт. 10.

515 Постановление Совета Министров Республики Беларусь 27 декабря 2012 г. № 1211 «Об утверждении Государственной программы содействия занятости населения Республики Беларусь на 2013 г.».

У плане мерапрыемстваў праграмы прадугледжана ўстанаўленне наймальнікам броні для прыёму на працу асоб, якім даюцца дадатковыя гарантыі пры працаўладкаванні і якія асабліва маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне, а таксама заданні па стварэнні вакансій (у тым ліку спецыялізаваных для асоб з абмежаванай працаздольнасцю). Чакаецца, што гэтыя меры закрануць 25260 чалавек (п. 28). Праграма таксама прадугледжвае выдзяленне бюджэтных пазык наймальнікам для стварэння працоўных месцаў, з іх не менш за 30% для працаўладкавання на іх грамадзян, якім даюцца дадатковыя гарантыі ў галіне садзейнічання занятасці (п. 29).

Такім чынам, дзяржаўная праграма садзейнічання занятасці, хоць і не спасылаецца наўпрост на прынцыпы роўнасці і недыскрымінацыі, але прадугледжвае пазітыўныя меры, накіраваныя на выраўноўванне дыспрапорцый, якія могуць быць на рынку працы, звязаных з прадстаўнікамі ўразлівых груп насельніцтва. Важная роля тут адводзіцца сістэме ўстанаўлення броні, апісанай вышэй.

### *Праграмы для інвалідаў*

У рамках Комплекснай праграмы развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011-2015 гг., зацверджанай урадам у 2010 г.,[516] была прынята спецыяльная падпраграма «Папярэджанне інваліднасці і рэабілітацыя інвалідаў». Мэта падпраграмы вызначана як павышэнне якасці і ўзроўню жыцця інвалідаў і стварэнне ўмоў для іх рэабілітацыі і інтэграцыі ў грамадства. Аднак сацыяльную значнасць падпраграмы ўлады бачылі менавіта ў тым, каб стварыць умовы для развіцця працэсу сацыялізацыі асобы інваліда, для павышэння яго канкурэнтаздольнасці, рэалізацыі права на роўнасць і паўнапраўнага ўдзелу ў жыцці грамадства (гл. раздзел «Мэты і задачы падпраграмы»).

Паказчыкамі прафесійнай і працоўнай рэабілітацыі інвалідаў для падпраграмы з'яўляюцца: павелічэнне колькасці інвалідаў, якія навучаюцца на новых спецыяльнасцях, што вярнуліся да прафесійнай

516 Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 29 июля 2010 г. № 1126 «Об утверждении Комплексной программы развития социального обслуживания на 2011–2015 гг.».





і іншай дзейнасці; пашырэнне пераліку ўстаноў прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, у якіх створаны спецыяльныя ўмовы для навучання асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, і пераліку спецыяльнасцяў, на якіх можа навучацца паказаная катэгорыя асоб. У гэтай сувязі падпраграма прадугледжвае цэлы шэраг канкрэтных мерапрыемстваў (раздзел «Мэты і задачы падпраграмы»).

Іншая падпраграма «Сацыяльная падтрымка ветэранаў, асоб, якія пацярпелі ад наступстваў войнаў, пажылых людзей і інвалідаў» таксама прадугледжвае мноства мерапрыемстваў у інтарэсах людзей з інваліднасцю. Яе мэтай заяўлена забеспячэнне сацыяльнай абароненасці, устойлівае павышэнне ўзроўню і якасці жыцця інвалідаў на шэрагу падстаў: сацыяльная салідарнасць і справядлівасць, захаванне балансу інтарэсаў усіх сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва і рацыянальнае выкарыстанне фінансавых рэсурсаў, забеспячэнне даступным сацыяльным абслугоўваннем (раздзел «Мэты і задачы падпраграмы»).

Дзяржаўная праграма па стварэнні безбар'ернага асяроддзя жыццядзейнасці фізічна аслабленых асоб на 2011–2015 гг. была зацверджана ў 2010 г. (папярэдняя праграма дзейнічала ў 2007-2010 гг.).[517] Улады не выкарыстоўваюць у дакуменце рыторыку роўнасці і недыскрымінацыі. Мэты стварэння безбар'ернага асяроддзя апісваюцца са спасылкай на рост узроўню і якасці жыцця насельніцтва, фарміраванне ўсебакова развітога чалавека, аднак у кантэксце інтарэсаў фізічна аслабленых асоб. Тым не менш, дакумент асабліва падкрэслівае інтарэсы інтэграцыі такіх асоб у грамадства, павелічэнне іх магчымасці весці незалежны лад жыцця (глава 2). Таксама ўлады разлічваюць, што выкананне праграмы будзе спрыяць стварэнню ўмоў, якія забяспечваюць фізічна аслабленых асоб роўнымі з усімі грамадзянамі магчымасцямі ў карыстанні аб'ектамі сацыяльнай інфраструктуры, сродкамі інфармацыі і сувязі. Адзін з чаканых вынікаў рэалізацыі мерапрыемстваў праграмы – павелічэнне ўдзельнай вагі аб'ектаў, якія ўлічваюць патрабаванні безбар'ернага ася-

517 Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 1 ноября 2010 г. № 1602 «О Государственной программе по созданию безбарьерной среды жизнедеятельности физически ослабленных лиц на 2011–2015 гг.».

роддзя, да 70% у цэлым па краіне (глава. 6). Як было паказана ў раздзеле 2 гэтага даклада, дадзеная праграма актыўна рэалізуецца на практыцы.

Людзі, якія жывуць з ВІЧ, з'яўляюцца бенефіцыярамі Дзяржаўнай праграмы прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі на 2011–2015 гг.[518] Мерапрыемствы ў рамках гэтай праграмы заклікаваны, акрамя іншага, даць асобам, інфіцыраваным ВІЧ, бесперапынны і роўны доступ да лячэння, догляду і падтрымкі (глава 3).

***Праграма развіцця канфесійнай сферы і нацыянальных адносін***

Статус Праграмы развіцця канфесійнай сферы, нацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2011-2015 гг. (папярэдняя праграма дзейнічала ў 2006-2010 гг.)[519] дастаткова нізкі – яна, па сутнасці, з'яўляецца ўнутраным дакументам (узгодненым з шэрагам міністэрстваў) апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Па змесце гэта – план дзеянняў з кароткім папярэднім каментарыем. У тым, што тычыцца рэлігійнага жыцця, праграма ў тлумачэннях робіць аднachасова спасылку і на роўнасць рэлігій, і на іерархічны спіс з пяці «традыцыйных канфесій», а таксама на каштоўнасці памяркоўнасці і ўзаемапавагі. Адной з мэтаў праграмы заяўлена садзейнічанне грамадзянам у рэалізацыі іх права на свабоду сумлення (глава 1). Вывучэнне плана канкрэтных мерапрыемстваў дае падставу лічыць, што іншыя заяўленыя задачы – аптымізацыя працы органаў дзяржаўнага кіравання па рэгуляванні канфесійнага жыцця, падтрыманню міжканфесійнага міру і згоды ў грамадстве, і развіццю ўзаемадзеяння з рэлігійнымі арганізацыямі па супрацоўніцтве ў сацыяльна значных галінах – маюць прыярытэтны характар.

У сферы этнічных адносін праграма гаворыць аб удасканаленні работы дзяржорганаў, развіцці іх узаемадзеяння з арганізацыямі меншасцяў,

518 Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 4 марта 2011 г. № 269 «Об утверждении Государственной программы профилактики ВИЧ-инфекции на 2011– 2015 гг.».

519 Решение коллегии аппарата Уполномоченного от 26 января 2011 г. № 1 по согласованию с заинтересованными министерствами, другими республиканскими органами государственного управления, облисполкомами и Минским горисполкомом «Об утверждении Программы развития конфессиональной сферы, национальных отношений и сотрудничества с соотечественниками за рубежом на 2011–2015 гг.».





падтрыманні міжнацыянальнага міру і згоды, садзейнічанні асобам у рэалізацыі іх правоў на нацыянальна-культурнае развіццё і «нацыянальную самабытнасць». Аднак сярод асноўных задач – забеспячэнне аптымальных умоў і магчымасцяў для паўнавартаснай рэалізацыі правоў на нацыянальна-культурнае развіццё і ўмацаванне беларускай грамадзянскай супольнасці, а таксама «прадухіленне негатыўных з'яў і працэсаў у гэтай сферы» (глава 2). Асноўная частка практычных мерапрыемстваў накіравана на ўзаемадзеянне з асацыяцыямі меншасцяў культурнай скіраванасці, работу са СМІ і ўдзел у навуковых мерапрыемствах.

Пералічаныя ў праграме мерапрыемствы – гэта шмат у чым тыповы набор мер для краін еўрапейскай часткі былога СССР. Яны апасродкавана могуць спрыяць практычнаму ўвасабленню прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі ў дачыненні да прадстаўнікоў рэлігійных і этнічных груп пастолькі, паколькі перашкаджаюць размыванню іх ідэнтычнасці і дазваляюць усведамляць свае асаблівыя праблемы ў рамках сацыяльнага ўзаемадзеяння. Пры гэтым за фармулёўкамі праграмы выразна праглядаецца прыярытэт уладаў – «гарманізацыя» адносінаў паміж членамі розных груп, паміж членамі груп і дзяржавай, падтрыманне (знешне) бесканфліктнай сітуацыі, а таксама накіраванне намаганняў прадстаўнікоў груп па палітычна нейтральнай траекторыі.

Важным элементам дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне варта таксама прызнаць падатковыя льготы для рэлігійных арганізацый і зніжаныя стаўкі арэнды для рэлігійных і этнічных арганізацый.[520]

520 Гл. спасылку 488, п. 71.

## 3.4 Судовая практыка

Як было паказана вышэй, хоць у Беларусі няма спецыяльнага антыдыскрымінацыйнага заканадаўства, прынцып роўнасці і забарона дыскрымінацыі можна знайсці ў тэксце Канстытуцыі і асобных законаў. Прабелы ў нацыянальных нарматыўных актах можна тэарэтычна папоўніць з дапамогай прамога прымянення норм міжнародных дагавораў. Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства (арт. 8 Канстытуцыі). Таксама дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя не толькі ў Канстытуцыі і законах, але і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы (арт. 21).

Паўнавартаснай судовай практыкі па антыдыскрымінацыйных справах за апошнія гады ў Беларусі не сфарміравалася. Спасылкі на дыскрымінацыю ў рамках судовых працэсаў вельмі рэдкія, і суды праявілі нізкую зацікаўленасць і недахоп спецыяльнай падрыхтоўкі, займаючыся гэтымі справамі. Практыка прамога прымянення норм міжнароднага права апынулася не напрацаванай. Дадзеная сітуацыя, зрэшты, цалкам тыповая для некаторых краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Выключэннем з агульнага правіла з'яўляецца толькі Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусь, які прыняў у апошнія гады некалькі рашэнняў і заключэнняў, што датычацца пытанняў дыскрымінацыі. Пасля агульных тлумачэнняў аб беларускай судовай сістэме, мы далей разгледзім некаторыя з гэтых рашэнняў і заключэнняў, якія тычыліся працоўнага права – найбольш урэгуляванай (у кантэксце недыскрымінацыі) галіны беларускага права. Пасля гэтага мы прывядзем прыклады нездавальняючага пакуль разгляду пытанняў аб дыскрымінацыі звычайнымі судамі.

### *Судовая сістэма Беларусі*

Судовая ўлада ў Беларусі належыць судам, сістэма якіх будуецца на прынцыпах тэрытарыяльнасці і спецыялізацыі (арт. 109 Канстытуцыі). Асобна стаіць Канстытуцыйны Суд, паўнамоцтвы якога мы разгледзім ніжэй. У гэтым дакладзе мы таксама не разглядаем кампетэнцыю ваенных судоў. Усе іншыя суды можна падзяліць на дзве асноўныя групы – агульныя суды, якія ажыццяўляюць правасуддзе праз грамадзянскае, крымінальную і адміністрацыйную судавытворчасць; і гаспадарчыя суды, якія ажыццяўляюць правасуддзе праз гаспадарчую і адміністрацыйную судавытворчасць (арт. 5 Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў[521]). Агульныя суды могуць быць трох узроўняў: раённыя (гарадскія), абласныя (уключаючы Мінскі гарадскі[522]) і Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь (арт. 28). У сістэме гаспадарчых судоў два ўзроўні – абласныя (і горада Мінска) і Вышэйшы гаспадарчы суд Рэспублікі Беларусь (арт. 59). Рашэнне ніжэйшых судоў можна аспрэчваць у вышэйшай інстанцыі. Асаблівасцю крымінальнай судавытворчасці ў Беларусі з'яўляецца тое, што падсуднасць па некаторых справах належыць толькі вышэйшым судам. Пры гэтым перадача любой справы ў Вярхоўны суд можа рабіцца са згоды абвінавачанага і абаронцы «ў мэтах забеспячэння аб'ектыўнасці судовага разбору» (арт. 267-269, 274 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса). У рамках грамадзянскай судавытворчасці суд другой і трэцяй інстанцыі можа ўзяць любую справу з ніжэйшага суда і прыняць яе да вытворчасці ў якасці суда першай інстанцыі. Таксама вышэйшыя суды часам выступаюць судамі першай інстанцыі ex lege, напрыклад, па адмовах у рэгістрацыі адпаведна мясцовых або рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў (арт. 44-45 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса).

### *Практыка Канстытуцыйнага Суда*

Канстытуцыйнаму Суду прысвечаны артыкул 116 Канстытуцыі, які ў якасці галоўнай яго задачы вызначае кантроль над канстытуцыйнасцю нарматыўных актаў у дзяржаве. У склад суда ўваходзяць 12 суддзяў, палова з якіх прызначаецца прэзідэнтам Беларусі, а іншая – верхняй палатай парламента – Саветам Рэспублікі. Па прапановах прэзідэнта, кожнай з палат парламента, Вярхоўнага суда, Вышэйшага гаспадарчага суда і ўрада Канстытуцыйны суд, перш за ўсё, дае заключэнні аб адпаведнас-

521 Кодекс Республики Беларусь о судоустройстве и статусе судей от 29 июня 2006 г. № 139–З.

522 Беларусь падзелена на шэсць абласцей і тэрыторыю сталіцы рэспублікі – горад Мінск, таму ў Мінску суды другой інстанцыі – «гарадскія».

ці законаў, дэкрэтаў, указаў прэзідэнта, міжнародных дамоўных і іншых абавязкаў беларускай Канстытуцыі міжнародным прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь. Пры гэтым нарматыўныя акты або іх асобныя палажэнні, прызнаныя неканстытуцыйнымі, страчваюць сілу.

Што датычыцца звычайных судоў, то калі пры разглядзе канкрэтнай справы яны прыйдуць да высновы аб неадпаведнасці нарматыўнага акта Канстытуцыі, то яны прымаюць рашэнне ў адпаведнасці з Канстытуцыяй. Пасля ўступлення судовага рашэння ў сілу суд ставіць адпаведна перад Вярхоўным судом або Вышэйшым гаспадарчым судом пытанне аб унясенні імі прапановы ў КС аб прызнанні гэтага нарматыўнага акта неканстытуцыйным, і тыя павінны зрабіць гэта ў месячны тэрмін. Іншыя дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, а таксама звычайныя асобы могуць выступаць з адпаведнай ініцыятывай перад органамі і асобамі, якія валодаюць правам на ўнясенне прапаноў аб праверцы канстытуцыйнасці акта (арт. 112 Канстытуцыі, арт. 6 Закона «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь».)[523]

Хоць кола суб'ектаў, якія валодаюць правам звяртацца з прапановамі аб праверцы канстытуцыйнасці, з'яўляецца абмежаваным, КС, зыходзячы з агульных канстытуцыйных прынцыпаў,[524] можа разглядаць звароты прыватных асоб і грамадскіх арганізацый і выносіць рашэнні аб ліквідацыі прабелаў або супярэчнасцяў у заканадаўстве. Вышэй у гэтым дакладзе мы прыводзілі прыклады такіх рашэнняў, якія закраналі: пытанні роўнасці дзяржаўных моў (па звароце ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны») і альтэрнатыўнай службы (па звароце намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, а таксама старшыні РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт»).

523 Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 сакавіка 1994 г. № 2914-XII «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь».

524 Асабліва артыкул 40 Канстытуцыі, які гарантуе права на петыцыі ў дзяржаўныя органы і на атрыманне адказу на іх па сутнасці.





Кампетэнцыя Канстытуцыйнага Суда была ўдакладнена прэзідэнцкім дэкрэтам ад 26 чэрвеня 2008 г.,[525] згодна з якім КС ажыццяўляе, акрамя іншага, абавязковы папярэдні кантроль канстытуцыйнасці ўсіх законаў, прынятых парламентам, да іх падпісання кіраўніком дзяржавы.

*Заключэнне ад 23 верасня 1994 г. № 3-1/94*

Гэта вытворчасць[526] была распачата па меркаванні самога Канстытуцыйнага Суда ў рамках працэдуры, якая дзейнічала на той момант. Беларускае заканадаўства захоўвала з савецкага часу становішча, згодна з якім у адпаведнасці з артыкулам 181 цяпер ужо адмененага Кодэкса законаў аб працы[527] (КЗаП), з работнікамі, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту (мужчыны – 60 гадоў, жанчыны – 55 гадоў) і маюць права на поўную пенсію, наймальнік мог: 1) захаваць працоўныя адносіны на нявызначаны тэрмін; 2) заключыць па пагадненні бакоў тэрміновы працоўны дагавор (да двух гадоў) з наступным яго прадаўжэннем або перазаключэннем у тым жа парадку; 3) скасаваць працоўны дагавор у адпаведнасці з пунктам 11 артыкула 33 КЗаП.[528]

Пры разглядзе дадзенай справы суд зыходзіў з таго, што артыкул 2 Канстытуцыі аб'яўляе чалавека найвышэйшай каштоўнасцю грамадства і дзяржавы. У ёй жа ўстаноўлена ўзаемная адказнасць грамадзяніна і дзяржавы адзін перад адным, не завязаная з узростам грамадзяніна. Далей Асноўны закон, даючы ўсім роўныя правы для ажыццяўлення любой дзейнасці (арт. 13), выключае магчымасць дыскрымінацыі грамадзян ва ўсіх сферах жыцця, у тым ліку і ў сферы працы. Артыкул 14 Канстытуцыі ўстанаўлівае, што дзяржава рэгулюе адносіны паміж сацыяльнымі,

525 Декрет Президента Республики Беларусь от 26 июня 2008 г. № 14 «О некоторых мерах по совершенствованию деятельности Конституционного Суда Республики Беларусь».

526 Заключение Конституционного Суда Республики Беларусь от 23 сентября 1994 г. № 3–1/94.

527 На той момант афіцыйная назва: Закон Белорусской ССР от 23 июня 1972 г. «Кодекс законов о труде Белорусской ССР».

528 Адпаведная папраўка была прынята Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР ад 26 лютага 1988 г. «О внесении изменений и дополнений в Кодекс законов о труде Белорусской ССР».

нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў і інтарэсаў, г. зн. без ніякай дыскрымінацыі. Артыкул 22 вызначае прынцып роўнасці ўсіх перад законам, а артыкул 41 – гарантуе ўсім грамадзянам права на працу і забяспечвае ім роўнасць пры рэалізацыі гэтага права. Канстытуцыйны Суд таксама ўлічыў нормы міжнароднага права: артыкулы 2 і 6 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах; артыкул 2 Канвенцыі МАП № 111 «Аб дыскрымінацыі ў галіне працы і занятказў» і Рэкамендацыю МАП № 111 «Аб дыскрымінацыі ў галіне працы і заняткаў».

На думку Канстытуцыйнага Суда, дыскрымінацыйны характар скасавання працоўнага дагавора з-за ўзросту выяўляўся ў самым парадку такога скасавання, пры якім не патрабавалася якога-небудзь абгрунтавання для звальнення: працоўныя адносіны спыняліся наймальнікам аднаасобна без уліку жадання работніка працягнуць працу, яго здольнасцяў, прафесійнай прыдатнасці, паводзінаў, а таксама вытворчых прычын. Згаданы парадак таксама, па сутнасці, азначаў легалізацыю прымусовага выхаду на пенсію, пры тым што нежаданне многіх асоб сыходзіць на пенсію часта выклікалася нізкім узроўнем сацыяльнага забеспячэння. Акрамя таго, Канстытуцыйны Суд адзначаў, што звальненне работніка ў сувязі з дасягненнем пенсійнага ўзросту пазбаўляла яго права на судовую праверку абставінаў звальнення па сутнасці, што ў цэлым не было характэрна для іншых падстаў звальнення па артыкуле 33 КЗаП. Суд таксама палічыў, што існаванне ў заканадаўстве такой падставы для звальнення не адказвае нормам маральнасці, якія прадугледжваюць фарміраванне паважлівага стаўлення да старэйшага пакалення; кожная асоба, якая дасягнула пенсійнага ўзросту, знаходзіцца пад пагрозай звальнення. Усё гэта не спрыяе сцвярджэнню дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы, якое абвешчана ў артыкуле 1 Канстытуцыі.

У выніку Канстытуцыйны Суд прыйшоў да высновы, што дадзеныя нормы не адпавядаюць Канстытуцыі і носяць дыскрымінацыйны характар у адносінах да сацыяльнай супольнасці, якой з'яўляюцца асобы, што дасягнулі пенсійнага ўзросту.





*Рашэнне ад 18 ліпеня 2001 г. № Р-127/2001*

Гэта вытворчасць,[529] у пэўным сэнсе, звязана з папярэдняй. У рамках яе зноў разглядалася пытанне аб дыскрымінацыйнасці няроўнага звароту па ўзросце. Аднак дадзеная вытворчасць тычылася не звычайнага работніка, а публічнага службоўца (чыноўніка). Вытворчасць у Канстытуцыйным Судзе была ініцыявана на падставе звароту дэпутата парламента, які палічыў норму права, што дзейнічала тады, супярэчнай шэрагу нацыянальных і міжнародных актаў, уключаючы Канстытуцыю і Канвенцыю МАП № 111 «Аб дыскрымінацыі ў галіне працы і заняткаў».

Згодна з артыкулам 21 Закона «Аб асновах службы ў дзяржаўным апараце»,[530] які дзейнічаў на той момант, адной з падстаў спынення службы было паказана «дасягненне служачым пенсійнага ўзросту і наяўнасць у яго права на поўную пенсію па ўзросце, калі дзяржаўны орган не захаваў з ім працоўных адносінаў». Згодна з пастановай Пленума Вярхоўнага суда ад 29 сакавіка 2001 г.[531] спыненне службы ў дзяржаўным апараце ў сувязі з дасягненнем пенсійнага ўзросту і правам на поўную пенсію па ўзросце з'яўлялася самастойнай падставай спынення працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка незалежна ад тэрміну, на які заключаны кантракт.

Пачаўшы разгляд, Канстытуцыйны Суд адзначыў, што артыкул 41 Асноўнага закона гарантуе права на працу, а артыкул 39 прадастаўляе грамадзянам у адпаведнасці са сваімі здольнасцямі, прафесійнай падрыхтоўкай права роўнага доступу да любых пасад у дзяржаўных органах. Аднак згодна з дзеючаму заканадаўству ў дачыненні да служачых дзяржаўнага апарату спецыяльным заканадаўствам былі прадугледжаны дадатковыя падставы спынення службы ў дзяржаўным апараце. Суд палічыў, што хоць адносіны служачага з дзяржаўным апаратам з'яўля-

529 Решение Конституционного Суда Республики Беларусь от 18 июля 2001 г. № Р–127/2001.

530 Закон Республики Беларусь от 23 ноября 1993 г. № 2581–XII «Об основах службы в государственном аппарате».

531 Постановление Пленума Верховного суда Республики Беларусь от 29 марта 2001 г. № 2 «О порядке применения некоторых постановлений Пленума Верховного Суда Республики Беларусь», п. 12. Ёсць на: http://www.supcourt.by.

юцца, па сутнасці, працоўнымі праваадносінамі, дзяржслужба з-за сваёй спецыфікі азначае асаблівы прававы статус дзяржаўных служачых, а заканадаўца можа ўстанаўліваць асаблівасці і абмежаванні пры рэгуляванні гэтага віду працоўнай дзейнасці, зыходзячы з прынцыпу забеспячэння высокай эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўных органаў.

Далей суд адзначыў, што названыя абмежаванні дапускаюцца Канстытуцыяй і міжнародна-прававымі актамі. Напрыклад, згодна з часткай 2 артыкула 1 Канвенцыі МАП № 111, любое адрозненне, недапушчэнне або перавага ў дачыненні да пэўнай працы, заснаваная на спецыфічных патрабаваннях такой, не лічыцца дыскрымінацыяй. Пэўныя абмежаванні для знаходжання на службе ў дзяржаўным апараце ўстанаўліваюцца і ў законах іншых краін, напрыклад, у Расійскай Федэрацыі. Канстытуцыйны Суд адзначыў, што ўстаноўленыя ў законе абмежаванні кампенсуюцца прадастаўленнем пэўных ільгот і пераваг у параўнанні з рэгуляваннем правоў іншых работнікаў, якія тычацца працягласці адпачынку, выплаты выхадной дапамогі ў павышаных памерах пры звальненні, льготнага парадку вылічэння памеру пенсій.

Такім чынам, Канстытуцыйны Суд палічыў, што вызваленне ад службы публічных служачых толькі з-за іх ўзросту не мае дыскрымінацыйнага характару.

*Крытыка рашэння ад 18 ліпеня 2001 г. № Р-127/2001*

Каментуючы рашэнне Канстытуцыйнага суда ад 18 ліпеня 2001 г., трэба адзначыць, што ўстанаўленне асобага рэжыму работы публічных служачых назіраецца ў многіх краінах, а пытанне пра ўзроставыя абмежаванні для іх не з'яўляецца адназначным. Рашэнне беларускага суда можна параўнаць з рашэннем Калегіі па канстытуцыйным наглядзе Вярхоўнага Суда Эстоніі.[532] У Эстоніі, згодна з артыкулам 120 Закона «Аб публічнай службе» ад 25 студзеня 1995 г.,[533] таксама было магчыма звальняць публічнага службоўца (чыноўніка) толькі з-за дасягнення ім пэўнага ўзросту (65-ці гадоў).

Адпаведная вытворчасць у Калегіі па канстытуцыйным наглядзе была ініцыявана Талінскім адміністрацыйным судом, які палічыў дадзеную норму супярэчнай шэрагу нацыянальных і міжнародных актаў, уключаючы Канстытуцыю і Канвенцыю МАП № 111 «Аб дыскрымінацыі ў галіне працы і заняткаў». Акрамя іншага, артыкул 12 Канстытуцыі Эстонскай Рэспублікі абвяшчае роўнасць кожнага перад законам і забараняе дыскрымінацыю па любой падставе.

Калегія сканцэнтравала сваю ўвагу менавіта на пытанні аб абароне права на роўнасць у кантэксце разгляданага законапалажэння. Спасылаючыся на сваю ўласную практыку, Калегія падкрэсліла, што адпаведнае канстытуцыйнае палажэнне патрабуе, каб закон звяртаўся роўным чынам з усімі асобамі, якія знаходзяцца ў падобнай сітуацыі. Гэты прынцып выказвае ідэю субстантыўнай роўнасці: з роўнымі варта звяртацца роўным спосабам, з няроўнымі – няроўным. Аднак не кожнае праяўленне няроўнага звароту будзе парушэннем права на роўнасць: забарона звяртацца з роўнымі няроўным чынам будзе парушана тады, калі такі зварот мае адвольны характар. Калі для няроўнага звароту ёсць разумная або дастатковая падстава, то няроўны зварот у праве будзе апраўданым.

Разглядаючы гэтае пытанне, Калегія палічыла, што не мае ніякага разумнага апраўдання сітуацыя, калі адзін чыноўнік па дасягненню 65-ці гадоў можа заставацца на службе, а другі вызваляцца ад яе толькі з-за ўзросту. Калегія таксама не пагадзілася з довадамі ўдзельнікаў працэсу, што звальненне з-за ўзросту будзе ўспрымацца пажылым чалавекам лепш, чым звальненне з-за неадпаведнасці займаемай пасады (у тым ліку па стане здароўя). Калегія падкрэсліла, што матывы вызвалення ад пасады павінны быць празрыстыя і адлюстроўваць рэальную сітуацыю: гэта неабходна, каб пазбегнуць адвольнага няроўнага звароту. У выніку Калегія вырашыла, што ў дадзеным выпадку абмежаванне права на роўнасць не было апраўдана разумным або дастатковым чынам, і таму з'яўлялася адвольным няроўным зваротам і парушэннем права на роўнасць.

532 Judgment of the Constitutional Review Chamber of the Supreme Court, case No. 3–4–1–14-07, 1 October 2007. Ёсць на: http://www.riigikohus.ee/?id=850.

533 Avaliku teenistuse seadus, vastu võetud 25.01.1995, Riigi Teataja I 1995, 16, 228. Ёсць на: https://www.riigiteataja.ee/akt/106072012011?leiaKehtiv.

Такім чынам, і Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь, і Калегія па канстытуцыйным наглядзе Вярхоўнага суда Эстоніі разглядалі пытанне аб патэнцыйным парушэнні права на роўнасць у дачыненні да публічных служачых (чыноўнікаў), якія дасягнулі пэўнага ўзросту. Тым не менш, яны выбралі розныя групы для параўнання, калі вырашалі пытанне аб дапушчальнасці звальнення такіх чыноўнікаў. Так, беларускі Канстытуцыйны Суд сканцэнтраваў увагу на дапушчальнасці ўстанаўлення асобага рэжыму для публічных служачых пэўнага ўзросту ў параўнанні са звычайнымі работнікамі (не чыноўнікамі) таго ж ўзросту (гэта значыць, на абгрунтаванасці сітуацыі, калі першых можна было звольніць толькі з-за ўзросту, а іншых – нельга). Эстонскі суд, наадварот, параўноўваў розных публічных служачых аднаго ўзросту, г. зн. разглядаў пытанне аб няроўным звароце з рознымі прадстаўнікамі адной узроставай групы чыноўнікаў ва ўзросце 65-ці гадоў і старэй (сітуацыя, калі аднаго чыноўніка ў адным аддзеле Міністэрства закон без якога-небудзь дадатковага абгрунтавання дазваляе пакінуць на службе, а яго аднагодка – звольніць). Такі розны падыход да праблемы прывёў да таго, што беларускія і эстонскія суддзі прынялі розныя рашэнні па сутнасці пытання. Не выключана, што беларускі суд пагадзіўся б з эстонскімі калегамі, калі б таксама разгледзеў пытанне аб няроўным звароце ўнутры групы чыноўнікаў, якія дасягнулі пэўнага ўзросту (а не стаў бы параўноўваць толькі чыноўнікаў і нечыноўнікаў адной узроставай групы).

Акрамя таго, пытанне аб адвольнасці і абгрунтаванасці ў кантэксце права на раўнапраўе гэта, па сутнасці, пытанне аб прапарцыйнасці абмежаванняў асноўных правоў і свабод, да ліку якіх у Беларусі належыць і роўнасць перад законам (арт. 22 Канстытуцыі). У гэтай справе Канстытуцыйны Суд таксама павінен быў праверыць, наколькі дадзенае распазнаванне адпавядае артыкулу 23 Канстытуцыі, паводле якой абмежаванне правоў і свабод асобы дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маральнасці, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб. На жаль, ён не стаў гэтага рабіць.

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь, абгрунтаваўшы асаблівы рэжым спынення службовых адносін з-за ўзросту чыноўнікаў (у параўнанні са звычайнымі работнікамі), падвёў тэарэтычную базу для захавання такога становішча і надалей. Новы Закон «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» (2003 г.)[534] прадугледжвае ўжо «лімітавы ўзрост» знаходжання на дзяржаўнай службе (65 гадоў). Магчымасць застацца на службе цяпер пакінута толькі тым служачым, што ўключаны ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь (арт. 41), г. зн. тым, хто займае вышэйшыя дзяржаўныя пасады і пасады кіруючых работнікаў дзяржаўных органаў і некаторых іншых арганізацый.

*Рашэнне ад 4 кастрычніка 2011 г. № Р-627/2011*

Дадзеная вытворчасць[535] грунтавалася на звароце прыватнай асобы, якая паставіла пытанне аб правамернасці непрадастаўлення адпачынку па даглядзе за дзіцем да дасягнення ім узросту трох гадоў бацьку ў выпадку ажыццяўлення маці дзіцяці прадпрымальніцкай дзейнасці ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Адмова ў прадастаўленні названага адпачынку бацьку дзіцяці засноўваўся на тым, што паколькі заяўніца – маці дзіцяці – з'яўлялася індывідуальным прадпрымальнікам і ў сілу працоўнага заканадаўства не мела права на прадастаўленне ёй адпачынку па даглядзе за дзіцем да дасягнення ім узросту трох гадоў, то такі адпачынак не мог быць прадастаўлены і бацьку дзіцяці.

Суд адзначыў, што канстытуцыйнае права на працу (арт. 41) можна рэалізаваць як з дапамогай вольнага выкарыстання здольнасцяў і маёмасці для занятак прадпрымальніцкай дзейнасцю (арт. 13), так і, напрыклад, у парадку найму (арт. 42). Паколькі занятак прадпрымальніцкай дзейнасцю ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка з'яўляецца рэалізацыяй гарантаванага дзяржавай канстытуцыйнага права, то яно не павінна цягнуць якіх-небудзь негатыўных наступстваў для сям'і індывідуальнага прадпрымальніка. Згодна з артыкулам 22 Канстытуцыі, усе роўныя перад законам і маюць права без уся-

534 Закон Республики Беларусь от 14 июня 2003 г. № 204–З «О государственной службе в Республике Беларусь».

535 Решение Конституционного Суда Республики Беларусь от 4 октября 2011 г. № Р-627/2011.

кай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў. Гэты прынцып юрыдычнай роўнасці, адзначыў Канстытуцыйны Суд, з'яўляецца адным з найважнейшых прынцыпаў прававой дзяржавы, якому Беларусь, як прававая дзяржава, абавязана прытрымлівацца пры ажыццяўленні дзяржаўных функцый, у тым ліку нарматворчай і правапрымяняльнай дзейнасці. Канстытуцыйны Суд, у прыватнасці, сказаў:

> *Права бацькі, які працуе, або іншага сваяка дзіцяці, які фактычна ажыццяўляе дагляд за ім, на такі сацыяльны адпачынак з'яўляецца самастойным правам, гарантаванасць рэалізацыі якога грунтуецца на палажэннях Канстытуцыі і Працоўнага кодэкса. Магчымасць вырашэння пытання аб прадастаўленні названага адпачынку бацьку, іншаму сваяку дзіцяці, які фактычна ажыццяўляе за ім дагляд, у залежнасці ад статусу маці дзіцяці (калі маці дзіцяці працуе па працоўнаму дагавору, то адпачынак бацьку, іншаму сваяку дзіцяці прадастаўляецца, а калі яна з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам – не прадастаўляецца) сведчыць аб пэўнай дыскрымінацыі ў адносінах да працуючага бацькі, іншага сваяка дзіцяці, што забараняецца як артыкулам 22 Канстытуцыі, артыкулам 14 Працоўнага кодэкса, так і абавязковымі для Рэспублікі Беларусь міжнародна-прававымі актамі. (…) Адмова ў прадастаўленні названага адпачынку бацьку, іншаму сваяку дзіцяці, які фактычна ажыццяўляе за ім дагляд, на той падставе, што маці дзіцяці з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, ставіць названых асоб у заведама няроўнае становішча ў параўнанні з астатнімі, хто працуе і рэалізуе свае права на гэты адпачынак на падставе артыкула 271 Працоўнага кодэкса.*[536]

536 Там жа.





У выніку Канстытуцыйны Суд вырашыў, што неабходна ліквідаваць згаданы вышэй прабел у заканадаўстве. Гэта патрэбна ў мэтах захавання: канстытуцыйных прынцыпаў юрыдычнай роўнасці; прапарцыянальнасці абмежавання правоў і свабод грамадзян; норм, якія гарантуюць права на працу і сацыяльнае забеспячэнне; норм, якія гарантуюць недапушчэнне дыскрымінацыі ў сферы працоўных і звязаных з імі адносін; для забеспячэння сацыяльнай справядлівасці, дзейсных механізмаў абароны сям'і, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства.

Гэтае рашэнне Канстытуцыйнага Суда з'яўляецца ўзорам адэкватнага прымянення прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі ў кантэксце беларускага працоўнага заканадаўства. Важным заключэннем суда стала пастуляванне недапушчальнасці парушэння прынцыпу роўнасці тады, калі чалавек выкарыстоўвае нейкія іншыя, гарантаваныя Канстытуцыяй, правы. Пры гэтым суд вылучыў права на роўнасць перад законам як самастойнае права, якое нязменна павінна паважацца дзяржавай.

Варта таксама адзначыць, што Канстытуцыйны Суд вызначыў дыскрымінацыю на такой «незвычайнай» для беларускай судовай практыкі падставы, як статус на рынку працы. Такім чынам суд прапанаваў актыўна карыстацца магчымасцямі артыкула 22 Канстытуцыі, які ўстанаўлівае роўнасць усіх і кожнага перад законам і гарантуе роўную абарону правоў і законных інтарэсаў без якога-небудзь абмежавання па спісе «абароненых прыкмет».

### *Іншыя прыклады судовай практыкі*

Практыка Канстытуцыйнага Суда павінна не толькі служыць кантролю і «выпраўленню» беларускага заканадаўства, але, у ідэале, павінна і для звычайных судоў з'яўляцца ўзорам для пераймання. На жаль, гэтага часта не адбываецца. Крытычны погляд на працу беларускіх судоў выяўляе некаторыя сістэмныя праблемы, шмат у чым успадкаваныя яшчэ з савецкіх часоў. Па-першае, гэта адсутнасць выразнага прытрымлівання іерархіі прававых нормаў. Па-другое, варта згадаць амаль неабмежаваны прававы пазітывізм суддзяў, які не дазваляе тлумачыць прававыя нормы ў іх узаемасувязі з палажэннямі беларускай

Канстытуцыі, міжнароднага права і агульнапрызнанымі прававымі прынцыпамі.

У гэтым дакладзе для ілюстрацыі такіх сістэмных складанасцяў будуць апісаны рашэнні па двух справах, якія РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» вёў у межах праекта Асацыяцыі роўных правоў.

*Справа Грышчанкі*

Справа Грышчанкі – добры прыклад ігнаравання правілаў аб іерархіі прававых нормаў беларускімі судамі, а таксама іх нежадання пры вырашэнні канкрэтных спраў зважаць на складаныя прынцыпы, зафіксаваныя ў Канстытуцыі.

В. Грышчанка – асоба без грамадзянства, уступіла ў шлюб з грамадзянінам Беларусі. Пры заключэнні шлюбу яна не скарысталася сваім правам абраць сабе прозвішча мужа. Аднак прайсці адпаведную працэдуру можна ў любы час. Згодна з артыкулам 222 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, «асобам, якія дасягнулі 16-ці гадоў», трэба толькі падаць заяву аб рэгістрацыі змены прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку, у органы, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану, па месцы іх жыхарства (АЗАГС). Аднак у падзаконным акце – у пункце 68 главы 8 «Палажэння аб парадку рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану і выдачы дакументаў і (або) даведак органамі, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану» (далей – Палажэнне), зацверджаным урадам, замест тэрміна «асоба» выкарыстоўваецца тэрмін «грамадзянін Рэспублікі Беларусь».[537] Паколькі В. Грышчанка была асобай без грамадзянства, АЗАГС Першамайскага раёна г. Мінска адмовіўся прыняць заяву аб рэгістрацыі змены яе прозвішча на прозвішча мужа.

Справа не атрымала станоўчага рашэння ў судзе першай інстанцыі, і В. Грышчанка падала касацыйную скаргу. Заяўнік абгрунтавала сваю

537 Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2005 г. № 1454 «Аб парадку арганізацыі работы з грамадзянамі ў органах, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану, па выдачы даведак або іншых дакументаў, якія змяшчаюць пацверджанне фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне», «Палажэнне аб парадку рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану і выдачы дакументаў і (або) даведак органамі, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану».





нязгоду з рашэннем раённага суда. У прыватнасці, падкрэслівалася калізія паміж нормамі прававых актаў рознага ўзроўню – кодэкса і пастановы ўрада (падзаконны акт), якая павінна вырашацца на карысць нормы таго акта, які валодае большай юрыдычнай сілай, г. зн. кодэкса. Адпаведныя правілы выразна сфармуляваныя ў Законе «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь»[538] (арт. 10). Акрамя таго, да гэтай сітуацыі дастасавальныя нормы артыкула 22 Канстытуцыі (роўнасць перад законам і права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў) і артыкула 23 Асноўнага закона, які вызначае магчымае абмежаванне правоў і свабод асобы. У касацыйнай скарзе змяшчалася патрабаванне прымяніць непасрэдна артыкул 222 Кодэкса аб сям'і і шлюбе, які не мае абмежаванняў незалежна ад грамадзянства. Таксама было патрабаванне прымяніць палажэнні Канстытуцыі як акта прамога дзеяння, надаўшы асаблівую ўвагу яе артыкулам 22 і 23. У скарзе было таксама ўказана, што інструкцыя для працы органаў унутраных спраў пры змене прозвішча,[539] якая ўжываецца ў дадзенай справе, не ўтрымлівае палажэнняў, якія б забаранялі выносіць заключэнні аб змене прозвішча адносна асобы без грамадзянства.

Мінскі гарадскі суд – суд другой інстанцыі – у сваім вызначэнні, працытаваўшы арт. 222 Кодэкса аб сям'і і шлюбе і пункт 68 главы 8 Палажэння, заключае:[540]

> *Суд прыйшоў да высновы, што ЗАГС адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска пры вырашэнні пытання аб прыняцці заявы Грышчанкі В. У. не парушыў дзеючае ў Рэспубліцы Беларусь заканадаўства. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 кастрычніка 2008 г. «Аб асновах адміністрацыйных працэдур»*

538 Закон Республики Беларусь от 10 января 2000 г. № 361–З «О нормативных правовых актах Республики Беларусь».

539 Постановление Министерства внутренних дел Республики Беларусь от 4 мая 2005 г. № 137 «Об утверждении Инструкции по организации работы органов внутренних дел, связанной с переменой фамилии, собственного имени и отчества, внесением изменений, дополнений и исправлений в записи актов гражданского состояния».

540 Определение судебной коллегии по гражданским делам Минского городского суда от 14 мая 2012 г. по делу № 33–1221.

*не парушаны, падстаў для задавальнення скаргі няма.*

*Довады скаргі аб ушчамленні грамадзянскіх правоў заяўніка з'яўляюцца беспадстаўнымі, паколькі парадак змены, у прыватнасці, прозвішча, урэгуляваны дзеючым у Рэспубліцы Беларусь заканадаўствам, абавязковым для выканання як фізічнымі, так і юрыдычнымі асобамі. З прычыны таго, што матэрыялы аб змене прозвішча накіроўваюцца для праверкі ў органы ўнутраных спраў, якім забаронена выносіць заключэнні аб мэтазгоднасці змены прозвішча ў дачыненні да асоб, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, ЗАГС, на думку суда, правамерна адмовіў у прыняцці заявы аб здзяйсненні адміністрацыйнай працэдуры.*

*Довады скаргі аб неабгрунтаванасці і незаконнасці рашэння суда беспадстаўныя, паколькі пры вынясенні рашэння судом улічаны ўсе факты, якія ўваходзяць у прадмет даказвання, ім дадзеная правільная прававая ацэнка, няма парушэнняў працэсуальнага права, ужыты нормы матэрыяльнага права, якія падлягаюць прымяненню.*

*Такім чынам, судовая калегія не знаходзіць падстаў да адмены рашэння суда і задавальнення касацыйнай скаргі.*

Гэта вызначэнне судовай калегіі сталічнага (Мінскага гарадскога) суда з'яўляецца наглядным прыкладам таго, як падзаконны акт і ведамасная інструкцыя, да таго ж, на нашу думку, няправільна вытлумачаныя, сталі самым важным аргументам пры прыняцці рашэння па скарзе. Суд не прааналізаваў ні пытанне аб калізіі норм права, ні патрабаванні аб захаванні канстытуцыйных прынцыпаў роўнасці перад законам і забароны на дыскрымінацыю.





*Справа Песікава*

Справа Песікава добра ілюструе дамінаванне прававога пазітывізму ў беларускіх суддзяў. І. Песікаў знаходзіўся на ўліку ў Цэнтры занятасці насельніцтва ў якасці беспрацоўнага. Упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Светлагорскага райвыканкама выдала яму накіраванне на працу ў аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму Светлагорскага райвыканкама, калі там адкрылася вакансія. Аднак яму было адмоўлена ў прыёме на працу ў сувязі з неадпаведнасцю кваліфікацыі. Паводле яго словаў, калі ён прыйшоў з накіраваннем на працу, то начальнік аддзела, не высветліўшы яго асобу па пашпарце і не праверыўшы адпаведнасць яго кандыдатуры кваліфікацыйным патрабаванням, адразу адмовіў з-за неадпаведнасці кваліфікацыі. І. Песікаў лічыць, што адмова ў заключэнні працоўнага дагавора мела дыскрымінацыйны характар і стала вынікам яго актыўнай грамадзянскай пазіцыі па шэрагу вострых пытанняў, звязаных са спартыўным жыццём горада, якую ён выказаў у СМІ.

Як падрабязна разглядалася вышэй, беларускі Працоўны кодэкс мае закрыты пералік падстаў для дыскрымінацыі (арт. 14). РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» падрыхтаваў незалежную грамадскую юрыдычную экспертызу для суда Светлагорскага раёна.[541] Увага суда было прыцягнута да Канстытуцыі (арт. 22 – роўнасць перад законам і права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў). Была зроблена таксама спасылка на Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, які гарантуе раўнапраўе грамадзян незалежна ад палітычных ці іншых перакананняў і мае ў Беларусі прамое дзеянне. Было падкрэслена, што і Канвенцыя МАП № 111 «Адносна дыскрымінацыі ў галіне працы і заняткаў» адносіць да спісу забароненых для дыскрымінацыі падстаў «палітычныя перакананні». Камітэт мяркуе, што адмова ў заключэнні працоўнага дагавора магла з'явіцца наступствам праявы

541 Белорусский Хельсинкский Комитет. *Заключение (независимая общественная юридическая экспертиза) «О недопущении дискриминации в сфере трудовых правоотношений»*, неопубликованный документ.

актыўнай грамадзянскай пазіцыі Песікава па шэрагу актуальных пытанняў.

Варта патлумачыць, што ў сучаснай інфармацыйнай прасторы Беларусі словазлучэнне «актыўная жыццёвая пазіцыя» нярэдка выкарыстоўваецца як эўфемізм для апазіцыйных ці неартадаксальных поглядаў на палітычныя і грамадскія з'явы.

На працэсе большая частка аргументаў бакоў тычылася ўсё ж адпаведнасці І. Песікава кваліфікацыйным патрабаванням, і суд пагадзіўся тут з адказчыкам. Аднак для мэтаў нашага даклада цікава паглядзець на тыя аргументы суда, якія тычацца падстаў для забароненай дыскрымінацыі ў кантэксце працоўнага права. Разгледзеўшы аргументы бакоў, якія тычацца кваліфікацыйных патрабаванняў, суд пераходзіць да пытання, якое цікавіць нас:

> *Суд лічыць, што падчас судовага разбору гэтай грамадзянскай справы не было ўстаноўлена якіх-небудзь дакладных доказаў, якія пацвярджаюць абгрунтаванасць сцвярджэння Песікава І. С. аб праявах ў адносінах да яго дыскрымінацыі.*
>
> *Акрамя таго, суд адзначае тую акалічнасць, што паняцце «актыўная жыццёвая пазіцыя» не ўключана ў пералік выпадкаў праявы дыскрымінацыі, які змяшчаецца ў частцы 1 артыкула 14 ПК Рэспублікі Беларусь, што сведчыць аб больш шырокім тлумачэнні гэтай нормы заканадаўства аб працы.*
>
> *Такім чынам, па справе не ўстаноўлена прававых падстаў для прызнання аспрэчанай пазоўнікам адмовы ў заключэнні з ім працоўнага дагавора неабгрунтаванай і спагнанні сярэдняга заробку за час вымушанага прагула.*[542]

Інакш кажучы, суд адмовіўся прымяняць нормы Канстытуцыі і міжнароднага права і выразна прытрымліваўся літары канкрэтнай нормы нацыянальнага закона. Пры гэтым ён не абгрунтаваў, чаму ў дадзеным выпадку пашыральнае тлумачэнне нормы права не дапушчальна. Такі падыход для беларускіх судоў з'яўляецца тыповым.

З моманту падрыхтоўкі тэксту даклада са значных зменаў, якія ўплываюць на сітуацыю з дыскрымінацыяй, варта вылучыць наступныя. Законам ад 8 студзеня 2014 г. «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь» унесены змены ў артыкул 14, які ўстанаўлівае забарону на дыскрымінацыю ў працоўных адносінах. У мэтах выканання рашэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 17.07.2009 г. № Р-360/2009 у пералік забароненых падстаў дыскрымінацыі ў сферы працоўных адносін уключаны ўзрост і месца жыхарства, а таксама іншыя абставіны, не звязаныя з прафесійнымі якасцямі і не абумоўленыя спецыфікай працоўнай функцыі работніка. Такім чынам, пералік забароненых дыскрымінацыйных падстаў не толькі пашыраны, але і стаў адкрытым. Гэта дазваляе на практыцы лічыць дыскрымінацыйнымі любыя падставы для абмежавання ў працоўных правах або атрыманне якіх-небудзь пераваг, калі яны не звязаны з прафесійнымі якасцямі і не абумоўлены спецыфікай працоўнай функцыі работніка.

13 снежня 2013 г. Камітэт па эканамічных, сацыяльных і культурных правах разгледзеў чарговы даклад Беларусі аб ажыццяўленні Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (E/C.12/BLR/4-6) і прыняў Заключныя заўвагі. У прыватнасці Камітэт адзначыў, што «ўнутранае заканадаўства дзяржавы-ўдзельні-

542 Мотивировочная часть (обоснование) решения суда Светлогорского района Гомельской области от 25 мая 2012 г. по гражданскому делу по иску Песикова И. С. к Отделу физической культуры, спорта и туризма Светлогорского районного исполнительного комитета о признании необоснованным отказа в заключении трудового договора, взыскании среднего заработка за время вынужденного прогула, возмещения морального вреда, 1 июня 2012 г. С. 5.

цы не прадугледжвае поўнай абароны ад дыскрымінацыі па ўсіх прыкметах, забароненых Пактам, і што забарона дыскрымінацыі ў галіне занятасці абмяжоўваецца толькі прамой дыскрымінацыяй (артыкул 2, пункт 2)». У сувязі з гэтым Камітэт: a) заклікае дзяржаву-ўдзельніцу забяспечыць, каб яе заканадаўства эфектыўна забараняла дыскрымінацыю ва ўсіх галінах эканамічных, сацыяльных і культурных правоў у адпаведнасці з палажэннямі Пакта і прадугледжвала адпаведныя санкцыі за яе; b) настойліва рэкамендуе дзяржаве-ўдзельніцы прыняць усёабдымны закон аб барацьбе з дыскрымінацыяй, у якім вырашалася б праблема дыскрымінацыі, у тым ліку ў прыватнай сферы, забаранялася б прамая і ўскосная дыскрымінацыя па ўсіх прыкметах, названых у Пакце, і прадугледжваліся б эфектыўныя сродкі прававой абароны у выпадку дыскрымінацыі ў ходзе судовага і адміністрацыйнага разбору. У сувязі з гэтым Камітэт звяртае ўвагу дзяржавы-ўдзельніцы на сваю заўвагу агульнага парадку № 20 (2009 г.), якая датычыцца недыскрымінацыі ў галіне эканамічных, сацыяльных і культурных правоў; c) просіць дзяржаву-ўдзельніцу даць у сваім наступным перыядычным дакладзе інфармацыю пра выпадкі дыскрымінацыі, у дачыненні да якіх былі прыняты рашэнні ўнутранымі судамі; d) просіць дзяржаву-ўдзельніцу правесці даследаванне ў дачыненні да характару і маштабаў ускоснай і сістэмнай дыскрымінацыі ў краіне і мер, прынятых па барацьбе з такой дыскрымінацыяй, а таксама ўключыць інфармацыю пра гэта ў свой наступны перыядычны даклад. Такім чынам неабходнасць развіцця заканадаўчага рэгулявання процідзеяння дыскрымінацыі пацверджана кампетэнтным міжнародным органам.





# 4. ЗАКЛЮЧЭННЕ І РЭКАМЕНДАЦЫІ

## 4.1 Заключэнне

У сучаснай Беларусі на фоне канкурэнцыі ў грамадстве паміж рознымі праектамі будучыні краіны прадстаўнікі шэрагу сацыяльных груп аказваюцца ва ўразлівым становішчы як патэнцыйныя або рэальныя носьбіты «няправільнасці» з пункту гледжання ўладаў і / або большасці насельніцтва. Гэтая «няправільнасць» можа выяўляцца ў падтрымцы альтэрнатыўных праектаў нацыябудаўніцтва або проста альтэрнатыўных стыляў жыцця і сямейных адносін, а таксама ў любым тыпе сувязі з палітычнай апазіцыяй. Тыповай праявай няроўнасці для ўсіх уразлівых груп з'яўляюцца спрэчныя па стандартах дэмакратычнага грамадства абмежаванні свабоды асацыяцыяў, сходаў, слова і рэлігіі. Захаванню такога становішча спрыяе неразвітасць дэмакратычнай палітычнай культуры, прыкметныя аўтарытарныя тэндэнцыі ў дзяржкіраванні і імкненне беларускіх уладаў праводзіць эканамічную мадэрнізацыю з апорай на кансерватыўныя групы насельніцтва. Наступствы дамінавання дзяржавы ў эканоміцы, аднак, не адназначныя, і, акрамя іншага, дазваляюць праводзіць такія меры падтрымкі ўразлівых груп на рынку працы, якія з цяжкасцю здзяйсняльныя ў краінах з развітай рынкавай эканомікай.

Беларускія ўлады праводзяць адрозненні паміж пяццю «традыцыйнымі» **рэлігіямі**, на чале з праваслаўем, і іншымі канфесіямі, як у заканадаўстве, так і ў адміністрацыйнай практыцы. З абмежавальным рэгуляваннем сутыкаюцца, аднак, усё канфесіі без выключэння. Тым не менш, дзяржаўная палітыка накіравана на прадухіленне распаўсюджвання «новых рэлігійных рухаў», нярэдка па меркаваннях дзяржаўнай бяспекі і абароны «традыцыйнай» ідэнтычнасці беларусаў. Акрамя юрыдычных варта ўлічваць таксама адміністрацыйныя перашкоды. Пры гэтым уразлівасць рэлігійных груп шмат у чым залежыць ад іх сацыяльнай актыўнасці і сувязяў з палітычнай апазіцыяй. Асаблівай праблемай з'яўляецца да гэтага часу нявырашанае пытанне аб праходжанні альтэрнатыўнай службы. Такім чынам, у Беларусі і на ўзроўні заканадаўства, і на ўзроўні практыкі магчымая дыскрымінацыя па рэлігійных падставах, асабліва чальцоў груп, якія не належаць да «традыцыйных» канфесій. Пры гэтым вастрыня праблем шмат у чым

зніжаецца нізкім узроўнем «актыўнай рэлігійнасці» большасці беларускага насельніцтва.

Доля беларусаў у насельніцтве краіны перавышае 4/5, але ў Беларусі жывуць таксама некалькі буйных груп **нацыянальных (этнічных) меншасцяў**. Заканадаўства аб правах нацыянальных меншасцяў, моўнае заканадаўства і рэгуляванне ў сферы адукацыі носіць умерана абмежавальны характар. Моўныя абмежаванні, мабыць, амаль не прымяняюцца на практыцы. Магчымасці выкарыстання недзяржаўных моў пры кантактах з уладамі, а таксама права выкладання на гэтых мовах на вышэйшых прыступках адукацыі практычна адсутнічаюць. Улады актыўна імкнуцца да ўмацавання грамадзянскай, а не этнічнай ідэнтычнасці ўсіх асноўных груп насельніцтва. Пры гэтым у якасці агульнай асновы відавочна выбраны руская мова і праваслаўе (з памяркоўным стаўленнем да іншых «традыцыйных» канфесій, напрыклад, каталіцызму). Дзяржава імкнецца да барацьбы са злачынствамі на глебе нянавісці, уключаючы матывы антысемітызму. Пры гэтым любыя формы публічнай самаарганізацыі прадстаўнікоў груп меншасцяў, як і любая іншая грамадская дзейнасць у краіне, кантралююцца ўладамі, а амаль любая актыўнасць, што ўвязвацца з палітычнай апазіцыяй, падвяргаецца абструкцыі або забароне. У складанае становішча на фоне палітызацыі звязаных з імі пытанняў трапілі лідары польскай нацыянальнай меншасці, якія пакутуюць ад умяшання ва ўнутраныя справы іх арганізацый як беларускіх, так і польскіх уладаў. Прыклад яўрэйскай меншасці выяўляе падкрэслена вертыкальны характар узаемаадносін дзяржавы з грамадзянскай супольнасцю, часткай якіх таксама з'яўляюцца арганізацыі меншасцяў. Падобныя праявы няроўнага звароту з'яўляюцца следствам неадчувальнасці большасці да асаблівых патрэб меншасцяў. Цыганская меншасць, члены якой з'яўляюцца частымі ахвярамі сістэмнай дыскрымінацыі і этнічнага прафілявання з боку праваахоўнікаў, на сваім прыкладзе доказвае адсутнасць мер спецыяльнай падтрымкі для ўразлівых этнічных груп з боку беларускай дзяржавы.

Парадаксальная сітуацыя склалася ў Беларусі з **носьбітамі беларускай мовы**, якая ў краіне з'яўляецца роднай мовай большасці насельніцтва і мае статус дзяржаўнай. У сферы адукацыі і пры доступе да тавараў і паслуг беларускамоўныя жыхары на практыцы пастаўлены ў няроўнае





становішча з-за іх моўных пераваг. Іх сітуацыя можа яшчэ пагаршацца з-за таго, што іх перавага беларускай мовы рускай увязваецца з апазіцыйнымі поглядамі і дзейнасцю. Вастрыня праблем у гэтай галіне зніжаецца шырокім распаўсюджваннем беларускай і рускай мовы і блізкасцю гэтых моў.

У Беларусі традыцыяналісцкія ўстаноўкі ўплываюць на нарматыўныя ўяўленні аб узаемаадносінах паміж мужчынам і жанчынай, сацыяльнай ролі жанчыны, статусе людзей з абмежаванымі псіхічнымі і фізічнымі магчымасцямі, памяркоўнасці да адрознага ад большасці стылю жыцця і характару сямейных адносін. Пры гэтым беларуская дзяржава надае ўвагу пытанням раўнапраўя жанчын і мужчын, а таксама грамадскай інтэграцыі інвалідаў. Тым не менш, традыцыяналісцкія і патэрналісцкія падыходы па-ранейшаму шмат у чым вызначаюць іх становішча ў розных галінах грамадскага жыцця.

Прыкладамі праявы няроўнасці ў адносінах да **жанчын** з'яўляюцца больш нізкія, чым у мужчын, даходы, недастатковае прадстаўніцтва на самых верхніх прыступках кар'ернай лесвіцы і канцэнтрацыя ў менш прэстыжных і менш прыбытковых галінах эканомікі. У асабліва ўразлівым становішчы знаходзяцца жанчыны дзетароднага ўзросту. Пры гэтым гендарны дысбаланс на рынку працы шмат у чым транслюецца праз сістэму адукацыі. Распаўсюджаныя стэрэатыпы адносна роляў і адказнасці жанчын і мужчын у сям'і і грамадстве негатыўна адбіваюцца на сацыяльным статусе жанчын і перашкаджаюць іх роўнаму ўдзелу ў палітычным і эканамічным жыцці. У сямейным жыцці жанчыны нярэдка робяцца ахвярамі хатняга (побытавага) гвалту. Праблемы гендарнай няроўнасці атрымалі прызнанне ўладаў, што стала асновай для прыняцця канкрэтных мер па яе пераадоленні.

Беларусь робіць крокі па вырашэнні праблем даступнасці публічнай інфраструктуры і больш поўнай інтэграцыі **інвалідаў** на рынку працы. Аднак факты сведчаць пра ўсё яшчэ шырокую распаўсюджанасць адпаведных праяў няроўнасці. Хоць беларускае заканадаўства прадугледжвае цэлы шэраг мер, накіраваных на палягчэнне доступу інвалідаў на рынак працы, сітуацыю ў цэлым пагаршае адсутнасць выразных нормаў, якія тычацца права кожнага інваліда на разумнае прыстасаванне працоўнага месца. Сацыяльная паліты-

ка ў адносінах да інвалідаў можа спараджаць утрыманскія настроі, хоць улада і імкнецца да іх сацыяльнай інтэграцыі. Узровень занятасці сярод інвалідаў застаецца нізкім. Асаблівай увагі заслугоўваюць праблемы стыгматызацыі і дыскрымінацыі людзей, якія жывуць з ВІЧ.

З няроўнасцю і дыскрымінацыяй у самых розных галінах грамадскага жыцця сутыкаюцца прадстаўнікі вельмі закрытай супольнасці ЛГБТ. Яны нярэдка робяцца ахвярамі фізічнага і псіхалагічнага гвалту. Дыскрымінацыя членаў **супольнасці ЛГБТ** можа адбывацца на рынку працы, у сферы гандлю і паслуг, пры рэалізацыі права на свабоду сходаў і асацыяцый. Агульныя прынцыпы роўнасці і недыскрымінацыі ў беларускім праве могуць быць малаэфектыўныя для абароны членаў гэтай супольнасці з-за агульнай атмасферы нецярпімасці да іх у беларускім грамадстве.

У падобнай сітуацыі знаходзяцца і **асобы з апазіцыйнымі поглядамі і перакананнямі**, якія часта аказваюцца ва ўразлівым становішчы пры ажыццяўленні права на працу, на адукацыю (асабліва на вышэйшых яе прыступках) і на свабоду творчай дзейнасці. Некаторыя ўразлівыя сацыяльныя групы часцей сутыкаюцца з праблемай беднасці. У Беларусі таксама захоўваецца неабгрунтаваная заканадаўчая дыскрымінацыя неграмадзян, напрыклад, у этнаканфесійнай сферы.

Беларусь удзельнічае ў цэлым шэрагу **міжнародных пагадненняў** (краіна далучылася да важнейшых адпаведных дакументаў на ўзроўні ААН і СНД) і прыняла палітычныя абавязацельствы ў рамках АБСЕ. **Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь** мае прамое дзеянне і прадугледжвае прынцып роўнасці кожнага перад законам і права на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў без якой-небудзь дыскрымінацыі. Хоць Канстытуцыя не згадвае магчымасці пазітыўных мер, яны загадзя дапушчальныя ў дачыненні да шэрагу сацыяльных груп і / або ў шэрагу абласцей. Уразлівая група насельніцтва, якія асабліва згаданая ў Канстытуцыі ў кантэксце роўных магчымасцяў – гэта жанчыны. Пры тлумачэнні адпаведных артыкулаў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь выкарыстаў асноўныя прынятыя ў развітых краінах падыходы да вызначэння прапарцыйнасці абмежавання правоў і свабод чалавека.





Найбольшая ўвага пытанням абароны ад дыскрымінацыі нададзена ў беларускім крымінальным і працоўным заканадаўстве. **Крымінальны кодэкс** прадугледжвае, акрамя іншага, асаблівыя склады злачынстваў, датычныя «парушэнне раўнапраўя грамадзян» і «наўмысных дзеянняў, накіраваных на ўзбуджэнне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці неладоў, на прыніжэнне нацыянальнага гонару і годнасці». Пры гэтым злачынствы па матывах расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці неладоў, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці, а таксама па матывах варожасці або неладоў у дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы з'яўляюцца абцяжарваючай віну акалічнасцю. У беларускім праве таксама крыміналізаваны паклёп і абраза.

**Працоўны кодэкс** Рэспублікі Беларусь забараняе дыскрымінацыю, вызначаную як абмежаванне ў працоўных правах або атрыманне якіх-небудзь пераваг у залежнасці ад полу, расы, нацыянальнага паходжання, мовы, рэлігійных ці палітычных поглядаў, удзелу ці няўдзелу ў прафсаюзах ці іншых грамадскіх аб'яднаннях, маёмаснага або службовага становішча, недахопаў фізічнага або псіхічнага характару, якія не перашкаджаюць выкананню адпаведных працоўных абавязкаў. На жаль, Працоўны кодэкс не адрознівае прамую і ўскосную дыскрымінацыю, а пералік падстаў для забароненай дыскрымінацыі мае закрыты характар і не ўключае, напрыклад, узрост і сексуальную арыентацыю. У ім ёсць патрабаванні ў дачыненні да разумнага прыстасавання працоўнага месца з боку канкрэтнага наймальніка толькі для тых інвалідаў, якія атрымалі інваліднасць з прычыны працоўнага калецтва або прафесійнага захворвання на пэўнай вытворчасці (а не для кожнага інваліда). Прыкладам асаблівага падыходу да ўразлівых груп насельніцтва на беларускім рынку працы з'яўляецца сістэма браніравання працоўных месцаў для інвалідаў і іншых сацыяльна неабароненых груп, а таксама стварэнне для іх асаблівых працоўных месцаў пры падтрымцы ўладаў. Гэтым правілам павінны падпарадкоўвацца наймальнікі незалежна ад формы ўласнасці. Неабгрунтаваная адмова ў прыёме на працу чалавека, накіраванага органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў лік броні, з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем, як і не выкананне прадугледжанага законам абавязку па стварэнні працоўных месцаў.

Прынцыпы роўнасці і / або раўнапраўя ўключаны і ў **іншыя законы**. Аднак яны звычайна ніяк не раскрываюцца ў тэксце саміх нарматыўных актаў і не могуць служыць эфектыўнай мерай абароны ад дыскрымінацыі ў судзе. Вялікім недахопам з'яўляецца адсутнасць у Беларусі спецыялізаванага антыдыскрымінацыйнага заканадаўства. Да прыняцця такога заканадаўства, якое зможа забяспечыць усеабдымную прававую абарону ад усіх формаў дыскрымінацыі, прабелы ў законах можна папоўніць з дапамогай прамога прымянення норм міжнародных дагавораў, паколькі яны з'яўляюцца часткай беларускага права, да таго ж Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім свайго заканадаўства. Адным са спосабаў абароны правоў у выпадку дыскрымінацыі з'яўляецца таксама выпатрабаванне кампенсацыі за прычыненую маральную шкоду ў межах грамадзянскага працэсу.

Асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь (2005 г.) сярод іншых прынцыпаў **унутранай палітыкі** звяртаюць увагу на «гарантыю канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян» і «сацыяльную справядлівасць». Спецыяльная палітыка, накіраваная на дасягненне раўнапраўя і роўнага звароту, праводзіцца ў Беларусі толькі ў адносінах да жанчын. У цяперашні час рэалізуецца ўжо чацвёрты Нацыянальны план дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці на 2011–2015 гг. Спецыяльнага згадвання заслугоўваюць штогадовыя дзяржаўныя праграмы садзейнічання занятасці насельніцтва, якія прадугледжваюць асаблівыя меры ў інтарэсах сацыяльна слабых груп. Комплексная праграма развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011–2015 гг. уключае падпраграму «Папярэджанне інваліднасці і рэабілітацыя інвалідаў». Акрамя таго, выконваецца ўжо другая па ліку Дзяржаўная праграма па стварэнні безбар'ернага асяроддзя жыццядзейнасці фізічна аслабленых асоб на 2011-2015 гг. У этнаканфесіянальнай галіне рэалізуецца Праграма развіцця канфесійнай сферы, нацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2011-2015 гг., накіраваная, перш за ўсё, на «гарманізацыю» адносін у гэтай сферы. У цэлым усе праграмы выконваюцца на практыцы і прыносяць пэўную карысць у кантэксце прасоўвання прынцыпаў роўнасці і недыскрымінацыі.

Паўнавартаснай **судовай практыкі па антыдыскрымінацыйных справах** за апошнія гады ў Беларусі не сфарміравалася. Спасылкі на





дыскрымінацыю ў рамках судовых працэсаў вельмі рэдкія, і суды, займаючыся гэтымі справамі, праяўляюць нізкую зацікаўленасць і недахоп спецыяльнай падрыхтоўкі. Выключэннем з агульнага правіла з'яўляецца толькі Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь, які прыняў у апошнія гады некалькі рашэнняў, што тычацца пытанняў роўнасці і недыскрымінацыі. Крытычны погляд на працу беларускіх судоў выяўляе некаторыя сістэмныя праблемы, шмат у чым успадкаваныя яшчэ з савецкіх часоў. Па-першае, гэта непрытрымліванне іерархіі прававых нормаў. Па-другое, прававой пазітывізм суддзяў, які не дазваляе тлумачыць прававыя нормы ў іх узаемасувязі з палажэннямі беларускай Канстытуцыі, міжнароднага права і агульнапрызнанымі прававымі прынцыпамі.

## 4.2 Рэкамендацыі

***Агульныя рэкамендацыі***

- Прыняць спецыяльны ўсеабдымны закон па праблематыцы роўнасці і недыскрымінацыі. У ім трэба даць вызначэнне прамой і ўскоснай дыскрымінацыі па адкрытым спісе падстаў, даць вызначэнне прыгнёту і пазітыўных дзеянняў. Закон таксама павінен змяшчаць працэсуальныя гарантыі, якія тычацца даказвання выпадкаў дыскрымінацыі, перш за ўсё зрушэнне цяжару даказвання на адказчыка. У законе варта выразна замацаваць права дыскрымінаванага на пакрыццё маральнай шкоды пры любой праяве дыскрымінацыі. Закон павінен таксама прадугледзець стварэнне спецыялізаванага незалежнага органа падтрымкі ахвяр дыскрымінацыі.

- Укараняць у судовую і іншую правапрымяняльную практыку прамое прымяненне міжнародных дагавораў, у тым ліку тых, якія змяшчаюць антыдыскрымінацыйныя палажэнні і стандарты. Праводзіць спецыяльнае на-

вучанне суддзяў, прадстаўнікоў іншых юрыдычных прафесій і дзяржаўных служачых для павышэння ўзроўню іх кампетэнцыі ў сферы барацьбы за роўнасць і супраць дыскрымінацыі.

- Прааналізаваць і знайсці шляхі для лібералізацыі заканадаўства, якое мае непасрэднае дачыненне да свабоды рэлігіі, асацыяцыі, слова і сходаў. Адмяніць забарону на дзейнасць незарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў і рэлігійных арганізацый, а таксама дэкрыміналізаваць дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый.

- Надаваць асаблівую ўвагу падрыхтоўцы па пытаннях роўнасці і недыскрымінацыі для палітыкаў, журналістаў і выканаўчай улады. Падрыхтоўка павінна грунтавацца на тым, што роўны, свабодны і дэмакратычны ўдзел прадстаўнікоў уразлівых груп у палітычным і грамадскім жыцці з'яўляецца адным з неабходных умоў поўнага ажыццяўлення міжнародных абавязацельстваў Беларусі.

- Ажыццяўляць гендарны мейнстрымінг у рамках любой дзяржаўнай палітыкі Беларусі.

- Праводзіць мэтанакіраваную палітыку для павышэння ўзроўню памяркоўнасці насельніцтва да сацыяльных груп, асабліва ўразлівых у кантэксце рэалізацыі права на роўнасць і недыскрымінацыю.

- Гарантаваць роўны доступ грамадзян Рэспублікі Беларусь і неграмадзян да грамадзянскіх, эканамічных, сацыяльных і культурных правоў, асабліва ў сферы працоўнай дзейнасці, сацыяльнага забеспячэння і доступу да адміністрацыйных працэдур.

- Працягваць намаганні для ліквідацыі праблемы беднасці, надаючы асаблівую ўвагу становішчу дзяцей, бацькоў-адзіночак і сельскіх жыхароў.

***Свабода сумлення і веравызнання***

- Спрасціць рэгістрацыю рэлігійных суполак і аб'яднанняў.

- Зняць забароны, звязаныя з ажыццяўленнем рэлігійнай дзейнасці па-за культавымі будынкамі або за межамі месца рэгістрацыі, а таксама ліквідаваць бар'еры для працы святароў-замежнікаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

- Вырашыць пры падтрымцы публічных фондаў праблему недахопу культавых будынкаў іўдаістаў і «новых рэлігійных рухаў». Прадугледзець магчымасць для праходжання альтэрнатыўнай службы. Дэкрымінізаваць адмову ад службы ў войску па рэлігійных прычынах.

***Нацыянальныя (этнічныя) і моўныя групы***

- Выключыць крытэрый грамадзянства з афіцыйнага вызначэння паняцця «нацыянальная меншасць».

- Гарантаваць неўмяшанне дзяржавы ва ўнутраныя справы грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных меншасцяў.

- Надаваць павышаную ўвагу барацьбе з праявамі антысемітызму, ксенафобіі і нецярпімасці.

- Прыняць рашучыя меры для выкаранення сістэмнай дыскрымінацыі цыганоў. Забяспечыць роўны доступ цыганоў да рэалізацыі правоў чалавека ва ўсіх сферах жыцця, у тым ліку праз прыняцце пазітыўных мер, накіраваных на выкараненне негатыўных стэрэатыпаў у дачыненні да цыганоў у беларускім грамадстве.

- Забараніць практыку этнічнага прафілявання меншасцяў і правесці адпаведнае навучанне сярод супрацоўнікаў праваахоўных органаў.

- Мэтанакіравана працаваць над праблемай інтэграцыі цыганоў-рома ў беларускім грамадстве, асабліва ў сферы адукацыі і рынку працы, надаючы таксама ўвагу праблеме захавання іх культурнай адметнасці.

- Працягваць падтрымку грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных меншасцяў і навучання на мовах нацыянальных меншасцяў і на замежных мовах у розных формах. Гарантаваць права на навучанне на мовах меншасцяў на ўсіх узроўнях, калі прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў выказалі такое пажаданне.

- Забяспечыць у заканадаўстве і правапрымяняльнай практыцы субстантыўную роўнасць носьбітаў беларускай і рускай мовы, асабліва ў сферы адукацыі і пры доступе да тавараў і паслуг. Аказваць усялякую падтрымку выкарыстання беларускай мовы, а таксама моў нацыянальных меншасцяў у публічнай прасторы.

- Прадугледзець магчымасці для выкарыстання мовы нацыянальнай меншасці ў кантактах з уладамі ў месцах іх кампактнага пражывання. Даць права размяшчаць у публічных месцах інфармацыю на мовах меншасцяў.





***Гендарная роўнасць***

- Прыняць закон аб папярэджанні хатняга гвалту, які замацоўвае канкрэтныя правы ахвяр на дапамогу, абарону і пакрыццё шкоды. Арганізаваць для суддзяў, пракурораў і супрацоўнікаў міліцыі абавязковую падрыхтоўку па пытаннях выканання нарматыўных палажэнняў аб гвалце і дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын і растлумачваць супрацоўнікам міліцыі стандартныя працэдуры абыходжання з жанчынамі, якія пацярпелі ад гвалту. Павысіць даступнасць дзяржаўных прытулкаў, пашырыць супрацоўніцтва дзяржавы з грамадскімі арганізацыямі, якія прадастаўляюць ахвярам прытулак і рэабілітацыйныя паслугі.

- Скасаваць любую дыскрымінацыю жанчын пры доступе да адукацыйных устаноў Беларусі.

- Актывізаваць намаганні, накіраваныя на дыверсіфікацыю выбару адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі сярод мужчын і жанчын, і прыняць дадатковыя меры для заахвочвання выбару мужчынамі і жанчынамі нетрадыцыйных сфер адукацыі і прафесійнай дзейнасці.

- Выявіць прычыны і зрабіць адпаведныя крокі, накіраваныя на ліквідацыю розніцы ў аплаце за роўную працу мужчын і жанчын.

- Прыняць канкрэтныя меры, накіраваныя на дасягненне адэкватнага прадстаўніцтва жанчын на вышэйшых прыступках кар'ернай лесвіцы.

- Актыўна супрацьдзейнічаць грамадскім стэрэатыпам адносна размеркавання хатніх абавязкаў паміж членамі сям'і.

***Людзі з інваліднасцю і людзі, што жывуць з ВІЧ (ЛЖВ)***

- Працягнуць намаганні па стварэнні безбар'ернага асяроддзя для людзей з інваліднасцю.

- Дамагацца большага ўдзелу інвалідаў у працоўным жыцці, ліквідацыі бар'ераў для іх на рынку працы.

- Скасаваць дыскрымінацыйныя нормы Закона «Аб папярэджанні распаўсюджвання захворванняў, якія ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва, віруса імунадэфіцыту чалавека». Забяспечваць захаванасць асабістых дадзеных ЛЖВ.

- Рабіць з прыцягненнем грамадскіх арганізацый тлумачальную працу з дзяржаўнымі службоўцамі, работнікамі аховы здароўя, сацыяльнай сферы і адукацыі, якія кантактуюць з ЛЖВ і членамі іх сем'яў. Павышаць дасведчанасць такіх асоб у сферы правоў чалавека.

***Супольнасць ЛГБТ***

- Замацаваць у заканадаўстве забарону на дыскрымінацыю па прыкмеце сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, асабліва ў працоўным праве і пры доступе да тавараў і паслуг.

- Выразна пастанавіць, што матыў нянавісці па прыкмеце сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці пры здзяйсненні крымінальных і адміністрацыйных правапарушэнняў з'яўляецца абцяжарваючай віну акалічнасцю.

- Арганізоўваць для прадстаўнікоў праваахоўных органаў адукацыйныя праграмы і трэнінгі па працы з ЛГБТ і расследаванні злачынстваў і правапарушэнняў на глебе нянавісці да ЛГБТ.

- Паважаць права прадстаўнікоў супольнасці ЛГБТ на свабоду сходаў і свабоду асацыяцый.

- Укараняць праграмы дапамогі ЛГБТ у пытаннях адстойвання сваіх правоў, псіхалагічнай падтрымкі ЛГБТ, іх сем'яў і бліжэйшага атачэння. Падтрымліваць няўрадавыя арганізацыі, якія займаюцца пытаннямі прасоўвання правоў ЛГБТ.

***Людзі з апазіцыйнымі палітычнымі поглядамі і перакананнямі***

- У дадатак да Крымінальнага і Працоўнага кодэксам, увесці заканадаўчую забарону на дыскрымінацыю па прыкмеце палітычных поглядаў і перакананняў у іншых сферах грамадскага жыцця, асабліва пры доступе да тавараў і паслуг, у тым ліку публічных.

- На рынку працы і ў сферы адукацыі правесці маніторынг эфектыўнасці прымянення норм недыскрымінацыі ў дачыненні да асоб, якія прытрымліваюцца апазіцыйных палітычных поглядаў і перакананняў. Па выніках маніторынгу прыняць меры, накіраваныя на выкараненне дыскрымінацыйных практык.

БІБЛІЯГРАФІЯ

## МІЖНАРОДНЫЯ ПАГАДНЕННІ, ПАЛІТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ, АЎТАРЫТЭТНАЕ ТЛУМАЧЭННЕ І РЭКАМЕНДАЦЫІ

Пагадненні ў рамках ААН

Дополнительная Конвенция об упразднении рабства, работорговли и институтов и обычаев, сходных с рабством, 226 U.N.T.S. 3, 1956.

Конвенция о ликвидации всех форм дискриминации в отношении женщин, G.A. Res. 34/180, 1979.

Конвенция № 29 Международной организации труда о принудительном или обязательном труде, принята 28 июня 1930 г., вступила в силу 1 мая 1932 г.

Конвенция № 100 Международной организации труда о равном вознаграждении мужчин и женщин за труд равной ценности, принята 29 июня 1951 г., вступила в силу 23 мая 1953 г.

Конвенция № 111 Международной организации труда о дискриминации в области труда и занятий, принята 25 июня 1958 г., вступила в силу 15 июня 1960 г.

Конвенция № 182 Международной организации труда о запрещении и немедленных мерах по искоренению наихудших форм детского труда, принята 17 июня 1999 г., вступила в силу 19 ноября 2000 г.

Конвенция № 183 Международной организации труда об охране материнства, принята 15 июня 2000 г., вступила в силу 7 февраля 2002 г.

Конвенция о правах инвалидов, G.A. Res. A/RES/61/106, 2006.

Конвенция о правах ребенка, G.A. Res. A/RES/44/25, 1989.

Конвенция Организации Объединенных Наций против транснациональной организованной преступности , G.A. Res. 55/25, 2000.

Конвенция против пыток и других жестоких, бесчеловечных или унижающих достоинство видов обращения и наказания, G.A. Res. A/RES/39/46, 1984.

Конвенция ЮНЕСКО против дискриминации в области образования, 429

U.N.T.S. 93, 1960.

Международная конвенция для защиты всех лиц от насильственных исчезновений, G.A. Res. A/RES/47/133, 2006.

Международная конвенция о защите прав всех трудящихся-мигрантов и членов их семей, G.A. Res. A/RES/45/158, 1990.

Международная конвенция о ликвидации всех форм расовой дискриминации, G.A. Res. 2106 (XX), 1965.

Международный пакт о гражданских и политических правах, G.A. Res. 2200A (XXI), 1966.

Международный пакт об экономических, социальных и культурных правах, G.A. A/RES/2200(XXI), 1966.

Протокол о предупреждении и пресечении торговли людьми, особенно женщинами и детьми, и наказании за нее, дополняющий Конвенцию Организации Объединенных Наций против транснациональной организованной преступности, GA Res. 55/25, 2000.

(Дагаворы ААН ёсць на: http://treaties.un.org.)

**Рэгіянальныя пагадненні**

Конвенция о правовом статусе трудящихся-мигрантов и членов их семей государств-участников Содружества Независимых Государств, принята 14 ноября 2008 г., вступила в силу 21 февраля 2010 г.

Конвенция об обеспечении прав лиц, принадлежащих к национальным меньшинствам, принята 21 октября 1994 г., вступила в силу 10 января 1997 г. (СНГ).

Конвенция Содружества Независимых Государств о правах и основных свободах человека, принята 26 мая 1995 г., вступила в силу 11 августа 1998 г.

Organization of African Unity, Protocol to the African Charter on Human and Peoples' Rights on the Rights of Women in Africa, OAU Doc. CAB/LEG/66.6, 2000.

(Дагаворы СНД ёсць на: http://cis.minsk.by/reestr.)

**Заўвагі агульнага парадку і рэкамендацыі**

Комитет по правам ребенка, *Замечание общего порядка № 13: Право ребенка на свободу от всех форм насилия*, UN Doc. CRC/C/GC/13, 2011.

Комитет по экономическим, социальным и культурным правам,

*Замечание общего порядка № 5: Люди с инвалидностью (пункт 2 статьи 2 Международного пакта об экономических, социальных и культурных правах)*, UN Doc. E/1995/22, 1995.

Комитет по экономическим, социальным и культурным правам, *Замечание общего порядка № 20: Недискриминация экономических, социальных и культурных прав (пункт 2 статьи 2 Международного пакта об экономических, социальных и культурных правах)*, UN Doc. E/C.12/GC/20, 2009.

Комитет против пыток, *Конвенция против пыток и других жестоких, бесчеловечных или унижающих достоинство видов обращения и наказания: Замечание общего порядка № 2. Имплементация статьи 2 государствами-участниками*, UN Doc. CAT/C/GC/2, 2008.

Human Rights Committee, *General Comment No. 18: Non-discrimination*, 1989, UN Doc./HRI/GEN/I/Rev.1 at 1.

Human Rights Committee, *General Comment No. 22: The Right to Freedom of Thought, Conscience and Religion (Art. 18)*, CCPR/C/21/Rev.1/Add.4, 1993.

Human Rights Committee, *General Comment No. 23: The rights of minorities (Art. 27)*, CCPR/C/21/Rev.1/Add.5,1994.

**Заключныя заўвагі і даклады**

Комитет по ликвидации дискриминации в отношении женщин, *Заключительные замечания Комитета по ликвидации дискриминации в отношении женщин: Беларусь*, Un Doc. CEDAW/C/BLR/CO/7, 4 февраля 2011 г.

Комитет по правам ребенка, *Рассмотрение докладов, представленных государствами-участниками в соответствии со статьей 44 Конвенции, Заключительные замечания: Беларусь*, Un Doc. CRC/C/BLR/CO/3-4, 8 апреля 2011 г.

Совет по правам человека, *Доклад Рабочей группы по универсальному периодическому обзору: Беларусь*, Un Doc. A/HRC/15/16, 21 июня 2010 г.

Совет по правам человека, *Доклад Рабочей группы по универсальному периодическому обзору: Беларусь, Добавление: Мнения по выводам и/или рекомендациям, добровольные обязательства и ответы, представленные государством – объектом обзора*, Un Doc. A/HRC/15/16/Add.1, 15 сентября 2010 г.

**Палітычныя абавязацельствы**

*Документ Копенгагенского совещания конференции по человеческому измерению СБСЕ*, Копенгаген, 1990 г.





**Дакументы пра найлепшыя практыкі**

*Ословские рекомендации о правах национальных меньшинств в области языка,* 1 февраля 1998 г.

*Declaration of Principles on Equality*, The Equal Rights Trust, London, 2008.

European Commission for Democracy through Law (Venice Commission), *Report on the Preferential Treatment of National Minorities by Their Kin-State*, Strasbourg, 22 October 2001, CDL–INF(2001)19.

European Commission for Democracy through Law (Venice Commission) and OSCE Office for Democratic Institutions and Human Rights (OSCE/ODIHR), *Joint Opinion on the Law on Mass Events of the Republic of Belarus*, Strasbourg, Warsaw, 20 March 2012, CDL–AD(2012)006.

**РЭГІЯНАЛЬНАЕ ПРАВА**

Council Directive 2000/43/EC of 29 June 2000 implementing the principle of equal treatment between persons irrespective of racial or ethnic origin.

Council Directive 2000/78/EC of 27 November 2000 establishing a general framework for equal treatment in employment and occupation.

Communication from the Commission to the European Parliament and the Council: Eastern Partnership, Brussels, 3.12.2008(2008) 823 final.

**НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПРАВА Рэспубліка Беларусь, Беларуская ССР, СССР**

*Конституции, законы, кодексы, указы, декреты*

Гражданский кодекс Белорусской ССР от 7 декабря 1998 г. № 218–З.

Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь от 11 января 1999 г. № 238–З.

Декрет Президента Республики Беларусь от 26 июля 1999 г. № 29 «О дополнительных мерах по совершенствованию трудовых отношений, укреплению трудовой и исполнительской дисциплины».

Декрет Президента Республики Беларусь от 26 июня 2008 г. № 14 «О некоторых мерах по совершенствованию деятельности Конституционного Суда Республики Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 7 декабря 2009 г. № 65–З «Об основах государственной молодежной политики».

Закон Республики Беларусь от 10 января 2000 г. № 361–З «О нормативных правовых актах Республики Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 11 ноября 1991 г. № 1224–XII «О социальной защите инвалидов в Республике Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 11 ноября 1992 г. № 1926–XII «О национальных меньшинствах в Республике Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 14 июня 2003 г. № 204–З «О государственной службе в Республике Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 14 июня 2007 г. № 239–З «О государственных социальных льготах, правах и гарантиях для отдельных категорий граждан».

Закон Республики Беларусь от 14 ноября 2005 г. № 60–З «Об утверждении Основных направлений внутренней и внешней политики Республики Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 15 июня 1993 г. № 2406–XII «Об адвокатуре».

Закон Республики Беларусь от 15 июня 2006 г. № 125–З «О занятости населения Республики Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 16 ноября 2010 г. № 190–З «О наименованиях географических объектов».

Закон Республики Беларусь от 17 декабря 1992 г. № 2054–XII «О свободе совести и религиозных организациях».

Закон Республики Беларусь от 17 июля 2008 г. № 427–З «О средствах массовой информации».

Закон Республики Беларусь от 19 ноября 1993 г. № 2570–XII «О правах ребенка».

Закон Республики Беларусь от 23 июля 2008 г. № 421–З «О международных договорах Республики Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 23 июля 2008 г. № 422–З «О предупреждении инвалидности и реабилитации инвалидов».

Закон Республики Беларусь от 23 июня 1972 г. «Кодекс законов о труде Белорусской ССР».





Закон Республики Беларусь от 23 ноября 1993 г. № 2581–XII «Об основах службы в государственном аппарате».

Закон Республики Беларусь от 26 января 1990 г. № 3094–XI «О языках в Республике Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 28 октября 2008 г. № 433–З «Об основах административных процедур».

Закон Республики Беларусь от 10 ноября 2008 г. № 453–З «Об основах деятельности по профилактике правонарушений».

Закон Республики Беларусь от 30 декабря 1997 г. № 114–З «О массовых мероприятиях в Республике Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 30 декабря 2010 г. № 225–З «О внешней трудовой миграции».

Закон Республики Беларусь от 30 декабря 2011 г. № 334–З «Об адвокатуре и адвокатской деятельности в Республике Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 30 марта 1994 г. № 2914–XII «О Конституционном Суде Республики Беларусь».

Закон Республики Беларусь от 4 октября 1994 г. № 3254–XII «Об общественных объединениях».

